# ВАНДРОЎНІК

## Дарогамі Міколы Купрэева

*Успаміны, эсэ, прысвячэнні, вершы і проза*



Мінск
Выдавец Цымбераў Р. М.
2024

УДК 821.161.3-3???
ББК 84(4Беи)
В17

Рэдакцыйная калегія:
М. А. Аляксандраў,
Л. Ф. Валасюк і Л. М. Галубовіч (укладальнікі),
М. І. Сянкевіч.

ISBN 978-985-7303-89-2???

© Калектыў аўтараў, 2024
© Валасюк Л. Ф., Галубовіч Л. М., уклад., 2024
© Афармленне. ІП Цымбераў Р. М., 2024

# «О, як многа хацеў вам сказаць...»

Мікола Сямёнавіч Купрэеў нарадзіўся 25 траўня 1937 года ў вёсцы Ямнае Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Пасля вайны сям'я пераехала на Брэстчыну. У 1957 годзе М. Купрэеў скончыў Івацэвіцкую сярэднюю школу, а затым факультэт беларускай і рускай мовы і літаратуры Брэсцкага педагагічнага інстытута (1962). Працаваў у школах Івацэвіцкага і Ляхавіцкага раёнаў, у рэдакцыі ляхавіцкай раённай газеты «Будаўнік камунізму». Нейкі час лёс пісьменніка быў цесна звязаны з Ганцаўшчынай, дзе ён працаваў настаўнікам у Чудзінскай і Малькавіцкай сярэдніх школах. У 1994 годзе яго прынялі ў Саюз пісьменнікаў. Апошнія гады жыцця М. Купрэеў быў звязаны з Берасцейскім Палессем, думкамі ж заўсёды вяртаўся ў роднае Ямнае — калыску сваёй паэтычнай і вандроўнай душы.



• *Мікола Купрэеў у час школьніцтва. 1952 год*

Літаратурную працу М. Купрэеў пачаў у 1957 годзе. З канца 80-х гадоў яго вершы, паэмы, балады пачалі ўсё часцей з'яўляцца ў перыёдыцы. Першая кніга паэзіі «Непазбежнасць» выйшла ў 1967 годзе. Яна, у асноўным, складаецца з балад і элегій, і таму ў ёй пераважаюць ціхія, самотныя інтанацыі. Але ў такой ціхай споведзі аўтара заўсёды адчуваюцца тыя грымотныя падзеі, якія пакінулі след на зямлі і ў сэрцы паэта.

М. Купрэеў вельмі рэдка звяртаўся да гімнаў, а калі пісаў іх, то прысвячаў роднаму полю, лесу... Хараство прыроды,

любаванне ёю і адначасова боль за родны край перадае не адзін верш паэта: «Камень», «Лістападная балада», «Журавы не пралятаюць міма», «Вясна», «Цішыня», «Лясныя сполахі»...

Вершы М. Купрэева часта вызначаюцца казачнасцю, выкарыстаннем фальклорных матываў і стыляў. Адсюль і любоў да верлібра, балады, элегіі, прытчы. Яго стыхія — ціхія лясныя вёсачкі, дзе яшчэ жывуць народныя песні і легенды. Характэрнымі рысамі паэзіі М. Купрэева з'яўляюцца філасофская глыбіня, спалучэнне метафарычнасці з рэальнасцю, асацыятыўны падтэкст і ў той жа час прастата выказвання.

Другі зборнік вершаў аўтар выдаў амаль праз 30 гадоў («Правінцыйныя фантазіі», 1995). Ён перадае цесную сувязь чалавека з радзімай, з яе гісторыяй. Менавіта такое яднанне выклікае ў лірычнага героя жаданне жыць, дапамагае пераадолець адзіноту. Паэт пастаянна звяртаецца да вобраза дарогі, героі ж яго вершаў — вечныя вандроўнікі. Часам галоўным героем твора з'яўляецца сам аўтар, яго біяграфія. Так, біяграфічнай стала паэма М. Купрэева «З сястрой і Уладзімірам Караткевічам на Рагачоўшчыне».



• *У студэнцкім асяродку. Мікола Купрэеў (стаіць другі злева)*





• *Мікола Купрэеў з жонкай Таццянай (на здымку справа) і яе сяброўкай*



• *Берасцейскія літаратары. 1980-я гады. Стаіць трэці справа Мікола Купрэеў*



• *Мікола Купрэеў (стаіць у цэнтры), злева ад яго — жонка Таццяна*

Сустракаюцца ў М. Купрэева і творы пра каханне. Гэта заўсёды чыстае і прыгожае пачуццё, якое валодае ўсёператваральнай сілай.

М. Купрэеў звяртаўся не толькі да вершаваных форм, пісаў таксама і прозу. У 1995 годзе была надрукавана яго аповесць «Дзіцячыя гульні пасля вайны», у 1996-м — «Імгненне светлае», у 1997-м — «На вуліцы Карла Маркса з Паэтам». Гэта своеасаблівая трылогія напісана на гістарычную тэматыку. Аб'ядноўвае аповесці ўспамін пра трагедыю вайны, цяжкія пасляваенныя гады, роздум аб далейшым жыцці.



• *Сустрэча з Міколам Купрэевым (справа) у Пружанскай СШ № 4. Выступае паэт Мікола Антаноўскі*



• *Мікола Купрэеў у апошнія гады жыцця*

Лёс паэта не заўсёды быў міласцівым да яго, але Мікола Купрэеў заставаўся верным абранаму шляху, свайму адметнаму погляду на жыццё. Яго паэзія, як і сам аўтар, свабодная ад догмаў і штампаў, нечаканая і арыгінальная.

Памёр творца 19 верасня 2004 года...



# ТЭКСТ І КАНТЭКСТ ЖЫЦЦЯ

# «Верш — гэта дыханне яго творцы»

*Гутарка Леаніда ГАЛУБОВІЧА з Міколам КУПРЭЕВЫМ, якая адбылася на пачатку 1994 года*

*Леанід ГАЛУБОВІЧ: — Мікола, даволі пагаманілі мы з табою сам-насам, а вось цяпер давай рызыкнём вынесці нашу размову на публіку. Усё вельмі проста, прынамсі, як для мяне, журналіста, які звык варушыць чалавечыя душы. Вось цыгарэты, вось кава… Кавы не п’еш?.. Пачакай, гляну ў буфет… Павінна недзе гарбата быць… Ну што, цяпер можна пачынаць? А з чаго ж нам пачаць? Давай з каламбура: з чаго і з каго пачаўся паэт Мікола Купрэеў?*

Мікола КУПРЭЕЎ: — Упэўнены, ніхто з Паэтаў (сябе я, канечне, не адношу да гэтай шаноўнай касты з вялікай літары) не помніць, з чаго і з каго пачаўся. Як ніхто з людзей не помніць сваіх першых крокаў па зямлі, сваіх першых вымаўленых словаў. Толькі версіфікатар, графаман можа сказаць: з таго і таго, тады і там. А юны чалавек са шчымлівай, трапяткой душою не скажа, нават не шапне, а проста няўцямна падумае: можа — у лесе, можа — ля ракі, можа — ля вакна, расчыненага насцеж у сонечна-зялёны ранішні свет роднага падворка, а можа, і хутчэй за ўсё, крыху пазней — ля слядоў дзяўчынкі, калі цікаваў за ёю з-за дрэва, з-за куста, ці ля яе блізкага дыхання за пярэдняй партай; а можа — калі вучыў і ніяк не мог вывучыць на памяць «Мой родны кут! Як ты мне мілы!..» Не мог вывучыць на памяць таму, што побач з коласаўскім словам раптам страпянулася апантанымі крылцамі і сваё слова… Але ён нічога гэтага ўжо не помніць — бо то быў проста працяг жыцця, але жыцця ўжо нейкага нетутэйшага…

Настаўнік прыходзіць да творцы-пачаткоўца сам. Дакладней: патэнцыяльны настаўнік-паэт і патэнцыяльны вучань-паэт ідуць, імкнуцца адзін да аднаго на сустрэчу і, сустрэўшыся, злучаюцца ў адну душу. Той настаўнік можа быць жывым сучаснікам, а можа быць ужо даўно па-за сваёй фізіялагічнай існасцю, але — не па-за паэзіяй. І неабходна, каб вучань хоць зрэдку паказваў-чытаў яму свае творы — яны ж злучыліся ў адну душу, і таму таленавітаму пачаткоўцу неабходна гэта — павяраць свой радок (!) духоўнай і эстэтычнай сутнасцю паэзіі куміра. Паўтаруся: павяраць сутнасцю, а не радком яго, не слоўнікам яго…

Такое адбываецца, калі пачатковец жадае мець настаўніка-паэта (дарэчы, настаўнікамі-натхняльнікамі могуць аказацца і празаікі, напрыклад: І. Бунін, М. Гарэцкі, Я. Брыль).

Але ж былі і ёсць, і будуць пачаткоўцы-адзіночкі, пры тым — зацятыя, якія ад усіх адмахваюцца рукамі, упарта ўцякаюць ад усякіх уплываў, хоць нехта ж некалі і даў ім паэтычны штуршок, узрушыў чуйнае сэрца.

Але мы тут гаворым пра тое, як бывае — пра настаўніцтва і вучнёўства.

У маім сціплым выпадку ўсё, здаецца, пачалося з «Кургана» Янкі Купалы. «Курган» я ўпершыню прачытаў (ці пачуў — не помню) у другім ці трэцім класе, і паэма мяне так уразіла, што я доўга маўчаў у сваім кутку ў хаце, — уразіла нейкай дзівоснай, незразумелай тады, і прыгожай, і страшнай, музыкай, сваімі не ўсюды зразумелымі і, зноў жа, страшнымі словамі. Гэта было насланнё, начараванне, штуршок на задуменнасць у сваім самотніцкім кутку…

Настаўнікам маім Янка Купала не стаў. У юнацтве растрывожылі мяне, падштурхнулі сесці перад чыстым аркушам паперы і нешта (нешта!) напісаць на ім Максім Багдановіч і Аляксандр Блок. Доўга пакутаваў музыкай і раскаванасцю іх паэтычнага радка (у «Страцім-лебедзі», у «Вольных мыслях»). А крыху пазней, але ўсё яшчэ ў юнацтве добра-такі патрывожылі палякі Галчынскі і Тувім,



іспанец Лорка, француз Прэвер, летувіс Марцінкявічус. Але і яны настаўнікамі, у вузкім значэнні гэтага слова, не сталі, як не маглі імі стаць ні для кога. Ага!.. Усе згаданыя мною паэты, пачынаючы ад Купалы, зліліся з часам у адну Асобу, асобу Паэта, да якое хацела далучыцца і мая перыферыйная душа.

Калі мы павялі ўжо гаворку пра настаўнікаў і вучняў дык хачу тут успомніць…

У 50-я гады я вучыўся ў Івацэвіцкай сярэдняй школе. Там працаваў завучам Якаў Дзмітравіч Янчанка, выкладчык рускай літаратуры, інвалід вайны. У яго быў прыгожы адухоўлены твар. На школьных вечарынах ён чытаў са сцэны паэмы Пушкіна. Да вайны Якаў Дзмітравіч вучыўся ў мастацкім інстытуце. Пасля вайны давялося, замест мастацкага, закончыць філалагічны факультэт універсітэта. Але ён не кінуў жывапіс: навучыўся маляваць левай рукой. У калідорах, кабінетах школы віселі яго карціны. Ён «заразіў» школу: шмат хто з вучняў, асабліва хлопцы, сталі маляваць — дома, у школе, нават на ўроках матэматыкі. Прафесійных мастакоў з нас не выйшла, але, ведаю, некаторыя і цяпер, пад старасць, працягваюць маляваць, і нават няблага. (Дарэчы, некалькі гадоў таму ў «Нёмане» былі апублікаваны вершы таго ж Янчанкі.)

А цяпер пра сябе ў падобнай сітуацыі. Хоць твар мой і не прыгожы, і не адухоўлены, як у таго нашага завуча. У шасцідзясятыя гады я працаваў завучам Чудзінскай сярэдняй школы Ганцавіцкага раёна, на маляўнічым беразе былой ракі Лані. Я ўжо лічыўся маладым паэтам, друкаваўся ў «Маладосці» і мясцовых газетах. Мае вучні ведалі пра гэта. Адзін з іх — Алесь Каско — усур'ёз заняўся паэзіяй і з цягам часу стаў вядомым паэтам, выдаў некалькі зборнікаў і цяпер нават узначальвае Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Потым я працаваў у Сташанах Пінскага раёна, таксама ў школе. Тут мае вучні ведалі, што ў мяне ўжо ёсць кніжачка вершаў. Гэта некаторых з іх інтрыгавала і «падбі-

вала» на свае вершы. Сярод гэтых некаторых былі Мікола Антаноўскі і Анатоль Шушко. Нядаўна і той, і другі выдалі пад эгідай «Маладосці» свае паэтычныя зборнікі. Дык вось, усе трое, калі былі вучнямі, вершаў мне сваіх не паказвалі. Як прызнаваліся пасля Каско і Шушко, — яны саромеліся іх паказваць, а былі, паўтаруся, проста заінтрыгаваны: «Як так? Наш настаўнік піша вершы. А мы што — не можам?» Толя Шушко прызнаўся нават у тым, што цікаваў за мною з-за дрэва, з-за куста, калі я летам прыходзіў да сажалкі, і ён глядзеў, ці пішу я там што. А потым ён прыбягаў дахаты і пісаў сам. Тым летам, калі Толя заканчваў сярэднюю школу, яго першыя (!) вершы былі надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва». І цяпер я рады, што гэтыя тры хлопцы працуюць у паэзіі больш апантана, чым іх былы школьны настаўнік. От як бывае!..

Вось і ты, прабач, Лёня, нагадваеш цяпер вучня, якому не абрыдзела слухаць настаўніка. У старасці ўсе мы любім пагаварыць-паўспамінаць. Але ты, відаць, яшчэ ў тым узросце, калі ёсць патрэба слухаць...

*Л. Г.: — Ведаеш, цябе люба слухаць... мова ж вельмі народная, не літаратурная. Вось пра мову і добра было б працягнуць нашу гаворку...*

М. К.: — ...Усё пачынаецца з роднага слова, схаванага глыбока ўнутры, удыхнутага ў сябе, а потым лёгка выдыхнутага разам з родным паветрам. Мне на гэты конт, асабліва напачатку, не надта пашанцавала. Глядзі: мая Рагачоўшчына, бацькава і матчына вёскі, ля Дняпра. Зямля радзімічаў, зямля якая была калыскай найшчырэйшых беларусаў Ядвігіна Ш., Андрэя Макаёнка, Міколы Сурначова, Алеся Жаўрука, была дзяцінствам і маладосцю Міхася Лынькова, «запасным» прытулкам (па найбліжэйшай радні) і творчым жнівом для Уладзіміра Караткевіча. І ад такой беларушчыны я быў адарваны (пераезд сям'і) у дзесяцігадовым узросце. На Старапескаўскіх вуліцах у Бярозаўскім раёне я акунуўся ў заходнепаляшуцкую моўную стыхію. Але мова далёкай радзімы яшчэ дыхала ўва мне, да таго ж яна сілкавалася беларускімі ўрокамі ў школе. І таму, калі я, вучань сямігодкі, напісаў там свой першы, па-дзіцячы наіўны, верш пра Першамай, — напісаны ён быў па-беларуску.

Дарэчы, прыкладна ў той час у суседняй вёсцы Нівы падрастала Ніна Мацяш, а па той бок чыгункі Масква — Брэст, у Сяльцы, магчыма, лазіў у чужы сад па яблыкі вясковы хлопчык Алесь Разанаў, — можа, тады ўжо Алесь задумаўся пра яблык Н'ютана?

*Л. Г.: — Ну, наўрад ці ў такім узросце Алесь Сцяпанавіч пачаў прылучацца ў час шкоды да вялікай мудрасці... Ранавата.*

М. К.: — Прабач, відаць, загаварыўся. Аднак, вярнуся да думкі... Недзе тады ж маленькая Райка Баравікова паехала з Бярозы на Магілёўшчыну...

І пасля гэтай «паляшуцкай» Бярозаўшчыны я стаў вучнем-старшакласнікам рускамоўнай івацэвіцкай школы, а затым — студэнтам-філфакаўцам моцна зрусіфікаванага тады, у другой палове 50-х гадоў, педінстытута імя Пушкіна ў Брэсце — горадзе з вуліцамі Гогаля, Лермантава, Талстога, Тургенева, Маякоўскага, Шолахава, Міцкевіча, Шаўчэнкі, але без вуліцы Купалы (цяпер такая, нават з рэстаранам «Паўлінка», у адным з мікрараёнаў ёсць)... Да ўсяго, гэтая — хатняя, у сям'і, «вучыцельская» — моўная трасянка. Але ж паехалі мы на Брэстчыну, калі мне было ўжо дзесяць гадоў, і таму жывое роднае слова колькі часу яшчэ стаяла ў дзіцячай памятлівай душы («А мая ж ты, таячка, а хадзі ж ты сюды! Можа, кулагі пасёрбаеш? Акы-ыш, пранцаватыя!» — так казала мая баба Марфа ля варотаў дзяўчынцы-сіраціне і праганяла курэй з гародчыка. Дарэчы, у хатах маіх абодвух дзядоў я не чуў паганых, «мацюжных» слоў, занесеных на Беларусь вятрамі з усходу. «Пранцаватыя», «пранцы» (ад францы) — гэта адзі-

ная, лічы, лаянка, якая засталася ў народзе пасля вайны з французамі 1812 года) .

Генная памяць матчынай мовы жывучая... У маім выпадку — дзедавай, бабулінай мовы я не ведаю і не помню, як не помню і што гаварыла мая маці: яе забілі ў вайну, калі мне было пяць гадоў.

От гэткія мае стасункі з роднай мовай, таму пачаў я пісаць «вершыкі» па-беларуску, а крыху пазней прозу — па-расейску. Я быў радасна здзіўлены, калі мяне, дзевяцікласніка, паклікалі на абласную нараду маладых пісьменнікаў. Там я, заікаючыся яшчэ больш, чым цяпер, чытаў свае мініяцюры перад Янкам Брылём, і ён ухваліў іх — тым самым велікадушна заахвоціў мяне да далейшай творчасці. Потым мініяцюры мае былі надрукаваны ў альманаху «Советская Отчизна» (цяпер часопіс «Нёман»), а потым, ужо будучы студэнтам, я напісаў аповесць з такой рамантычнай назвай: «Бродят на рассвете юные». Рукапіс чыталі Янка Брыль і Барыс Бур'ян (апошні — ужо ў «Нёмане»). Яны зрабілі мноства крытычных заўваг, але ў цэлым ухвалілі, параілі, як давесці пісаніну да ладу. Ды на той час я ўжо працаваў у Ляхавіцкім раёне (вёска Пранчакі, адкуль родам паэт-песеннік Леанід Пранчак), жыў-гасцяваў у цешчы ў Клецкім раёне, на беразе колішняй рамантычна-прыгожай рэчкі Начы. А мова ў гэтым краі чысцюткая, незасмечаная ні з захаду, ні з усходу (ты, браце, ведаеш гэта так добра, як ніхто іншы).

Вось тут лёгка і назаўжды вярнуўся толькі ў роднае — пісаў толькі вершы і толькі на сваёй мове. А тую аповесць падчас адной сваёй вандроўкі па Палессі я закінуў на гарышча ў аднаго знаёмага мужыка — а ён рукапісам аповесці распальваў дровы ў печы. Усё ж карысць ад яе нейкая была... Мне сорамна перад самім сабой за сваю прозу не на роднай мове.

Ад таго сарамоцця я нават не асмеліўся падзякаваць Янку Брылю за страчаны час... Ніякаватасць перад ім нашу па сёння. А сваё тое, даўняе ўжо, «рэнегацтва» неяк



вытлумачваю сам сабе творчым лёсам такіх нашых літаратараў, як Казько, Тарас, Ждан, Някляеў...

А калі адкінуць усю гэтую маю гаварыльню і коратка адказаць на пытанне: з чаго пачаўся паэт Мікола Купрэеў? Я адказаў бы так: захацелася сказаць нешта такое самому сабе, што мяне ж самога і здзівіла. А сказаў я так: «Сонца ўзышло, і пабег ручаёк». І здзівіўся: ног жа ў сонца няма, і ў ручайка няма. Толькі потым дацяміў: я проста паўтарыў тое, што казалі мае продкі сотні гадоў. Так што пачаў я з найгрубейшага плагіяту.

*Л. Г.: — Ты ўжо вопытны чалавек і не менш вопытны літаратар. Панюхаў удосталь, як гавораць, і потнага хлеба, і застольнага чарніла... І ў чым усё-ткі больш сэнсу — у жыцці-быцці ці ў паэзіі?*

М. К.: — А што гэта такое, дарэчы, — сэнс жыцця? Можа, проста — жыць па-чалавечы, па-Боску. Да гэтага і просіць людзей існі паэзія, песня, асабліва беларуская народная лірычная жаночая песня. У ідэальным грамадстве (а ці было калі такое і ці будзе?) сэнс жыцця і сэнс паэзіі (увогуле сэнс мастацтва) — і гэта натуральна — павінны быць як адзінае цэлае.

*Л. Г.: — Само па сабе напрошваецца пытанне: паэт і грамадства. «Поэтом можешь ты не быть, но гражданином быть обязан»...*

М. К.: — ...І ў дружбе, і нават ва ўзаемнай любові клянуцца, і — варагуюць, а грамадства ў абліччы дзяржавы нават на шыбеніцы валакло сваіх лепшых паэтаў, а потым велікадушна, яшчэ пры жыцці паэта ці пасля яго пагібелі, зыходзіла да літасці... Франсуа Віён быў асуджаны на смерць. Але перад шыбеніцай яму пашанцавала: ён прыняў удзел у турніры паэтаў Францыі і быў прызнаны каралём паэтаў. І грамадства дазволіла яму жыць. Разумнае грамадства. Яно спасцігла тую ісціну, што сапраўдны паэт, як і дзіця,

не можа быць злачынцам. Хоць дзіця і можа ўзяць дарагую, прыгожую вазу і кінуць яе на падлогу.

Добра, калі паэт і грамадства папікаюць, ушчуваюць адно аднаго ад любові адно да аднаго. Нагадаю Багдановіча: «Народ, Беларускі Народ! Ты цёмны, сляпы, быццам крот... І душу тваю абакралі, — у ёй нават мовы няма». І «Народ» у Багдановіча з вялікай літары. А ўспомнім нядаўнія вершы Пімена Панчанкі пра мову — з папрокамі да народа...

*Л. Г.: — Папахвае хрысціянствам... Дарэчы, як у цябе з веравызнаннем? Я заўважыў, што ты і сёння пішаш слова Бог з малой літары?*

М. К.: — Але Ісус Хрыстос я пішу з вялікай... Рэлігія з'явілася на зямлі, каб уратаваць чалавека. І кожная з яе галін (хрысціянская, мусульманская, іудзейская...) ратуе вернікаў па-свойму, хоць, зрэшты, кажа ім адно: узлюбі чалавека. А ці ж не гэта вяшчуе праз тысячагоддзі паэзія? Ці ведаем мы хоць аднаго вялікага (!) паэта-чалавеканенавісніка?! Давай канкрэтызуем так: паэзія і царква (касцёл, сінагога, мячэць...). Вернік уваходзіць у свой храм на ачышчэнне душы сваёй. Перад святынямі ён моліцца, узносіць рукі да Бога са слёзамі на вачах... А ці з гэткім жа ўзрушаннем душэўным чалавек ідзе ў той храм, які мы называем паэзіяй? Зачараваны, шэпча радкі любімага паэта... Шэпча, як малітву... Прычашчаецца — і ачышчаецца, і хочацца жыць яму прасветлена, з любоўю. Так, кожная вера робіць сваю святую справу па-свойму, толькі фармальна па-свойму, хоць у тых фармальнасцях шмат падобнага. Біблія адрозніваецца ад Карана, але ў іх многа агульнага. Сэнс, па вялікім рахунку, — адзін...

*Л. Г.: — У тваёй паэзіі міфалогія фармальна як бы адсутнічае, але па-за словам чуецца. Якая роля міфалогіі ў тваёй творчасці?*



М. К.: — На жаль, міфы даўно-даўно ўжо нідзе на зямлі не ствараюцца. Мастацкая літаратура, прынамсі — паэзія, як, дарэчы, і жывапіс, толькі час ад часу сілкуюцца міфамі (у нас — паданнямі, легендамі, казкамі) для вырашэння сваіх сэнсавых і фармальных задач. У нашай паэзіі, напрыклад, з такою мэтай звяртаўся да міфічных вобразаў Максім Багдановіч («Калі зваліў дужы Геракл у пыл Антэя...», «Страцім-лебедзь»), былі спробы ў Анатоля Вялюгіна («След мастака»), ну і, вядома, шырока выкарыстоўваў міфалогію Уладзімір Караткевіч (асабліва ў прозе — «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Ладдзя роспачы»).

З'явай грамадскага жыцця, а не толькі літаратуры, суджана было стаць напачатку 60-х гадоў баладзе ўкраінца Івана Драча «Крылы». Дзед Мароз раздаваў людзям навагоднія падарункі, дык мужыку Кірылу дасталіся ў падарунак крылы. Мужык прыладзіў іх на сабе, крылы прараслі праз сцены яго хаты, і мужыка разам з хатай узнеслі над зямлёй; далейшы змест балады — што адчуваў і што бачыў мужык з-пад неба на зямлі... Верш — як паданне. Магчымасці для паэта падсілкоўвацца міфамі не абмежаваныя. І я на гэта зважаю.

*Л. Г.: — Цікава было б пачуць тваё меркаванне наконт паэтычнай метрыкі, паколькі яна ў цябе, як бы гэта дакладней сказаць, — гіпертанічная... Душэўны ўздым — высокі ціск радка, самотны стан — нізкі... Нерв верша «гуляе»... Вечная арытмія.*

М. К.: — Верш — гэта дыханне яго творцы на той час, калі ён, верш, «выліваецца». На той час... А з гэтым дыханнем, сапраўды, надараецца ўсякае. Роўнае, спакойнае дыханне — меладычны верш... А характар жа дыхання — ад гармоніі ці дысгармоніі ў паэтавай душы, якая, у сваю чаргу, такая чуйная на гармонію ці дысгармонію ў прыродзе, у грамадстве, нават у надвор'і за акном.

У дзяцінстве і ў раннім юнацтве я надта (пасля нейкага ў вайну ўзрушэння ці перапуду) заікаўся...У апошнія прыкладна трыццаць гадоў на Палессі, дзе я жыву, сатаной парушана гармонія, музыка-рытм у прыродзе. Бязглуздая асушка знявечыла векавечны рытм зямлі, напеўнасць яе рэк і рачулак, дарог і сцежак. А сацыяльна-палітычныя стрэсы ўжо даўно разарвалі рыфму «дарога — да Бога». І я не магу пісаць без спатыканняў-паўз, без «заікання» пра вайну ці якое іншае гора...

*Л. Г.: — ...А можа, гэта і на карысць нашай паэзіі, бо гладкапісу прыпевачнага тыпу ў ёй цераз край... Адны іх (вершы) «адстрэльваюць» па сваіх франтавых успамінах, другія — «косяць», як незабыўны вясковы луг, трэція — «адбіваюць» пад дыскатэчныя рытмы, чацвёртыя — знемагаюць ад слоўнай «вольнасці» (я, спадзяюся, ты разумееш, што азначае гэтае народнае слова, акром сэнсу свабоды)... Ці не зашмат у нас трафарэтнай і «другаснай паэзіі», версіфікатарства?*

М. К.: — Перад тым, як пачаць верш на чыстым аркушы паперы, трэба паглядзець на сябе ў люстэрка — каб яшчэ раз пераканацца, што ты з твару не падобны ні на кога ў свеце. Потым трэба ўспомніць, што і думаеш ты так, як ніхто ў свеце. І бачыш ты вунь тую травінку, той каменьчык за акном не так, як бачыць іх нават найбліжэйшы табе па духу і па крыві чалавек. Дык чаму ж тады твой верш павінен быць падобны на верш Багдановіча ці Жычкі, Пушкіна ці Бадака?!

*Л. Г.: — А што для цябе найбольш блізкае і адметнае ў беларускай літаратуры?*

М. К.: — Люблю апрадмечаную, сатканую з дэталяў побыту, прозу Вячаслава Адамчыка і Анатоля Кудраўца, густую на думкі біяграфічную прозу Уладзіміра Арлова... Запомніліся лімаўскія апавяданні Алеся Чобата, а таксама апавяданне «Маёр» Уладзіміра Сцяпана... Упэўнены: В. Адамчык здольны на вялікі эпічны твор пра Беларусь. І — забываюся пра ўсё на свеце, пра свае нягоды, калі ў сваім кутку у сваёй мансардзе бяру ў рукі «Полымя» ці «ЛіМ» з мініяцюрамі Янкі Брыля. Лічу, што «Споведзь» Ларысы Генiюш — найадметнейшая з'ява ў нашай літаратуры. Сапраўдная споведзь перад людзьмі, перад родным кутам, перад сабой...

Заўжды рады сустрэцца з простымі знешне і мудрымі ўнутры вершамі Леаніда Галубовіча (прабач, што нагадваю табе пра цябе, толькі не крыўдуй — лепш палічы за камплімент), зачараваны паганскай паэзіяй Анатоля Сыса. У вершаказах Алеся Разанава, асабліва апошніх, бачу паэзію ўсеславянскага маштабу, хацеў сказаць — еўрапейскага маштабу... Але на раманскія мовы паэзія Разанава не перакладальная, бо яна — у беларускай (а значыць — і ў славянскай) моўнай стыхіі. Гэтаксама і Рыгор Барадулін не будзе гучаць на іншай мове, як ён гучыць на роднай.

*Л. Г.: — А ці ведаеш ты свайго патэнцыяльнага чытача, ці зважаеш ты на яго, пішучы той ці іншы верш? Для каго пішам, Мікола? Самае сумнае, відаць, пытанне...*

М. К.: — Закаханы падлетак ведаў, для каго ён пісаў «Алесю». І Пушкін ведаў, для каго ён пісаў сваё «Послание в Сибирь». І санэты Пятраркі мелі свайго адрасата — Лауру. І Багдановіч ведаў, каму пяе душа ў «Зорцы Венеры». А Якуб Колас «Новую зямлю» пісаў для беларускага народа. Але людзі зрабілі «Алесю» адной са сваіх любімых песняў. На покліч Пушкіна адклікнуліся не толькі сасланыя дзекабрысты. Мільёны юных жанчын бачылі, а мо яшчэ і бачаць сябе Лаўрамі...

Увогуле ж, паэт не думае, для каго ён піша. Проста вылівае сваю душу на паперу, а потым, збоку, глядзіць са здзіўленнем на гэтую душу. Быццам незнарок адашле ці аднясе верш у рэдакцыю. Але ж знаходзіцца недзе ў нейкім кутку яшчэ душа, і не адна, якая схіліцца над тым вершам. Дык для каго ж пішуцца вершы? А для — некага...

Ах, не будзем самі сабе хлусіць: вершы мы пішам для людзей і хочам, каб яны іх чыталі.

*Л. Г.: — Будзем спадзявацца, што нейкі ўсё ж чытач у нас яшчэ пакуль ёсць. Як казаў Чэхаў: калі гэтая маленечкая кніжачка пабачыла свет, то, пэўна ж, недзе ў нейкім закутку свету жыве і яе маленечкі чытач… Ці выжыве паэзія наогул у наш час?*

М. К.: — А што — наш час самы трагічны з усіх часоў? У сярэднявечнай Еўропе вялікая паэзія (у тым ліку італьянская) выжыла ў час «вялікай» чумы. І ніякія «гулагі» не змаглі яе ўсмерціць. Наш час, наадварот, балюча пабіўшы ёй бакі, узнясе нашу паэзію вышэй. Праўда, гэта будзе каштаваць нямала паэтычных нерваў, і самі вершы часта будуць нервовымі ці, як казала мая клецкая цешча, «нарванымі». Але гэта будзе толькі адной з прыкмет паэзіі нашага часу.

*Л. Г.: — Папраўдзе кажучы, не думаў, што ты такі аптыміст…*

М. К.: — Гэта парадаксальна: паэзія, як і мастацтва ўвогуле, — самая кансерватыўная галіна чалавечай дзейнасці. Глянь, як развіваюцца навука і тэхніка ў апошнія сто гадоў! А мастацтва і літаратура, прынамсі — паэзія? Што — сучасныя жывапісцы па майстэрстве вышэй за Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Босха, Брэйгеля-мужыцкага?.. Што — сучасныя кампазітары пераўзышлі вялікіх кампазітараў XVIII–XIX стагоддзяў? А ў архітэктуры — старажытныя храмы?.. І, нарэшце, у паэзіі. Хто-небудзь з сучасных расейскіх паэтаў стварыў што-небудзь лепшае за лермантаўскія радкі «Выхожу один я на дорогу…»? Санэты якога сучаснага аўтара глыбейшыя, мудрэйшыя за санэты Шэкспіра? А старажытная егіпецкая, кітайская, японская паэзія? А, бліжэй па часе і бліжэй да нас, «Пагоня» Багдановіча… А нерукатворная песенная паэзія беларускіх жанчын, якая ўсё ж часткова захавалася да нашага часу… (Гаворым пра дакладную рыфму, а яна, найдакладнейшая, вось тут:

> — Не хачу, матулечка, без кубла.
> — Ты ж мне кудзелечку не скубла.

Гаворым пра асацыятыўнасць як пра адметнасць сучаснай паэзіі, а яна ж, асацыятыўнасць, і вось тут і даўно:

> «Замуцілі гусі воду на Дунаі…»,
> «У полі вярба нахілёная…»)

Так, на фармальныя (!) адкрыцці сучасныя творцы надта здатныя (і ў жывапісе, і ў тэатры, і ў паэзіі). Але сучасны паэтычны андэрграўнд у шмат чым паўтарае італьянскі і расейскі футурызм і нават сімвалізм канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. Сучасная суполка рускамоўных верлібрыстаў, здаецца, у Данецку ва Украіне толькі тужыцца на адкрыцці… даўно знаёмых прыёмаў версіфікацыі. А Іосіф Бродскі, які толькі змястоўна паглыбіў і фармальна пашырыў традыцыйныя магчымасці класічнай расейскай і англамоўнай паэзіі, стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі…

Наш даволі-такі незакамплексаваны паэт Алег Мінкін упарта перакладае вялікага польскага паэта-наватара Цыпрыяна Норвіда і… што-нішто пераймае ў яго…

Што мне бачыцца ў вышэй прыгаданай кансерватыўнасці? Кансерватыўнасць спосабу мыслення чалавецтва ў апошнія стагоддзі. І гэта — добра. Гэта — наша шчасце. Гэта сведчыць пра тое, што якіх-небудзь найтрагічнейшых катаклізмаў на Зямлі даўно-даўно, ці не з часу Ноева Каўчэга, не было. Новы, непрадказальны спосаб мыслення чалавецтва, а значыць — і новая ПАЭЗІЯ змогуць (калі, дай Божа, змогуць) быць толькі пасля нейкага найвялікшага ўзрушэння на Зямлі. І не дай Бог, каб гэтае ўзрушэнне сталася найтрагічнейшым.

Дай Бог, каб свяціла Сонца і зелянела Трава на Зямлі, а заадно — свяціла і зелянела ПАЭЗІЯ.

*Л. Г.: — Дзякуй, Мікола. Здаецца, няблага пагаманілі... Кава ў мяне, вунь, зледзянела... Праўда, твайму кубку гэта не пагражае. У тваім кубку заўжды цёпла і хмельна, як і ў тваёй душы, як і ў тваіх вершах... Будзь здаровы, Мікола! Поспехаў табе!*

*1994*

***Леанід ГАЛУБОВІЧ***

## Схіліўшыся над мурашнікам

*(Да 60-годдзя Міколы КУПРЭЕВА)*



Амаль шэсцьдзясят гадоў Міколу Купрэева мала хто ведаў і асабліва ніхто ў гэтым свеце не ўспамінаў. І во, раптам схамянуліся — не стае, як высветлілася, у беларускай літаратуры аднаго чалавека, і трэба ж так стацца, што менавіта яго — Купрэева.

*Дажыўся*, што й казаць...

Аднак лічба яго ўзросту здаецца наўмысна завышанай. Купрэеву — сорак, хочацца паспрачацца мне, бо дваццаць гадоў нармальнай творчай працы ўкралі ў яго савецкія чыноўнікі і, падобныя да іх, савецкія беларускія пісьменнікі...

Выдаўшы яго зборнік вершаў, з празорлівым да ўласнага лёсу назовам — «НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ», яшчэ ў 1967 годзе яны адначасна адсунулі аўтара і ад Саюза пісьменнікаў, і ад сталіцы — туды, на палескую перыферыю — і забыліся...

А сёння вось як бы ўспомнілі і, радняволя, дадаюць яму тыя дваццаць пакутна-вандроўных гадоў адзіноты і ўнутранай эміграцыі.



«Шэсцьдзясят, — кажуць, — табе, Мікола! Віншуем з пенсіяй...»

«Дзякуй», — адказвае Мікола. Ён — беларус, а значыць, чалавек не злапомны і памяркоўны.

Ну і лады, здавалася б, чаго між людзей ні бывае — усё травой зарастае...

Аднак сённяшні час паказвае, што гэта не зусім так.

Ну не ўпісваецца *дарэшты* Купрэеў у афіцыйны літаратурны гурт, хоць ты плач...

Анягож! Нейкага нерытмічна пішучага бадзягу з Белавежскай пушчы зноў дапусцілі да казённага, хоць ужо й не надта хлебнага стала, а ён, не паспеўшы паабцерціся, — адразу ж да *лаўраў*!..

Таму, як і раней, цішком-употай адсунулі Міколу Купрэева ад чарговага дзяржаўнага «кавалка». І як адмыслова ўсё зрабілі: *галасы* яму ў Дзяржкамітэце па прэміях *аддалі*, маўляў, мы за цябе ўсёй душою, — і не наша тут віна, што ў апошнюю хвіліну вышняя рука выкрэсліла цябе са спіса... На ўсё воля Божая... Відаць, целам не выйшаў ці душок не той, потам пахнеш ці кашуля нямытая...

Ёсць дзве катэгорыі пісьменнікаў. Адныя *жывуць з таго часу*, у якім жывуць, па негалосным прынцыпе Петруся Броўкі: міне твой час, «ападзе грэбень — і на х.. ты каму патрэбен...»

Купрэеў адносіцца да літаратараў другой катэгорыі, да тых, якія *жывуць сваім часам*.

І, перш чым пачынаць гэтую блытаную і не да канца вызначаную размову пра жыццё і творчасць Міколы Купрэева, хочацца, як эпіграф да гэтай часткі, працытаваць радкі з верша не менш таленавітага, але й не менш адрознага паэта Леаніда Дранько-Майсюка:

Даволі вярэдзіць раны!
І без таго заўважаю —
глядзяць, як на эмігранта,
на мяне, калі размаўляю.

Адкуль? З якой рэзервацыі?
З якой Беларусі такой?
Эх, вечная эміграцыя
на радзіме сваёй.

Не пакідаючы межаў радзімы, Купрэеў, дзе змушана, а дзе ўсхілку свайго характару і паводзін, эмігрырue ў самога сябе. Ён пачынае жыць у межах сваёй душы і ўласнага розуму. Акаляючая прырода і *прырода* самабытнага *таленту* водзяць яго па высыхаючым меліярацыйным Палессі без малога сорак гадоў, як Майсей іудзейскі народ па Аравійскай пустэльні...

Гэты бясконцы шлях можна назваць *бязмэтным*, як *бязмэтны* ў жыцці і ў сутнасці сваёй творчасці сам Мікола Купрэеў, — як, у рэшце рэшт, *бязмэтная* і сама прырода.

...Сухастой, гніллё і карабельныя сосны, мухаморы, паганкі і баравікі, выспы, балоты і хлебадайны чарназём — усё гэта ёсць і *сродкам*, і *вынікам*, і *прычынай* ТАГО жыцця і ТОЙ творчасці.

Хто чытаў дзве, блізкія да аўтабіяграфічных, аповесці-споведзі Купрэева ў часопісе «Крыніца» («Дзіцячыя гульні пасля вайны» ды «Імгненне светлае...»), напэўна, заўважыў, што аўтарскае «я» там не вытыркаецца — *не гераізуецца* — а стаіць як бы «па-над» і «наводдаль» — *сузірае*, але не ацэньвае, не судзіць, не асуджае... Бо — КАГО? Бо — за ШТО? СЯБЕ-НАС? За тое, што *ёсць як ёсць*, што жывём?

Прырода не мяняе сваёй глыбіннай сутнасці ні падчас праліўных дажджоў, ні падчас засухі, ні падчас землятрусу — ні вясной, ні зімою...

Яна ёсць, і мы павінны змірыцца з тым, якая яна ёсць, і шукаць і знаходзіць *паразуменне* з яе праявамі ў сваёй душы.

Нярэдка — *халодны* і *галодны* — Купрэеў піша пра *холад* і *голад* гэтай самай чалавечай душы... на каленях, на камянях, на падваконнях, на бальнічных тумбачках, у вузкай і затхлай паржаўленай ваннай тубдыспансера, на векавым дубовым пні Белавежскай пушчы...



Напісаныя ім словы — вузлаватыя і сухія, як хруст леташняга галля пад нагамі, то працяглыя і ліпка-смалістыя, як рэха, што адгукаецца толькі таму, хто кліча, то вуркатліва-іранічныя, як вада ў раўчуку...

У яго словах няма ўзроставага маразму і павучання. І гэты голас заўжды новы, як сёлетняя вясна. Ён можа быць сцюдзёным альбо цёплым, але — заўжды *ўласным*.

У сваіх тэкстах, як у акварыуме, ён захоўвае сваё ўнутранае духоўнае жыццё, але не кансервуе яго, як спажытак, а падкормлівае назапашанымі крышынкамі быцця, што засталіся ў ветраных кішэнях пасля чарговай вандроўкі ў людскі свет...

Ён не песіміст і не аптыміст, больш таго, нават не рэаліст. Купрэеў *пэўны* ў НЕПАЗБЕЖНАСЦІ чалавечага лёсу, і, як загнаны воўк, упарта мкне па цаліку, не зважаючы на пераслед... таго ж лёсу...

Як той воўк — ён, гнаны непадуладным духам усяіснага часу, ехаў і едзе *беларускім шляхам* па зачараваным коле дзяржаўнай чыгункі... У яго не было й няма ні дарожных квіткоў, ні канцавых станцый... Едучы, ён не бачыць дарогі, а *жыве наўзбоч яе*, углядваючыся ў прастору, што прамінае за вокнамі помных вачэй... І едзе ён з намі ў адзін бок, але *паасобна* ад нас...

Ніхто не ведае, як яму было і ёсць аднаму. Бо — не жаліўся, не назаляў рукапісамі, не засціў свет у літфондаўскіх чэргах, не лаяў людзей, не прасіў начлегу, не набіваўся ў сяброўства, па сутнасці, не меў сям'і, хоць фактычна яны былі і ёсць...

У яго няма ні сваёй хаты, ні свайго *пэўнага месца* на зямлі. Як ніхто іншы, ён апраўдвае баптысцкі перафраз: мы не дома — мы ў гасцях... Купрэеў — *госць*. Гаспадаром ён ніколі й не быў, нават гаспадаром сваіх рукапісаў...

Ён — *аўтар*, *тэкст* і *кантэкст* свайго жыцця. У літаратурах свету такіх няшмат. У сучаснай беларускай лі-

таратуры Купрэеў, бадай, адзіны, хто *безаглядна*, *бескарыслíва* і *бясслаўна* скормлівае сваё жыццё творчасці. Далёка не кожны, нават вялікі, талент здольны прынесці сябе ў ахвяру слову. Ды й не ад нас гэта ўрэшце залежна. Тут трэба нарадзіцца як бы *неданошаным*, каб увесь час *памятаць* пра гэта і *мецъ пожад даносіцца* да сваёй чалавечай *пэўнасці* ў лоне боскай прыроды, адчуваючы сваю высокую, лёсам дадзеную, *ушчэрбнасць* як наканаванае табе НЕШТА...

Неад'емнасць новых пошукаў і адкрыццяў у такіх творцаў гарманічна нітуецца з класічнай традыцыяй. Яны шукаюць *вечнае* не на пустым месцы, але пустое месца *тым* засяваюць...

«Ты не ведаеш, часам, дзе цяпер Купрэеў? (Сыс? Асташонак?)» Падобнымі пытаннямі мяне даймаюць амаль штодня ўсе тыя, хто неабыякавы да нацыянальнай літаратуры. І чамусьці ніхто ніколі не задае мне недарэчных пытанняў тыпу: дзе цяпер Навуменка, Шамякін, Марчук, Спрынчан-старэйшы, Дашкевіч?

Не ведаю я — дзе тыя і дзе гэтыя. Я ўжо слаба арыентуюся — дзе я сам...

Праўда, што наконт Купрэева, то мне здаецца, што гэтай цёплай травеньскай парой ён зноўку стаіць недзе ў гушчары Белавежскай пушчы, звесіўшы на кульбаку сваю ссівелую і свежую ад расы галаву, над мурашнікам, і сочыць за мітуслівай мурашынай валтузнёй, за іх спрадвечным бытаваннем. Мітусяцца, томяцца мурашы, цягаючы хвойныя іголкі... І сцежкі ў іх усё тыя ж — пакручастыя, і архітэктура мурашніка ўсё тая ж — надземная і ўзвышаная... Юдзіць зазірнуць у нутро — што там ды як? Але — дазнаўшыся, разбурыш... Няхай поўзаюць, няхай жывуць — у гэтым іх сэнс і сутнасць існавання...

Як проста і як геніяльна! Туды-сюды, сюды-туды... дакладна адлічваючы імгненні вечнасці — іголка да іголкі, ад першай да...



І раптам яго позірк засяродзіцца на адным з іх, самым бяспечным і маладым, што скіне сваю ношу пры самым уваходзе ў дом-мурашнік і нечакана скіруе далёка за межы *«страны муравии»*; падпаўзе да самага наска ўношанага чаравіка Купрэева і пачне ўзбірацца на яго высокую вяршыню, забыўшыся пра ўсё, апантаны адно толькі *інстынктам* ды *прагай спазнання* самога сябе і таго, што перад ім паўстала...

— Ну, куды ты, брат?..
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
— Назад, назад кіруй у свой мурашнік...
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
— Які неслух!..

І няўзнак яны паразумеюцца і пасябруюць...

Прысвячаючы Янку Брылю верш, што адкрывае неўлаўрэачаную Дзяржаўнай прэміяй, другую і пакуль апошнюю кніжку «Правінцыйныя фантазіі», Мікола Купрэеў, хочучы таго ці не хочучы, напісаў сабе прыжыццёвую эпітафію.

Косю мой, косю,
дзе ты блукаў-лятаў?
Дзе ты якія землі
капытамі таптаў?
. . . . . . . . . . . . . . .
Косю мой, косю,
за намі ідуць —
напэўна, у Гродна
тыграм павязуць.
Як будуць вясці нас
па роднай мяжы —
каб людзі не чулі,
мой конь, не іржы.
Косю мой, косю...

«...Ведаеш, які народ тут — амаль адны бамжы ды былыя зэкі. Імі забітыя ўсе палаты. Ванную адчыняюць толькі ў «банныя» тры дні — да вечара. Не пачытаеш па-людску, не папішаш... <...> Бывае, дыхаць няма чым на зямлі нашай, нават у правінцыях — маіх колішніх «палесцінах»... <...> Ды ну Вас усіх у Менску!.. Колькі мне гэты Менск (здаецца ён — «сталіца» Беларусі?) папсаваў нерваў... І тут — хоць ты ў нару якую хавайся ці ў бярлогу... <...> Ты пішаш мне: «жыві, пішы, твары, не раскісай»... Не, Лёня, ты ўжо там сам у сваёй сталіцы і жыві, і пішы, і твары, і не раскісай... А мы, гэткая навалач, прыблуды ў гэтым свеце, можа, як-небудзь яшчэ ўпадзём, як пацяплее, у мох пад сасной ці елкай — з гэтымі яшчэ можна жыць...»

(З ліста да мяне ад 11.03.1997, тубдыспансер, в. Вярховічы.)

— Косю мой, косю...
— Які неслух...



• *Мікола Купрэеў. Канец 1990-х*



***Леанід ГАЛУБОВІЧ***

# Помнік паэту

Мінула гадавіна з дня смерці вядомага паэта Міколы Купрэева. У сталічным літаратурным асяродку гэта падзея прайшла абсалютна незаўважнай. І дзівіцца тут няма чаму. Сучасныя пісьменнікі разгубіліся ў варунках стыхійнага і неадназначнага часу. Але, дзякаваць Богу, не ўсе на ўсіх забыліся...

Пакутны самотнік Мікола Купрэеў нарэшце займеў па сабе людскую памятку — уласны помнік на магіле ў Івацэвічах, які стаў магчымым (цытую інтэрнэт-ліст) *«дзякуючы павазе паэта і пчаляра з Лінёва Міколы*



• *Алесь Навараыч і Леанід Галубовіч каля магілы Міколы Купрэева (злева-направа). 2007 год*

*Папекі і журналісткі Пружанскай раённай газеты Ганны Хадаровіч да Міколы Купрэева, мастака Юрыя Малышэўскага — да Хадаровіч ды Папекі, дырэктара Брэсцкага рытуальнага завода (дзе і быў куплены шыкоўны камень на магілу паэта) — да беларускіх пісьменнікаў увогуле. Сродкі на помнік збіраліся сярод прыхільнікаў творчасці і сяброў Міколы Купрэева. Народны майстар Юрый Малышэўскі ахвяраваў свой час на выгатаўленне помніка і барыльефа на камяні.*

*Сябрамі паэта з Пружан ды Івацэвіч у суботу 17 верасня помнік і быў усталяваны на магіле. Памянулі вядомага паэта чаркай, чытаннем яго вершаў і добрым словам...»*

Памятаем, Мікола, тваe шчымліва-развітальныя словы: *«Б'юць з нябёсаў званы беларускіх цэркваў — толькі яны й жывыя, і ў іх апантаным звоне я, чырвонай халоднай вадою напоўнены, чую крык маёй колішняй роднай мовы, чую ціхае ў звоне высокім маленне нашай вечнай Жанчыны Полацкай.*

*Дайце дарогу, браты-чарвякі, прапусціце, стаміўся — паўзу я спачыць у нетры пад роднае Ямнае».*

Не *дапоўз* да бацькаўшчыны, на жаль... Лёг пад маладым дубам у Івацэвічах. Спадзяёмся, што і тут будзе табе пухам зямля, Мікола. Ты не забыты...



***Віктар ГАРДЗЕЙ***

## Вершы, напісаныя ў белых бярэзніках

*(Да 70-годдзя з дня нараджэння Міколы Купрэева)*

Усе мы ведалі, што Мікола Купрэеў, як толькі пакінуў неспакойную пасаду завуча ў Чудзінскай сярэдняй школе, самахоць, незаўважна нават для сябе пачаў аддаваць перавагу вандроўніцкаму ладу жыцця, таму ў рэдакцыі «Савецкага Палесся» ніхто не здзіўляўся, калі ў праёме пахілых весніц пад навіссю жоўтых акацый паэт узнікаў з кадоўбчыкам чырвоных лясных суніц або ёмкай ношкай крамяных маладых баравікоў, знізаных на вербалозавы дубчык.

Яшчэ з пасляваеннага часу ганцавіцкая раённая газета і друкарня месціліся ў пакоях вялікага ксяндзовага дома ў атачэнні пладаносных, але ўжо старых, адзічэлых садовых дрэў. На цесным дворыку акурат насупраць рэдактарскіх вокнаў, з якіх раз-пораз выглядваў заклапочаны Васіль Праскураў, расла прыземістая яблыня-антонаўка, а пад ёю, бадай, у кожны свой візіт ратаваўся ад спёкі ці проста спаў непрабудным сном наш здарожаны госць. Абцяжаранае яблыкамі голле і высокая, да пояса, трава засланялі яго ад староніх вачэй, не дужа дакучалі сляпні і мухі, бо ў самую заядзь таленавіты пасланец Апалона вочы і лысіну прыкрываў сваім жа паэтычным зборнікам «Непазбежнасць», які пабачыў свет менавіта ў тое цёплае, грыбное і такое ўжо далёкае лета 1967 года. Аднак трывожыцца за лёс і жыццё Міколы ўсё ж трэба было: з недалёкага і яшчэ неасушанага балотца на рэдакцыйны панадворак часта запаўзалі вужы і гадзюкі, натуральна, што мы, раённыя журналісты, час ад часу зазіралі пад раскідзістую яблыню, хоць нярэдка

заставалі там апусцелае паэтава логвішча. Жывы і здаровы, ды, на шчасце, непакусаны балотнымі гадамі, аўтар першай і на доўгія дзесяцігоддзі адзінай кнігі вершаў меў звычку прападаць у туманных далечах гэтак жа нечакана, як і з'яўляўся.

Палескімі разлогамі і лясными гасцінцамі ён вандраваў звычайна пяшком, бо грошай на цывілізаваны транспарт не хапала, праўда, па дарозе ў багатых тутэйшых лясах паэт збіраў не толькі вершы, але і грыбы, як прызнаваўся сам, здаючы іх авоськамі ў сустрэчныя грыбаварныя пункты, за што меў сякі-такі рубель на абыходак. Не магу сказаць, дзе і якім пансіёнам бавіў сцюдзёныя зімовыя месяцы самабытны творца, ды ўжо ж кожнаму вушастаму зайцу вядома, што ганцавіцкае Палессе, ад Чудзіна і Вострава, ад Малькавіч і Хатыніч, Мікола Купрэеў любіў апантана, з нейкай малавытлумачальнай пяшчотай і сыноўняй замілаванасцю, чаму ў ягонай лірычнай паэзіі ёсць безліч вартых прыкладаў. Па дарозе са Святавольскага дрымучага лесу касавокага сябра ён частаваў «заечай капустай, прынесенай з Прыпецкага заказніка», лісе даваў «пеўня, украдзенага ў цешчы», штосьці там, мясное, з вандроўніцкай торбы перападала і шэраму ваўку за адну ўсяго просьбу: «Толькі вось гэту маю балоцінку зберажыце…»

Ведаючы паэтаву схільнасць да асацыятыўных вобразаў, я шчыра пасмяяўся, калі аднойчы, ужо добра па часе пасля незабыўнага грыбнога лета, з невядомай далечы ў чарговы раз прыблытаўшыся на Ганцаўшчыну, Мікола падзяліўся са мной дасціпнай, хоць і не зусім жыццёвай ідэяй, ці, як сёння сказалі б, выгадным камерцыйным праектам. Памятаецца, у хвіліну найвышэйшай асалоды, будучы ўпэўненым, што варта прыдумаць дзівосную мару-летуценне, як усё ліхое пойдзе на гнілыя брады і балоты, прасветлены геніяльнай думкай, паэт шчыра радаваўся, што, дзякуючы толькі яму, усе мы, ганцавіцкія творцы, заўтра будзем мець адпаведныя свайму прызванню хай не дужа прыбытковыя, але паважаныя ў народзе чыны і пасады.



Соль гэтай Міколавай прыдумкі, з пазіцый рынкавых адносін не такой ужо і абсурднай, была ў тым, што тады, на пачатку сямідзясятых, у рэдакцыі нашай «раёнкі» і вакол яе, дакладней, пад крылом руплівага збіральніка талентаў Васіля Праскурава, згуртаваўся цэлы легіён маладых і пачынаючых літаратараў, якіх з лішкам хапіла б, каб укамплектаваць кадрамі сярэдняе па велічыні дзяржаўнае лясніцтва. Адно з іх, здаецца, ці не Чудзінскае, самае глухое і аддаленае, Купрэеў «узяў» у бестэрміновую арэнду, і, калі ўсе службовыя партфелі былі раздадзены хлопцам з улікам хоць якіх-небудзь іхніх заслуг перад лясной гаспадаркай, седзячы ў маім рэдакцыйным пакоі, абодва мы дружна разрагаталіся ў азарце цікавай і займальнай слоўнай гульні. Сваё ілюзорнае лясніцтва ўжо не юны летуценнік бачыў такім: сабраныя ў гурт пад цяністымі шатамі і вольныя ад іншых абавязкаў, ганцавіцкія творцы плённа рыпяць пёрамі і штодня выдаюць «на-гара» класныя рэчы — вершы, нарысы, апавяданні, а жывуць на ганарары і сякі-такі падзаробак у самім лясніцтве. Зразумела, гэта была мара стомленага ў няспынных паходах чалавека, не дужа шанцоўнага як у асноўнай настаўніцкай прафесіі, так і ў сямейным жыцці, мара, якая не магла здзейсніцца нават па той прычыне, што вялікага скутку ў калектыўнай творчасці, як правіла, не бывае.

Не менш, чым хто, Мікола Сямёнавіч і сам адчуваў усю марнасць і бессэнсоўнасць сваёй прыдумкі з зялёнымі лесніковымі картузамі на паэтычных галовах, з чаго было бачна, што вандроўнае жыццё стала для яго як горкая рэдзька, аднак ён не зламаўся, не ўпаў духам — трэба, урэшце, мірыцца з тым, што ёсць, і, больш не кранаючы балючую для сябе тэму, усё яшчэ высокі ростам, з голай лысінай і нязменным гальштукам на чыстай кашулі, паэт развітаўся са мной і зноў надоўга пакінуў ганцавіцкую рэдакцыю, дзе заўсёды меў надзейную, і не толькі маральную, падтрымку. Гледзячы праз акно на старыя акацыі, паміж якімі ў прасветлінах мільганулася знаёмая постаць,

я лёгка мог уявіць, як Мікола Купрэеў, ужо тады прыкметна накульгваючы на адну нагу, няспешна цялепкае ляснымі гасцінцамі і прасекамі ад вёскі да вёскі, ад сябра да сябра — радасна запыніцца на грыбной нерушы, няхітра падсілкуецца з абшарпанага кейса, а сустрэўшы ў баравінах белакорую прыгажуню, прашэпча ёй свае журботныя і такія прачулыя радкі:

Мілая бярозка, не бядуй:
мы яшчэ з табою ўстрапянемся.
Толькі заўтра на зары
Ў сукенку найбялейшую адзенься.

Белую кашулю я і сам
на сябе надзену, прычашуся.
І пойдзем мы з табою каля рэк
нашай добрай роднай Беларусі.

Мілая бярозка, не бядуй:
мы з табой яшчэ пачуем,
як прыходзіць вечар на палі,
і ў траве ля Начы заначуем.

А раніцой ты веццем узмахнеш
светла і зялёна, як ніколі.
І будзем мы абняўшыся стаяць,
слухаць, як расце пад намі поле.

У вось такіх шчырых лірычных вершах, у строгіх, як вокрык, баладах, ды найчасцей у меланхалічных, прасякнутых смуткам элегіях паэт хацеў спалучыць чужы Лад з уласным няўтульным Хаосам, але ягоны двайнік, у сваіх учынках не дагадзіўшы аднаму, спадабаўся другому: «Цягнуць мяне з маім чорным лёсам д'ябал — у пекла, анёлак — у рай». Паэзія неардынарнага позірку, тэматычна разнастайная і нечаканая яшчэ і сягоння, калі і сам творца заснуў вечным сном у «глыбокім пад крыжамі ляс-



ку», выклікае непадробную цікавасць і зацяжныя спрэчкі. Цяпер ужо ніхто не пярэчыць, што Мікола Купрэеў быў яркім прадстаўніком і носьбітам так званага новага стылю, які зарадзіўся на пачатку шасцідзясятых гадоў, у час славутай хрушчоўскай «адлігі», што шчасліва супала з ранім юнацтвам паэта. Творы яго знешне нязграбныя, часцей з «непрычасанай», дысанансвай рыфмай, з перавагай верлібру і белага верша. Галоўнае ў іх — думка, якая ў напластаваннях самых неспадзяваных мастацкіх вобразаў пульсуе, бы кроў у перапляценні крываносных сасудаў. Калісьці, рэцэнзуючы ў газеце «Чырвоная змена» зборнік «Непазбежнасць», чуйны да навізны Сцяпан Гаўрусёў пісаў, што Купрэеў высмыквае з хаосу і прадзе думку, як добрая пралля з распушанай кудзелі выцягвае суравую нітку, адным толькі няўлоўным дотыкам пальцаў шалёна раскручваючы верацяно.

У пошуках свайго адметнага, самабытнага стылю, які пазней назвалі «купрэеўскім», пісьменнік, пачаўшы з апавяданняў, надоўга трапіў у магутныя паэтычныя абдымкі Музы, затым, выдаўшы яшчэ адну кнігу паэзіі «Правінцыйныя фантазіі», на апошнім жыццёвым перагоне зноў вярнуўся да лірычнай прозы. Шмат гадоў таму назад у ёмістай літаратуразнаўчай працы «Берасцейскае вогнішча» знакаміты крытык і вучоны Уладзімір Калеснік, увогуле высока ацэньваючы лірыку таленавітага палескага вандроўніка, даў надзвычай ёмкую і трапную характарыстыку ягонай творчай манеры, пры гэтым акцэнтаваў увагу менавіта на спецыфічных асаблівасцях стылю.

«На празаічны, як шэрае грубае палатно, фон рука паэта, адукаванага філолага (М. Купрэеў закончыў філфак Брэсцкага педінстытута), знарок нязграбна і абыякава або паспешліва шпурляе яскравыя мазкі метафар ці асацыятыўных параўнанняў, — зазначае Уладзімір Андрэевіч. — Так азартны прадавец рассыпае брыльянты на чорным моршчаным бархаце, каб здзівіць і ашаламіць пакупніц. Спантаннасць выяўлення абвостраных пачуццяў чалавека,

які чамусьці перанатужыў сваю эмацыянальнасць, і яна ўжо не вяртаецца да колішніх нармальных дыяпазонаў,— характэрны каларыт лірыкі Купрэева. Ён сутыкае на сцежках быцця паэзію і прозу, красу і брыдоту, цнатлівасць і бруд. Прытым гэтыя сутыкненні часам такія рызыкоўныя, што ў душы з’яўляюцца дысаніруючыя рэакцыі, якія пагашаюць адна другую, пакідаючы адчуванне збянтэжанасці і патрэбу ў ахоўных рэакцыях: густ хоча пратэставаць супраць бесцырымонных выпрабаванняў».

Першым з прафесійных крытыкаў Уладзімір Калеснік па-сапраўднаму затрывожыўся, што пасля зборніка «Непазбежнасць» у Міколы Купрэева пачалася зацяжная творчая дэпрэсія, пагражаючы знікненню паэта з літаратурнага гарызонта. У сямідзясятыя гады ён пісаў мала ці наогул нічога не пісаў, нават свае рэчы ў друк аддаваў неахвотна. Прычын творчага крызісу было шмат, і не ўсе яны ляжаць на паверхні, але сярод іх ёсць дзве відавочныя: неўладкаванасць уласнага побыту і расчараванне ў паэтычнай працы, боязь зноў апынуцца пад перакрыжаваным абстрэлам крытычных, яшчэ пятроўскага ўзору, фузій і мушкетаў — яны гулка ляскаюць, а карысці ніякай. Справа ў тым, што на зборнік «Непазбежнасць», канечне ж, не бездакорны ў мастацкіх адносінах, адразу пасля выхаду ў свет абрынуўся цэлы вадаспад артыкулаў, рэцэнзій, чытацкіх водгукаў, часта зычлівых і аб’ектыўных, а часам і не вельмі. Назаву толькі тыя, якія траплялiся мне на вочы: «Неизведанными тропами» — А. Майсейчык, газета «Заря», «Хацеў сказаць...» — Хв. Жычка, часопіс «Беларусь», «Сваё праз чужое» — В. Тарас, часопіс «Маладосць», «На хадулях «арыгінальнасці”» — У. Варно, «ЛіМ». Згадзіцеся, вось гэтыя бесцырымонныя «хадулі» раўназначны здрадніцкаму выспятку з-за вугла, і, хоць вялікім славалюбцам Купрэеў не быў, заўвагі і папрокі ў свой адрас успрыняў балюча, а ў ранімай і ўражлівай душы буйна прараслі зярняты недаверу да ўласнай творчасці. Відавочна: ён марыў пра большае — займеў жа тое, што



змог адужаць, дзякуючы свайму вытанчанаму ды неарганізаванаму густу.

З другога боку, смелыя эксперыменты паэта з верлібрам і белым вершам, напаўненнем іх зместам, малазасваяльным пры першым прачытанні, у многіх якраз і выклікала, па словах Ул. Калесніка, ахоўныя, дысаніруючыя рэакцыі. Памятаю, як у 1968 годзе на Свіцязі, дзе праходзіў Другі рэспубліканскі семінар творчай моладзі, вакол яшчэ «свежай» па часе выхаду кнігі «Непазбежнасць» разгараліся цэлыя слоўныя баталіі. Нават сівыя і ўжо знаныя паэты горача абмяркоўвалі нязвыклыя асацыяцыі тыпу «Гарады спыняюцца каля астравоў...», «Бугам пілоткі плывуць...», ды ўжо ніяк не маглі ўспрыняць як быццам нелагічны ўчынак лірычнага героя, які караскаецца на высокую сасну, «каб убачыць крыло адлятаючага жураўля». Лёгка ўявіўшы верхалаза на макушы дрэва, можна было жахнуцца: хаця б дзівак з такой высачыні не бразнуўся вобзем! Аднак у мастацтве без рызыкі не бывае. На шчасце, і тут абышлося без ахвяр: на «хадулі арыгінальнасці» паэт не стаў, а ў прамым сэнсе падбіўся ў бясконцых падарожжах, з-за хваробы суставаў пачаў моцна кульгаць на абедзве нагі, і пад канец жыцця яму давялося карыстацца інвалідскімі мыліцамі.

Ёсць яшчэ адна прыкрая несправядлівасць, якая, на мой погляд, усё ж закранала самалюбства неардынарнага творцы: пералічваючы яркіх прадстаўнікоў пакалення, чыё дзяцінства прыпала на суровае ваеннае ліхалецце, Міколу Купрэева, як правіла, і раней, і цяпер абмінаюць увагай, хоць у «абойме» відавочцаў і пакутнікаў вялікай народнай трагедыі ён мае сваё, лёсам вызначанае, месца. Рэха вайны невыказным болем і смуткам чуецца ў многіх яго ранніх і пазнейшых вершах: «Я хацеў вам сказаць...», «Камень», «Лясныя сполахі», «Дзявятае мая», у баладзе «А ў полі вярба» і, асабліва, у паэме «З сястрой і Уладзімірам Караткевічам па Рагачоўшчыне», дзе паэт, не здраджваючы ўласнай творчай манеры, у разумных пра-

порцыях спалучае паэзію і прозу. Твор гэты не проста на тэму вайны — гэта яе незагойная, крывавая памяць. Вось толькі адзін эпізод. Ці то ў жудасным сне, ці то праз набрыдзь галюцынацый аўтар убачыў сваю маладую маму — «у сасновай труне, у кужалёвай сукенцы белай...». За сувязі з партызанамі маму «немец параніў, цэліўся забіць, а паліцай Руды Яўдося закапаў яе, жывую, у балоце ля Варшаўскага шляху». Шасцігадовы Міколка, схаваўшыся ў кустах, зблізку бачыў зверства фашыстаў. Не кожны ганават можа ўявіць, пад цяжарам якіх жудасных успамінаў з маленства ён блукаў ухабістымі дарогамі ў сваіх прыдуманых і рэальных зялёных лясніцтвах. Ведаючы жыццёвую трагедыю паэта, язык не павернецца назваць яго звычайным валацугам, бо і вершы Купрэева пра маці хутчэй нагадваюць народныя плачы і галашэнні:

Пакліч жа мяне,
мая мама!
Я прыйду!
Я прыйшоў,
а цябе няма.
Палажы мне,
мама,
на галаву свае рукі.
Я шукаў твае рукі.
а іх — няма.
Скажы хоць здаля мне:
«Сын».
Я буду стаяць і чакаць...
Я стаяў і чакаў,
а голасу — больш няма.
Ой, не кліч мяне,
Мама,
не кліч!
Нічога няма!
Знаю, што ты — была.
І была — вайна.



Я, вядома, не бачыў, як паэт «першы раз тут, над крыжам, заплакаў», і наогул не ведаю, ці ўмеў ён плакаць, хоць нашы жыццёвыя шляхі-дарогі, асабліва ў маладосці, вельмі часта перакрыжоўваліся, затое добра помню той далёкі зімовы дзень, калі ўпершыню сустрэўся з Міколам Купрэевым — зусім маладым тады чалавекам, інтэлігентным, шчыгульна апранутым, з надзіва высокім ілбом, што сведчыла аб выключных разумовых здольнасцях яго ўладальніка. Было гэта ў рэдакцыі ляхавіцкай раённай газеты, куды мяне аднойчы нясмелым школьнікам нейкае ліха занесла са сшыткам сваіх вершаў. Здаецца, я прыязджаў у ваенкамат на прызыўную медыцынскую камісію і па дарозе завітаў у рэдакцыю, дзе ніколі не быў. Рэдактар газеты Вікенцій Шталь не паспеў і словам абмовіцца, як без стуку зайшоў чалавек з абліччам, ужо знаёмым мне па газетных фотаздымках. Выбраўшы нешта для друку, мяне хуценька выправадзілі з кабінета, і прычынай таму, думаю, стаўся пузаты, яшчэ не абшарпаны саквояж у Міколавай руцэ. Было, аднак, і лета 1965 года, калі я, ужо штатны літсупрацоўнік «раёнкі», пешшу ішоў з вёскі Востраў, радзімы яшчэ аднаго слаўнага беларускага паэта Міхася Рудкоўскага. Стаяў цёплы сонечны дзень, навокал зелянелі палеткі, і раптам на скрыжаванні палявога прасёлка і сіняўскай шашы да мяне даляцела: «Віця!». Павярнуўся, гляджу: у танкаствольным бярэзніку, на траве-мураве разлёгся Мікола Купрэеў і моўчкі, ціхамірна любуецца беласнежнымі воблакамі. Цяпер мы «знаёміліся» доўга, пра штосьці балакалі, чыталі вершы і разышліся добрымі сябрамі. Не ведаю, адкуль паэт прыблытаўся сюды, у боскую лясную адзіноту, усё ж ці не ўцякаў з краіны Цыганіі, дзе ён захацеў стаць баронам, прычым баронам, разумнейшым за сваіх папярэднікаў, бо адразу аблюбаваў сабе і «цыганачку Азу, чарнавокую заразу» (верш «Як быў я цыганскім баронам»).

І стаў пісаць я кнігі і артыкулы,
каб на маё імя ўсе пальцам тыкалі.
А зладзюгі гэтыя чытаць іх не ўмелі
або чытаць іх не хацелі.

Тады я стаў вучыць іх:
— Не туды ступіў — ступі сюды!
Не так устаеш — вось так уставай!
Не так пяеш — вось так спявай!

Душы маёй яны не зразумелі,
угаворваў іх я так і гэтак,
што, моў, і сыты будуць і адзеты
і што анёламі зраблю іх дзетак...

І на ўсю Цыганію аднойчы тройчы свіснулі —
усе баці як нахлынулі
і — мяне з баронства скінулі.

І калі з Цыганіі ўцякаў я,
аднекуль з неба рагатала Аза,
чарнамазая зараза.

Той белы бярэзнічак даўно стаў цудоўным гаем, але я і сёння грэшна думаю: нездарма там, на развілцы дарог, ляжаў спякотным летам закончаны пустэльнік Мікола Купрэеў. Дзесьці паблізу, за Крышылавіцкім ляском, струменілася рэчка Нача, так часта і хораша апетая ў вершах паэта, дзесьці паблізу, мусіць, сапраўды жыла ягоная Муза-дзяўчынка і дзесьці тут, паміж Востравам і Гутай, Лактышамі і Малым Сялом, на самой справе, мабыць, існавала легендарная краіна Цыганія, бо гэта адтуль — задзірыста-вясёлае, разухабіста-гарэзлівае:

І — эх, цыганачка Аза,
Чарнавокая зараза!



Не буду паўтарацца, што асабістае жыццё ў Міколы Купрэева склалася няўдала, і ён, па словах Ул. Калесніка, стаў вандроўным палескім бардам, хоць ніколі не брынькаў на гітары і не спяваў пустых серэнадаў сваёй падманлівай «чарнавокай» Музе, якая час ад часу жорстка і здзекліва параготвала з неба. Ён і не крыўдаваў, бо ў яго была адзіная радасць і суцеха — стаптаныя чаравікі нястомнага падарожніка, лёгкая авоська з сякім-такім падмацункам, шматкамі пісчай паперы і абавязковай кнігай. Не было хаты, не было сталага прыстанку, але паўсюдна на Палессі яго сустракалі гасцінныя, цёплыя бярэзнікі. «Мне сёння хораша: у ноч прыйшоў я чысты і багаты, кладу пад галаў белы корч, і лес вакол — мае пенаты». Калісьці В. Хлебнікаў на станцыях паліў свае вершы і грэў над кволым цяпельцам пакрэплыя рукі. Вершы і прозу ў Міколы Купрэева на станцыях кралі. Укралі і першы варыянт яго выдатнай аповесці «Дзіцячыя гульні пасля вайны», якую яшчэ ў Ганцавічах я чытаў, напісаную алоўкам у вялікім канцылярскім сшытку. На вакзале ў Івацэвічах вецер доўга кружыў у паветры ашмоцце белай паперы. Парвалі, бо ў бядовых людзей нічога лепшага не ўкрадзеш.

На першы погляд, прычынай бязглуздай неўладкаванасці побыту Міколы Купрэева была ягоная безабароннасць і бездапаможнасць. Крыўдзіцца мог, але ненадоўга. У час мала не штодзённых палескіх бадзянняў паэт праседжваў у сельскіх бібліятэках, што траплялiся па дарозе, і потым на станцыях разгадваў красворды. Некалькі красвордаў за ноч, і ніводнай пустой клетачкі. Эрудыт! Прычым эрудыт бедны, без грошыка ў кішэні, часам нават без уласнай кніжкі «Непазбежнасць», у якой быў змешчаны партрэт зусім яшчэ маладога аўтара і якая не адзін раз выратоўвала «барда без гітары» ад надта прычэпістых міліцыянераў. Мусіць, якраз з гэтай нагоды, седзячы ў рэдактарскім кабінеце Васіля Праскурава, аднойчы паэт дазволіў сабе паіранізаваць з уласнай непрыстасаванасці да жыцця:

Мелі добрых мецэнатаў
І Пятрарка, і Рублёў.
Ні кала ў мяне, ні хаты —
Мне б авансам пяць рублёў!

Паэтычныя вандроўкі Міколы Купрэева, як я ўжо казаў, пачаліся на слыннай Ганцаўшчыне, дзе ў Чудзіне, далекаватай ад райцэнтра вёсцы, падчас педагагічнай працы ён прыкмеціў сярод дзятвы будучага паэта Алеся Каско. Забягаючы наперад, хачу дадаць: а ў вёсцы Сташаны Пінскага раёна, дзе таксама настаўнічаў, адразу двух — Міколу Антаноўскага і Анатоля Шушко. Асабіста мне запомніўся 1963 год, калі ў Ганцавічах яшчэ самі маладыя пісьменнікі В. Праскураў, М. Рудкоўскі, М. Купрэеў праводзілі пасяджэнне мясцовага літаб'яднання. Дзіўна, але ўжо тады, на пачатку шасцідзясятых, тут заяўляла аб сабе шмат пачынаючых аўтараў, а ў ляхавіцкай зоне аднаго на той час раёна іх практычна не было. Усе на пасяджэнні чыталі свае вершы: чытаў я, чытаў Віктар Лунёў, чытаў Косця Мохар, а Мікола дык здзівіў прысутных. Спачатку ён прачытаў верш пра кветкі, якія кідае ў вокны міністру сельскай гаспадаркі, каб той выйшаў з кабінета і паглядзеў, дзе гэтыя кветкі растуць, а затым позірк паэта сягнуў далёка за межы Беларусі:

Гарыць над Іспаніяй
Сэрца Лоркі —
Над горам радзімы, над сваёй жа крывёй.
Расстраляныя, прабітыя кулямі зоркі —
Сэрцы паэтаў гараць над зямлёй.

Гэты верш пазней быў надрукаваны ў кнізе «Непазбежнасць», а вось верш пра кветкі, што ляцелі ў вокны міністра сельскай гаспадаркі, я не знайшоў і ў другім зборніку Купрэева «Правінцыйныя фантазіі»: мусіць, яго забыў і сам паэт. Зрэшты, як і не забыць пра такую «дробязь», калі, стаўшы на лыжы, Мікола мог віхурна прамчацца па палях, па гарах, па далінах, міма заснежаных гарадоў:

«Дзень добры, свента Варшава!»
«Гутэн абэнд, Берлін!»
«Лондан, алрайт!»
«Банжур, масье Парыж!»

Нічога сабе правінцыйныя фантазіі! А гэта ўсяго толькі адзін верш, у якім, гледзячы на рэпрадукцыі Ракуэла Кента, паэт здзяйсняе вялікую вандроўку па планеце Зямля і ў міжзорных прасторах.

Парыж ёсць Парыж, і яму Мікола Купрэеў сказаў у засмучэнні: «Адзью, Парыж!» Дакладней, сказаў сваёй «чарнавокай» Музе: «У Парыж з табою не паедзем паглядзець Еўропы з Эйфелевай вежы».

Лондан ёсць Лондан, і Мікола Купрэеў сказаў расчаравана: «На туманны Альбіён, мілэдзі, таксама нас не пусцяць, грэшных».

Вось Варшава свента — пані не скупая! «Дык хоць з мура Белай Вежы скокнем праз кардон у Паспаліту... — паднімем над Віслаю кілішкі за нашага агульнага Адама, за прыгожую Марыну Мнішак...»

Тут я ўжо цытую верш Міколы Купрэева «Кароткае падарожжа» і зноў бачу: не, гэта зусім не правінцыйныя фантазіі.

А што Берлін? «Аўвідэрзайн, Берлін!» А што Масква? Ні «здравствуй», ні «прощай»? Крыху не так. Масква сама адшукала таленавітага беларускага паэта.

Аднаго разу, у стагоддзяў на размежжы, праездам у «белакаменную» паэт і перакладчык Валеры Грышкавец паведаміў мне, што вершы Міколы Купрэева ідуць у Маскве на «ўра». Вялікую падборку надрукавала «Литературная газета» і заказала новую. Надрукаваў «День», і давай, Валеры, перакладай яшчэ. Прасілі вершаў самабытнага паэта часопісы «Дружба народов», «Наш современник», іншыя выданні, а «заваяванне» Масквы Купрэевым цал-

кам залежала ад таго, як ягоную паэзію паспяваў пераўвасабляць на рускую мову В. Грышкавец — па сённяшнім часе, бадай, адзіны творца, які сваім яркім перакладчыцкім талентам служыць інтарэсам дзвюх братніх літаратур. Нягледзячы на тое, што толькі ў слыннай Маскве жыве і працуе некалькі соцень сваіх выдатных паэтаў і, шчыра кажучы, ім самім няма дзе друкавацца, яны без бурчання пацясніліся, далі новаму «маскоўскаму заваёўніку» годнае месца каля сябе. Дарма адзін мінскі зайздроснік з’едліва пасміхаўся: правінцыйнаму паэту не бачыць Масквы як уласных вушэй. Убачыў! На тое ён і ёсць відушчы Мікола Купрэеў.

Будучы прызнаным носьбітам нетрадыцыйнага ці, як сказалі б сёння, «эксклюзіўнага» стылю, паэт ведаў пра сваё дзівоснае ўзнясенне ў дужа пераборлівых літаратурных колах Расіі, хоць ніякай ганарарнай узмогі, ні малой, ні вялікай, адтуль не меў. Па часе ў родны Пінск, да хворай маці, вярнуўся і Валеры Грышкавец, але плённую перакладчыцкую працу не кінуў, вершы беларускіх аўтараў у яго перакладах па-ранейшаму друкуюцца ў Маскве. Даўнавата сярод іх няма толькі твораў Міколы Купрэева. У асяроддзі пісьменнікаў, чытачоў і паклоннікаў забываюцца пакрысе і розныя хлуслівыя выдумкі, звязаныя з гэтым вядомым прозвішчам. Багата чаго крыўднага, пачутага пра сябе, з хваравітай усмешкай апавядаў мне сам творца, бо ўсе яго паэтычныя вандроўкі, адкуль бы ні ішоў — з Ляхавіч ці Пінска, з Івацэвіч ці яшчэ адкуль, нязменна заканчваліся на блаславёнай Ганцаўшчыне, дзе ён меў і прытулак, і сяброўскую ўвагу. Потым былі доўгія гады расстання па той прычыне, што я выехаў на жыхарства ў Мінск, а наша апошняя сустрэча з Міколам іменна на ганцавіцкай зямлі адбылася ў надта сумны і горкі майскі дзень — на пахаванні старэйшага сябра і дарадчыка Васіля Праскурава.

Не буду вярэдзіць душу трывожным успамінам, але ўжо на другі дзень самым раннім «дызель-поездам» Купрэеў



вёз мяне ў госці да сябе — у аддаленую вёску Малькавічы, дзе ён тады выкладаў у мясцовай школе беларускую мову і літаратуру. Над рэчкай Цной якраз узыходзіла сонца — агністае, набрынялае яркай, сляпучай чырванню, такога чырвонага сонца я ніколі не бачыў, ні раней, ні пазней. Самі ж Малькавічы ўвачавідкі прадэманстравалі сваю адвечную паляшуцкую шчодрасць і гасціннасць. У прасторнай, але пустой сялянскай хаце, дзе кватараваў настаўнік, усюды па кутах на табурэтках і шкапчыках ляжалі апетытныя, з мясною праслойкай плахі сала. «Людзі думаюць, што жыву адзін, дык і галадаю. Вось і нанасілі «свіных плячэй», — перахапіўшы мой здзіўлены позірк, патлумачыў Мікола Сямёнавіч. — Але грошы цяпер у мяне ёсць. Сёння таксама паеду ў Ганцавічы, атрымаю зарплату за летнія вакацыі». Сапраўды, заканчваўся навучальны год, для выпускнікоў мелася быць апошняя школьная лінейка, а хітры беларускамоўны педагог завёў мяне ў школу ў якасці прамоўцы і чытальніка вершаў. Літаральна за два дні перад трагічнай падзеяй, 20 мая, паэту споўнілася роўна 50 гадоў, аднак пра свой круглы юбілей ён сціпла маўчаў, ды і аб чым можна было размаўляць пасля такой нечаканай і цяжкай страты ў ганцавіцкай дружнай літаратурнай сябрыне?

На гаспадарку да Купрэева трохі раней за мяне прыязджалі Алесь Каско, Мікола Пракаповіч, Зінаіда Дудзюк, магчыма, яшчэ якія берасцейскія пісьменнікі. Наведаць Малькавічы збіралася і Яўгенія Янішчыц — адсюль ужо зусім блізка яе родная Ясельда, але не паспела. Нават у сталым узросце лёгкі да перамены месц, Мікола неўзабаве развітаўся з Малькавічамі і апынуўся на Пружаншчыне — настаўнічаў у вёсцы Папялёва, што на самай мяжы з Белавежай, потым як пенсіянер па хваробе асеў на жыхарства ў саміх Пружанах, цяпер ужо назаўсёды. Вось гэты «пружанскі» перыяд у жыцці і творчасці старэйшага сябра я ведаю слабей, бо апошнім часам бачыліся мы рэдка, гады ў рады. Праўда, на кватэры ў Купрэева, стан-

дартнай дзяржаўнай аднапакаёўцы, будучы ў Пружанах у гасцях, я ўсё ж пабываў, а дзверы запасным ключом адчыніў рэдактар «раёнкі» Мікола Антаноўскі, як бы давераная асоба і клапатлівы апякун колішняга свайго настаўніка. Гаспадара дома, на жаль, мы не засталі, і я ў засмучэнні пакінуў яму на стале гасцінец: некалькі дэфіцытных тады цыгарэт і запіску: «Дзе валочышся, Адысей?» Вярнуўшыся, паэт быў узрадаваны, таму што гэтую цыдулку і цыгарэты з цёплынёй прыгадвае ў рэцэнзіі на маю кнігу «Межань» у мясцовай жа газеце «Раённыя будні».

Пружанскі перыяд у творчасці Купрэева адметны даволі плённай працай, ва ўсякім выпадку час бяздумна не марнаваўся. Калі паэтычнае натхненне звычайна прыходзіла ў падарожжах і вандроўках, а лепшыя вершы ўсё ж былі напісаны ў зялёных лясных кварталах і белых бярэзніках, то, займеўшы жыллё і пастаянную прапіску, ён з маладым імпэтам улёг у прозу, хоць часцей працаваў не дома, а ў санаторыях і розных лякарнях. З-пад пяра пісьменніка, які знайшоў у сабе сілы прадоўжыць цярністы шлях празаіка, пачаты яшчэ ў юнацтве, адна за адной выйшлі аповесці «Дзіцячыя гульні пасля вайны», «Імгненне светлае», «Па вуліцы Карла Маркса з Паэтам», «Палеская элегія», «Рэчкаю плывём, плывём...», «Пастух у космасе», «Лісты з млына». Не з рукі аналізаваць іх ды пахвальваць аўтара, таму што пра ажыятажную лірычную прозу Міколы Купрэева многа і цёпла пісалі прафесійныя крытыкі. Напрыклад, два зусім не падобныя ні стылем, ні манерай аналізу даследчыкі літаратуры Уладзімір Саламаха і Сяргей Грышкевіч, рэцэнзуючы таксама розныя па тэме і жыццёвых калізіях творы пісьменніка, першы — аповесць «Па вуліцы Карла Маркса з Паэтам», другі — аповесць «Лісты з млына», прыходзяць практычна да агульнага вываду: лірычная проза Купрэева шчырая і праўдзівая, гуманістычная і чалавечная ў сваёй аснове.

Уладзімір Саламаха**:** «І тут я зноў думаю пра тое, пра што ўжо неаднойчы пісаў у некаторых сваіх артыкулах:



як жа мы, людзі, прывыклі ўсе нашы горшыя, па-чалавечы невытлумачальныя ўчынкі апраўдваць фактарам часу, рэжымам, грамадскім ладам. Пры гэтым забываем, што толькі сапраўдныя людзі застаюцца людзьмі ў любых сітуацыях. Думаю, твор выклікае на такі роздум...» (З артыкула «Пра што раскажа вучням», кніга крытыкі «Сусвет дабрыні»).

Сяргей Грышкевіч**:** «У беларускай прозе апошніх гадоў рэдка калі сустрэнеш падобную шчырасць, без штучнага схематызму ў дыялогах, ненатуральных паводзін, серыяльнай тэатральнасці, навамодных сэксуальных выкрунтасаў... Аказваецца, пра каханне можна пісаць так, каб быць сучасным ва ўсе часы. Каб табе верылі, як уласнаперажытаму. Хоць і не прапушчанаму цераз млын запознена спасцігнутай ісціны, ужо непатрэбнай у сівой сталасці гадоў». (З артыкула «Адвечныя лісты з млына...», газета «Заря»).

Проза прозай, няхай сабе і дужа прыцягальная сваім непаўторным лірызмам, але галоўную пісьменніцкую справу Мікола Купрэеў, як мне думаецца, зрабіў іменна ў паэзіі, у якой набіраў недасяжныя інтэлектуальныя вышыні, спярэшчаныя наўкруг камяністымі крутымі спускамі і спадамі. На любай яму Ганцаўшчыне з дзён маладосці паэт меў немалы творчы надзел — сам яго скародзіў, сам засяваў, збіраў ураджай калі хацеў і як хацеў. Да слова сказаць, пісьменнік нарадзіўся ў вёсцы Ямнае Рагачоўскага раёна, школьныя гады правёў у Івацэвічах і тут жа, у прыгараднай вёсцы Міхнавічы, пахаваны.

1937–2004. Пражытае жыццё не ўмяшчаецца паміж гэтымі датамі. Па колькасці пройдзеных дарог яму таксама няма роўных. Хіба што, азірнуўшыся ў трыцца-


• *Мікола Купрэеў*

тыя і саракавыя гады мінулага стагоддзя, на старасвецкіх трактах ды гасцінцах можна ўбачыць з вандроўніцкім посахам і хатулём за плячыма славутага мастака Язэпа Драздовіча, які ўсюды, дзе б ні быў, змалёўваў для нашчадкаў узоры народнага дойлідства, прылад працы і быту, запісваў фальклор і лексіку мовы. Вядома, ніяк не выпадае параўноўваць гэтыя дзве не аднолькавыя па значнасці фігуры, але і Мікола Купрэеў, надта часта сутыкаючыся з тым, што сам жа назваў непазбежнасцю, у беларускай літаратуры пакінуў яркі след, прынамсі, будучы добрым і шчодрым чалавекам, паэт не таптаў прыгожыя кветкі ў сваіх зялёных лясных пенатах.

***Леанід ФІЛАТАЎ***

## То сэрца паэта гарыць

*Да 70-годдзя Міколы Купрэева*

Як светла, як шчасна спявалася пра Цябе, калі Ты быў! І як скрушна-пакутна нарадзіўся гэты «санэт» без Цябе!..

Ён нам сказаў: «Як на кончыку промня калышацца ліст юнай яблынькі. Як ён уцякаў ад шчасця ў шчасце». Ён сказаў нам: «Ой, не кліч мяне, мама, не кліч! Нічога няма! Знаю, што ты была, і была вайна. Што ў іх кінулі тры гранаты. І толькі адзін паспеў усміхнуцца небу блакітнаму». Ён сказаў: «Глядзелі на яго дзве дзяўчынкі вачыма-знічкамі, а ў руках па яблыку — белы наліў». Ён сказаў: «Смейцеся. Смейцеся, хлопчыкі, і за сябе, і за мяне». Ён нам сказаў: «І калі я па дарозе іду і шчасця ўсім вам хачу, вы, калі ласка, мяне не чапайце! Калі хочаш наведаць мой край... ад бруду шчэ здаля ногі свае выцірай, рукі свае выцірай, сэрца сваё выцірай — калі хочаш наведаць мой родны зялёна-блакітны наш край».



Нарэшце ён нам сказаў: «Начамі не зоркі гараць над светам — то сэрцы паэтаў гараць... О, я многа хацеў вам сказаць!..»

А мы, хто нават зрэдзь слухаў, не чулі яго тады. А сёння цытуюць Купрэева многія на нашай зямлі. Разышоўся і ўздоўж і ўпоперакі, расспяваўся ад Буга да Дняпра, ад Нёмана да Дзвіны, ад ягонага Рагачова да маіх Бабініч і Ляхаўцоў, ад ягоных Сожа і Прыпяці да маіх Віцьбы і Рыты. Бы Грыбаедаў у свой час ад Волгі да Ангары і Амура. Толькі не дзеля «нежного ушка», а дзеля «расстралянага, прабітага кулямі сэрца... Пушкіна, Лермантава, Гарэцкага, Лоркі і Ягонага.

Так любіць, так шанаваць сваю Радзіму-Беларусь, так клапаціцца пра яе светлы дзень, пра неўміручасць справы Каліноўскага, Калесніка і Караткевіча, пра Мішу Стральцова з Мішам Рудкоўскім змог толькі абраны Богам чалавек адзіны раз на стагоддзі.

Два зборнікі ягоныя, «Непазбежнасць» і «Правінцыйныя фантазіі», — помнік у «новыя, далёкія гады» ўсё яшчэ пакуль не адроджанай нашай краіны.

Шукайце, па расінцы-пацерцы збірайце ягоныя бессмяротныя радкі, дзецям і ўнукам чытайце — і будзе жыць Беларусь!

Ён любіў ставіць клічнікі. Нават на левай ягонай далоні былі вытатуіраваныя клічнік з пытальнікам. Але так і не сказаў ён нам, пра што тое гаворыць?!.

*Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ*

# Працяг пачатку

*(Да 70-годдзя з дня нараджэння Міколы Купрэева: 25.V.1937–19.IX.2004)*

Я прыязджаю ў Івацэвічы жнівеньскім ранкам. Нядаўна прайшоў дождж, і лужыны яшчэ не падсохлі. У паветры стаіць пах мокрай зямлі і лістоты.

Вакзальная касірка ўсхвалявана тлумачыць мне: «Дык да тае вёскі даехаць гэта трэба аўтобусам, нашым, гарадскім. Сядзеце — во там, каля дрэва, прыпынак — і скажаце, што да помніка Коле Гойшыку. Давязуць!»

З акна аўтобуса пазіраю на прывакзальны пляц, сёння амаль пусты, і прыгадваю пачатак купрэеўскай аповесці «Палеская элегія», дзе той пляц апісаны шумным, поўным размаітага палескага люду. А сёння — пуста... Уласна Івацэвічы — невысокія ладныя дамкі, многа зеляніны. Спакойна, ціха ў горадзе. Раніца...

Аўтобус, высадзіўшы мяне ля помніка піянеру-герою і пырхнуўшы наастачу шызым дымам, знікае за павароткай. Помнік і аддзяляе вёску ад горада. Але як знайсці тое, што я шукаю? Паблукаўшы трохі, заўважаю каля адной з хацін бабулю. Быццам выразаная з цэльнага дрэва, у карычневым шляхецкім палітоне яна сядзіць на старой лаве, абапіраючыся на драўляную, відаць, самаробную кульбу. Ніяк не здзівіўшыся майму пытанню, бабуля гаворыць, як лепш дайсці. Шыбую па той самай дарозе, якой паехаў аўтобус, два разы пераходжу чыгуначныя рэйкі, і вось — бліскае за цаглянай сцяною возера, а за ім відны сярод бярозаў чорныя драўляныя крыжы.

Гэта могілкі вёскі Міхнавічы. Тут пахаваны Мікола Сямёнавіч Купрэеў, вядомы беларускі паэт і празаік.

Магіла яго — проста на ўваходзе. Чырвонага граніту помнік, на ім — барэльеф, даты жыцця і радок з верша, якім некалі адкрываўся першы купрэеўскі зборнік — «Непазбежнасць».



Вось і ўвасабленне тое непазбежнасці...

На граніце ляжыць колькі штучных кветак, а вакол — жыве, расце, хвалюецца цэлае мора палявых красак. Сеўшы пад маладым дубком, успамінаю трагічнага Башлачова:

> Шатаясь от слёз и от счастья смеясь под сурдинку,
> Свой вечный вопрос они снова выводят к кольцу.
> В миру тяжелы да зато как легки... на поминках.

*Вот тогда и поймём, что цветы им, конечно, к лицу.*

І — пачынаецца размова...

* * *

Але што я, юнак, магу сказаць пра чалавека, якога зусім не ведаў пры жыцці і ніколі ў вочы не бачыў? Хіба тое, што чытаў яго творы і плакаў над імі... Было ў ім *нешта,* жыла ў ім Паэзія... А Паэзіі не важна, ці ты вясковы юродзівы, ці ты оксфардскі прафесар. Яна жыве па-за часам і месцам. Можа і праўда, што яна абумоўлена сацыяльна-гістарычна, культуралагічна, псіхалагічна, фізіялагічна. Але ўсё гэта — толькі ўмова, а не прадмет Паэзіі. Часам, пры поўным здароўі і зладжанасці, пачынае балець душа, і тут, у гэтай кропцы, якая пульсуе ўнутры цябе і знаходзіцца прадмет Паэзіі.

* * *

На магіле Міколы Купрэева — процьма мурашоў...

Яны тут паўсюль поўзаюць: і па помніку, і па зямлі, і па шэрым надмагіллі, праз якое ўжо сям-там прабіваюцца парасткі зеляніны. Успамінаючы, як гэта рабіла нябожчыца-бабуля, пачынаю рваць траву, каб чыста было. Пакрысе набіраецца цэлы пук. Ім можна і падмесці. Ну, вось, здаецца, і прыбралі трохі.

Заліваюцца птушкі.

Па-над бярозавым гаем белымі ахапкамі — аблокі.

* * *

У прадмове да «Дзіцячых гульняў пасля вайны» Купрэеў згадваў, што яшчэ ў маладосці напісаў быў аўтабіяграфічную аповесць, але рукапіс згубіўся. А мне падаецца, што гэтым згубленым рукапісам яму ўяўлялася ўсё ягонае жыццё, да якога потым удалося вярнуцца праз цыкл з 4-х аповесцей. Я кажу «цыкл» таму, што зусім выразна бачу яго: «Дзіцячыя гульні пасля вайны» — дзяцінства, «Імгненне светлае» — юнацтва, «На вуліцы Карла Маркса з Паэтам» — сталасць, «Палеская элегія» — старасць. Тут трэба было супасці з самім сабою, вярнуцца. *«Я стаў вяртацца. Але ўсюды і да ўсяго вярнуцца ўжо, на вялікі жаль, немагчыма...»* — пісаў паэт у лісце да Леаніда Галубовіча.

*«Я пакутаваў над гэтымі двума словамі: «Я цябе...» А што «цябе»?.. Я быў крыкнуў аднойчы праз нейкае поле, нейкі лес: «А што «цябе"?!». Але ніхто і нішто мне нічога не адказалі... Той раніцай, той дарогай, ад знявечанай Морачы ехаў, можа, у апошні раз».*

«Рэчкаю плывём, плывём...» — цалкам іншая аповесць. Аўтар-апавядальнік цяпер не Анатоль Хведаравіч Кухараў, а хлопчык Васілёк. Народжаны 26. 04. 1986 сям'ёю алкаголікаў, жыве ён з дзядзькамі на забруджаных радыяцыяй землях. Пільна, вельмі пільна ўглядаецца пісьменнік у свайго новага героя — дзіцёнка-падлетка. А падлетак углядаецца ў жыццё і ў ім спрабуе знайсці сваё дзяцінства. Ён, хлопчык, нечым (некім?) злучаны, паяднаны з Кухаравым, а менавіта — з тым Толем 1942-га, які крычыць каля забітай паліцаямі маці. Тут замыкаецца кола. Што будзе з новым пакаленнем дзяцей з «украдзеным маленствам»? Зноў трэба шукаць будучыню, зноў усё плытка і невыразна... Акрамя аднаго: ёсць яшчэ поціск сяброўскай рукі, глыбокія вочы гожай дзяўчыны, зялёнае хараство роднай краіны. А значыць, вырасце Васілёк, і, хто ведае, можа, ён стане той благаславёнай валошкай у жыце, без якой нельга і жыць жыту.

Будзе працяг пачатку.

*«І во мы зноў плывём у лодцы нашай рэчкай, мы — трое людзей з хат, тры хатнія жывёліны і адна хатняя птушка, — плывём у бок вялікай ракі, якая ўпадае ў яшчэ большую раку, а тая рака ўпадае недзе далёка-далёка ў мора. Але ж нашая лодка вялікімі тымі рэкамі плысці не будзе — нам не будзе чаго рабіць на тых рэчках і на іх берагах. Мы плывём у сваей невялікай лодцы нашай вузкай, нядоўгай рэчкай. На берагах яе і так ужо столькі намі ўбачана, сустрэта, перадумана, адпакутавана. А колькі яшчэ ўсяго гэтага перад намі...*

*"Плывіце!" — хто гэта сказаў нам з таго берага?..*

*Плывём».*

* * *

Я ведаю, што вярнуся.

Да вакзала шыбую пешшу, праз увесь горад — напрасткі. І вось маршрутка вязе мяне ў Пінск. Едучы, міжволі слухаю гучныя размовы маладых целяханцаў пра мабільныя тэлефоны, камп'ютарныя гульні і «крутыя» фільмы паводле Д. Браўна і П. Зюскінда.

Яны вяртаюцца дамоў. Я таксама вяртаюся дамоў.

Пад маімі пазногцямі чарнее зямля з магілы Міколы Купрэева.

* * *

*«Нішто не прыходзіць да чалавека раней прызначанага часу. Каб зразумець пачатак, трэба ведаць канец»,* — пісаў Міхась Стральцоў.

Купрэеў **ужо** пражыў сваё жыццё. Так, як змог.

*«Пра што я не сказаў на гэтых старонках, а хацелася ж сказаць?*

*Пра тое, што з таго майго першага і апошняга хаджэння з дзедам у царкву я, калі заплюшчваю вочы, бачу*

*залатыя іконы і святло свечак перад імі, і людзей, што стаяць там цесна адзін да аднаго, плячо да пляча, і шэптам, схіліўшы галовы, моляцца...*

*Пра тое, якімі ўсе мы былі добрымі, спагадлівымі, чуйнымі адразу пасля вайны, мы — малыя дзеці, і дарослыя, і зусім старыя, людзі ля Дняпра на Усходзе і ў Чорных Пясках на Захадзе. Але вайна была такая балючая, такая крывавая, што людзі пастараліся як найхутчэй аддаліцца ад яе, забыцца на яе і на шмат што іншае, у тым ліку й на саміх сябе...»*

Не забывацца б...

Калісьці ў інтэрв'ю паэт сказаў: *«Выдаюць таго, каго* ***цяпер*** *чытаюць. Мяне не чытаюць... Ну, няхай і не выдаюць»*.

Хацелася б, каб усё-ткі чыталі і менавіта цяпер...

Да Міколы Купрэева кожны мусіць дайсці сам, пабыць з ім, услухоўваючыся ў *«задуменна-самотную мелодыю»*, што гучыць у душы. Бо ў гэтым — *«усё чалавечае»*.

Тое, што не знікае.

***Анатоль СІДАРЭВІЧ***

# У чаканні біёграфа

*25 мая 2012 года споўнілася б 75 гадоў паэту Міколу Купрэеву*

Мікола Купрэеў.

З якога боку падступіць?

Вазьму тэму «Паэты маёй старaны».

Для тэмы гэтае павінны быць нейкія абмежаванні ў прасторы. Ганцавіцкі раён? Чаму б і не? Ладны кавалак Случчыны, цэлая Круговіцкая воласць. І кавалак Піншчыны — Хатыніцкая воласць. Ды яшчэ кусочак



Дабраслаўскае воласці. А раз Дабраслаўская воласць, значыць, і Сташаны.

Калі ўжо Сташаны, дык не Малкавічы. Калі зірнем на мапу Ганцавіцкага раёна, убачым, што самы паўднёвы пункт Ганцавіцкага раёна, калі не лічыць майго Задуб'я, — Малкавічы, але яны павінны саступіць званне самага паўднёвага пункта маёй старaны Сташанам, хоць ёсць спакуса дабрацца да Ясельды і паплысці па ёй, зазірнуць у Парэчча, Велясніцу і Рудку — вёскі незабыўнае Жэні Янішчыц, ды ўсё ж абмяжуемся Сташанамі («сто шан для Сташан»).

Раз ужо Сташаны наш паўднёвы крайні пункт, паўночным абярлом Востраў. (Ведама, яно спакуслівa праз Машукоўскі лес выбрацца з Палесся да палевікоў і далучыць да нашай старaны вёску Леаніда Галубовіча). А самы ўсходні (ці паўночна-усходні) пункт — вёска Чудзін.

Такім чынам, Чудзін, Сташаны і Востраў — крайнія пункты маёй паэтычнай старaны. І Малкавічы не забудзем.

Пакуль жывыя сведкі, трэба было б пісаць біяграфію аднаго з паэтаў маёй старaны — Міколы Купрэева.

Вось для мяне пытанне: дзе ён раней працаваў — у Сташанах, Малкавічах ці ў Чудзіне. Калі працаваў? Ды мы такія — часта біяграфіі пішам, калі і сведкі ўжо сышлі ў нябыт.

У 1980-х, калі рабілі «Энцыклапедыю літаратуры і мастацтва Беларусі», артыкул пра Міколу Купрэева прадугледжаны не быў. Як і пра Алеся Наўроцкага.

Мала храналагічнай канкрэтыкі і на багатым ганцавіцкім краязнаўчым сайце (на ім распачаўся тыдзень Міколы Купрэева).

Хто возьмецца пісаць дэталізаваную біяграфію паэта? Не ведаю. Тут жа падзялюся назіраннем.

Дзе б ні працаваў Мікола Купрэеў у маёй старане, там (ці адтуль) меўся яшчэ хоць бы адзін паэт.

Каб не казаць доўга пра Чудзін, кожнаму параю пачытаць казкі палешукоў у запісах Сержпутоўскага. Колькі там

паэзіі! А калі браць наш ужо час, у Чудзіне нарадзіўся і ў Чудзінскай школе, дзе працаваў Мікола Купрэеў, вучыўся паэт Алесь Каско. На хутары Запрапасць пад Малкавічамі нарадзіўся, а ў Малкавіцкай школе, дзе працаваў Мікола Купрэеў, вучыўся паэт Іван Лагвіновіч. У Сташанах, дзе працаваў Мікола Купрэеў, нарадзіўся і вучыўся паэт Анатоль Шушко.

Ёсць у Міколы Купрэева верш, прысвечаны жыхарам Вострава, і верш памяці самага знакамітага «астравіцяніна» — паэта Міхася Рудкоўскага.

Пішучы пра Міколу Купрэева, не магу не згадаць яшчэ двух паэтаў, надзеленых, як і ён, талентам празаіка.

Не магу не згадаць Міхася Стральцова і Алеся Наўроцкага. З імі Міколу Купрэева яднае не толькі месца нараджэння (Усходняя Беларусь), але й год нараджэння — 1937.

Так здарылася, што яны, народжаныя ў год Вялікага тэрору, былі ў шэрагу разбуральнікаў сацыялістычнага рэалізму ў нашай літаратуры. Міхась Стральцоў — праз вернасць класічным запаветам і канонам, Алесь Нароўцкі — праз адсутнасць тутэйшай літаратурнай вывучкі і няўпісанасць у тутэйшую паэтычную «школу», Мікола Купрэеў — праз ледзь не дэманстрацыйнае выяўленне свайго Я, праз выклік таталізуючаму калектывізму.

Нехта з біёграфаў, гісторыкаў літаратуры, пішучы пра агульнае і індывідуальнае ў творчасці трох пісьменнікаў 1937 года нараджэння, напіша пра іх драматычны лёс, неўладкаванасць, апрычонасць. І пра тое, што іх жыццёвая драма спалучалася, як ні парадаксальна, з прыжыццёвым прызнаннем іх таленту.

Тут я пераходжу да тэмы ўспрыняцця творчасці Міколы Купрэева крытыкай, калегамі. Будучаму біёграфу нельга будзе абысці і пытанне пра тое, як яна, крытыка, уздейнічала на творчасць, на асобу пісьменніка.

У тыя 60-я грэх было жаліцца на адсутнасць увагі да дэбютантаў. Першы зборнік Міколы Купрэева не быў вы-



ключэннем. Свае рэцэнзіі Сцяпан Гаўрусёў, Уладзімір Гніламёдаў, Хведар Жычка, Аляксей Майсейчык і Валянцін Тарас змясцілі ў «Чырвонай змене», маскоўскім часопісе «Дружба народов», часопісе «Полымя», брэсцкай абласной газеце «Заря» і часопісе «Маладосць». Ведама, было б цікава супаставіць тагачасныя ацэнкі паасобных вершаў паэта з тым, што на пачатку XXI стагоддзя было выбрана для анталогіі «Я хацеў вам сказаць...», якая выйшла ў серыі «Беларуская паэзія XX стагоддзя», але абавязкова трэба адзначыць, што водгукі на першую кнігу былі прыхільныя, зычлівыя. Хіба што дысанансам прагучала слова Уладзіміра Варно (хто памятае такога аўтара?) у газеце «Літаратура і мастацтва». Дый тую рэцэнзію, па-мойму, нельга аднесці да разраду аглабельнай крытыкі. Ці я не маю рацыі?

І ўсе ж, пытанне: чаму, нягледзячы на прыхільнае ўпрынацце яго першага зборніка амаль усімі рэцэнзентамі, чаму, нягледзячы на зычлівае стаўленне да яго і Янкі Брыля, і Уладзіміра Калесніка, і іншых літаратараў старэйшага пакалення, чаму, нягледзячы на добрую чытацкую рэцэпцыю, Мікола Купрэеў на доўгі час застаўся на маргінэсе літаратурнага жыцця?

Ён не быў, як Алесь Наўроцкі, дысідэнтам. Нават наадварот: у нечым ён быў звычайны савецкі чалавек. Але ж нешта замінала яму ўпісацца, як Міхасю Рудкоўскаму ці Міхасю Стральцову, у берасцейскае ці ў менскае літаратурныя колы, нешта ж не давала яму выйсці са статусу сельскага настаўніка і супра-



• *Мікола Купрэеў. Хвіліны адпачынку*

цоўніка райгазеты. Гэта даволі складаная даследчыцкая тэма.

У кожнага пісьменніка ёсць калі не адаратары, дык сябры. Яны, сябры, дапамаглі ў свой час вярнуцца ў літаратурнае рэчышча Міхасю Стральцову, які пад канец свайго кароткага жыцця ўразіў нас зборнікам-шэдэўрам «Мой свеце ясны». Васіль Сёмуха, якому (як рэдактару) перапала ад аднаго крытыка за першы зборнік Алеся Наўроцкага, у 1990-м узяўся рэдагаваць яго трэці зборнік — «Пакаленні і папялішчы». І гэта было вяртаннем Алеся Піліпавіча ў літаратуру. (Адзнака часу: я не знайшоў ніводнае рэцэнзіі гэтае кнігі, як, зрэшты, і другое кнігі вершаў Міколы Купрэева «Правінцыйныя фантазіі», што выйшла ў 1995 годзе.)

Літаратурнаму «рэнесансу» Міколы Купрэева паспрыяла ўвага да яго Леаніда Галубовіча, які з уласнага досведу ведаў, што за бяда напаткала чалавека.

Сам пазбыўшыся бяды, ён спагадаў чалавеку, які не знайшоў сілы волі пазбыцца яе і цярпеў праз гэта ад хваробаў. І прыйшоў яму на дапамогу. У тым, што ў друку 1990-х гадоў з'явіліся творы Міколы Купрэева, што выйшлі ягоныя кнігі паэзіі («Правінцыйныя фантазіі») і прозы («Палеская рапсодыя»), а таксама ў тым, што пасмяротна ягоныя вершы апублікаваныя ў зборніку «Я хацеў вам сказаць...», — немалая заслуга Леаніда Галубовіча (вось чаму мне захацелася бачыць яго ў маёй паэтычнай старане).

Былі ў Міколы Сямёнавіча і іншыя спрыяльнікі, якія не махнулі на яго рукою, не адцураліся яго. І пра гэта, спадзяюся, з належнай увагай і тактоўнасцю напіша будучы гісторык літаратуры, якога зацікавяць лёсы паэтаў маёй старанЫ і пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў 1937-м.

*25 мая 2012 г., вёска Задуб'е Ганцавіцкага раёна*



***Алесь КАСКО***

# «Жураўлі журлівыя мае...»

*Эсэ*

Дзіўлюся дзядам, якім за восемдзесят, былым партызанам: яны ў сваіх мемуарах нават колькасць трафейных патронаў злічваюць не круглымі лічбамі. А мы з ім пры другой сустрэчы, ужо ў дарослым маім жыцці, і году яго прыезду ў нашу Чудзінскую дзесяцігодку ніяк не маглі ўзгадаць. Нейк у слове пра яго для часопіса «Крыніца» я наўпрыкід назваў адзін, дык ён папракнуў: няпраўда. Папракнуў, але не паправіў. Дзе яму, калі гэтулькі школаў памяняў, гэтулькі працоўных кніжах згубіў! Як і кніжак (ці паўкніжак) рукапісных, з вершамі ды прозаю. Вось адзін эпізод.

Напрыканцы 1970-х, працуючы настаўнікам на Камянеччыне, Мікола (мы ўжо былі на «ты») калі-нікалі прыязджаў да мяне ў Жабінку. Таго разу амаль заначавалі на беразе Мухаўца каля цяпельца. Нагаманіліся пра ўсё, але час ад часу запыняліся на ягонай аповесці, рукапіс якое ён прывёз і чытаў у мяне дома. Аповесць захапіла, для мяне тады было адкрыццём, што гэтак проста і шчыра можна пісаць пра патаемнае, інтымнае, так паэтычна — пра звычайны сялянскі побыт, што можна і цяпер на Палессі напаткаць... Аляксандра Купрына і нават выпіць з ім. Праўда, не з усім я пагаджаўся: тут занадта сентыментальна, там занадта натуралістычна... Раніцою пасля гарбаты Мікола паехаў аўтобусам, а праз дні тры паведаў, што рукапіс згубіў па дарозе. Памаўчаў у тэлефонную трубку і рагатнуў: «Кепска напісаў, таму і згубіў». Я пачуваўся вінаватым, аднак з цягам часу пераканаўся: чужой «камеры захоўвання» вандроўнік Мікола Купрэеў не давяраўся, хіба што выпадкам; згубу ды іншыя нелады з сабою раствараў у душы, хаваў пад самаіроніяй.

Не любіў між тым «шпілек», што падкідвалі яму. Адказваў на іх дасціпна, адпаведна. Памятаю, у рэдакцыю Міколы Пракаповіча, дзе бавілі час мы з вандроўнікам, адчыніў дзверы галоўны рэдактар аблтэлестудыі, сакратар партарганізацыі, аднакашнік: «Здароў, Купрэеў, як жывеш?» — «Добра, Толя. Жыву, як бачыш». — «Бачу, ажно чырвоны ўвесь!» — «Не з таго расчырванеўся, як ты думаеш. Учора я ў кампартыю ўступіў». Ды часта зброя самаахovы хібіла, калі крыўда апякала да самага дна і яе немагчыма было схаваць або парыраваць. «Шкада, што дзяржаўную прэмію амаль «выпісалі», ды не далі, я хоць расчоску купіў бы», — з натужнай усмешкай прамовіў і правёў далоняю па рэштках валасоў. Перажываў, гэта было відавочна. Не кожны ж, хто ведаў пра казус, здагадваўся, што справа не ў недаацэнцы таленту аўтара «правінцыйных фантазій». Сам ён сфакусіраваў прычыну на радках пра Зіну Зёлкіну, што «паляцела з Лукашэнкам у Маскву» (верш «Сустрэча з К. Крапівой у 1993 годзе»).

Літаратурная прэмія імя А. Куляшова, прысуджаная яму Саюзам пісьменнікаў, з'явілася пэўнай маральнай кампенсацыяй, дый факт вылучэння на прэмію дзяржаўную меў станоўчы рэзананс — падштурхнуў улады загадзя памяняць ягоны пакой у двухпавярховай будыніне (з вонкавай стромай лесвіцай для хворага на ногі паэта!) у пушчанскай вёсцы Папялёва на кватэру ў Пружанах (на першым паверсе, між іншым).

Што да згубленых рукапісаў, дык далёка не ўсё паэту і празаіку ўдавалася ўзнавіць. З узноўленага — тая аповесць, што ён зачытваў мне ў Жабінцы. Яе раздзелы лёгка пазнаю ў «Імгненні светлым», творы, напісаным літаральна за месяц у Вярховіцкай, на Камянеччыне, бальніцы для сухотнікаў. Несумненна, сам працэс напісання быў светлым імгненнем для яго: цэлы месяц згадак пра маладосць і каханне, уваскрашэння сваёй і купрынскай Алесяў, увасаблення сябе ў любімым пісьменніку і яго ў сабе, балазе прозвішчы сугучныя!.. Дарэчы, вы заўважылі?



Усе пяць аповесцей, якія склалі зборнік «Палеская элегія» (2007), М. Купрэеў стварыў на працягу 1994 — 1999 гадоў у Вярховічах, дзе меў і ўтульнасць, і душэўны спакой, і ўвагу да сябе, а да белых палатаў і халатаў яму было не прывыкаць. Зусім няпраўда, што самотнікам можна жыць пастаянна. Нават воўк з аднайменнага купрэеўскага верша цягнецца да людскога жытла.

Аднак жа я «забег» у пазнейшыя часы. Карціць вярнуцца да вытоку нашага знаёмства, а пасля і сяброўства, у той «недакладны» год, у сонечны школьны верасень 1964-га (дата, зафіксаваная Ганцавіцкім райаддзелам адукацыі). Свята было надзвычайнае: настаўнічаць у Чудзін прыехала шэсць-сем інтэлігентаў і ітэлігентак, маладых, прыгожых, бадзёрых. Крыху старэйшы — завуч Мікалай Сямёнавіч Купрэеў, годны паставаю, позіркам, з бялявымі кудзеркамі на скронях. Рыхтык знакаміты рускі класік. Неўзабаве ў Пушкіна яго і «пераахрысцілі», балазе выкладаў ён тады рускую літаратуру. Мусіць, я спрычыніўся да гэтага, трохі з захапленем, трохі з крыўдаю (з «крыўдазахпленнем» напісаў бы ўкраінец Васыль Стус). Пачаўся ўрок з пушкінскага «В Сибирь». Яшчэ не знаёмы для нас тэкст настаўнік даў чытаць аднаму, другому, пасля першай страфы пасадзіў і мяне, забраў з рук хрэстаматыю і прачытаў сам. Гэта было не чытанне, а пражыванне верша, нібы чытальнік ёсць і аўтар яго. З таго ўрока Купрэеў стаў для нас «Пушкіным».

Завуч кватараваў у гаспадыні Навотнай, хата месцілася на ўскрайку вёскі непадалёку ад лазні і электрамеханічнага млына. За імі адразу — хмызняк і балотца, цяпер асушанае і забудаванае. Стаяў восеньскі надвячорак, калі мы з аднакласнікамі завіталі ў госці — праведаць хворага настаўніка; ён ужо трэці дзень не прыйшоў да нас на ўрокі. Мікола Сымонавіч запрасіў на «чыстую» палавіну хаты, дзе жыў. Быў прыемна здзіўлены, што без нічыёй падказкі і без педагога мы надумаліся зайсці. Куды падзелася яго строгасць! Мяккі, добры, гаваркі, прычым размаўляў

з намі не так, як на ўроках і калідоры, а па-беларуску. І ўсё ж размова не клеілася. У нас дрыжалі калені, а завуч раз-пораз кідаў позірк на стол, дзе ляжалі ўроскід кнігі па баках, пасярэдзіне — разгорнуты сшытак і на ім ручка. Ясна было, што заседжвацца нельга. Дый некаторыя з нас стаялі, бо канапа, наспех вызваленая гаспадаром ад коўдры з падушкаю, і два зэдлікі ўсіх не ўмясцілі. На развітанне ён папрасіў: «Каско, ты часта ходзіш у бібліятэку, дык занясі і маё заўтра, ператрымаў». Ён падаў мне кніжку са стала — том Івана Буніна — і дадаў: «Можаш на сябе перапісаць. Чытай, многа чытай!»

Гэта была адзіная сустрэча ў яго дома. Яна ўтрывалілася ў памяці пазней, калі ў зборніку «Непазбежнасць» (1967) прачытаў верш «Паланэз Агінскага»:

За сценамі дзесьці ў балотцах
мерзнуць пакінутыя журавіны.
Над хатай даўно ўжо, даўно ўжо
ў небе след адгарэў жураўліны...
Хворы ляжу на канапе...

Ці не ў той самы вечар пісалася гэта? У М. Купрэева ж канкрэтыка мясціны, часу, стану душы адчуваецца і ў прозе, і ў паэзіі — ад геаграфічнай назвы ці імя чалавека да «квадратна-гнездавой бульбы» і «шклянкі Малянкова». Ён калісьці і ў мяне паправіў абстрактны «родны край» на яскравыя, вобразныя назвы вёсак ды ўрочышчаў, з-за чаго мой вершыкператварыўся ў этнаграфічную замалёўку і мною быў выкінуты з ужо падрыхтаванай падборкі.

Пра паэтычнае вучнёўства пытанне далікатнае. У вядомых дыялогах Міколы Купрэева і Леаніда Галубовіча мой школьны настаўнік абмовіўся: Каско і Шушко сталі паэтамі ад зайздрасці да яго. Сказаў, няйнакш, з іроніяй. Пушкін Пушкіным, а што ён паэт насамрэч, я толькі здагадваўся. Ніводнай даверлівай гаворкі з ім у мае школьныя гады не было. Як і ўсе вучні, я пабойваўся надта строгага завуча, а пасля аднаго выпадку ўвогуле пачаў пазбягаць. Была



прызначана піянерская лінейка з нагоды чырвонай даты, а «штатны» гарніст у той дзень захварэў. Конкурс на замену выйграў я, але такога нагарніў з пераляку, што ўся тая лінейка клалася ад рогату. Завуч знайшоў мяне, паўжывога, у калідоры і «дабіў»: «Не, чалавека з цябе не будзе!» Праз шмат гадоў я прыгадаў яму: «Мікола Сымонавіч, ты як у ваду пазіраў...»

У студэнцтве сустрэў яго спачатку «завочна». У кабінеце беларускай літаратуры Брэсцкага педінстытута з ініцыятывы У. Калесніка вывесілі стэнд з гонарам за паэтаў-выпускнікоў: «Яны надрукаваліся». Сярод іншых — Мікола Купрэеў. Партрэт задуменнага інтэлігента ў шырокім капелюшы і старонкі з «Маладосці», дзе вершы майго настаўніка. Адклаўся ў памяці, не, у душы, адзін — «Журавы не пралятаюць міма». Во калі я светла пазайздросціў і доўга хадзіў акрылены: «О, каб сэрца ў мяне было жураўлінае ці, як у тых журавоў, чалавечае сэрца было!». Менавіта — «чалавечае», а не «чалавечнае», як потым было папраўлена (хутчэй за ўсё — выдавецтвам, а не рэдактарам на грамадскіх пачатках А. Вярцінскім) у першым зборніку. Гэтае ўстаўленае «н» адназначна прыглушыла пачуццё, ідэю, паэтычнасць, урэшце — сутнасць купрэеўскага светаўспрымання. Вобраз жураўля — скразны ў М. Купрэева, ён увасабленне ягонай любові, нязменна шчымлівай і балючай, да людзей з іх няведаннем, што часам творац, да жыцця, якое плыве і плыве жураўлінын клінам у небасхіл, да радзімы і вялізнага свету, дзе творца з ранімай душой бывае аднолькава самотным. У аповесці «Палеская элегія» адзінокія ўсе: і непрыкаяны галоўны герой-студэнт, і яго каханая, у якой «апальны» бацька, і грэшны перад аднавяскоўцамі вартаўнік Янко, і журавель, асуджаны памерці. «...Я ледзь дыхаў — баяўся чым патрывожыць яго, і журавель таксама, напэўна. І ўсё-такі мы абодва дыхалі — таму што абодва яшчэ жылі. Патрон пакуль яшчэ схаваны ў кішэні Янко... Птушка зусім наблізілася да мяне. Не я, чалавек, быў першым у

нашым набліжэнні. Даруй мне, птушка, ты слаба ведаеш наш свет — ты бачыш яго зверху, з неба».

Як настаўнік даведаўся, што былы ягоны вучань паступіў у педінстытут, застаецца для мяне загадкаю: праз свайго сябра Міхася Рудкоўскага ці з публікацый у абласной «Зары»?.. Ён знайшоў мяне сам, у студэнцкім інтэрнаце. Пачытаў мае вершапрактыкаванні, памяркоўна сказаў: пішы, маўляў, але не старайся быць зарана мудрым. На летніх вакацыях прыехаў у Чудзін, парыбаліў са мною на Лані, падпісаў сваю «Непазбежнасць» з зычэннем, каб кожны мой верш быў не горшы ад таго ладнага шчупачка, якога злавілі на вуду. Мала, дык яшчэ падабраў вершы і суправадзіў іх у «Чырвоную змену» Міколу Федзюковічу. Так я ў 1970 годзе дэбютаваў у рэспубліканскім друку, між іншым, з яшчэ адным ягоным вучнем Анатолем Шушко.

Здаецца, Мікола Купрэеў ніколі не даваў адназначных ацэнак ні чужым, ні тым болей сваім вершам, прынамсі, не выказваў іх наўпрост, як і стаўлення да крытычных артыкулаў і рэцэнзій. У коле сяброў і падчас літаратурных сустрэч чытаў самае блізкае сваёй душы. Маладым раіў чытаць таго ці іншага аўтара, а то і дарыў іхнія творы ў зборніках і часопісах: мне, напрыклад, — вершы Ф. Віёна, Ж. Прэвера, М. Рубцова. У прадмове да «Чарнавікоў» Міколы Папекі ён зноў жа абышоўся без ацэнак, схаваўся за фразамі пра пчолаў і параныя буракі, якія нібыта любіць аўтар. Штрыхі да паэзіі давялося ўносіць мне як рэдактару...

Што пра самога Купрэева пісала крытыка раней, мне не падабалася. Чаго варты загаловак — «Сваё праз чужое»! З кім толькі не параўноўвалі Купрэева. Скажам, з У. Уітменам. Узоры сусветнай лірыкі, у якой заўзяты кніжнік быў добра абазнаны, дапамагалі сцвердзіцца на ўласным адметным шляху. Ён ад самага пачатку імкнуўся да свабоднага — не ў тэрміналагічным значэнні, а ў сэнсе разняволенасці — верша. 1960-я гады наогул характэрныя абнаўленнем нацыянальнай паэзіі. Змагаўся за беларускі верлібр Максім Танк, разбураў аднастайную



рытміку і рыфміку Анатоль Вярцінскі, ён жа падтрымаў паэта-наватара Міколу Купрэева, падрыхтаваў да друку яго першую кніжку. Зрэшты, «Непазбежнасць» крытыкавалі не за «вольнасці» ў формабудове верша, не за празмерную элегічнасць ці занадта смелую метафару, але перш за ўсё за «безыдэйнасць» і «абстрактны гуманізм», які знайшлі і ў шэдэўры «Замест лекцыі пра жыццё»:

Паліла сонца — дажджу хацелася,
дажджы навaліліся — сонца хацелася,
быў хлапчуком — пасталець хацелася,
выйшаў за трыццаць — юнацтва схацелася.
Стаў паміраць — жыць захацелася
ў сонцы,
у ліўнях,
у юнацтве,
у сталасці
і — таму што жыў, жыў на зямлі! —
плакаў прад сконам ад гора і радасці.

Новую кніжку М. Купрэева чытачы, сябры-паэты, а таксама крытыкі, тыя, хто ацаніў самабытную яго творчасць, чакалі з нецярплівасцю: «Марудна, з працяглымі і прыкрымі перапынкамі, але ўсё ж даходзіць да чытача па-свойму цікавая і па-чалавечы неабходная паэзія Міколы Купрэева. Новыя яго вершы, тыя, што з'явіліся ў друку пасля выхаду зборніка «Непазбежнасць», не могуць не парадаваць і шчырасцю хвалявання, і глыбінёй зместу» (Янка Шпакоўскі). Чакаць давялося ажно дваццаць восем гадоў. Выхаду ў 1995-м «Правінцыйных фантазій» ускосна паспрыялі незалежнасць і дэмакратызацыя краіны, аднак рэальна не абышлося без высілкаў захопленага талентам Купрэева не менш адметнага паэта Леаніда Галубовіча. Ён, па сутнасці, на дзясятак апошніх гадоў стаў рэдактарам і апекуном яго, падахвоціў на стварэнне яшчэ і кнігі прозы ды вёў перамовы з выдаўцамі пра яе выпуск (на жаль, кніга пабачыла свет толькі праз тры гады пасля смерці аўтара).



• *Мікола Купрэеў у сваёй, пружанскай, кватэры*

У выдатных паэтаў, асабліва калі яны дэбютуюць у не зусім маладым узросце, як Мікола Купрэеў, розніца ў мастацкіх вартасцях зборнікаў звычайна невялікая. Ды яны і не дапускаюць, каб наступны быў горшы за папярэдні. Лепей зробяць паўзу, доўгі ці кароткі час не стануць друкавацца, а то і пісаць. Гэта таксама адна з прычын вялікай часавай разбежкі паміж «Непазбежнасцю» і «Правінцыйнымі фантазіямі» — поруч з жыццёвай неўладкаванасцю, хранічнай нястачай душэўнай раўнавагі, узаемнай непрыязнасцю ў стасунках з праваднікамі ідэі «светлай будучыні» і «правільнай» маралі. Пастаянны чытач М. Купрэева добра ведае, як ён ставіўся да кожнай сваёй публікацыі ў перыёдыцы: што ні падборка, дык тэма для размовы пра невычэрпныя магчымасці паэтычнага слова. Паэт, хоць і «марудна, з працяглымі і прыкрымі перапынкамі», набліжаўся да новай кніжкі, і калі нарэшце яна выйшла, пісьменнікі не раздумвалі доўга, каго на гэты раз вылучыць на самую высокую тады (і збанкручаную цяпер) прэмію. Памяталі пры гэтым і раней напісанае ім.

Яны перада мною на стале, два купрэеўскія зборнікі (першы — у ксеракопіі). З захапленнем і смуткам перачытваю вершы то з аднаго, то з другога. Смутку ў другім пабольшала, у ім няма і намёку на рамантыку, іронія і самаіронія саступілі роспачы і сарказму:



За гарою пытае крывіцкая Друць:
«А хто там ідзе?» Адказаў іудзей: «Беларусы».

Затое ў ім багата горкай праўды пра жыццё і праўды мастацтва, красы. У такім спалучэнні і самы элегічны, самы трывожны верш пакідае светлы след у душы, як яго пакідаюць увосень «журавы журлівыя», што адлятаюць. Існае мастацтва ачышчае і ўзвышае праз роздум чалавека над сабою, лёсамі блізкіх людзей, радзімы, і, можа, чым больш журбы-горычы ў ягоным роздуме, тым дабрэйшым, лепшым ён робіцца або хоча стаць у гэты момант:

...і ў радзімы прасі, як у Бога:
«Не трэба мне больш нічога —
дзякуй за поле.
І ў далях далёкіх,
куды адвязуць мяне ціха,
мне цяжка не будзе —
будзе вечна і лёгка
тваё зерне ў зямлі svіціцца...

«Правінцыйныя фантазіі» — або «Непазбежнасць»? Сабе такога пытання не задаю. Яны ўзаемапранікальныя, блізкія, многія творы першага зборніка вельмі ўдала дапоўнілі б і ўзмацнілі другі. Нездарма я ўгаворваў Міколу спалучыць два зборнікі ў адной кніжцы, тым болей, што першы зрабіўся надзвычайнай рэдкасцю. Хіба што цяпер, дзякуючы памнажальнай тэхніцы ды рупнасці яе ўладальнікаў, скажам, М. Папекі, ён распаўсюджваецца. А раней выпрошваўся, а то і цішком забіраўся аўтарам з шафаў сяброў (менавіта гэтак я страціў падпісаны мне асобнік). Дарагі ён быў яму як дзецішча, як памяць пра маладосць. І меў у дадатак не абы-якую побытавую вартасць.

«Непазбежнасць» з фотапартрэтам доўгі час служыла для аўтара адзіным пасведчаннем асобы. Гэтую кніжыцу ён заўсёды насіў з сабою, яна ратавала яго ад міліцыі і выпадковых застольнікаў-задзіраў. Яшчэ насіў у торбе

шмат газет, часопісных выразак, нятоўстых кніжак, якія пакаваў разам з хлебам ды салам. Рукапісы, завершаныя або ў накідах, былі тут жа. Губляў, узнаўляў, зноў губляў... Нямала купрэеўскіх неапублікаваных вершаў і экспромтаў у памяці сяброў, у рэдакцыйных архівах, з якіх пакрысе іх дастае Ціхан Чарнякевіч. З верша, прачытанага паэтам у разгар меліярацыі, памятаю ўсяго два радкі ды назву «Маналог чорных буслоў»:

> Не баяліся ваўка мы шэрага —
> баімся мы Пятра Машэрава...

Яшчэ памятаю экспромт, складзены вандроўнікам пасля чарговага завітання ў іванаўскую «Чырвоную звязду», куды больш «не паеду, не пайду», радок-рэфрэн верша, напісанага ім на ганку рэдакцыйнага будынка ў




• *Пружанская бібліятэка. Прамаўляе Алесь Каско. Злева направа: Мікола Купрэеў, Мікола Папека і, справа, Уладзімір Ягоўдзік*



Ганцавічах з просьбаю да Васіля Праскурава: «...сто дубцоў і — авансу пяць рублёў!».

Многія паўанекдатычныя выпадкі абыходжу. Для мяне Мікола Купрэеў у любым (нехта прачытае: нецвярозым) сваім стане і выглядзе перш за ўсё Паэт. З ягонага вобраза я «спісаў» героя навэлы «Паэты», надрукаванай у «Звяздзе». Свабодалюбства, стыхія жыцця, якое б цяжкае яно ні было, непадлегласць ніякім нагаворам і плёткам, датклівая, далёка не для ўсіх разгорнутая душа — вось што нараджае сапраўднага творцу.

Прыплюшчу вочы — і зноў перада мною Чудзін, сонечны верасень, Мікола Купрэеў. І далёкая тады, а цяпер вельмі блізкая і вечная паэзія ягоная з журавамі, няхай сабе журлівымі:

> ...тыя, з кім развіталіся,
> збіраюцца на маякі,
> на дахі высокіх дамоў —
> каб яшчэ раз угледзець мачту
> адплываючага карабля.
> А я на сваім Палессі,
> раздзіраючы скуру далоняў,
> лезу на крохкі вяршок сасны —
> каб яшчэ раз угледзець
> крыло адлятаючага жураўля.

***Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ***

## Хацеў нам сказаць

*(Мікола Купрэеў — шасцідзясятнік)*

*«Пісьменнік — гэта стыль». Выказванне не старэе. «Стыль» — гучыць шляхетна, санорна. Як «сталь», толькі мякчэй, больш працяжна, з паніжэннем голаса.*

*Іншая рэя: «пісьменнік — гэта тэкст». Брыдка нават слухаць такое. Рэжа вуха. «Не-не, гэта абсалютна розныя рэчы».*

Калі паспрабаваць сказаць пра Міколу Купрэева ў двух словах, то ў галаву прыходзіць адно: «дысметрычны верш». Тэрмін даволі пэўны, які крытыкамі часта размазваецца ў дзесяці-пятнаццаці метафарах: «перарывістае дыханне», «расцятасць светапогляду», «збой рытму» і г. д. Насамрэч, калі сказаць пра паэтыку беларускіх шасцідзясятнікаў, то паняцце дысметрычнага верша трэба згадваць абавязкова, бо менавіта яны зрабілі шмат для таго, каб гэты «памер» у нашым пісьменстве ўсталяваўся. Мікола Купрэеў, нягледзячы на сваю выключную маргінальнасць, быў адным з самых актыўных прапагандыстаў: яго збонік «Непазбежнасць» (адрэдагаваны яшчэ адным «дысметрычнікам» Анатолем Вярцінскім) можа быць названы ўзорным у гэтым плане.

Пераход да дысметрычнага верша з'яўляўся амаль незаўважным зломам ва ўсёй паэтыцы беларускай лірыкі. Адыход ад «кананічнага гладкапісу», якім быў літаральна завалены ўвесь літаратурны друк 1950-х гадоў, стаў вехай на шляху да якаснага абнаўлення паэзіі наагул. Праўда, справа абнаўлення зазвычай выклікае пярэчанні, і нездарма многія з тых, хто прыйшоў з новым, апынуліся ў хуткім часе маргіналамі сярод дзясяткаў літаратараў афіцыйнага СП. Акрамя Купрэева, тут, бясспрэчна, можна назваць Алеся Наўроцкага. Абодва яны былі выштурхнутыя з тагачаснай пісьменніцкай штодзённшчыны (прыкладна на такім жа маргінэсе літаратурнага жыцця знаходзіўся і паэт Міхась Рудкоўскі).

Зборнік Алеся Наўроцкага «Неба ўсміхаецца маланкаю» значна больш цэльны, вядома, чым купрэеўская «Непажбежнасць». У Алеся Наўроцкага выверaны вектар — савецкі міжваенны мадэрн. Дысметрычны фразавік Міколы Купрэева хутчэй карэляваў з фальклорам, чым



з лірыкай мадэрністаў (савецкіх і не толькі). Але нават і гэтае, спадчынна-фальклорнае, як піша А. Кваткоўскі ў «Паэтычным слоўніку», «паўзнае чляненне фразы паводле прыкметаў інтанацыйнай выразнасці» ўспрымалася крытыкай з насцярогай. Бо так пісаць было «не прынята». Гэта выклікала «пытанні».

Цікавай бачыцца сама літаратурная сітуацыя, калі «новая» форма ўваходзіць у процістаянне з нормай. Дысметрычны «разлом» у лірыцы быў неабходны, бо гэта адкрывала магчымасці для праяўлення эмацыянальнага. Той жа канфлікт быў і ў французскіх імпрэсіяністаў з акадэмічным жывапісам. Абнаўленне мастацкай мовы прыводзіла да індывідуалізацыі. У выпадку з пасляваеннай паэзіяй у ролі «акадэмістаў» выступалі сацрэалісты, якія і ваявалі супраць абнаўлення мовы, бо гэта непазбежна выклікала распад «адзінага непадзельнага» метада. З гэтага пункту погляду, насцярога была цалкам апраўданай.

Бясспрэчна, што час першых пасляваенных дзесяцігоддзяў у нацыянальнай літаратуры з'яўляецца пераходным, але многія змены праводзіліся ў жыццё знарок павольна і неахвотна. Англійскі даследчык Арнольд Макмілін наогул сцвярджае, што «ў краіне, відавочна, амаль зусім не ўзнікалі ідэі рэфармавання. У Беларусі не было «адлігі» як такой, і, вядома, не было такой хуткай рэакцыі на смерць Сталіна, як у Расіі. Не было і значных літаратурных твораў ліберальнага накірунку, якія б сімвалізавалі ці ўвасаблялі новы настрой у краіне». Але больш слушнай падаецца думка Уладзіміра Глыбіннага: «Паслясталінскі перыяд у беларускай савецкай культуры набывае ўсё больш складаны характар з прычыны змагання ў ёй супярэчлівых тэндэнцыяў. Некаторыя палёгкі ў ідэалагічнай галіне даюць магчымасць ажыўлення тэндэнцыяў да беларускага нацыянальнага зместу. Разам з тым на перашкодзе стаіць ранейшы партыйны канфармізм, які вымагае безумоўнага падпарадкавання ўсёй культуры мэтам партыйнае палітыкі. Прынцып партыйнасці, праўда, пачаў разумецца не

гэтак вузка, як гэта было ў часы сталінскага культу асобы». Сапраўды, менавіта «падпарадкаванасць культуры» доўгія гады яшчэ вызначала асноўныя рысы яе твару. Праз гэтую ж падпарадкаванасць тыя творцы, якія дазвалялі сабе не зважаць на норму і правіла, прымушаны былі цярпець папрокі цэнзараў, непрыемнасці ў выдавецтвах альбо мастацкіх саветах. Свабоднае мастацтва пакрысе рабілася непублічным, сыходзіла ва «ўнутраную эміграцыю», што паспрыяла яго дыстыляцыі і падрыхтавала новы разлом другой паловы 1980-х гадоў, калі відавочным стала несупадзенне двух полюсаў.

Першая кніга Міколы Купрэева складалася з трох частак (без загалоўкаў у раздзелах). Умоўна назавём іх «Я» (экзістэнцыйная, скажам так, лірыка — эстэтычная праграма маладога паэта, а таксама вершы-ўспаміны), «Беларусь» (грамадзянская, патрыятычная лірыка), «Яна» (інтымная лірыка). Ва ўмоўны раздзел «Беларусь» уключана адзіная ў зборніку паэма — «Арыніна студня». Сама ідэя кампазіцыйнасці кнігі была сярод шасцідзясятнікаў даволі папулярнай. Відавочна, крыху зніжаныя, тут праяўляліся традыцыі сімвалістаў.

Зразумела, што ў «Непазбежнасці» не было такіх словаў, як «савецкі», «Ленін», «камсамолец», «камуніст», «партыя», «дружба народаў» і г. д. Пішу «зразумела», але па тым часе — вялікая дзёрзкасць для маладога паэта. Нават гранды змушаны былі пісаць «паравозы», каб тыя выцягнулі на варштат рукапіс кнігі.



• *Мікола Купрэеў*

Але каб такі верш з'явіўся, адразу б запахла фальшам.

Верш «Непазбежнасці» сапраўды па-за тым вывераным, дыялектычна-матэрыялістычным светам. Ён увесь у свеце духоўным (душэўным?). Рэчаіснасць для паэта — загадкавая, таямнічая, яе можна толькі адчуць, але не вызначыць тэрмінам. Вечны «адрыў літаратуры ад жыцця», вечныя пакуты ад несупадзення ўласнага ідэальнага свету са светам рэальным, але, нягледзячы на гэта, празарэнне і ў рэальным свеце водбліскаў нерэальнага.



Ранняя паэзія Міколы Купрэева — радасная, узнёслая, рамантычная. Як асаблівы каларыт яго лірыкі таго часу Уладзімір Калеснік вызначыў «спантаннасць выяўлення абвостраных пачуццяў чалавека, які чамусьці перанатужыў сваю эмацыянальнасць, і яна ўжо не вяртаецца да колішніх нармальных дыяпазонаў». Трэба адзначыць, што эстэтыка і паэтыка «Непазбежнасці» пэўным чынам нагадвае эстэтыку і паэтыку «маладнякоўцаў» і «ўзвышэнцаў». Як і ў іх, эмацыянальнасць Міколы Купрэева часцяком засноўваецца на публіцыстычным пафасе.

Заўважаюцца ў зборніку і пэўныя праявы максімалізму, павучальнасці. Галіна Каржанеўская так пісала пра Міколу Купрэева: «Ён цалкам адкрыты для людзей і трошкі мараліст (што не дзіўна для настаўніка па прафесіі). Адсюль і дзеясловы загаднага ладу: «будзьце прамымі», «любіце» і г. д.». Падобная дэкларатыўнасць была выключна характэрная для шасцідзясятнікаў наогул. І не толькі ў творчасці. Апошнюю яшчэ можна абвінаваціць у следаванні за ідэалагічнымі ўстаноўкамі. Аднак «стратэгія паводзін» шасцідзясятніка таксама грунтавалася на дэкларатыўным непрыняцці зла. Вельмі добра гэтая палкая вера ў чалавека паказаная ў ранняй расійскамоўнай аповесці Міколы Купрэева «Бродят на рассвете юные».

Скажу пра яе колькі словаў, бо твор гэты не аб'яўляўся ў друку, а сам аўтар у размове з Леанідам Галубовічам нават завяраў, што адзін з прыяцеляў паліў рукапісам аповесці печ.

«Бродят на рассвете юные» — першы буйны празаічны твор Міколы Купрэева. Спачатку ім быў напісаны шэраг апавяданняў (два-тры былі апублікаваны ў альманаху «Советская Отчизна» — папярэдніку часопіса «Нёман»). Аповесць была адрэдагавана Янкам Брылём і адпраўлена аўтару на дапрацоўку. У часе купрэеўскіх вандраванняў

яна згубілася. Аднак захаваўся, відаць, першы, няпоўны варынт яе (у рукапісе не хапае заключэння). Цяпер рукапіс захоўваецца ў Ганцавіцкім краязнаўчым музеі.

Можна назваць гэтую аповесць першай у цыкле аўтабіяграфічных аповесцяў Міколы Купрэева ці нават прапушчаным звяном у гэтым цыкле. Паміж аповесцямі «Дзіцячы гульні пасля вайны» і «Імгненне светлае» (бадзянне пасля выгнання з універсітэта) якраз маецца прагал, які і запаўняе «Бродят на рассвете юные». Гэта твор пра студэнцтва Купрэева (ён, як вядома, штудыяваў філалогію ў Берасцейскім педагагічным інстытуце). Некаторыя з сітуацый аповесці наўпрост адсылаюць да мадэлі паводзін шасцідзясятніка. Скажам, насельнікі інтэрната змаўляюцца не зачыняць дзверы ў пакой, бо прыйшоў час, калі ніхто нічога красці не будзе. Пра гэтую змову ведае ледзь не ўвесь універсітэт, і да пары да часу нічога кепскага сапраўды не адбываецца. Па начах вядуцца гарачыя спрэчкі на маральна-філасофскую тэматыку. Аднак «у адзін цудоўны дзень» з пакоя знікае дарагая рэч — фотаапарат. Праз што духоўнае адзінства і сяброўства студэнтаў распадаецца.

Усё гэта нагадвае стужкі Марлена Хуціева: Мікола Купрэеў апісвае свой час досыць дакладна.

Акрамя заглыбленасці ў этычную праблематыку, тут добра паказаная імпульсіўнасць героя. Гэтак жа, як і персанаж фільма «Застава Ільіча» спыняе аўтобус і кідаецца за ўбачанай незнаёмкай праз увесь горад, герой аповесці Міколы Купрэева едзе ў мястэчка, дзе жыве дзяўчына, якая здавала разам з ім уступныя экзамены, але ў студэнты не патрапіла. Лірычны герой праходзіць нямала складаных сітуацый, каб дазнацца адрас незнаёмкі, убачыць яе і… прамаўчаць аб сваіх пачуццях.

Вось гэтая пагоня за незнаёмым яшчэ пачуццём, «за вобразам, які толькі варухнуўся» (Т. Ружэвіч), бадай, вытлумачвае і падыход Міколы Купрэева да літаратуры. Яна для яго, як для праверанага шасцідзясятніка, была



толькі спосабам расказаць пра жыццё — таемнае, няўлоўнае, магчымае.

Жыццё як тэкст. Тэкст як жыццё.

***Аляксей БЕЛЫ***

# Непазбежнасць правінцыйных фантазій

*(Успаміны пра Міколу Купрэева)*

З надыходам халадоў з нейкай асаблівай вастрынёй пачынаеш усведамляць, што зноў не ўсё зрабіў, не ўсё паспеў. І гэта зусім не разуменне таго, што не пасаджана дрэва ці не перакопаны грады. Зрэшты рэшт зноў прыйдзе вясна, падаўжэе дзень, з’явіцца больш вольнага часу і ўсё будзе дагледжана. Восеньскі сум прыходзіць з іншых прычын: не паспеў запісаць бацькавы аповеды пра жыццё — пра вайну, пра тое, як заганялі ў калгас, як вымушалі касіць на дзясятую капіцу…

А між тым столькі пісаў пра іншых…

Не паспеў з’ездзіць у вёску Лясная, што ў Баранавіцкім раёне, дзе дажываў свае апошнія дні ў доме для састарэлых цудоўны беларускі паэт Мікола Купрэеў. А цяпер яны — мой бацька Ілля, які ўсё жыццё выцягваў жылы на цяжкай вясковай працы, а ўначы слухаў па радыёле «Латвія» Голас Амерыкі, і Мікола Сымонавіч, якога шануюць усе тыя, хто шануе беларускае Слова, — ляжаць на кладах у маёй роднай вёсцы Міхнавічы, што ўжо даўно зраслася з Івацэвічамі. Іх магілы аддзяляе крокаў семдзесят, не болей.

Пра Міколу Купрэева я пачуў упершыню ў канцы пяцідзясятых-пачатку шасцідзясятых ад яго бацькі Сямёна Іванавіча, які быў маім першым настаўнікам. Тады ў

Міхнавічах яшчэ існавала пачатковая школа на чатыры класы, у якой займалася крыху больш за дваццаць вучняў. У невялічкім пакойчыку ў два рады стаялі парты, на сценах віселі карты і іншыя наглядныя дапаможнікі. Трэці і чатвёрты класы займаліся ў першую змену, другі і першы — таксама разам — у другую. На другой палове дома жыла сям'я настаўніка, Сямён Іванавіч і яго жонка — мачыха Міколы Купрэева, якую мы называлі *цёцька* (маці Міколы ў вайну забілі немцы). Цётка Марыя прыбірала ў пакоі і ў калідоры, а таксама заварвала нам гарбату. Апроч службовай кватэры і класа ў доме была і маленькая баковачка, дзе знаходзілася бібліятэка.

Кожную восень мы зграбалі пад велізарнымі клёнамі, якія раслі вакол школы, лісце і рабілі з яго «прызбу" — каб было трошкі цяплей. Маразы ў часы майго дзяцінства даходзілі да мінус трыццаці пяці градусаў. Увогуле сядзіба, дзе месцілася наша школка і быў цудоўны сад, раней належала пану Сіліцкаму, які пасля прыходу Саветаў у 1939 годзе вымушаны быў з'ехаць у Польшчу. У часе Вялікай Айчыннай вайны ў гэтым доме, які стаяў на самым ускрайку сяла, недалёка ад лесу жылі нашы вяскоўцы. Тут, на вялікім двары з калодзежам, дзічкай каля яго і, стаўшым ужо калгаснай стайняй, велізарным цагляным хлявом, праходзіла пасляваеннае дзяцінства і юнацтва Міколы Купрэева. На жаль, цяпер ад той сядзібы, дзе жылі Купрэевы, амаль нічога не засталося. Толькі старая дзічка і парушаны калодзеж. На месцы, дзе стаяла школа, з адабранага некалі ў майго дзядзькі Аляксея хлява, складзенага з моцнага смалістага дрэва, улады зрабілі вясковую краму.

У час майго навучання ў гэтай пачатковай школе ў нас яшчэ не было святла, калі ў Міхнавічы прывозілі кіно, то круцілі яго менавіта ў школе. Завешвалі плакатамі вокны, запускалі на вуліцы рухавічок, які кінамеханік прывозіў з сабою — вось яна, дзея! Калі не ўдавалася патрапіць у залу, мы, дзятва, стараліся хоць нешта ўбачыць з вуліцы, праз шчыліны паміж плакатамі. Кінамеханік Коля, узброіўшыся кавалкам тоўстага кабелю, пільна цікаваў за намі, калі хто не паспяваў уцячы — апярэзваў гэтым ізаляваным дротам па спіне і ніжэй...

Завочнае знаёмства з Міколам Купрэевым адбылося менавіта ў сценах нашай школкі. Як ганарыўся тады наш настаўнік Сямён Іванавіч, які тады ўвесь час хадзіў у паўвайскавой фуражцы і паказваў нам баявыя раненні, сваім сынам!

Пасля інстытута Мікола настаўнічаў. Усё ў яго было цудоўна! Сям'я, праца. У шасцідзясятыя ён шмат друкаваўся, менавіта тады пабачыла свет яго першая кніжка вершаў «Непазбежнасць». Купрэеў-старэйшы не проста расказваў нам пра сына. На ўрок малявання ён прыносіў дзіцячыя работы Міколы, якія старанна захоўваў, і мы з задавальненнем перамалёўвалі гэтыя сюжэты. Добра помню адзін з тых малюнкаў, які называўся «Апошні». На альбомным лісце была размешчана постаць марака, які стаяў на палубе з забінтаванай рукой і корцікам у другой. Дэталяў на малюнку было няшмат. Але нечым ён уразіў і запомніўся. І нават цяпер стаіць перад вачыма.

Потым, калі я падрос, з Міколам Купрэевым завязалася перапіска. Ён тады быў літкансультантам у абласной газеце «Заря», а я дасылаў туды свае вершы. Зрэшты, глядзячы на гэта цяпер, разумееш, што вершамі тое, што я тады рыфмаваў, можна было назваць з вялікай нацяжкай. У юнацтве я шмат чытаў Ясеніна, і яго ўплыў на маю творчасць адчуваўся. Хутчэй не ўплыў — пераймание. Вядома, водгукі Міколы на маю творчасць былі не заўсёды станоўчымі, за што я яму вельмі ўдзячны. Шкада, што ў юнацкія гады мы не збіраем архівы. Ішоў час. Я папрацаваў на Поўначы матросам, паступіў у інстытут воднага транспарту ў Ленінградзе на штурманскае аддзяленне, потым кінуў ВНУ, адслужыў у войску ў Венгрыі, пахадзіў некалькі гадоў па рэках Беларусі ў якасці памочніка ка-

пітана, у 1977 годзе пераехаў з Пінска, дзе пражыў амаль пяць гадоў, у Баранавічы.

Менавіта тут, калі пачаўся мой аседлы вобраз жыцця, з'явілася магчымасць больш сур'ёзна займацца літаратурнай творчасцю і часцей сустракацца з тымі, чые імёны ў Беларусі ўжо добра ведалі ў творчым асяроддзі: Данута Бічэль, Мікола Пракаповіч, Алесь Каско, Леанід Галубовіч, Мікола Федзюковіч, Мікола Купрэеў...

Помніцца, сустрэліся ў чарговы раз з Купрэевым у Брэсце на нейкай імпрэзе, і я папрасіў яго падпісаць тую, першую, кніжку Міколы, яго «Непазбежнасць», якую мне пашчасціла набыць у кнігарні ў вёсцы Сноў, што на Нясвіжчыне. *«Дзе ты яе выпараў?»* — спытаў тады Мікола. Потым напісаў на кнізе некалькі шчырых слоў.

Гісторыя гэтага зборніка цікавая тым, што праз некаторы час, калі паэт Купрэеў жыў на Ганцаўшчыне і працаваў у Малькавіцкай школе, я атрымаў ад яго ліст з просьбай прыслаць тую самую кніжку з яго аўтографам. *«Ніхто не верыць тут, што ў мяне выйшаў зборнік вершаў. Вышлі мне яго»* — пісаў ён. Шкада было развітвацца з такой рарытэтнай рэччу, але я пераслаў Міколу гэтую кніжку з яго аўтографам для мяне.

На той час ён пагубіў ці пазабываў у цягніках і аўтобусах шмат што са сваіх папер, дакументаў і хацеў хоць нешта са свайго архіва адрадзіць і вярнуць. Быў час, калі кніжка «Непазбежнасць», у якой была змешчана фатаграфія паэта, з'яўлялася для яго нечым накшталт пашпарта ці пасведчання асобы. Ён шмат тады вандраваў па Беларусі. Мілавіды, Ганцавічы, Рагачоў. То ў сяброў у гасцях, то ў калег, то ў доме адпачынку. Дарэчы, менавіта Рагачоўшчына, вёска Ямнае — яго малая радзіма.

Жывучы на Ганцаўшчыне, Мікола выкладаў у Малькавіцкай школе беларускую мову і літаратуру. Хату ён здымаў на беразе ці то рачулкі , ці то канавы, зусім недалёка быў лес. Як успамінае Віктар Гардзей, сустракаліся яны там неаднаразова. Бачыліся на пахаванні Васіля Праскурава,



дзе Мікола чытаў свой верш «Лістапад». А аднойчы, калі Віктар спазніўся на цягнік на Мінск, на станцыі ў Ганцавічах, ён сустрэў Купрэева. Паехалі ў Малькавічы. Гэта быў 1987 год, вечар, калі ў школах праходзяць выпускныя балі. Віктар заўважыў, што ў хаце Міколы амаль па ўсіх кутках былі раскладзены велізарныя кавалкі сала. На зацікаўлены позірк сябра Купрэеў патлумачыў, што гэта бацькі вучняў, клапоцячыся пра настаўніка, думаючы, што яму няма чаго есці, прыносяць такія падарункі. Пасля афіцыйнай часткі мерапрыемства, віншавання выпускнікоў, мужчынская палова настаўнікаў і гасцей сабралася ў садзе каля дома, дзе жыў Мікола. *«Спявалі песні да ранку* — расказвае Гардзей. — *Назіралі, як узыходзіла чырвонае сонца»*.

На наступны дзень узнікалі праблемы з апахмелкай — не было дзе ўзяць гарэлкі , а ўсе «запасы, якія меліся ў колбах у школьных кабінетах, былі знішчаны» яшчэ з вечара. Выручыў старшыня сельсавета, які даў адпаведную паперку, і «пітво ў краме адпусцілі». Гасцей прымаць Мікола ўмеў і любіў. Збіралася да яго ў Малькавічы, па словах Віктара Гардзея (яна яму пра гэта гаварыла), і Яўгенія Янішчыц. Не даехала. Як расказвала адна з каляжанак Купрэева, потым, з'ехаўшы з Малькавічаў, ён пісаў туды лісты — вучням, настаўнікам. Некаторыя з іх захаваліся.

А жыццё працягвалася. Адносіны з бацькам на той час у Міколы сталі проста ніякімі. Пры нашых сустрэчах ён пра блізкіх не згадваў. Ды і Сямён Іванавіч, калі я бываў у роднай вёсцы і забягаў да яго на хвіліну-другую, каб пагаварыць ці пакінуць сваю чарговую кніжку вершаў, старанна абмінаў у размовах тэму сына.

Я расказваў яму пра сустрэчу з Міколам, а ён мне — пра сенакос, пра тое, як гадуюцца яго трусы, пра здароўе... Міколавы шляхі тады не пралягалі праз дом бацькі, які жыў з жонкай ужо ў новай цаглянай будыніне, на другім канцы сяла, у якой месціліся яго кватэра, школа, клуб.

А мы з Міколам бачыліся. Ён часцяком заязджаў на бабаўняны камбінат, дзе я працаваў рэдактарам шматтыражнай газеты, у маім маленькім кабінеціку мы папівалі «чарніла», закусваючы таннай каўбасой і агуркамі. Гэта былі цікавыя часы. Перабудова, забарона на алкаголь, бясконцыя чэргі за «пітвом». Каб набыць патрэбнае, я вымушаны быў звяртацца да афіцэра міліцыі — яны рабілі гэта без чаргі. Чаму мы пілі менавіта «чарніла»? Рэч у тым, што Міколу было цяжка хадзіць, ён кульгаў, а я жыў тады за 15 кіламетраў ад Баранавічаў — і не заўсёды была магчымасць без праблем туды дабрацца і ўзяць яго з сабой. Таму мы выбіралі такія напоі, якія нам падаваліся «лёгкімі».

Мікола расказваў пра свае паездкі, пра тое, як адпачываў у санаторыі, як заязджаў (калі гэта здаралася) у такі блізкі нам Івацэвіцкі раён, аб чым пішацца...

Зрэшты, пра гэта можна прачытаць і ў яго цудоўнай прозе. А аднойчы ён расказваў, дзе лепш за ўсё ў Івацэвічах піць віно, каб не нарвацца на міліцыянта, не «заляцець». Гэтым месцам ён лічыў курылку ў райкаме партыі. *«Паставіш на падваконнік сакваяж, у якім раскаркаваная пляшка і шклянка, нальеш, вып'еш, сціснеш «пашчэнкі» сакваяжа — стаіш сабе, пакурваеш, — расказваў ён. — Ніхто не замінае, не турбуе. Цішыня! Потым — яшчэ разок, яшчэ»*. Насамрэч, тады ва ўстановах улады і міліцыянтаў не трымалі, людзей было значна менш.

Наш тлумны век пакідае ўсё менш часу на разважанні, на сустрэчы з сябрамі, на тое, каб проста сесці і пагаварыць. Калі Мікола жыў у Папялёве на Пружаншчыне, вельмі хацелася да яго з'ездзіць. І рэдактар мясцовай раёнкі, паэт Мікола Антаноўскі, запрашаў, казаў: прыязджай з сваіх Баранавіч — махнём у вёску да Купрэева. Наведаць той стары, але моцны дом асадніка, зроблены з пушчанскай сасны, дзе ў Міколы быў пакойчык на другім паверсе і куды яму так цяжка было падымацца, тады не атрымалася. І потым, калі Купрэеву мясцовыя ўлады далі ў Пружанах кватэрку, а я аказаўся ў гэтым горадзе па справах, сустрэцца з Міколам зноў не ўдалося. Здавалася, часу яшчэ досыць, усё паспеецца.



Праз нейкі час, прыехаўшы да маці, я сустрэў у Івацэвічах знаёмага журналіста, які паведаміў, што Купрэеў захварэў, трапіў у дом для састарэлых у Баранавіцкім раёне, вельмі слабы. Думаю, пад'еду, пагутару, вазьму з сабою яго другую кніжку «Правінцыйныя фантазіі», што была ўхвалена камісіяй на Дзяржаўную прэмію, якую ён так і не атрымаў — скончылася перабудова, змяніліся часы і норавы.

Праз пару дзён (было гэта ў верасні 2004-га) я патэлефанаваў маці.

*«Памёр твой друг»,* — сказала яна.

*«Хто?»*

*«Сын Сямёна, Мікола»*.

Пра тое, што трошкі раней не стала бацькі Міколы, Сямёна Іванавіча, а потым, праз два з нечым месяцы, і яго жонкі, я ўжо ведаў.

Так сталася, што ўсе яны памерлі напрацягу аднаго года і пахаваны на адных, нашых, міхнавіцкіх могілках. Праўда, нехта распарадзіўся (ці наказваў суродзічам): у зямлю бацьку і сына паклалі чамусьці не побач, а воддаль, хаця месца каля магілы Сямёна Іванавіча і яго жонкі хапае да гэтай пары.

Час ад часу ўстаўляю ў музычны цэнтр касету з песнямі брэсцкага барда Вольгі Сідарук. І льецца з дынаміка гітарная мелодыя, гучаць пранікнёныя і шчырыя словы.

Па чорнай ночы скача белы конь,
Па тумане цёплым скача.
Грыву рве халодная далонь,
Перапёлка ў жыце плача.

Гэта — з кнігі Міколы «Правінцыйныя фантазіі».

Між тым афіцыйнай адзнакі за свой талент і сваю творчасць сапраўдны беларускі паэт Мікола Купрэеў пры жыцці ўсё ж дачакаўся. Прадпрымальнік з Пружаншчыны Мікола Папека заснаваў Берасцейскую мядовую літара-

турную прэмію. Пры ўручэнні дыплома за дасягненні ў галіне літаратуры Папека ўручае пераможцу яшчэ і пуд мёду. Такую прэмію Мікола Купрэеў, пад віншаванні калег і сяброў, атрымаў...

Ён заўсёды жыў па-свойму. Ні да каго не падладжваўся, ні перад кім не ўкленчваў (хіба толькі перад цудоўнай жанчынай). Так, пэўна, і трэба Творцу.

Нават помнік на яго магіле, а дакладней, камень, з якога гэты помнік зроблены, мае сваю гісторыю. Гэта была невялікая частка мемарыяла Брэсцкай крэпасці. Але, калі на ім высякалі літары, была дапушчана памылка. У фразе «В этом месте» — «Вэтом» напісалі разам, таму камень звезлі на прадпрыемства, дзе выраблялі надмагільныя пліты. А Мікола Папека з сябрам набылі яго, з вялікай цяжкасцю, ледзь не паламаўшы прычэпчык аўтамабіля, даставілі дамоў, і потым гэты камень стаў асновай для помніка Купрэеву.

...А кніжка тая, «Непазбежнасць», якую Мікола Купрэеў мне некалі падпісаў, знайшлася. Я даведаўся пра гэта, калі рыхтаваў артыкул. Яе захаваў Мікола Антаноўскі. Праўда, яна «прыйшла» да яго ўжо без вокладкі.

І ёсць у ёй той запаветны для мяне аўтограф:

*«Дарагі зямляча Алёша Белы!*
*Дзякуй, што ты расцеш, робіш добрую справу.*
*Верыцца вельмі ў цябе!*
*Мікола Купрэеў.*
*1 красавіка 1986 г., г. Брэст».*

Вершы ў кніжцы такія цудоўныя, такія напеўныя і шчырыя.

Калі расцвітаюць кветкі —
вы іх не тапчыце,
калі жаўранак у горле нясе зару —
вы лепш памаўчыце,



калі вас абдымаюць, цалуюць і шэпчуць —
любіце, любіце, любіце!
Калі душа перапоўніцца шчасцем —
вы песняй крычыце!
Я хацеў вам сказаць.
О, я многа хацеў вам сказаць!

Дарэчы, гэтыя, апошнія словы, выбіты золатам на камяні, што ўсталяваны на магіле Міколы Купрэева.


• *Мікола Купрэеў з жонкаю Таццянаю*

А ён ужо ў свеце іншым, і, хочацца спадзявацца, у свеце лепшым. Ён шмат што прадчуваў і прадказваў. У тым ліку, як і многія з паэтаў, сваю смерць. І менавіта ў сваёй «Непазбежнасці», якая пабачыла свет у далёкім 1967 годзе, калі яму было толькі трыццаць гадоў.

І пайду да светлых я вытокаў,
як той вольны, ваяўнічы, мірны смерд,
аж пакуль не стрэне на гары высокай
мяне другая непазбежнасць — смерць.



• *Школьнік Аляксей Белы (у апошнім радзе трэці справа). 1962 год. У цэнтры — настаўнік Сямён Іванавіч Купрэеў, бацька Міколы*

Пэўна, смерць і стрэла яго ля светлых вытокаў, пра якія ён ніколі не забываў, на высокай вяршыні. Няхай не Славы, але Майстэрства і Таленту — дакладна.

Перачытваю цудоўную прозу Міколы Купрэева, яго «Лісты з млына», дапісаныя ў снежні 2003 года,

Лісты да Жанчыны, прасякнутыя каханнем і жалем: *«Над рэчкай, над чаротам, — паўзе светлы туман. А што там у вас за вокнамі? Працягваю табе руку праз туман. Бывай»*.

Усё яшчэ не верыцца, што Міколы больш няма. Няўжо болей ніколі не пабачымся?..

***Святаслаў КАЖАДУБ***

## Дзве апошнія сустрэчы з Міколам Купрэевым

Дзесьці ў ліпені 1995 года, ідучы з дома па вуліцы Дзяржынскага ў Івацэвічах, я нечакана сустрэў Міколу Купрэева. Ён кіраваўся ў бок чыгуначнай станцыі: у адной руцэ кульба, у другой — нейкі скрутак. Павітаўшыся, Мікола спытаў:

— А ведаеш, Слава, што гэта ў мяне?

— Відаць, нейкі часопіс, — выказаў здагадку я.

— Так, так. Часопіс. І вельмі мне дарагі. Тут, Слава, змешчана мая першая аповесць на роднай мове. «Дзіцячыя гульні пасля вайны». Мы з табой перажылі вайну. Я згубіў маці, ты — бацьку і брата. І мы павіннны разумець адзін аднаго. Мы ж амаль равеснікі...

Разгарнуўшы часопіс (а гэта была «Крыніца»), ён пачаў чытаць урыўкі з аповесці. Міколу цяжка было стаяць, і мы звярнулі ў падворак Леаніда Русака, што знаходзіўся побач, прыселі на лаўку. Купрэеў, чытаючы ўрыўкі, успамінаў, як працаваў над аповесцю ў Вярховічах.

— Я доўга думаў над сюжэтам, прыкідваў, з чаго лепш пачаць, — казаў Мікола. — Часта сядаў за стол, схіляўся над чыстым аркушам — і так надоўга застываў у нейкім незразумелым чаканні. Думак было многа, галава кругам ішла, а на паперы — ні радка. Праз колькі дзён, лежачы ў ложку, я доўга не мог заснуць. Ужо мой сусед па палаце дае храпака, а я ляжу, думаю. Ужо і гімн па радыё прагучаў. Ліпеньская ноч кароткая, вось-вось пачне світаць, а я не сплю. Ціха злез з ложка, насунуў на ногі тапці, узяў са стала ручку і паперу, зачыніўся ў ваннай і напісаў першыя радкі: «Калі мужчыны ўзялі ў рукі рыдлёўкі і сталі засыпаць маму зямлёй, я пабег між магілаў, між крыжоў на край кладаўя, у лес...».

— Пэўна, ты не паверыш, Слава, — працягваў ён, — першыя старонкі былі са слязамі. Яны самі капалі на паперу. Было адчуванне, што перанёсся ў сваё маленства і плачу, як тады. Першыя старонкі гэтай аповесці з'явіліся на свет раннем 29 ліпеня мінулага года...

Мікола запаліў, памаўчаў. Відаць, і цяпер гэтыя ўспаміны растрывожылі ягонае сэрца, бо, гаворачы, ён часцей стаў заікацца, а гэта прыкмета таго, што мінулае зачапіла за жывое і трэба нейкі час, каб узяць сябе ў рукі, супакоіцца. У Купрэева гэта атрымлівалася не адразу.

— Слухай, Мікола, — нарэшце я парушыў маўчанне, — а як пісалася далей?

— Ды як сказаць?.. Па-рознаму. Часам наступала нейкае прасвятленне. І пісалася лёгка, з ахвотай сядзеў за сталом ці на ложку, альбо ў альтанцы ля бальніцы. А бывала і дзень, і другі не выціскаў ні радка. Нейкая *пламета* на мяне находзіла, ачмуранасць, і я нічога не мог рабіць, апроч як ляжаць і думаць...

Пагаманіўшы ўжо аб справах надзённых, Купрэеў на развітанне сказаў:

— А ведаеш, Слава, колькі ў мяне будзе аповесцей з майго жыцця-быцця? Не ўгадаеш. — І сам адказаў: — Восем ці дзесяць...

А потым нейк скрушна дадаў:

— Толькі б паспець...

— Чаму ж у цябе такі сумны настрой? — запытаў я.

— Сам бачыш, здароўе — пшык... На адным энтузіязме трымаюся. — І зноў паўтарыў: — Толькі б паспець...

Не зважаючы на свае хворасці і розныя балячкі, Мікола працаваў і працаваў. Відаць, творчая праца стымулявала і доўжыла ягонае жыццё, давала дадатковыя сілы, каб перамагаць боль, а часам і забываць пра яго. Купрэеў стрымаў сваё слова. Тое, што ён тады задумаў і абяцаў, — здзейсніў. Паставіўшы кропку напрыканцы чарговага твора, ён зноў быў апынаўся ў палоне новых задум і новых планаў. Пра гэта я спярша даведаўся з пісьма, якое ён даслаў 12 красавіка 2003 года з Вярховічаў сваёй сястры Валі ў вёску Вялікая Гаць, што ў Івацэвіцкім раёне: «А яшчэ я таму тут, што задумаў новую прозу. А для прозы патрэбны строгі бальнічны рэжым, светлая галава, ні «грамулькі". Гэта паэзію (чым дурнейшую, тым цікавейшую) можна іншым разам рабіць і на захмеленую галаву...»

На жаль, новую прозу ён не паспеў нават распачаць, хоць і рыхтаваўся (пра свае асобныя планы-задумы Мікола расказаў мне пазней). Але пра тое гаворка будзе далей.

...Сярэдзіна верасня 2003 года. Як помню цяпер, была субота. Жонка папрасіла мяне, каб схадзіў на рынак і купіў тое-сёе з харчоў. Там я трохі затрымаўся, снoўдаючы ад палаткі да палаткі. Сустрэў знаёмага з Целяхан, пагаварылі... Словам, затрымаўся гадзіны на дзве. А дома ўжо чакала жонка, бо назаўтра мы збіраліся ехаць электрычкай да дачкі ў Жабінку. А ў колькі паедзем, так і не вырашылі. Патэлефанаваў на чыгуначную станцыю, там адказалі, што білетная каса даведак не дае. Каб было хутчэй і надзейней, выгнаў з гаража сваю «капейку» і пакаціў на станцыю. Запісаўшы расклад руху цягнікоў, я намерыўся выйсці праз дзверы да чыгункі і зазірнуць у кіёск «Саюздруку». Падыходзячы да дзвярэй, я ўбачыў, што нейкі мужчына, падняўшы перад сабой газету, нешта ўважліва разглядае. Я міжволі павярнуў галаву і ўбачыў знаёмыя рысы твару.

— Мікола, ты?! — аклікнуў я.

Ён апусціў галаву і заўсміхаўся сваім амаль бяззубым ротам.



— А я цікаваў за табой, Слава, як толькі ты ўвайшоў у залу. Думаю, заўважыш мяне ці не? Заўважыў. От і добра. Прысядзь...

Я ўмасціўся ў крэсле. Мікола сядзеў з самага краю. Побач ля сцяны стаялі яго дзве мыліцы. З адной ён ужо дрэнна хадзіў, таму набыў яшчэ другую.

— А я табе з гадзіну назад тэлефанаваў, — працягваў размову Купрэеў. — У суседа-незнаёмца папрасіў мабільнік. Не адмовіў, што мяне здзівіла. Але ніхто не адказваў. Нумар помню яшчэ з часу тваёй працы ў рэдакцыі...

— Ну як, Мікола, жывеш, як змагаешся з хваробамі? — пачаў я з пытанняў.

— От, як бачыш, — і ён кіўнуў на мыліцы. — У Вярховічах цяпер лячуся. Адпрасіўся, каб прыехаць сюды. Цяжка цяпер мне на аўтобусах і цягніках ездзіць, асабліва садзіцца. І ўсё ж, думаю, паеду, мо апошні раз. А помніш, Слава, 95-ты, калі мы сядзелі ў падворку Русака?

— Вядома, помню. І абяцанне тваё не забыў, — нагадаў я.

— Дык вось абяцанне сваё, ну ты ўжо ведаеш, я выканаў. На гара выдаў восем аповесцяў. Так што чытай, не прапусці!

— Стараюся і ўжо большасць прачытаў, — адказаў я і запытаў: — А што ж далей?

— Спярша пра галоўнае, чаго я сюды прыехаў, — пачаў Купрэеў і пацікавіўся: — Ты з машынай тут ці не?

— З машынай, — адказаў я.

— Тады скажу: хачу пабываць у Міхнавічах, нешта карціць на бацьку глянуць, на хату, на вёску, дыхнуць там паветрам свайго юнацтва, а пасля можна і назад у Вярховічы...

— У чым справа, Мікола! Няма праблем. Паехалі...

Я дапамог яму падняцца, узяць пад пахі свае мыліцы, і мы патупалі да выхаду. Спусціліся па прыступках да плошчы. Пасля я падагнаў машыну, усадзіў Міколу на сядзенне каля вадзіцеля. Дарога да Міхнавіч заняла літаральна некалькі хвілін. Проста на падворак да былой школы, дзе

жылі Купрэевы, я заехаў адразу з шашы, бо ніякай агароджы там не было. Раней, праўда, і вароты, і веснічкі сталі. Гэта тады, калі ў левай палове знаходзілася школа. Калі яе не стала, тут месцілася друкарня райгазеты. Пасля яе расфарміравання сюды пасялілі людзей. Але ў правай палове па-ранейшаму жыў са сваёй другой жонкай Сямён Іванавіч, бацька Міколы.

Я адчыніў дзверцы машыны, і Мікола паціху выбраўся з салона, стаў, абапіраючыся на мыліцы. Стоячы ля машыны, я ўбачыў, як на акне, што выходзіла на двор, адхінулася фіранка і хтосьці выглянуў. А неўзабаве на падворку з'явілася Марыя Васільеўна, мачыха Міколы.

— А чаго табе тут трэба? — з ходу атакавала яна Міколу. — Бач ты, падкаціў на машыне...

— А мне нічога не трэба, — толькі і паспеў адказаць Мікола.

Выйшаў з хаты Сямён Іванавіч.

— Ну, здароў, сын-брадзяга, — з нейкай насмешкай вымавіў ён. — Што скажаш?

Але мачыха не дала Міколу адказаць бацьку.

— Хіба яму ёсць што сказаць нам? — пачала яна. — Глянь, Сенечка, што ён з сябе зрабіў? Цень адна, а не чалавек. А быў жа які хлопец! Во што робіць з людзьмі гэтае зелле...

— Бяда, калі няма галавы на плячах, — працягваў гаворку Сямён Іванавіч. — Казаў табе, што не сын мне будзеш, калі не паслухаеш. Не паслухаў, *дак* ідзі сабе, адкуль прыйшоў. Але ж трэба было б...

— Нічога не трэба. Ідзі, ідзі, — паддакнула мачыха. — Няма тут нічога твайго. І нікому ты не трэба...

Мікола стаяў, абапіраючыся на мыліцы, і моўчкі слухаў іх. Яны ж змянялі адно аднаго. Каб і хацеў Мікола што сказаць, дык яму не давалі і рота раскрыць.

— Ну, то бывайце, — раптам выціснуў з сябе Мікола, павярнуўся і ступіў да машыны. Я ўзяў мыліцы, адчыніў яму дзверцы і захлопнуў за ім.



Мачыха яшчэ штосьці гаварыла (праўда, не так гучна, як бывала ў маладосці), і, сядаючы за руль, я яшчэ пачуў: «Ідзі, ідзі!». І махала рукамі, нібы адганяла ад сябе нячыстую сілу. А Сямён Іванавіч стаяў на ранейшым месцы, нават не скрануўшыся, маўчаў. Развярнуўшыся ў двары, я ўбачыў, як Сямён Іванавіч выцірае хусцінкай слёзы. Відаць, нутром адчуў, што апошні раз бачыцца з сынам, і гэтая кароткая сустрэча, і такое бязглуздае расстанне данельга развярэдзілі яго душу. Так мне падалося.

І я не памыліўся.

У тым жа верасні мы з Сямёнам Іванавічам зусім выпадкова сустрэліся ў горадзе на малым рынку каля вакзала. Ён быў з веласіпедам, балелі ногі, а так ёсць апора, і сумку не трэба несці. Сказаўшы колькі слоў пра жыццё ды здароўе, Сямён Іванавіч цяжка выдыхнуў:

— От з Колем сустрэчы не атрымалася. Думаў, у хаце пасядзім, пагаворым. Марыя, як заўсёды, умяшалася. А я не ўзяў сябе ў рукі...

Апраўданне, хоць і запозненае, пачуў я тады ад Сямёна Іванавіча і зразумеў, што Міколаў бацька ўсё-ткі перажывае і не супраць пры новай сустрэчы неяк загладзіць сваю віну перад сынам. А калі яшчэ давядзецца ўбачыцца? Можа, на юбілей? Пра гэта я нагадаў Сямёну Іванавічу. Якраз праз чатыры месяцы, 13 студзеня 2004 года, старэйшаму Купрэеву павінна было споўніцца 90 гадоў.

— На юбілей абавязкова запрашу сына (у апошнія 30 гадоў Сямён Іванавіч не называў Міколу сынам за яго непаслухмянасць і бадзяжніцтва — *С. К*). Тады і пагаворым. І цябе, Рыгоравіч, загадзя запрашаю. Хацеў бы дажыць да гэтага дня...

Так, Сямён Іванавіч вельмі хацеў дажыць да свайго юбілею. На жаль, не ўдалося. Не выпала ўжо яму і з сынам пабачыцца, хоць гэтай сустрэчы ён вельмі чакаў. А тым часам Мікола загадзя з тых жа Вярховічаў паслаў бацьку паштоўку, у якой павіншаваў яго з Новым, 2004-м, годам,

і з блізкім юбілеем. Паштоўка прыйшла ў Міхнавічы праз два дні пасля пахавання Сямёна Іванавіча Купрэева.

Што ж здарылася? Расказала пра гэта Марыя Васільеўна, мачыха Міколы:

— 25 снежня пачаліся польскія Каляды. Як звычайна, я прыгатавала смачны абед, накрыла стол. Сямён Іванавіч быў у добрым настроі, хоць зранку, стогнучы, шмуляў па хаце. Але хутка супакоіўся. Селі за стол. Як вядзецца здаўна, на стале — паўлітэрка. Я сама наліла па стопачцы. Чокнуліся спярша за свята. І толькі Сеня стаў падносіць чарку да губ, як яна раптам выпала з яго рукі. Ён адхінуўся, галава ўпала на стол. Я закрычала. Прыехала «хуткая дапамога», але Сямён ужо не дыхаў...

...Калі мы ад'ехалі ад Міхнавіч, Мікола папрасіў спыніць машыну. Якраз справа ля дарогі раслі грушы-дзічкі, і мы схаваліся ў іх засені. Купрэеў прыадчыніў дзверцы, дастаў з кішэні цыгарэты, запаліў. Я бачыў, як ён хвалюецца, як дрыжаць у яго рукі, а вочы запаланілі слёзы.

«Хай супакоіцца, — думаў я. — Чаго лезці ў яго душу? Там і так трывожна. Хай лепш памаўчыць. Памаўчу і я...»

Але маўчанне было нядоўгім. Яго парушыў сам Мікола.

— Паслухай, Слава, — пачаў ён. — Гэта не споведзь і не апраўданне. Гэта паўтарэнне таго, што было. Так, я цяпер зусім хворы чалавек, няўдачнік, валацуга, як казаў бацька. Хто зрабіў мяне такім? Ты, вядома, не задумваўся, хоць, па-мойму, для цябе няма загадак, бо даўно ведаеш і мяне, і маіх бацькоў. На людзях яны добрыя, спагадлівыя, не раўнуючы — анёлы, хоць да раны прыкладвай...

Мікола замоўк, выпускаючы шызыя клубы дыму. Позірк яго быў скіраваны ўдалеч, у мінулае. І напраўду, загаварыў ён пра сваё дзяцінства.

— На ўсё жыццё запомніў я тую месячную вераснёўскую ноч, калі на возе ў труне ляжала мая маці, а я стаяў побач. Яна ляжала як жывая. З доўгай касой. Прыгожая... мёртвая. Я не мог і не магу забыць яе. Калі бацька адразу ўгаворваў, а пасля змушаў называць мачыху мамай, я альбо плакаў, альбо зашываўся ў куток і маўчаў. Інакш, як мачыха, я яе так і не назваў. Сястра Валя тады была яшчэ малой, таму хутка прывыкла і стала мачыху называць мамай. Я не пярэчыў, хай будзе так. Падрасце, сама зразумее, што да чаго. Так яно і было.

Калі ты чытаў мае «Гульні...», то заўважыў, што бацька і наша мачыха жылі не ў добрым ладзе, сварыліся, біліся, а пасля мірыліся. Ім было не да нас, дзяцей. Круты, наравісты характар у майго бацькі. А Марыя з маладосці не паддавалася яго ўладзе, а пазней і сама над ім уладу займела. Чаму я так гавару? Раскажу табе пра адзін выпадак. Я пра яго мала каму расказваў. Ведаюць яшчэ сястра Валя і сваякі маёй мамы на Рагачоўшчыне. Дык слухай. Ужо ў дзясятым класе я падумваў аб паступленні ў інстытут. Дый бацька не раз казаў: быць мне настаўнікам, як і ён. Неяк у нядзелю, калі бацька з жонкай падаліся ў горад, я рашыў паглядзець сваё пасведчанне аб наражэнні. Знайшоў яго сярод бацькавых дакументаў, прачытаў, адклаў убок. У другім стосіку былі Валіны метрыкі. Але падаліся яны нашмат навейшымі за мае. Гэта зацікавіла. Я стаў чытаць. У графе «маці» было напісана — Купрэева Марыя Васільеўна. Мяне аж скаланула. З якой такой прычыны мачыха стала роднай маці маёй сястры?! Падробка, падман! Я не знаходзіў слоў для свайго гневу і абурэння. Каб у той час побач быў бацька, я не ведаю, як бы я сябе паводзіў. Мабыць, сарваўся б і нагрубіў бы. Але бацька з мачыхай з'явіліся толькі пад вечар. Я ўжо астыў, спакойна падышоўшы да бацькі, паказаў Валіны метрыкі і спытаў: «Чаму ж сястрыну маму падмянілі?». Бацька, пэўна, не чакаў ад мяне такога «адкрыцця». У адзін момант яго губы затрэсліся, твар пачырванеў. Ён адразу не знайшоў, што сказаць, а пасля ажно зайшоўся ад крыку: «Какое твое сраное дело влазить в документы?! Какое ты имеешь право?!» І пайшло, і паехала. Пачуўшы гвалт, прыбегла мачыха. Даведаўшыся, чаму яе Сенечка сварыцца на сына,

і сама «завялася». Я выскачыў з хаты як апараны і ў тую ноч дамоў не прыйшоў, заначаваў у свайго аднакласніка. Ды мяне ніхто й не шукаў...

Мікола трохі памаўчаў, запаліў чарговую едкую «астру». Расказваючы пра набалелае, вядома, хваляваўся, перажываў. Пазней, калі я рыхтаваў нататкі пра яго жыццё і творчасць, мне патрапіў у рукі сшытак з запісамі Міколавага бацькі. Я зразумеў, як сур'ёзна ўспрынялі на Рагачоўшчыне родныя Галіны, маці Міколы, вестку, што іх сваячка Валя, Галіна дачка, запісана на мачыху.

«Николай у Вали обозвал скверностями Марию и сказал — в Викове ей повыкалывают глаза». Гэты запіс датуецца 5 чэрвеня 1983 года.

Супакоіўшыся, Мікола сказаў:

— Прабач, што адабраў у цябе столькі часу. Але гэта я павінен быў расказаць. Ты добрай душы чалавек і мяне разумееш. Паўтаруся, майго бацьку і мачыху цікавіла найперш уласнае жыццё. А мы, дзеці, раслі як дзічкі. Магчыма, таму і фінал такі... А цяпер, Сяргей, мне на вакзал пара, цягнік мой хутка...

Да прыходу электрычкі на Брэст заставалася менш за гадзіну. Мы сядзелі на лаўцы каля вакзала. Перад тым я заскочыў у кіёск, прынёс у пакеце пячэнне, цукеркі, цыгарэты, бутэльку «Дварцовай». А наастатку спытаў у Міколы пра новую прозу, пра якую ён намёкам пісаў сваёй сястры Валі.

— Галава з вясны гэтым занята, — уздыхнуў Мікола. І мне падалося, што яму цяжка гаварыць. Але пытанне было зададзена, і Купрэеў мулка выцягваў з сябе словы: — Задумак многа. Я не ўсё расказаў пра сябе, пра родных, знаёмых, толькі невялікую частку. Чаго варта толькі адна вандроўка з Івацэвічаў да Пінска праз Целяханы, а пасля да Лунінца? Або паездкі да цёткі ў Растоў, на Рагачоўшчыну? Нічога я не расказаў пра жыццё ў Міхнавічах, пра вучобу ў Івацэвічах, пра «житие в изгнании», калі я напісаў пісьмо Хрушчову. А рэштам скажу вось што: мару накрэмзаць



яшчэ адну больш рамантычную і лірычную аповесць, чым «Лісты з млына». З чаго пачну — не ведаю. І ці пачну — таксама невядома. Сам бачыш, які я. Зусім нездаляшчы. Хаця, як ні дзіўна, на галаву не скарджуся...

Тым часам падышла электрычка. Я дапамог Міколу забрацца ў тамбур, падаў пакет з правіянтам, ніякавата і спешна сунуў у яго працягнутую для развітання руку «чырвонец»...

— Бывай, Слава. Дзякуй за ўсё, — ён паківаў мне спярша галавой, а пасля памахаў правай рукой...

— Добрай дарогі, дружа!

На вялікі жаль, гэта была мая апошняя сустрэча з Міколам Купрэевым.

*17 лістапада 2007 г., г. Івацэвічы*

***Віталь СКАЛАБАН***

## «Шчырая Шчара мая...»

*(Успаміны пра Міколу Купрэева)*

У юнацтве бываюць сустрэчы, пра якія помняць усё жыццё. Такой падзеяй для мяне стала сустрэча з Міколам Купрэевым на пачатку 1964 года ў Ляхавічах. Новы школьны будынак быў узведзены ў 1961 годзе, да XXII з'езда КПСС, і школу, здаецца, неафіцыйна, з лёгкай рукі нястомнага дырэктара Івана Пііпавіча Дзегелевіча называлі імем партыйнага з'езда, што абвясціў пра пабудову да 1980 года камунізму.

Будынак быў выдатны, са спартыўнай залай, майстэрняй. Але быў і адзін недахоп — адсутнічала сцэна, а мне, актыўнаму ўдзельніку мастацкай самадзейнасці, гэта падавалася страшэннай заганай. На адным са сходаў я ўголас распавёў пра такую загану, што не дае школьным артыстам

напоўніцу раскрыць свае таленты. Іван Піліпавіч згадзіўся, што сцэна патрэбная, але ж для яе трэба знайсці пару кубаметраў дошак. Праўда, лепшы школьны спартсмен Генадзь Шэлест жартам папярэдзіў, што калі сцэна ў спартзале будзе замінаць трэніроўкам, то спартсмены яе разбяруць. Сцэна з'явілася, але не ў спартыўнай, а ў актавай зале, якая адначасова выконвала функцыі і сталовай.

Менавіта на гэтай сцэне і ўладкаваліся госці, што прыйшлі на сустрэчу са школьнікамі — ужо вядомыя паэты Юрась Свірка і Алесь Ставер, разам з імі ляхавіцкія паэты Кастусь Турко і Мікола Купрэеў. Рэй вёў Алесь Ставер. Ён прачытаў жартоўны верш «Скрыпка і бубен», спыніўся на літаратурных навінах, асобна адзначыў «Альпійскую баладу» Васіля Быкава, надрукаваную ў студзеньскім нумары «Маладосці». Алесь Ставер перапытаў у Юрася Свіркі, ці беларус Іван Цярэшка, галоўны герой аповесці. Памятаюцца і радкі верша, што чытаў Юрась Свірка: «Ходзіць лагчынай хлопец з дзяўчынай, туліць-мілуе, моцна цалуе». Цёпла было ўспрынята і выступленне Кастуся Турко. Мікола Купрэеў працаваў у Пранчакоўскай сярэдняй школе, і ляхавіцкія школьнікі яго не ведалі. Вершы ўразілі нейкай невытлумачальнай унутранай моцаю, агаленасцю душы, арыгінальнасцю вобразаў, падзейнічалі нароўні з творамі тагачасных маіх куміраў — Еўтушэнкі, Раждзественскага, Вазнясенскага. Верш «Сонечка» з таго часу я ведаю на памяць:

Было нам па шэсць гадкоў, мне і ёй,
Суседскай дзяўчынцы з сонечным імем Сонечка.
Мы разам гулялі.
Не помню, у што гулялі.
Не, помню, аднойчы з пяску мы будавалі домікі
І галіначкі клёну ўтыкалі ў пясок,
невялічкі капалі калодзеж.
І помню, была навальніца,
а мы з ёю беглі з лесу,
смяяліся і дзівіліся на маланкі



і нешта крычалі грому.
Больш нічога не помню,
толькі: вочы — вялікія, светлыя, як маланкі...
Было нам па шэсць гадкоў,
калі Сонечкі раптам зусім не стала.
Памерла. Ад голаду.
Я нежывую яе не бачыў.
Я хаваўся за вёскай,
бо вельмі страшна было мне,
што Сонечкі раптам зусім не стала.
Гэта было страшней, чым фрыцавы танкі,
чым іх гарматы...
Калі прыязджаю здалёку я ў родную вёску,
у дні навальніц, маланак, грому,
я ўспамінаю Сонечку,
і думаю: трэба наведаць магілку.
І не іду!
О, як робіцца страшна, калі ўяўляю:
я стаю ля магілкі,
а магілка — такая маленечкая,
а мне ж — дваццаць шэсць.

Вельмі ўразіў і верш Міколы Купрэева «Балада пра чаравікі».

Ішлі над Дняпром партызаны
і больш ісці не маглі.
Балюча смылелі раны, гарэнілі мазалі.

...І панёс чаравікі Дняпро ў мора.
Чорнае мора, Міжземнае мора,
а там акіян...
Хто лепш, чым гэтыя чаравікі,
свету раскажа пра гора,
пра гора майго народа,
пра вялікую помсту,
пра загінуўшых партызан?!
...

Калі я прыходжу на бераг Дняпра,
мне заўсёды здаецца:
не, то не сосны рыпяць —
то чаравікі аднекуль, аднекуль рыпяць...

(Мой калега па «Беларускай Энцыклапедыі» Янка Саламевіч рыхтаваў зборнік беларускіх балад. Я паказаў яму «Баладу пра чаравікі», і яна была ўключана ў кнігу.)

Мікола Купрэеў друкаваўся ў «Маладосці», «Літаратуры і мастацтве», ляхавіцкім «Будаўніку камунізму». А ў брэсцкай «Зары» пад рубрыкай «У добры шлях» малады крытык Уладзімір Гніламёдаў (сёння акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) змясціў нататку «Лірыка Міколы Купрэева». Усе гэтыя публікацыі я збіраў і захоўваў, шмат з іх маю і сёння.

У час працы ў Пранчакоўскай школе Мікола Купрэеў падрыхтаваў зборнік «Непазбежнасць», што ўбачыў свет у 1967 годзе. Паэт пераязджае ў Мінск, працуе пэўны час у рэдакцыі «Літаратуры і мастацтва», але хутка вяртаецца на Брэстчыну. Пачынаецца яго вандроўнае жыццё, неўладкаваны побыт.

Праз 10 гадоў пасля памятнай ляхавіцкай сустрэчы, дзякуючы нізцы вершаў Міколы Купрэева, змешчанай у майскім нумары часопіса «Маладосць» за 1974 год, адбылося завочнае спатканне з паэтам. Пачыналася нізка вершам «Выбух у Зялёным Лузе»:

Усю красавіцкую ноч з бараўлянскіх лясоў
у горад
палямі
настойліва поўз туман.
На тоненькай нітцы, з паветра звітай,
плаўна вёў над сабой маленькую міну —
пакуль яшчэ соннага жаўранка.
Спыніўся на вуліцы Каліноўскага.



* * *
Раскалоўся асфальт. Апантана
з нетраў зямных прарастае
зялёны і свежы звон.

* * *
Самую ж салодкую пакуту
першым зведаў я:
здалося — раптам звонка і рашуча
ўзарвецца тэлефон і голас мілай
прарасце пяшчотнаю травінкай з Енісейскай:
«Не спалася ўсю ноч. Усе гады. Прыйдзі. Дарую ўсё.»...

Мне, тады ўжо мінчуку, падалося, што пра Мінск так яшчэ ніхто не пісаў. Калі дадаць, што я здымаў пакой на вуліцы Каліноўскага, а сёння з 9-га паверха кватэры ў Зялёным Лузе на свае вочы бачу, як у горад «з бараўлянскіх лясоў» настойліва паўзе туман, то становіцца зразумелым, чаму верш для мяне вельмі дарагі. Ён дазваляе ўбачыць прыгожае ў будзённым, звыклым, з-за гарадскога тлуму незаўважаным.

Публікацыя ў «Маладосці» дазваляе спыніцца і яшчэ на адным моманце, важным для вывучэння творчасці паэта. Шмат якія публікацыі Міколы Купрэева расцярушаны па раёнках. Сумняваюся, што яны ўсе сабраныя і даступныя даследчыкам. Так, верш «Сёння позна сядзець не буду...» у часопісе пачынаецца наступнай страфой:

Сёння позна сядзець не буду,
спаць лягу рана.
Раніцою ў Антонаву Буду
пайду па тумане.

Але ж у ляхавіцкім «Будаўніку камунізму» (на жаль, дата на выразцы не пазначаная) гэтая страфа выглядала інакш:

Сёння позна пісаць не буду,
спаць лягу рана.
Раніцою ў далёкія Буды
пайду па тумане.

Можна паспрачацца, ці «маладосцеўскі» варыянт лепшы. Адна справа — «позна сядзець», а другая — «позна пісаць». У «далёкіх Будах» пазнаецца чыгуначная станцыя ў Ляхавіцкім раёне, а Антонава Буда, мабыць, прыдуманая.

У калекцыі матэрыялаў пра паэта зберагаецца і ягоны ліст ад 20 снежня 1987 года, калі стваралася кніга «Памяць. Ляхавіцкі раён». Па дапамогу звярнуўся да Міколы Купрэева, спадзеючыся, што ён напіша ўспаміны пра ляхавіцкія старонкі свайго жыцця, прапануе вершы. Але паэт вырашыў інакш.

«Я ў Ляхавіцкім раёне працаваў 23 гады назад, у школе. Пра што ж я мог бы напісаць? Думалася: толькі, можа, па слядах К. Паўстоўскага на Ляхавіччыне. Ён там у Першую сусветную вайну (ці ў грамадзянскую? — ужо і не помню, даўно чыталася) блукаў па вёсках, аселіцах і пісаў пра гэта ў пісьмах з прыфрантавога тылу (у адным з выданняў — ёсць). Але ўжо і кнігі той знайсці не магу (правінцыя!). Ды і трэба хаця на колькі часу зноў вярнуцца на тыя месцы. А гэта магу зрабіць толькі летам (працую ў школе).

*Але вось што я Вам падкажу. Апошнія гадоў 15 — 20 (з перапынкамі) у Ляхавіцкай райгазеце «Будаўнік камунізму» (рэдактар Вікенцій Юльянавіч Шталь) друкуе дакументальныя матэрыялы пра заходнебеларускіх падпольшчыкаў (найбольш — пра камсамольцаў) настаўнік-пенсіянер Васіль Міхайлавіч Сокал. Вельмі многа фактажу. А В. М. Сокал жыве ў в. Зубелевічы Ляхавіцкага раёна (дома ў яго ёсць тэлефон). Звяжыцеся са Шталем-рэдактарам і Сокалам — шмат возьмеце. Ды і іншыя газетныя матэрыялы — іншых аўтараў было ў іх.*

*Прабачце.*



Дзякую за вашу ўвагу да мяне.
*З прывітаннем — Мік. Купрэеў».*

Тэкст ліста заняў цэлую старонку, а на адвароце, у пастскрыптуме, Мікола Купрэеў напісаў пра пісьменнікаў і журналістаў, якія добра ведалі Ляхавіччыну: Віктара Гардзея, Васіля Праскурава, Уладзіміра Бацкалевіча, Алеся Шлега, Іосіфа Карпызу. Успомніў і пра Машукоўскія лясы на мяжы Ляхавіцкага і Ганцавіцкага раёнаў, дзе базіраваўся партызанскі атрад Кірылы Арлоўскага.

У кнігу «Памяць. Ляхавіцкі раён» быў прапанаваны верш «Спатканне са Шчарай», які падаўся мне найбольш ляхавіцкім:

Ну, як табе, Шчара, маецца
між палёў тваіх і лясоў?
Як хвалі тваёй гайдаецца
да нёманскіх берагоў?
...
Бачыш, і я ўжо ўспенены
на скронях густой сівізной.
Ходзяць маімі венамі
рэкі зямлі маёй.
І самая чыстая хваля
ў іх б'ецца з тваіх берагоў —
Тут сэрца маё абмывала,
пела сінюю песню без слоў.
І калі мне жывецца чыста
і я тут яшчэ не госць —
гэта даўняя наша ўрачыстасць
і наша з табой маладосць.
...Правяду ж я цябе да Цыгані
па нівах тваіх і гаях
і ў вячэрнім растанем тумане,
шчырая Шчара мая...

На жаль, энцыклапедычнае начальства такую лірычную споведзь палічыла не вельмі прыдатнай для «Памяці», і верш у кнігу не трапіў. Да гэтага часу шкадую, што пераканаць начальства не здолеў. Але ж дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што начальства — намеснікі галоўнага рэдактара «Беларускай Энцыклапедыі» Алесь Петрашкевіч і Іосіф Хаўратовіч, загадчык рэдакцыі Георгій Кісялёў падтрымлівалі імкненне напоўніць ляхавіцкую «Памяць» арыгінальнымі гісторыка-краязнаўчымі матэрыяламі, не абмяжоўвацца спісамі загінуўшых і падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.



• *Мікола Купрэеў у 1970-я гады*

Наступная і апошняя сустрэча з паэтам была нечаканая. Летам 1988 года ў Мілавідах ладзілася імпрэза ў памяць палеглых паўстанцаў Кастуся Каліноўскага. Прыехалі аматары гераічнай беларускай даўніны з Мінска, Баранавіч, Брэста, бліжэйшага наваколля. Сярод мінскіх гасцей быў і прафесар Мікола Грынчык. Менавіта ў дарозе нарадзілася задума яго нарыса пра франтавога сябра Сцяпана Цярэшку для ляхавіцкай «Памяці». З Ганцавіцкага раёна прыехаў Мікола Купрэеў. Фізічна ён выглядаў стомленым, недагледжаным, але вочы свяціліся ад радасці, што ён разам з аднадумцамі.

***Алег АБЛАЖЭЙ***

# Праклятыя паэты

Далі пачытаць стары нумар «Калосься» (№ 1, 2006). Ужо больш за месяц мінула, а ўсё круцяцца ў галаве думкі ад прачытанага. Як надакучлівыя мухі. А мо — восы?



Нумар прысвечаны трагічным лёсам паэтаў: Сыс, Купрэеў, Гадулька, Рубін. Усе яны заўчасна пайшлі з жыцця — хто спіўся, хто наклаў на сябе рукі... (Усе, бо хоць Мікола Купрэеў фармальна пражыў досыць доўга — але ці было гэтае існаванне жыццём?)

Пытанне, якое мучыла пушкінскага Сальеры — чаму высокі дар Нябёсаў дастаецца слабым і нікчэмным людзям? А няхай бы гэта была ўзнагарода за выдатную вучобу і прыкладныя паводзіны! А то — вершы будуць «праходзіць» у школе, а вось біяграфіі аўтараў, як прыклад «делать жизнь с кого» — не.

Варлам Шаламаў, прачытаўшы «Адзін дзень Івана Дзянісавіча», быў абураны: што гэта за лагер такі, дзе ўсе мелі лыжкі? У нашым баланду пілі цераз край! Чаму ходзіць кот? У нашым даўно б з'елі... і гэтак далей. «З'явіўся яшчэ адзін «лакіроўшчык рэчаіснасці» — рабіў выснову Шаламаў.

І вось гэтыя людзі, што прайшлі зямное пекла, непараўнальнае з дантаўскім, — не зламаліся. Ні Шаламаў, ні Салжаніцын, ані нашы Ларыса Геніюш ці Лявон Луцкевіч. Дык што ж за беды такія, якія пакуты сагнулі нашых паэтаў у барані рог? Ніводзін не зазнаў турэмных нараў, апроч выцвярэзніка. Ніхто не быў скалечаны, не страціў зрок, не аглух...

«...калі Сыс атрымаў кватэру», — не зарабляючы і не пазычаючы грошы, не беручы крэдыту — атрымаў, як кветку ў дзень народзін. Купрэеў — таксама. Не ў карцэры-адзіночцы пісалі вершы, а ў аднапакаёўцы з ваннаю й цёплым клазэтам...

Купрэеў, праўда, перажыў сапраўдную трагедыю: Дзяржаўнай прэміі не далі. Як жа тут не спіцца з гора...

І ўсё роўна — калі чалавек губіць сябе, гэта заўсёды драма. Якім бы гэты чалавек ні быў.

Часта цытуюць Пушкіна — як той абураўся, што публіка любіць смакаваць жыццяпісы творцаў — маўляў, «он

так же мал и мерзок, как мы!». Не, «мал и мерзок — но не так, как вы!» — пярэчыць паэт.

У тым і бяда, што — так. Бомж-паэт смярдзіць гэтак-сама, як любы іншы. Ці пакрыўдзіць цябе паэт, ці бухгалтар — усё роўна баліць. Толькі крыўда з боку паэта — горшая, бо ад яго чакаеш «разумнага, добрага, вечнага».

Бачыў у кнігарні таўстую кнігу — «Таркоўскі і я». Нейкая дама сабрала пад адной вокладкай усе рахункі вялікаму рэжысёру. Бо на вокладку вынесена тэза: няпраўда, што «гений и злодейство» несумяшчальныя.

Кнігу я не чытаў, але думаю, што там напісана праўда. (Дарэчы, гэтыя як жа часта цытаваныя словы Пушкіна, — не ягоная асабістая думка. Яны ўкладзены ў вусны Моцарта, каб падкрэсліць яго наіўнасць.)

Так бы хацелася, каб творцы нашых любімых вершаў і фільмаў былі белымі й пушыстымі, так хацелася б любіць аўтараў — як людзей. А яны найчасцей злыя, калючыя й кепска пахнуць.

Леў Талстой тлумачыў гэта так: мастак бярэ з сябе ўсё лепшае і ўкладвае ў свае творы, таму яны «прекрасны, а жизнь его дурна».

Мастак — і такі, і не такі як усе. Як і ў кожным, у ім гняздзіцца цэлы звярынец — не толькі белыя рахманыя галубкі, але й брудныя гіены. І не заўсёды ён мае ўладу над імі.

Але прыгажосць прыходзіць на гэты свет праз яго.

І не ў нашай моцы накіроўваць яе шляхі.

Быў бы творца з «іншага цеста» — як бы ён перадаў і выказаў тое, што робіцца з намі? Калі б не спазнаў усё на ўласнай скуры — гора і радасць, грэх і раскаянне?

Творца не можа пражыць жыццё, не пакрыўдзіўшы нікога. Многіх ён зневажае самім фактам свайго існавання. Тым, што пастаянна рвецца на волю — нават ад тых, хто яго ўсім сэрцам любіць.

Нельга апраўдаць брудныя ўчынкі паэта.

Але іх можна — прабачыць.



Няшчасны чалавек, якога пакрыўдзілі. Але той, хто няздольны прабачыць, — няшчасны ўдвая.

Жыццё кожнага чалавека — драма. Але драма паэта — падвойная. Бо ён жыве падвойным жыццём — зямным і нябесным.

Аднак на судзе над Паэтам у першую чаргу разглядаюцца ягоныя песні. І кепскі верш для паэта — грэх нашмат большы, чым няшлюбнае дзіця.

Паэт як асоба — наносіць раны.

Паэт як творца — раны гоіць.

Будзьма ж удзячнымі — нягледзячы ні на што.

*2007*



• *Каля магілы Міколы Купрэева — Валеры Гапееў і Леанід Галубовіч (справа-налева). 2023 год*

*Людміла БУНЕЕВА*

# «Ён па натуры быў вандроўнік»

*У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя Максіма Горкага прайшла прэзентацыя кнігі Міколы Купрэева «Палеская элегія».*

Пад адной вокладкай — пяць аповесцяў аўтабіяграфічнага характару. «Там — увесь Купрэеў!» — скажа на абмеркаванні паэт і тэлежурналіст Мікола Пракаповіч. «Светлай споведдзю сірочай душы» назавуць кніжку ў прадмове яе выдаўцы («Літаратура і мастацтва»). Для Міколы Купрэева яна — трэцяя пасля паэтычных зборнікаў «Непазбежнасць» (1967) і «Правінцыйныя фантазіі» (1995). Трэцяя і пасмяротная. Бо ў верасні 2004 года пісьменнік пайшоў ад нас.

Многія, хто ў нейкай ступені мае дачыненне да прыгожага пісьменства, ведалі ці хаця б бачылі гэтага чалавека. Інтэлігентны твар — і вопратка вечнага вандроўніка, які не ведае, дзе сённяшняй ноччу прытуліць галаву. Творчая самаадданасць (ён заміраў з алоўкам над чыстым аркушам у самых нечаканых месцах) — і нежаданне гаварыць на тэму літаратуры нават з сябрамі. Тонкая душа — і няўменне зрабіць шчаслівымі блізкіх людзей. Замест пашпарта, якога ў яго не было, ён прад'яўляў кніжачку сваіх вершаў. У кішэні насіў... выпаўшыя зубы ў пачку ад запалак.

Можна было чакаць, што ўдзельнікі вечарыны будуць згладжваць вострыя вуглы гэтай складанай неадназначнай натуры. Але ўжо першы прамоўца — мінскі літаратар Леанід Галубовіч, апякун і «душапрыказчык» Купрэева, ініцыятар выдання і ўкладальнік пасмяротнай купрэеўскай кніжкі, паказаў прыклад, як можна чуйна правесці «ладдзю ўспамінаў» паміж «тьмой низких истин» і «возвышающим обманом». А выкладчыкі Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А. С. Пушкіна Уладзімір Сенькавец і Генадзь Праневіч, якія вялі вечарыну, з першых хвілін задалі размове і інтэлектуальную вышыню, і задушэўную танальнасць.

Са студэнцкіх гадоў ведалі Купрэева Іван Мельнічук і Анатоль Гарай. Другія пасябравалі з ім, калі ён ужо быў сталым чалавекам. А хтосьці толькі цяпер адкрывае для сябе гэтую асобу.

Вядомы беларускі празаік Андрэй Федарэнка прызнаўся, што знаёміцца з Купрэевым наноў.

— Я ведаў чалавека, падобнага на Міколу, — Анатоля Сыса. Тыя ж звычкі, тая ж псіхалогія. Ёсць такія творцы, якія абсалютна свядома накіраваны на самазнішчэнне. Яны адмаўляюцца ад жонак, ад дзяцей, ні ад чаго не залежаць — ні ад пашпарта, ні ад прапіскі.

Федарэнка прызнаўся, што вельмі насцярожана ставіцца да празаікаў, якія займаюцца яшчэ і вершамі. Проза — вельмі капрызная жанчына. Яна не любіць, калі яе дзеляць з кімсьці. Таму, на думку літаратара, Купрэеву трэба было б засяродзіцца на чымсьці адным. А пра яго творчую манеру пісьменнік выказаўся так:

— Ён быў больш пейзажыст, маляваў словамі. Калі ўзяць яго прозу з намерам выпісваць мудрыя думкі, сентэнцыі — вы іх там не знойдзеце. Але ўбачыце малюнак, створаны натхненнем. Як верш. Проза яго была і ёсць дзіўная.

Вялікае ўражанне на прысутных зрабілі ўспаміны пісьменніка Леаніда Філатава. Ён расказваў, як у свой час спрабаваў даць Купрэеву прытулак у школе, якой загадваў. Завяршылася дабрадзейства тым, што «за Колю мне далі «вышку" — знялі тры аклады». І як яны палявалі на зайцоў і Купрэеў зрабіў трапны стрэл, седзячы на капоце трактара, які рухаўся. І як пісьменнік засылаў Філатава ў якасці свата...

Што ні ўспамін — то яркі, выразны штрых да партрэта чалавека нестандартнага, які жыў па сваіх законах.

Генадзь Праневіч згадаў італьянскага прапаведніка, заснавальніка ордэна «нищенствующих» Францыска Азіскага з яго прынцыпам быць самым найніжэйшым з брацій. Імкненне заставацца «ничтожнейшим из ничтожнейших» характэрна і для Купрэева. Што гэта? Несвядомы выбар? А можа, пазіцыя, з якой больш глыбока, ва ўсёй праўдзівасці адкрываецца свет? Калі ты знаходзішся на ўзвышэнні, калі займаеш нейкае становішча ў грамадстве, ты залежыш ад многіх людзей і многіх акалічнасцяў, і гэта перашкаджае бачыць жыццё такім, якое яно ёсць.

Дзве гадзіны праляцелі як адно імгненне. І многія з тых, хто прыйшоў у бібліятэку, прызнаваліся, што не могуць прыпомніць такой цікавай, змястоўнай і глыбокай размовы аб лёсе творчай асобы, якую мала хто разумеў пры жыцці і сапраўдная вартасць якой адкрываецца толькі цяпер.

*2008*

***Мікалай РЫМАЧ***

## Паэзія ў прозе

*(Выступ на прэзентацыі кнігі Міколы КУПРЭЕВА «Палеская элегія» ў Івацэвіцкай раённай бібліятэцы)*

Адразу ж хачу сказаць, што мне выпала нялёгкая місія — расказаць пра Міколу Купрэева. Здавалася б, 35 гадоў з хвосцікам я ведаў яго, як кажуць у такіх выпадках, асабіста, з іх добрых два дзесяцігоддзі нашы жыццёвыя шляхі-дарогі даволі часта перасякаліся. Мікола, гэты паэт-вандроўнік, ці як яго іншы раз называлі — бадзяжнік, знаходзіў мяне ўсюды: у Быцені, калі я праводзіў там свой водпуск, у Мінску, калі я там вучыўся, у Маларыце, дзе двойчы нам давялося працаваць у мясцовай раёнцы, ну і, канечне



ж, у Івацэвічах, дзе мой пакой часта станавіўся ягоным пристанкам на тры-чатыры дні, а то і на тыдзень. Няма сэнсу расказваць пра наша сяброўства падрабязна, бо яно, бадай што, нічым не адрознівалася ад сяброўства іншых людзей. Тым больш я не бяруся аналізаваць творчасць Купрэева, бо гэта справа літаратуразнаўцаў, а не такіх дылетантаў, як я.



• *На прэзентацыі кнігі. Выступае пляменніца Міколы Купрэева. Івацэвічы, раённая бібліятэка. 2007 год*

Спынюся ж сёння хіба што на некалькіх найбольш выразных эпізодах, якія пакінулі ў маёй свядомасці больш-менш глыбокі адбітак.

Упершыню я пабачыў Міколу Купрэева дзесьці ў сярэдзіне 1966-га года. Рэдакцыя івацэвіцкай раённай газеты «Кастрычнік», куды вясною таго ж года я быў запрошаны на працу ў якасці карэспандэнта мясцовага радыёвяшчання, размяшчалася тады па вуліцы Камсамольскай. І цяпер стаіць перад вачыма той дзень, калі я праводзіў запытальным позіркам незнаёмага мне стройнага, з пышнай шавялюрай на галаве, у беласнежнай сарочцы мужчыну гадоў трыццаці, які ўпэўнена крочыў у кабінет рэдактара Феафана Іларыёнавіча Хаванскага. А праз некаторы час да мяне падышоў адказны сакратар газеты Мікалай Радзюк і з гэткай хітрынкай на твары запытаў, ці не жадаю я пазнаёміцца з жывым паэтам?

— Чаму ж не, — без вагання адказаў я.

— Тады бяжы па пляшку, ды як найшпарчэй, а то хутка ад'едзе вандроўнік Купрэеў, — прапанаваў Радзюк, дарэчы, як потым я даведаўся, былы сакурснік Купрэева па Брэсцкім педінстытуце.

Мне быў тады 21 год, перамагла юнацкая цікаўнасць, і я, канечне ж, хуценька накіраваўся ў краму, якая і пасён-

ня стаіць на прывакзальнай плошчы і вядомая ў гараджан як дзяжурны, а цяпер і начны магазін. Трэба сказаць, што тады мы адчувалі сябе ў рэдакцыі даволі прывольна і працавалі па прынцыпе: «сделал дело — гуляй смело». Пляшку «Маскоўскай» за 2 р. 87 кап. утраіх мы выпілі не спяшаючыся, я літаральна лавіў кожнае слова Купрэева, здзіўляючыся ягонай простасці. У той час я не мог нават дапусціць думкі, што вось гэта знаёмства праз некалькі гадоў выльецца ў працяглае, даўжынёю больш за тры з паловаю дзесяцігоддзі, сяброўства.

Шчыра прызнаюся: тыя купрэеўскія вершы, якія даводзілася чытаць у абласной і нашай раённай газеце, мне тады не асабліва падабаліся. Настаўнікі літаратуры на сваіх уроках засяроджвалі нас, вучняў, на тым, што ў вершах павінны быць рыфмаваныя радкі з пэўнай колькасцю націскных і ненаціскных складоў. У Купрэева ўсё гэта зусім ці амаль зусім адсутнічала. Нас прывучылі ў школе, так бы мовіць, да «правільных» вершаў і, відаць, не асабліва настройвалі на ўдумлівы падыход да зместу, глыбіні думкі і сапраўднай паэтычнасці вершаваных радкоў. Карэнным чынам я змяніў свае адносіны да паэтычнай творчасці Міколы Купрэева падчас службы ў арміі, калі напрыканцы 1967 года ў адзін з зімовых дзён атрымаў бандэроль з невялічкай па фармаце кніжачкай. Гэта быў першы вершаваны зборнік майго сябра, і меў ён назву «Непазбежнасць». Так супала, што ў гэты самы момант аб'явілі пастраенне на пляцы вайсковай часці (не помню ўжо, з якой нагоды), і я за гадзіну-паўтары, бясконца прытупваючы задубелымі ў «кірзачах» нагамі, паспеў прачытаць кніжку ад першага да апошняга радка. Потым, перачытваючы вершы ўжо ў салдацкай казарме, зразумеў, што вельмі памыляўся раней, што вершы Купрэева — гэта сапраўдная паэзія, і яна калі не самай высокай, дык дастаткова высокай пробы.

З таго часу неаднойчы даводзілася чытаць іх маім сябрам, чытаў іх нам і сам Мікола — і гэта атрымлівалася ў яго больш дакладна, узвышана і лірычна. Да болю



крыўдна, што тыя нярэдкія застоллі, якія неўпрыкметку ператвараліся ў літаратурныя вечары з удзелам самога паэта, больш ніколі не паўторацца. Дакладней, мы і пасёння не-не ды й бяром у рукі кніжкі «Непазбежнасць» і «Правінцыйныя фантазіі», нешта чытаем з іх, але ўжо без аўтара кранаючых за душу вершаў.

А яшчэ мне помніцца 1983 год, калі ў Доме культуры райсельгастэхнікі праводзілася ўрачыстасць з нагоды 80-цігоддзя пісьменніка, нашага земляка Піліпа Пестрака. Мы з Купрэевым размясціліся на самай галёрцы, а на сцэне займалі свае месцы ў прэзідыуме кіраўнікі раёна, выхадцы з Брэстчыны паэты Мікола Пракаповіч, Алесь Каско, Зінаіда Дудзюк, гродзенская паэтка Данута Бічэль-Загнетава. Хвалюючым момантам, які і пасёння стаіць у маіх вачах, было з'яўленне паэта Васіля Жуковіча. Ён унёс на руках белаазёрскую паэтэсу і перакладчыцу Ніну Мацяш, у якой не дзейнічалі ногі, і асцярожна пасадзіў яе на крэсла.

— Большасць з іх — мае некалішнія вучні, — паказваючы позіркам на прэзідыум, ціха прамовіў тады Мікалай Сямёнавіч. — Яшчэ на старонках абласной «Зари», літкансультантам якой тады быў, я рэдагаваў і рэцэнзаваў іх вершы. А сёння ў кожнага па некалькі вершаваных зборнікаў, усе — у Саюзе пісьменнікаў, а я...

Я не адчуў у гэтых словах ні крыўды, ні жалю — і не змог прыдумаць у адказ нічога іншага, як толькі сказаць: «І ваша месца, Мікалай Сямёнавіч, павінна быць там, у прэзідыуме. Яны ж маладыя, а вам ужо за сорак...»

На той час у Купрэева быў выдадзены толькі адзін невялічкі зборнічак «Непазбежнасць». Былі публікацыі з ацэнкай ягонай паэтычнай творчасці не толькі ў беларускім, але і ва ўкраінскім і, здаецца, польскім друку, і ацэнкай даволі высокай. Нават у нейкай кніжцы, назву якой паспеў забыць, затое добра помню, што вершы Купрэева характарызаваліся як новы шматабяцаючы павеў у беларускай паэзіі.

Нягледзячы на такія станоўчыя водгукі пра вершы Купрэева, наступны яго зборнік «Правінцыйныя фантазіі» з'явіўся на свет Божы ажно праз 28 гадоў пасля першай кніжкі. Гэтая, па сутнасці, таксама невялікая кніжка выклікала даволі значны рэзананс у літаратурным асяродку сваёй глыбінёй зместу, чысцінёй і дакладнасцю паэтычна выказаных думак. Усяго нейкіх паўсотні вершаў і невялічкая па памеры паэма «З сястрой і Уладзімірам Караткевічам на Рагачоўшчыне» былі ўспрыняты літаратарамі і чытачамі настолькі цёпла і прыймальна, што хутка кніжка «Правінцыйныя фантазіі» была вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі ў галіне паэзіі, прайшла ўсе падкамісіі і камісіі, і вестка пра гэта была агучана ва ўсіх брэсцкіх і ў дзвюх івацэвіцкіх газетах — «Івацэвіцкі веснік» і «Газета для вас». А ў Брэсце па ўзгадненні з аблвыканкамам нават было арганізавана ўшанаванне будучага лаўрэата прэстыжнай прэміі. Ды здарылася так, што прэмію гэту па нейкім недаразуменні, хутчэй за ўсё ў вышэйшых кіруючых колах, як кажуць у такіх выпадках, «зарэзалі», і яе атрымаў ужо зусім іншы чалавек. Я помню, як Мікалай Сямёнавіч ніякавата адчуваў сябе падчас чарговай нашай сустрэчы, быццам спрабаваў апраўдвацца, але нікога не вінаваціў і не асабліва перажываў. Шкадаваў хіба пра тое, што напазычаў у знаёмых пэўную суму грошай, пераканаўшы іх, што вось хутка атрымае прэмію і спаўна разлічыцца з усімі. Не буду ўтойваць: і мы з Мікалаем Сямёнавічам таксама авансам добра «замачылі» будучую прэмію: як тут не парадавацца такому поспеху. І аказалася не дарма: Саюз пісьменнікаў хуценька прыняў рашэнне і ўручыў Міколу Купрэеву літаратурную прэмію імя Аркадзя Куляшова. Якая-ніякая, а ўсё ж таксама прэмія, і даецца яна, зноў-такі, не кожнаму. Тады ж Мікалай Сямёнавіч атрымаў у Пружанах, можна сказаць, першую ў сваім жыцці кватэру з камунальнымі выгодамі: аднапакаёўку на першым паверсе ў пяціпавярховым доме, пабудаваным некалі для ваеннаслужачых.



...Неяк атрымліваецца, што я больш кажу пра паэзію Міколы Купрэева, а сабраліся ж мы сёння на прэзентацыю ягонай першай кнігі прозы «Палеская элегія». Яшчэ гадоў з пятнаццаць таму Мікалай Сямёнавіч абмовіўся мне пра намер узяцца за напісанне некалькіх аўтабіяграфічных аповесцяў. А я ўжо ведаў, што адна з такіх аповесцяў была напісана раней, ды потым, як аднойчы прагаварыўся Купрэеў, падчас ягонай чарговай вандроўкі па чыгуначных вакзалах у яго, соннага, нейкі нягоднік сцягнуў сумку, у якой ляжаў і рукапіс. Потым неаднойчы Мікалай Сямёнавіч згадваў мне, што збіраецца ўзяцца за «ўваскрэсенне» згубленай аповесці, але гэтаму было суджана збыцца толькі ў 1994 годзе. Пасля таго, як аповесць «Дзіцячыя гульні пасля вайны» з лёгкай рукі пісьменніка Леаніда Галубовіча была надрукавана ў часопісе «Крыніца», за ёю, нібы з таго «рога изобилия», пасыпаліся новыя празаічныя творы. Пяць з іх і склалі кнігу, якую мы сёння прэзентуем і якую, на вялікі жаль, не пабачыў і ўжо ніколі не патрымае ў руках Мікола Купрэеў.

Паўтаруся: я не літаратуразнаўца, але калі чытаў аповесці яшчэ ў часопісе «Крыніца», атрымліваў вялікую асалоду. Купрэеўская проза — не проста проза, а паэзія ў прозе. Даволі цяжка прасачыць у ёй сюжэт, мо яшчэ цяжэй пераказаць змест, затое чытаецца кожная з аповесцяў нібы лірычная паэма, ад якой цяжка адарвацца і немагчыма перадыхнуць. Дарэчы, падчас нашай сумеснай з Купрэевым працы ў маларыцкай раёнцы я заўважыў, што ягоныя звычайныя газетныя артыкулы ці то на бытавую, ці на патрыятычную тэму істотна адрозніваліся ад нашых сваёй зноў жа паэтычнасцю, гэткай лірычнай пявучасцю. Талент ёсць талент, і тут, як кажуць, нічога не папішаш.

Вось, бадай што, і ўсё, што я хацеў сказаць вам сёння пра Міколу Купрэева. У апошні раз мы пабачыліся з ім у бальніцы для састарэлых і інвалідаў у Лясной, што пад Баранавічамі, куды я паехаў са сваёй васьмігадовай дачкою Юляй, якую вельмі любіў Мікалай Сямёнавіч і пастаянна

адорваў падарункамі і пачастункамі. Прывезлі мы тады вялікую звязку бананаў, бо, як сказала мне ягоная сястра Валянціна Сямёнаўна, больш ён есці нічога не мог. І не таму, што амаль не меў зубоў, а ўжо таму, што не меў сілы пераважаваць нешта іншае.

Мікалая Сямёнавіча мы пазналі з цяжкасцю: глыбока запалыя вочы і шчокі, жоўты колер твару і аголеных рук сведчылі, што ён знаходзіцца ў вельмі цяжкім, калі не ў крытычным стане. Нас з дачкою не пазнаў, гаварыў невыразна, паўтараючыся бясконца пра нейкую пападдзю і пры гэтым ледзь чутна смеючыся, і тады мною авалодала авантурная думка. Я пакінуў палату, знайшоў медсястру і папрасіў у яе дазволу прынесці бутэлечку віна, спаслаўшыся на тое, што Мікалай Сямёнавіч рэдка калі не спажываў яго. Я мог бы зрабіць гэта і без дазволу, але стан Купрэева не дазваляў мне пайсці на такую рызыку. Медсястра крыху завагалася, але ўсё ж дазволіла пачаставаць хворага віном. Праўда, тут жа папярэдзіла: толькі не больш за сто грамаў.

Я хуценька збегаў у мясцовую краму, узяў паўлітэрку нейкага чырвонага віна і кавалачак варанай, у разліку на яе мяккасць, каўбасы, ужо ў палаце наліў стограмоўку спачатку Мікалаю Сямёнавічу, потым аднаногаму суседу па палаце. Літаральна праз некалькі хвілін мой сябар прыкметна ажыў, вочы яго засвяціліся вясёлымі агеньчыкамі, і ён запатрабаваў наліць яшчэ. Я зноў напоўніў стограмоўку, дапамог Мікалаю Сямёнавічу данесці яе да вуснаў. Хутка ён зачырванеўся яшчэ больш, паспрабаваў нават прыўзняцца з падушкі, але гэта аказалася яму не пад сілу.

— Мікалай Сямёнавіч, цяпер Вы пазнаяце, хто перад Вамі? — гучна запытаўся я.

— Коля Рымач, — пачуў у адказ.

— А гэта хто? — паказваю на дачку.

— Юлечка! — з усмешкай, той самай, якая была ўласціва яму здароваму, амаль усклікнуў Мікалай Сямёнавіч.

Не стану ўтойваць: удваіх мы дапілі рэшту бутэлькі, пасля чаго Мікалай Сямёнавіч ажыў па-сапраўднаму і



запатрабаваў, каб прынёс яшчэ. Я, канечне, не пагадзіўся, але паабяцаў, што ў наступныя выхадныя прыеду з сябрамі, і мы абавязкова прывязем яму віна. А цяпер, маўляў, ані-ні, нельга. Дый на электрычку надышоў нам час падавацца.

Купрэеў усур'ёз зазлаваў, загадаў, як адрэзаў: «Тады едзь!» — і нават узмахнуў ужо амаль не дзеючай правай рукой.

Мы сапраўды паспяшаліся з Юляй на станцыю, маючы цвёрды намер праз тыдзень зноў наведаць бальніцу ў Лясной. Але праз тыдзень наша паездка не атрымалася, а яшчэ праз некалькі дзён Мікалая Сямёнавіча не стала. Гэта здарылася 19 верасня 2004 года, на 68-м годзе жыцця.



• *Каля магілы Міколы Купрэева — Мікалай Рымач (злева). 2007 год*

Сёння пра нябожчыка не-не дый можна пачуць: вось, маўляў, каб не залішне захапляўся ён спіртнымі напоямі, дык напісаў бы нашмат больш і вершаў, і апавесцяў. А мне ўвесь час падаецца, што магло быць і наадварот, і што Мікола Купрэеў напісаў роўна столькі, колькі яму было адведзена напісаць лёсам і Богам. І, як кажуць, ні на радок больш або менш.

Сёння, праз два гады пасля ягонай смерці, не-не дый адольвае боль ад таго, што няма ўжо Мікалая Сямёнавіча, і гэты боль, памножаны на пранізваючую ўсё цела і свядомасць думку, што ўжо ніколі не пачую ягонага хрыплавата-мяккага голасу, не пабачу ягонай па-дзіцячы шчырай усмешкі, у рэшце рэшт, не ўзніму разам з ім той жа шклянкі віна, якое было неад'емнай часткай кожнай нашай сустрэчы, робіцца асабліва нясцерпным. Асабліва я

адчуваю гэта, наведваючы міхнавіцкія могілкі, дзе на помніку — камені з высечаным на ім партрэтам пісьменніка, ягоным прозвішчам і гадамі нараджэння і смерці — значацца словы апошняга радка аднаго з яго выдатных вершаў, якім адкрываецца першая кніга паэта: «О, як многа хацеў вам сказаць!»

Мікола Купрэеў, напэўна ж, не выказаў усяго, што хавалася ў ягонай лірычна-тонкай душы, але ўсё ж многае паспеў нам сказаць, і сказанае, як і напісанае ім, засталося нам, жывым, застанецца і нашым нашчадкам. Вось гэта і супакойвае.

*Снежань 2007 г., Івацэвічы*

***Лявон ВАЛАСЮК***

## Многа паспеў нам сказаць...

Бачыў вядомага паэта-вандроўніка «ўжывую» ўсяго толькі аднойчы: на юбілейнай вечарыне Алеся Каско ў Абласным культурна-грамадскім цэнтры па вуліцы Энгельса. Я спускаўся па прыступках лесвіцы ўніз, а Мікола Сымонавіч Купрэеў выходзіў з дзвярэй на лесвічную пляцоўку. Сустрэліся поглядамі, я павітаўся, ён кіўнуў галавой у адказ. Так мы аднойчы пабачыліся і размінуліся назаўжды...

За творчасцю вядомага паэта і празаіка асабліва ўважліва пачаў сачыць у той час, калі ягоныя біяграфічнага характару аповесці друкаваліся ў часопісе «Крыніца». Ведаючы Міколу Купрэева як выдатнага паэта (зборнік вершаў «Непазбежнасць» (1967), «Правінцыйныя фантазіі» (1995), я быў прыемна здзіўлены, калі пабачыў яго першую аповесць у часопісе. З таго часу з нецярпеннем чакаў і чытаў яго новыя празаічныя творы. Паэт тонкай душы, Мікола Купрэеў быў творча самаадданым, не цярпеў фальшывай думкі і слова, хоць з вялікай неахвотай гаварыў пра літаратуру.

Нарадзіўся Мікола Купрэеў у вёсцы Ямнае Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка пачатковай школы. Вайна апаліла дзяцінства будучага паэта і забрала маці.

Пасля вайны Купрэевы пераязджаюць на Брэстчыну, у вёску Старыя Пяскі Бярозаўскага раёна, дзе Мікола пайшоў у першы клас. Падчас вучобы ў школе ў яго і пачалі выяўляцца літаратурныя здольнасці (у 5-м класе ў газеце «Піянер Беларусі» быў надрукаваны верш Міколы Купрэева пра Першамай). Творчаму росту ў школьныя гады паспрыяла захапленне паэзіяй Аляксандра Блока і Максіма Багдановіча.

У 1957 годзе, заканчваючы Івацэвіцкую сярэднюю школу, Мікола Купрэеў пачынае актыўна займацца творчасцю.

У 1962 годзе, скончыўшы Брэсцкі педагагічны інстытут, паэт едзе працаваць настаўнікам на Палессе. Ён далучаў дзяцей да чароўнага свету літаратуры ў Пінскім (у вёсцы Сташаны вучыў Міколу Антаноўскага і Анатоля Шушко), Ляхавіцкім і Ганцавіцкім (у Чудзінскай школе вучнем у яго быў Алесь Каско) раёнах.

Плёнам літаратурнай працы Міколы Купрэева ў 60-я гады стала выданне зборніка паэзіі «Непазбежнасць». Яго паэзія выгадна вылучалася сярод вершаў іншых аўтараў Берасцейшчыны і рэспублікі.

Прыкметнай з'явай у беларускай літаратуры стала выданне і другой паэтычнай кніжкі — «Правінцыйныя фантазіі» (у 1995 годзе). Саюз беларускіх пісьменнікаў адразу ж вылучыў зборнік на атрыманне Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы. На жаль, «добразычліўцы» не дазволілі ўганараваць правінцыйнага паэта...

Жыццёвы шлях таленавітага паэта абарваўся 19 верасня 2004 года ў вёсцы Лясная каля Баранавічаў, дзе ён дажываў свой век у доме састарэлых. Пахаваны Мікола

Сымонавіч у Міхнавічах — прыгарадзе Івацэвічаў. На надмагільным помніку ружанскі мастак Юрый Малышэўскі выбіў барэльеф паэта і словы ягонага верша: «О, як многа хацеў вам сказаць...»

*Ядзвіга БЫЧКОВА (АСЕЦКАЯ)*

## Погляд са студэнцкага часу і пазней...

Якім я помню Міколу Купрэева?

Для мяне гэта не зусім простае пытанне. Я вучылася з ім у адной групе Брэсцкага педагагічнага інстытута толькі два першыя курсы, прычым жыла не ў інтэрнаце, дзе жыў Коля. І ўсё ж я яго добра памятаю: такія людзі не забываюцца.

Калі гавораць пра Колю, я чамусьці бачу, як ён заходзіць у аўдыторыю, як шукае вачыма Т. Г. і садзіцца бліжэй да яе. Я бачу яго русыя, трошкі закучараўленыя валасы і, як памятаецца, чубок над ілбом, яго светлыя вочы, — па-мойму, яны ў яго былі блакітныя, хоць я не ўпэўнена ў гэтым, магчыма, і шэрыя.

Але не ў колеры сутнасць тых вачэй. Галоўным, мне думаецца, было ў іх выяўленне нейкай адстароненасці, нейкай адсутнасці там, дзе мы былі, і ў той жа час гэта было выяўленне поўнай незалежнасці ад усяго іншага. Вочы Колі, здавалася, былі ледзь прытушаны (але не затуманены, як гэта іншы раз бывае — гэта зусім розныя рэчы). Здавалася, Коля жыве нейкім сваім багатым унутраным жыццём. Так яно і было.

Гэта была творчая і светлая асоба. Як паэт ён ужо тады, на першым курсе, назіраў за жыццём сваім купрэеўскім зрокам і бачыў яго ў абсалютна розных праявах, фарбах, адценнях. Так, Коля ўжо тады адрозніваўся ад іншых сваёй



вельмі заўважнай нестандартнасцю, складанасцю. Гэтага нельга было не заўважыць і ў яго нешматслоўных выступленнях на семінарах, і ў яго рэдкіх рэпліках на перапынках паміж лекцыямі.

Вядома, Коля кахаў Т. Нельга было не бачыць, з якім захапленнем глядзеў ён на яе доўгія цёмныя валасы, з якой пяшчотай глядзеў у яе строгія сінія вочы. І таму зусім невыпадкова нарадзіліся ў яго радкі ў ясенінскім стылі, якія гулялі па факультэце ў розных рэдакцыях. Да мяне дайшлі ў такой:

Я бы поехал в какой-нибудь Та́вриз
Или в какой другой Шираз,
Если бы не было в Бресте Га́врис
И её прекрасных синих глаз.

І яшчэ ўспамінаецца: студэнцкі інтэрнат, доўгі стол з living рознымі прысмакамі, нашы студэнты, дзе галоўныя Коля і Т. Валасы ў Т. ужо не доўгія спадаючыя, а забраныя



• *Студэнцкія гады. Мікола Купрэеў чацвёрты злева*

ўверх у вялікі цяжкі вузел. Там я бачу і сябе з В. Б. (студэнтам-медыкам з Мінска, які пасля стаў маім мужам)... Цікавы быў, малады час.

Коля здаваўся рамантыкам і, вядома, быў ім.

Калі я цяпер успамінаю Колю, я бачу яго светла-шэры пінжак і ўвогуле бачу чамусьці ўсё светлае, што звязана з ім, з яго жыццём, з яго напоўненай тонкім адчуваннем і псіхалагізмам творчасцю. І гэты самы псіхалагізм падказвае мне вядомую біблейскую мудрасць: «Не судзі...»

Вельмі хочацца прачытаць усё ім напісанае...

*(Пераклад з рускай мовы Леаніда Галубовіча.)*

***Яўген ГАРАДНІЦКІ***

## Азірнуцца на сябе самога...

*Кніга вяртанняў Міколы Купрэева*

Ці існуе ўвогуле такі паэт, які хоць аднойчы не спрабаваў бы звярнуцца да прозы, а, значыць, да іншага, чым вершаваны, спосабу мастацкага выказвання? Ды ўжо сама па сабе прырода паэтычнага светаўспрымання з яго схільнасцю да сутыкнення супрацьлеглых з'яў робіць, мабыць, прыцягальным менавіта тое, што адрозніваецца па сваіх выяўленчых магчымасцях ад паэзіі. Звычайна сцвярджаецца, што да прозы паэты прыходзяць з гадамі, з набытым жыццёвым вопытам, з узнікненнем патрэбы ўспомніць і прааналізаваць перажытае. Напэўна, так яно і ёсць. У прозы іншыя ўзаемадачыненні з жыццёвым матэрыялам, для яе большае значэнне мае перспектыва бачання, часавая аддаленасць ад таго, што становіцца прадметам мастацкага ўвасаблення.

Markdown

Markdown note: Рознае, непадобнае спалучаецца між тым у поўную — і мастацкую, і асабовую — цэласнасць. Менавіта асоба творцы з'яўляецца тым асяродкам, вакол якога аб'ядноўваецца ўсе, часам і вельмі разнародныя, супрацьлегла скіраваныя, яго памкненні і зацікаўленні. Гэта тое сутнаснае і характэрнае ў чалавеку, што ў мастацкіх адносінах, у слоўным увасабленні атрымлівае найменне стылю.

А ёсць такія паэты, у вершах якіх ад самага пачатку праступаюць, падспудна акрэсліваюцца прыкметы празаічнага спосабу выказвання. Для іх межы паміж паэзіяй і прозай прадстаюць больш празрыстымі і пранікальнымі, чым для іншых. Верлібр для іх — натуральная форма ўвасаблення той паўнаты паэтычнага светаадчування, якая перасягае зададзеныя жанравыя абмежаванні.

У гэтым выпадку якраз мэтазгодна гаварыць пра стыль у шырокім значэнні гэтага паняцця. Пра стыль як пэўны спосаб жыцця, калі паэтычнасць адкрываецца ў самой рэчаіснасці і абумоўлівае сабой усе сродкі мастацкага выражэння, вызначаючы ў якасці ідэалу *свабоду* ў абыходжанні з імі.

Да ўвогуле нешмалікага кола такіх творцаў, несумненна, належыць Мікола Купрэеў, паэт, для вершаў якога характэрны разняволенасць паэтычнага выказвання, набліжанасць мастацкага маўлення да паўсядзённага. У першым зборніку вершаў «Непазбежнасць» (1967), які на працягу амаль трох дзясяткаў гадоў заставаўся да таго ж адзіным, была ўжо досыць выразна абазначана гэта памкнёнасць да выяўлення лірычнага пачуцця ў свабоднай, не скаванай традыцыйнымі патрабаваннямі форме. Многія вершы з гэтага зборніка як бы заключалі ў сабе магчымасць іх далейшага разгортвання ў штосьці значна больш абсяжнае, у чым маглі б увасобіць абрысы шматстайнага, напоўненага рознымі праявамі і малюнкамі мастацкага свету.

Зрэшты, гэта, мабыць, рыса, агульная для тых аўтараў, якія аднолькава нязмушана адчуваюць сябе і ў паэтычнай, і ў празаічнай стыхіі. З твора ў твор, незалежна ад яго жанравай прыналежнасці, могуць у іх пераходзіць,

удакладняючыся і развіваючыся пры гэтым, адны і тыя ж вобразы і матывы. Можна ў гэтай сувязі згадаць, да прыкладу, Уладзіміра Караткевіча, творчасць якога вызначаецца незвычайнай цэласнасцю мастацкай сістэмы, цеснай пераплеценасцю і ўзаемаўзгодненасцю вядучых матываў.

У паэтычных і празаічных творах Купрэева даволі часта можна сустрэць вобразныя і сюжэтныя сыходжанні. Гэта сведчыць пра тое, наколькі істотным для аўтара з'яўляецца аўтабіяграфічны матэрыял, менавіта тое, што ім самім перажыта, адчута праз непасрэднае судакрананне з рэчаіснасцю. Цэнтральны герой і вершаў (якога мы звыклі менаваць лірычным героем), і прозы Купрэева — ён сам. Гэта відавочна. Разам з тым, у яго творах адчувальныя прысутнасць творчага вымыслу, скіраванасць на вырашэнне ўласна мастацкіх задач. *Літаратурнасць* пры гэтым не высоўваецца на першы план, яна прадстае перш за ўсё як спецыфічная ўмова пашырэння індывідуальнага вопыту, данясення яго да іншых. Вобразы і калізіі, мастацкія прыёмы і дэталі, асаблівасці сюжэтнага разгортвання — усё тое, што можна абазначыць агульным паняццем літаратура, выяўляюцца ў творах Купрэева ў самай шчыльнай спалучанасці з адчуваннямі, намерамі, асабовымі схільнасцямі і перакананнямі аўтара. Тое, што пры чытанні ўяўляецца нязмушаным і створаным быццам на адным дыханні, насамрэч вынік складанага ўзаемадзеяння індывідуальна-аўтарскага з агульналітаратурным.

Для кожнага сапраўднага творцы ў гэтым, мабыць, і ёсць найбольшая загадка: якім чынам у кожным канкрэтным выпадку судакранаюцца, уступаюць ва ўзаемадзеянне жыццё і літаратура. Як яны, нягледзячы на мяжу, што існуе паміж імі, узаемна ўзбагачаюць адно аднаго. У паэме «З сястрой і Уладзімірам Караткевічам на Рагачоўшчыне» на заўвагу сястры пра тое, што ўсё з перажытага, што ўзнаўляецца ў творах, «гэта — літаратура», аўтар адказвае здзіўленым запытаннем: «Сястра! Няўжо ты на ганку роднай



хаты, Караткевіч пад бярозамі ля Дняпра, і я ля вас, і ўсе мы тут, мёртвыя і жывыя, — літаратура?..».

Такая гранічная набліжанасць да рэальна перажытага аўтарам адчуваецца ў аповесцях Купрэева, якія склалі кнігу «Палеская элегія» (2007), што была выдадзена пасля ўжо яго адыходу з жыцця. І разам з тым я не аднёс бы гэтыя празаічныя творы паэта да аўтабіяграфічнага жанру ў яго «чыстым» выглядзе, хоць цыкл купрэеўскіх аповесцей і ўспрымаецца як своеасаблівае «падвядзенне вынікаў», падсумаванне жыццёвага шляху. Найперш гэта ўсё-такі працяг пошукаў адэкватнай мастацкай мовы, здольнай выявіць жыццёвы вопыт у эстэтычна ўспрымаемай форме.

Кожная з пяці аповесцей, змешчаных у зборніку, адрозніваецца сваёй адметнасцю ў падачы жыццёвага матэрыялу, арганізацыяй мастацкай прасторы аповеда. У кожнай з іх — па-свойму разгортваюцца адносіны паміж героем-апавядальнікам і тым мастацкім светам, які адначасова прадстае і як жыццёвае асяроддзе, якое ім асвойваецца, і як мастацкая рэальнасць, якая ім жа самім прадукуецца. Так, напрыклад, у пачатку першай аповесці — «Дзіцячыя гульні пасля вайны» — якраз спецыяльна акцэнтуецца сітуацыя *расказвання,* стварэння твора як бы на вачах у чытача. Пры тым аказваецца, што гэта *перастварэнне*, узнаўленне раней страчанага тэксту. Дакладней кажучы, аўтар прызнаецца, што ўзнавіць у тым жа самым выглядзе свой твор ён «не мог», паколькі «тыя старонкі пісаліся на адным узроўні дыхання, на нейкім адным узроўні нервовага напружання».

Гэтыя развагі апавядальніка пра значэнне «дыхання» для творчага самавыражэння адразу вымушаюць згадаць падобнае выказванне самога аўтара — на гэты раз у дачыненні да паэзіі: «Верш — гэта дыханне яго творцы на той час, калі ён, верш, «выліваецца». Такое супадзенне поглядаў, выказаных пісьменнікам у інтэрв'ю, з тым, пра што гаворыцца ў яго творы, уяўляецца досыць паказальным, выступаючы сведчаннем таго, што ў мастацкім свеце

пісьменніка так або інакш выяўляюцца яго эстэтычныя погляды, яго мастакоўская сутнасць.

Патрэбна ўвогуле зазначыць, што даволі складаная сюжэтна-кампазіцыйная пабудова празаічнай кнігі Купрэева вызначаецца мастацкай цэласнасцю, суаднесенасцю і ўзаемазгодненасцю ўсіх яе элементаў. Кожная з аповесцей, выяўляючы асобны этап у жыцці героя, вызначаючыся адметнасцю апавядальнага ладу, разам з тым пэўным чынам звязана з іншымі, утвараючы агульную мастацкую прастору. Жыццё цэнтральнага героя аповесцей, *alter ego* аўтара, паўстае ў розных часовых зрэзах, значна аддаленых адзін ад аднаго пластах яго экзістэнцыйнага вопыту, аднак разам з тым выстройваецца ў пэўнай лагічнай, прычынна-выніковай паслядоўнасці, выяўляецца ва ўзаемазвязанасці і дапаўняльнасці асобных эпізодаў, дэталей, адчуванняў. Такая прырода мастацтва, што яно збліжае, ушчыльняе найбольш істотныя жыццёвыя моманты чалавека, надае ім цалкам адметную перспектыву бачання.

Кампазіцыйная цэласнасць «апавядання ў апавяданні», якім адкрываецца зборнік, абумоўліваецца ўнутранай спалучанасцю рознаскіраваных пунктаў гледжання аўтара-апавядальніка на сябе і свет — і з боку жыцця, і з боку мастацкай рэальнасці. Тое, што адклалася ва ўспамінах, не проста згадваецца ў нейкі прыдатны для гэтага момант, але наноў перажываецца, уваходзіць паўнапраўнай складовай часцінай у жыццёвую прастору, якая разгортваецца *тут* і *цяпер*.

Узяць хоць бы такую невялічкую дэталь: аўтар, які сядзіць у бальнічнай альтанцы і збіраецца прыступіць да напісання аповесці, назірае за некалькімі хворымі, што ідуць з рыдлёўкамі на могілкі капаць дол. І вось пачынаецца аповед. І пачынаецца ён якраз такім чынам, што зноўку запыняецца ўвага на тым жа самым прадмеце — рыдлёўках, на такой жа самай, па сутнасці, сітуацыі: «...Калі мужчыны ўзялі ў рукі рыдлёўкі і сталі засыпаць маму зямлёй...».



Вядома, немагчыма адназначна сцвярджаць, што менавіта дадзеная дэталь асацыятыўна выклікае ўсё тое, што разгортваецца затым у зладжаную паслядоўнасць мастацкага аповеда. І ўсё ж яна ўяўляецца невыпадковай, як увогуле нішто не бывае выпадковым у літаратурным творы, дзе мастацкая цэласнасць абумоўліваецца ўнутранай сувяззю ўсіх яе складнікаў. Паўтор адных і тых жа вобразаў і матываў у празаічных творах Купрэева наогул блізкі па сваім кампазіцыйным значэнні да аналагічнага прыёму ў паэзіі. У многіх выпадках гэта прыводзіць да метафарычнага пераасэнсавання рэальнасці, яе канцэптуалізацыі. Утвараецца іншая сістэма бачання, у якой прадметы і з'явы атрымліваюць шматбаковае, стэрэаскапічнае асвятленне, дзе магчымым становіцца амаль незаўважны пераход ад адной экзістэнцыйнай сітуацыі да іншай. Па меры разгортвання аповеда ад аднаго твора да другога, ён, як мне ўяўляецца, усё больш ускладняецца, дыферэнцыруецца, набываючы пры гэтым і асаблівую мастацкую цэласнасць.

Першая з аповесцей найбольш свабодна арганізаваная кампазіцыйна, у ёй вобразы і малюнкі далёкай пары маленства падаюцца як плынь успамінаў, якая абумоўліваецца і фарміруецца перш за ўсё скіраванасцю аўтарскіх думак і адчуванняў. Увогуле ўсе аповесці аб'ядноўвае такая агульная жанравая прыкмета, як *лірызм*, хоць у кожнай з іх ён атрымлівае своеасаблівае пераламленне. У «Дзіцячых гульнях пасля вайны» дыстанцыя паміж аўтарам і героем, мабыць, найкарацейшая. Гэта выяўляецца не толькі ў больш адкрытай *мемуарнасці* аповеда, але і яго форме. Часам, у найбольш узрушлівыя моманты, маўленне апавядальніка набывае рысы, уласцівыя паэтычнай мове, як гэта адбываецца, напрыклад, тады, як уцекачы-блакаднікі апынуліся раптоўна на лініі фронту. Так, пра гэта не *расказваецца,* а менавіта *пераказваецца*, як пра перажытае раней, спазнанае на ўласным лёсе, усім жыццём сваім зведанае. Перахоп дыхання ў інтанацыі апавядальніка — як бы водгулле тых даўніх адчаю і парыву*: «Мужчыны*

*сказалі, што вось-вось пачнецца бой, нашы будуць браць Рагачоў, а мы апынуліся паміж нашымі і немцамі, і нам трэба бегчы, бегчы за Збароўскую гару, за шашу — у лес, у лес, у лес»*. Лексічныя паўторы як фігуры паэтычнага сінтаксісу натуральна зліваюцца з размоўнай стыхіяй і, мабыць, немагчыма тут наогул размежаваць тое, што належыць майстэрству мастака, ад таго, што выклікаецца ў яго душы наплывам пачуцця.

Можна, вядома, спрабаваць і аналітычным шляхам ахарактарызаваць сілу эмацыянальнага ўздзеяння мастацкай формы, звярнуўшы, напрыклад, увагу на тое, што ў гэтым расказе пра ратаванне пераважаюць дзеяслоўныя формы як выражэнне дынамікі дзеяння, што мова аповеда перадае дынамізм сітуацыі кароткімі, бы сечанымі, аддзеленымі паўзамі, паўторамі-пералікамі. А можна проста працытаваць (бо ніякі аналіз не ўзновіць *музыкі* маўлення): *«І тады мы беглі, ішлі, паўзлі, падымаліся, падалі, на руках, пад рукі, абутыя і босыя, але ногі не чулі холаду, ногі нічога не чулі, яны толькі йшлі і беглі, і пхалі снег...»*.

Давядзецца вымушана абарваць цытаванне, бо інакш немагчыма было б спыніцца, паддаўшыся ўладарнай сіле жывога, імкнучага наперад слова. Якое, нягледзячы ні на што, злучае мінулае з будучым, сапраўдны боль са светлай надзеяй.

*2010*



***Сяргей ГРЫШКЕВІЧ***

# Адвечныя лісты з млына, альбо Пра тое, як паэт вершы ў прозу ператварыў

Паэт Мікола Купрэеў апошнім часам актыўна піша прозу. У жанравым вызначэнні — аповесці: «Палеская элегія» (1998), «Рэчкаю плывём, плывём...» (1999), «Пастух у Космасе» (2002). Некаторыя сцвярджаюць, быццам лепшых празаікаў, чым прафесійныя паэты, няма і быць не можа. І прыводзяць у якасці прыкладу І. Буніна, Б. Пастэрнака, Б. Акуджаву і іншых «сімбіёзных» пісьменнікаў. Мікола Купрэеў — найперш паэт, і ў прозе — невыпраўны лірык. Чарговая аповесць паэта М. Купрэева «Лісты з млына» апублікавана ў часопісе «Маладосць» (№4, 2004 год).

Па сваёй структуры твор складаецца з пралога, эпілога, пяці самастойных аповедаў-карацелек і адзінаццаці лістоў-прызнанняў да Яе; менавіта лісты, паводле аўтарскай задумы, звязваюць нераўназначныя ў сэнсавым плане часткі ў адное цэлае. Паказальна, што такая «хаатычнасць» у пабудове сюжэта не перашкаджае разуменню твора, наадварот, прыўносіць пэўную арыгінальнасць і стылістычную адметнасць. Аповесць напісана лёгка і нязмушана. Таму і не дзіўна, што ў літаратурных колах, у тым ліку Берасцейшчыны, яна выклікала пэўны ажыятаж. Прынамсі, пра яе і па сёння не сціхаюць спрэчкі.

Ужо ў прадмове М. Купрэеў раскрывае свае «карты», праводзячы аналогію з французскім паэтам Альфонсам Дадэ і яго «Лістамі з млына». Гэтак жа як, і ён, беларускі паэт паехаў на млын у нейкай глушы і шле адтуль лісты сваёй каханай, у нашым варыянце — «шаноўнай Кацярыне

Пятроўне, мілай Каці». Вядома, падобная паралель — толькі нагода, каб паразважаць над уласна дарагім і блізкім.

Лісты чаргуюцца з аўтарскімі тэкстамі-навэламі, у іх пісьменнік дзеліцца перажытым, прычым падзеі дзён мінулых падае выпукла, ярка і запамінальна.

Першы аповед «Сталін у Оршы па дарозе ў Патсдам» уяўляе фантазію на тэму праезду савецкім кіраўніком праз Беларусь у маі 1945 года. Пісьменнік упэўнены: наша дзяржава мае поўнае гістарычнае права на існаванне.

Другая гісторыя — «Беларуска-польскае пытанне» — прысвечана прынесенаму з маладосці каханню да полькі Сабіны, тым няспраўджаным марам і надзеям, якія суправаджаюць юначыя гады. Гэта своеасаблівы гімн жанчыне,здольнай на ахвяру дзеля кахання. У ідэале. Жыццё і твор паказалі іншае. Зразумела, што любоўная гісторыя з «донжуанскага» мінулага яе «Дон Кіхота» не спадабалася Каці: а як жа — адкрыта заяўляць жанчыне, што, апрача яе, былі калісьці і другія амурныя захапленні. У шчырым наіве М. Купрэеву не адмовіш.

Навэла «Як студэнт Алег быў «стукачом"» ужо больш прыземленая і расказвае пра вярбоўку органамі КДБ у верасні 1956 года студэнта-філфакаўца для супрацоўніцтва, «здачы» сяброў і выкладчыкаў пvärldінстытута. І тут аўтар расстаўляе маральныя акцэнты, зыходзячы з агульначалавечых прынцыпаў: нельга здрадзіць уласнаму сумленню. З гэтым прыйдзецца жыць.

Прыкладна пра тое ж драматычная навэла «Хроніка студзеняў», дзе падзеі далёкай вайны адгукаюцца рэхам у сённяшнім — немінучай расплатай за здзейсненае дзеля выратавання сябе. Гады ідуць — і цяжар грахоў усё большае, робіцца нясцерпна-невылечнай душэўнай пакутай.

Жыць вечна на млыне памяці нельга. Паэт К. вяртаецца ў горад, на прывакзальнай плошчы адбываецца сустрэча Яго і Яе, самотнае восеньскае развітанне, з познімі кветкамі і несціханым жалем аб страчаным назаўжды...



Адзіная ўцеха — у горкім самапазнанні: «...як добра галаве і сэрцу, калі на гэтай зямлі нас сустракаюць і праводзяць жанчыны, хай сабе іншы раз і здаля...».

Лірычна-шчымлівая плынь аповесці не пакідае абыякавым. Перад табою чалавек наросхрыст, з усім багажом няспраўджаных інтымных адчуванняў, жыццёвай мудрасцю, якая палёгкі не прыносіць. Вось як псіхалагічна тонка напісаў паэт свой восьмы ліст: «Мілая Каця! Усё сваё астатняе жыццё буду памятаць твой прыезд да мяне, буду памятаць, як ішлі мы з хутара на млын, як ты спынілася ля куста каліны і задуменна ўзяла ў далонь яе ружовую гронку, як стаяла пад бярозай і начамі шукала ў вецці верабейку, а ён дзесьці ўгары над табой чырыкаў: як нізка ты нахілілася над ужо адцвілай грэчкай, як мы ўзышлі на млын, як прысела ты на маю калодку, паклала рукі на «стол», як мы падышлі да вакна і глядзелі ў поле, як прыйшлі на бераг рэчкі і жабкі з вады віталі цябе інтэлігентнымі лупатымі вачамі і ўрачыста скакалі з вады на шырокае лісце гарлачыкаў, як пасля мы ўрэшце перапльілі рэчку... У пушчы я называў цябе любімай, каханай. Ты маўчала, я цалаваў твае слёзы. Ты маўчала...

Пушча была нашай. Дзякуй табе, любая жанчына, за маё неймаверна вялікае, на ўсё астатняе жыццё шчасце.

Я толькі прасіў цябе быць са мной на «ты». Згадзілася. А калі мы вярнуліся на свой бераг, ты зноў чамусьці стала са мной на «вы». Навошта, Каця?..»

У беларускай прозе апошніх гадоў рэдка калі сустрэнеш падобную шчырасць, без штучнага схематызму ў дыялогах, ненатуральных паводзін, серыяльнай тэатральнасці, навамодных сэксуальных выкрунтасаў. Аказваецца, пра каханне можна пісаць так, каб быць сучасным ва ўсе часы. Каб табе верылі, як уласнаперажытаму. Хоць і не прапушчанаму цераз млын запознена спасцігнутай ісціны, ужо непатрэбнай у сівой сталасці гадоў.

*Таццяна ГАЎРЫС*

# Вяртанне ў юнацтва

Маё студэнцкае юнацтва прыпадае на 1957–1962 гады: Брэсцкі педінстытут імя А. С. Пушкіна, філалагічны факультэт, паездка на цаліну, сяброўства з Міколам Купрэевым, якое хутка перарасло ў каханне.

Добра памятаю першую сустрэчу. Ужо даўно ідуць заняткі, мы старанна вучымся, слухаем лекцыі, канспектуем іх. Нечакана ў аўдыторыі з'яўляецца новы студэнт. Ён уладкоўваецца якраз за маёй спінай і строчыць эпіграмы, вершы і нават паэмы. Гэта і быў Мікола Купрэеў. У адрозненне ад нас, учарашніх школьнікаў, ён ужо меў жыццёвы вопыт, шмат чаго пабачыў, вандруючы па краіне. Івацэвіцкую школу скончыў у 1955 годзе, спрабаваў паступаць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на факультэт журналістыкі, ды не прайшоў па конкурсе. Лёс занёс яго ў геалагічную партыю і кудысьці яшчэ, аб чым успамінаць тады не хацеў і не любіў. Праз год быў залічаны ў Брэсцкі педінстытут, але займацца не стаў — узяў акадэмічны адпачынак. І вось цяпер сядзіць побач і дасылае мне запіскі-гумарэскі: «Я б давно уже уехал в Тавриз иль в какой-нибудь полуденный Шираз, если б не было здесь, в Бресте, Гаврис и её сверлящих и суровых глаз...»

Чытаючы іх, я глядзела на Колю з дакорам, гаварыла, што займаецца глупствам, лепш бы слухаў выкладчыка і запісваў «разумнае, добрае, вечнае...»

Неўзабаве прыйшла першая студэнцкая вясна, зацвілі акацыі і каштаны. Рыхтуючыся да экзаменаў, мы, першакурснікі, адпраўляліся ў крэпасць, дзе было ціха, ніхто не перашкаджаў. Па дарозе дамоў у інтэрнат аглядалі руіны, любаваліся зараснікамі чаромхі і бэзу. Разам з намі, купкай вясёлых, гарэзных дзяўчат, часта блукалі і юнакі (іх у групе было ўсяго пяць), яны дарылі нам букеты чаромхі і палявых кветак. Коля стараўся быць побач са мною і маёй сяброўкай-зямлячкай Жэняй Баранковай. Рамантычны юнак, цікавы суразмоўца, ён мог падоўгу пранікнёна дэкламаваць вершы і паэмы Аляксандра Блока, Сяргея Ясеніна і свае таксама. Я ўжо ведала, што вырас ён без маці (яе ў вайну немцы застрэлілі), бацька ажаніўся з маладой жанчынай, якую Коля і яго сястра Валя амаль не цікавілі, а сваіх дзяцей ёй Бог не даў. Стала вельмі шкада сімпатычнага таленавітага юнака, вершы якога хваліў сам Уладзімір Калеснік (ён выкладаў у нас сучасную беларускую літаратуру і кіраваў творчым гуртком, дзе абмяркоўваліся «першыя спробы пяра»). Я паверыла ў яго дар, раіла не пісаць на рускай мове, бо на роднай яго лірыка лепш гучыць, мацней кранае сэрца. А ён працягваў гаварыць мне пра сваё каханне па-руску: «Отдай мне свой пламень, отдай на века — все годы твои пронесу на руках...» (недзе гады два яшчэ пісаў на дзвюх мовах, пакуль не пасталеў).

Пасля летняй сесіі ў ліпені 1958 года нас, першакурснікаў-камсамольцаў, накіравалі ў Казахстан у Акмолінскую вобласць на ўборку цаліннага ўраджаю, прычым арыентавалі на летнія месяцы, а затрымалі аж да замаразкаў (вярнуліся дахаты ў лістападзе). Аб гэтай цаліннай эпапеі раскажа ў сваіх успамінах Вольга Іванаўна Ратнікава — наша абаяльная аднакурсніца Волечка Жыткоўская.

Другі студэнцкі год запомніўся частымі спатканнямі, я ўжо і маму нават пазнаёміла з Колем, калі яна прыязджала да мяне ў госці. Ён жа папрасіў у яе маёй рукі, ды пачуў у адказ, што яшчэ рана заводзіць сям'ю, трэба спачатку закончыць вучобу. Мудрая маміна парада засталася па-за ўвагай, бо мы ў жніўні 1959 года зарэгістравалі свой шлюб у Брэсцкім ЗАГСе.

Паэзія саступіла месца прозе. Адразу ж пазнаёмілася з бацькам Колі, і Сямён Іванавіч расказаў пра цягу сына да алкаголю пасля таго, як яго, яшчэ хлапчука, у геалагічнай экспедыцыі далучылі да чаркі. «Нічога, — сказала я, —

ён кахае мяне, дапамагу яму справіцца з гэтай звычкай». Бацька толькі паківаў галавой...

На трэцім курсе пачаліся і матэрыяльныя праблемы. Пакой у інтэрнаце нам не далі, прыйшлося ісці на кватэру. Пасля зімовай сесіі стыпендыю Коля не атрымаў, і таму перавёўся на завочнае аддзяленне (1960 г.), уладкаваўшыся на працу ў рэдакцыю Драгічынскай раённай газеты, дзе, відаць, не ўсё ў яго заладзілася, бо прыязджаў да мяне ў Брэст заўсёды галодны, без грошай, шукаў іншае месца. І знайшоў. З 1 студзеня 1961 года стаў настаўнічаць у Пранчакоўскай сярэдняй школе Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, выкладаў там беларускую літаратуру. Туды адразу ж тэлеграмай выклікаў і мяне («Без тебя пропаду здесь!»). Здаўшы экзамены на павышаную стыпендыю (гэта 50 рублёў), я перавялася на завочнае аддзяленне і паехала «ратаваць» мужа. З 1 лютага я ўжо працавала там настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў старэйшых класах. Мой заробак складаў 57 рублёў (стаўка з незаконачанай вышэйшай адукацыяй была тады 60 рублёў, з вышэйшай — 80), а ў Колі і таго меней, ды і не заўсёды даносіў грошы дамоў: было многа іншых шляхоў — «сябры» чакалі ў Ляхавічах, Баранавічах, Ганцавічах... Цяжкасцей хапала. Кватараваць давялося на хутары, у хаце не было электрычнасці, рыхтавацца да ўрокаў і правяраць сшыткі трэба было ля керасінавай лямпы, а страву варыць на керагазе ў халодных сенцах. Але гаспадыня была добрая, спагадлівая, прадавала нам малако, дапамагала парадай.

Нягледзячы на ўсё гэта, працаваць было цікава і радасна. Школа знаходзілася ў былым панскім маёнтку, месца маляўнічае, калектыў дружны. Яго ўзначальваў мудры кіраўнік Іван Васільевіч Малец. Жонка яго працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры. Жылі яны ў новым доме каля самай школы, дзе пазней кватаравалі і мы, калі І. В. Малец прадаў дом і пераехаў у Дзяржынскі раён Мінскай вобласці. Дарэчы, сам таго не жадаючы, Коля «пастараўся», каб школа страціла добрага дырэктара. А было гэта



восьяк. Каб прысвоіць звеннявой калгаса званне «Героя Сацыялістычнай Працы», ёй прыпісалі ўраджайнасць цукровых буракоў. Мы, настаўнікі, разам з вучнямі выбіралі буракі і падлічылі, колькі іх вырасла на калгасным полі. Лічбы былі далёка не тыя, што друкавалі раённая і абласная газеты. Коля абурыўся, захацеў вывесці на чыстую ваду мясцовых партыйцаў і напісаў аб гэтай «ліпе» XXII з'езду КПСС. Памятаю, як мой няўрымслівы муж збіраў подпісы. Дарэчы, я адмовілася падпісацца і пацікавілася, што думае аб гэтым «пасланні» дырэктар. Зразумела, што ён не адобрыў такога парыву, і як у ваду глядзеў. Пісьмо з Масквы адаслалі мясцовым уладам, тыя арганізавалі праверку школы, і як вынік — дырэктара звольнілі з пасады.

Вучні любілі нас, маладых настаўнікаў, а мы стараліся праводзіць цікавыя гутаркі на ўроках, літаратурныя вечарыны, хадзілі з імі на экскурсіі і ў паходы па родным краі.

А працаваць было нялёгка: на 4 курсе я практыку прайшла толькі ў 5—7-х класах, а выкладаць давялося ў 9—10-х, і класным кіраўніком назначылі ў 10 клас, а ў Колі наогул не было практыкі — толькі рэдакцыйныя будні. Даводзілася многа чытаць, займацца самаадукацыяй і мерацца сілаю з «зялёным зміем».

Мне яшчэ верылася, што каханне ўсё пераадолее, а Чалавек паднімецца над сваімі слабасцямі, калі захоча.

Думала, змагу дапамагчы. Не дала рады. Нават нараджэнне дачкі ў 1962 годзе нічога не змяніла. З ёю паехалі мы здаваць дзяржаўныя экзамены, на якія Коля амаль не звяртаў увагі, як і на мяне з дзіцем. Ён прападаў вечарамі на творчых сустрэчах, ездзіў па сёлах і райцэнтрах Брэстчыны, дзе чытаў свае вершы, з'яўляўся на кватэру раніцай, радасны і акрылены. Я ж, не спаўшы ўсю ноч (у дачушкі рана пачалі рэзацца зубкі), хвалявалася і за яго, і за экзамены, якія належала здаць. І ўжо тады, у 23-гадовым узросце, зразумела, што ні я, ні дзіця, ні вучоба, ні праца майго мужа не цікавяць, што галоўнае яго прызначэнне — творчасць і ён па-юнацку лётае ў нябёсах, шукаючы

натхнення ў новых сустрэчах, у прыродзе, а магчыма, і ў выпіўцы...

Здаўшы выпускныя экзамены, атрымаўшы дыпломы, мы разбегліся: Коля застаўся ў Брэсце, а я паехала дамоў у Клецкі раён адна з шасцімесячным дзіцём. У Сіняўцы нас сустрэла мама, у якой мы адпачылі да пачатку новага навучальнага года.

Праз два тыдні з'явіўся туды і муж, папрасіў прабачэння за свае загулы, абяцаў ледзь не залатыя горы. Хацелася верыць, што ён пасталеў і ўсё ў нас наладзіцца... Коля многа пісаў, рыхтаваў да друку ў раённай газеце новыя вершы і часта падоўгу гуляў на беразе Начы (была такая жывапісная рачулка ў вёсцы Панача, багатая рыбай, ракамі і крынічкамі. На жаль, цяпер яна ператварылася ў канаву — пастараліся меліяратары).

Хутка настаў час вяртацца ў Пранчакі, бо адпачынак скончыўся. Там я і даведалася, што ў мужа многа даўгоў (і сельскіх, і брэсцкіх — добра «замочваліся» нараджэнне дачкі і атрыманне дыплома), а разлічвацца трэба мне, так у нас было прынята. Грошай жа не было... «Любовная лодка разбилась о быт».

Непаразуменні раслі, што не спрыяла збліжэнню. У мяне пачаліся нелады са здароўем. Таму летам 1964 года мы разышліся: Коля паехаў настаўнічаць на Палессе (Ганцаўшчыну), а я засталася ў Пранчаках.

І хоць мы працавалі ў адным раёне, лёс нас не зводзіў болей разам. Жыў Коля як вольны вецер. Дачку не наведваў, аліменты не плаціў (я адмовілася). Сустракаліся мы толькі ў раённым судзе, які нас не разводзіў — усё давалі выпрабавальныя тэрміны. І толькі Брэсцкі абласны суд (выязны, у горадзе Баранавічы) у сакавіку 1965 года скасаваў наш шлюб, і я зноў атрымала дзявочае прозвішча.

Ведаю, што афіцыйна Коля яшчэ два разы жаніўся, ад трэцяга шлюбу нарадзіўся сын Андрэй, недзе на 4 гады малодшы за нашу дачку.



Адзінае, што засталося ў мяне на памяць — першы зборнік вершаў «Непазбежнасць» (1967 г.), куды ўвайшлі лепшыя творы, напісаныя ў пачатку 60-ых гадоў, і прозвішча дачкі...

Я заўсёды сачыла за яго творчым ростам, чытала публікацыі ў «ЛіМе», «Маладосці», «Нёмане», «Полымі» і «Крыніцы». Мяркую, што ён змог бы надрукаваць значна болей, каб не губляў запісныя кніжкі і сшыткі з вершамі, нарысамі і замалёўкамі.

На жаль, рана пайшоў Мікола з жыцця. Цярністым быў яго шлях, і не нам судзіць паэта. Бязгрэшных людзей няма. Цяпер адзін Бог яму суддзя, дарэчы, як і ўсім нам. Непрыемна чытаць публікацыі кшталту, колькі рублёў і ў каго пазычаў паэт і не разлічыўся...

Галоўнае, што творы яго жывуць, лірычная споведзь кранае сэрца, і, здаецца, што ён тут, побач з намі, жартуе, усміхаецца, разважае...

Пісаць успаміны было балюча. Хочацца пажадаць усім маладым і таленавітым не губляць свой дар, Богам дадзены, а берагчы і развіваць яго.



• *Мікола Купрэеў. Сталыя гады*

*Жнівень 2007 г.*

***Ірына РУДКОЎСКАЯ***

## «Я ганаруся...»

Хачу напісаць пра Міколу Купрэева, якога я ведала больш як сорак гадоў. Першая сустрэча адбылася, калі ён летам прыехаў да майго брата, паэта Міхася Рудкоўскага ў вёску Востраў на Ганцаўшчыне, дзе Міхась праводзіў свой

водпуск. Было гэта на пачатку 60-х гадоў. Я тады вучылася ў класе дзявятым ці дзясятым.

Мікола пасля таго бываў у Востраве ў бацькоў і з Міхасём, і без яго. Мама ўсіх сяброў Міхася сустракала і прывячала вельмі гасцінна. Па-мацярынску сустракала яна і Міколу. Потым, калі бацькоў не стала, у роднай хаце засталася жыць (і цяпер жыве) наша сястра Ліда. Паранейшаму Мікола бываў у Востраве, толькі ролю гасціннай гаспадыні ўзяла на сябе ўжо Ліда.

А я, адвучыўшыся ў Брэсцкім педінстытуце, вярнулася на Ганцаўшчыну настаўнічаць. І ў час сваіх вандровак Мікола не мінаў і маю хату, знаходзіў тут і прытулак, і адпачынак. Жыў па тыдні і больш. А калі ад'язджаў, я старалася пакласці ў яго карычневы партфель што-небудзь на дарогу, а ў кішэню совала які траяк на цыгарэты.

Неяк, расказваючы мужу пра тое, як Купрэеў кругом пазычаў, кажу, што я не чакала, калі Мікола папросіць пазычыць яму грошай, а апярэджвала гэтую просьбу. Муж і кажа мне:

— А я, каб і ты не ведала, запіхваў яму ў кішэню траяк-другі...

Дык вось у час гэтых прыездаў я старалася, каб ён хоць крыху адчуў дамашнюю ўтульнасць, адпачыў, па-чалавечы сталаваўся.

З кожным новым наведваннем ён выглядаў усё горш і горш. Суставы круціў артрыт, хварэў на сухоты, страшэнна кашляў... Яго было вельмі шкада. Ці то была наканаванасць лёсу, ці то сам чалавек быў вінаваты, ці то абставіны складваліся не на яго карысць — не нам судзіць. Але гэта быў Чалавек. І па агульначалавечай маралі, і па хрысціянскай таксама ён заслугоўваў міласэрных адносінаў да сябе. Дзякаваць Богу, што я гэта разумела і тады, калі гэтага яшчэ можна і не разумець — у маладосці.

Гэта быў чалавек надзвычай трагічнага лёсу. І гэты трагізм суправаджаў Міколу з дзяцінства да самага скону. Не прывядзі Гасподзь перажыць тое, што перажыў



ён у дзяцінстве. На яго вачах паліцаі катавалі маці, а потым, яшчэ жывую, закідалі зямлёю. А яго няўдалыя спробы стварыць сям'ю, адну, другую? А яго складаныя ўзаемаадносіны з бацькам? Літаратурнае забыццё пасля «Непазбежнасці», потым вось-вось Дзяржпрэмія за «Правінцыйныя фантазіі», воля лёсу — і прэмія дастаецца другому. А ён жа, гаротнік, ніколі не плакаўся, не жаліўся, ніколі, я паўтараю, ніколі ні на кога не крыўдзіўся. Асабіста я ставіла яго ў прыклад як стойкага чалавека, які цярпліва пераносіў усе жыццёвыя складанасці і не стаў жорсткім да людзей. Можна ўявіць, якія фізічныя мучэнні пераносіў ён! А маральныя?!

Дарэчы, бацьку Міколы я не разумею, хоць і асуджаць не маю права. Я, можа, не ўсё ведаю ў іхніх адносінах. Але ганарыцца сынам, калі ў яго ўсё добра было, і адцурацца, калі той стаў весці «няправільны» лад жыцця?! Дык хто ж павінен прыйсці на дапамогу, як не самы родны табе чалавек? Дзякаваць Богу, што сястра яго прывячала. Ды і яшчэ, што ў Міколы было шмат сяброў, якія прымалі яго, якім бы ён ні быў. Да прыкладу, А. Крэйдзіч, які пісаў: «Асабіста я ганаруся тым, што падчас вандровак ён не абмінаў і маё жытло, начаваў, чытаў вершы яшчэ ў рукапісах». Зноў жа В. Грышкавец у эсэ «Вот пришел анахорет Купреев» зусім не крыўдна піша і пра яго згубную звычку, і, цёпла, пра свае сустрэчы з Міколам, і не цураецца новых сустрэч з тады яшчэ жывым паэтам: «...Но где бы ты ни был, что бы ты ни делал, брат Микола, дай Бог тебе здоровья, а нам — встречи на нашей горькой, нашей доброй, нашей родной земле».

Зусім па Дастаеўскаму!

Дзякуй і спадару А. Беламу за добрыя словы пра свайго земляка ў «ЛіМе». Яшчэ большы дзякуй паважанаму В. Макарэвічу, за артыкул «Нельга маўчаць», за яго заступніцтва за Міколу. Я — з Вамі.

А табе, Мікола, светлая памяць... Я памалілася за спакой тваёй змучанай душы і за тое, каб Усявышні дараваў усе твае зямныя грахі.

Асабіста я ганаруся, што была знаёмая з гэтым чалавекам, таленавітым, самабытным паэтам, які ў час сваіх вандровак завітваў і да нас, што ў маім доме ён адчуваў сяброўскія адносіны да сябе, што і муж мой, і мае сыны ведалі гэтага чалавека і цёпла ставіліся да яго.

*P.S.* А зборнік «Непазбежнасць» з вельмі лірычным аўтографам Міколы пасля аднаго з яго візітаў да нас прапаў. Шкада. Але ж я ведала, што ён (зборнік) саслужыў яму добрую службу — быў замест пашпарта.

Прабачце. Не перачытваю, бо баюся, што не рашуся адправіць. Можаце вольна карыстацца маім матэрыялам. Хацелася б, каб надрукавалі, каб людзі зразумелі паэта...

*26 сакавіка 2007 г., вёска Хатынічы Ганцавіцкага раёна*

***Іван ШТЭЙНЕР***

## Мост над зачараванай ракой

*На помніку вялікаму філосафу і паэту Рыгору Скавaрадзе напісаны крылатыя словы: «Свет лавіў мяне, але не спаймаў».*

Паэты і філосафы ўсіх часоў і народаў марылі аб белай вежы са слановых біўняў, дзе яны змаглі б схавацца ад гэтага вялікага спакушальніка, што перашкаджае ім выканаць боскае прадвызначэнне і наканаванасць. Менавіта схавацца, бо змагацца з ім немажліва. Але часцей за ўсё яны ў вечных пошуках ідэалу, сіняй птушкі, духоўнага



Эльдарада ператварыліся ў вечных вандроўнікаў, пілігрымаў, агасфераў.

Такім і быў Рыгор Скаварада, які, кінуўшы такую прэстыжную і грашовую, як сказалі б цяпер, працу ў Харкаўскім калегіуме, на тры дзесяцігоддзі сыходзіць у народ і да самай смерці вандруе на Слабадской Украіне, прапангадуючы свае ідэалы не толькі ўласнымі творамі, многія з якіх фальклярызаваліся, але і жывым словам, і самім ладам уласнага жыцця.

З самага маленства Арцюр Рэмбо не мог нідзе знайсці сабе прыстанку — ні ў сям'і, ні ў родным краі, з гадамі толькі пашыралася прастора ягоных вандраванняў: Францыя змянілася Амерыкай і Малайзіяй. І толькі гангрэна і, як вынік, ампутацыя нагі спыняе фізічную і віртуальную вандроўку вялікага бадзяжніка і па сумяшчальніцтве рэфарматара паэзіі.

Эдгар По адначасова шукаў сябе паўсюдна і ўцякаў ад сябе, таму і памёр непазначаным на лаўцы невядомага парку невядомага яму горада.

Куды і ад каго ўцякалі паэты, каго шукалі?.. У шэрагу згаданых вышэй творцаў (а спіс можна працягваць бясконца) выразна бачыцца і постаць беларускага паэта Міколы Купрэева, які ўвасобіў у сябе і абязножанасць француза, схільнасць да acva-vitae амерыканца, філасофскае бадзяжніцтва ўкраінца. Тым болей, што ён па-майстэрску спалучыў, як і яго вялікія папярэднікі, рэальнае жыццё і літаратурны пачатак, а таму цяжка адрозніць, дзе першае, а дзе другое.

Невыпадкова ў фінале сваёй другой кнігі ўсклікаў: *«Сястра! Няўжо ты на ганку роднай хаты, Караткевіч пад бярозамі ля Дняпра, і для вас, і ўсе мы тут, мёртвыя і жывыя, — літаратура?..»*

Сам паэт ужо за смугой часу, таму спалучэнне міфу і рэальнасці правамернае. Нарадзіўшыся на Рагачоўшчыне ў 1937 годзе, зведаўшы жахі вайны, у дзесяцігадовым узросце вымушаны пакінуць маленькую радзіму, да якой

назаўсёды захавае самыя цёплыя пачуцці, і пераехаць на Палессе, дзе здабудзе вышэйшую адукацыю, сталую працу (завуч, настаўнік), але потым усё пакіне-забудзе і пачне бадзяжнічаць-вандраваць па Брэстчыне, наводзячы жах на мясцовае начальства і выклікаючы жаль і спагаду ў нешматлікіх сяброў, перш за ўсё мастакоў і пісьменнікаў.

Мікола Купрэеў задаваў сабе анталагічнае пытанне: *«Як мне жывецца ў маім Хаосе?»* Горка-самотная чара, якую паднёс паэту Хаос, пераварочвае звыклае светаўспрыманне, менавіта таму ў ягоным свеце разам жывуць смех і слёзы, каханне і здрада, ціша і тлум, а ў адну і тую ж хату заходзяць акупанты і госці. Сімвал роднага краю, апетая белая птушка дарэмна ладкуе гняздо на Каложы, ратуючы сябе Святым Духам, бо ўжо крывінкай сцякае пад Сожам, тужліва клякоча пад Бугам.

Матыў расстання — асноўны, вядучы, дамінуючы, і асабліва ён уражвае, калі гучыць адтуль, куды ўзносяцца малітвы аб літасці і даступніцтве:

Жураўлі журлівыя мае —
праплывае новае растанне.
Зноў над Шчарай
шчыры крык растане —
ў гэтым свеце вечна не стае...

Птушкі — найважнейшая частка сусвету М. Купрэева, бо ўжо не столькі славяць Бога і створаны ім сусвет, яны, нібы дазорцы ў Кіплінга, першымі ўздымаюць трывогу. Яны роўнавялікія ў сваёй значнасці і векавым прызначэнні — птахава крыло і рука паэта. Невыпадкова М. Купрэеў марыць стаць пасля сыходу з зямлі калі не птушкай, то хаця б яе крылом.

Найбольш яскрава і тужліва ўвасоблены роспач расстання з былым у паэме «З сястрой і Уладзімірам Караткевічам на Рагачоўшчыне», дзе згубленыя векавыя бярозы, алешнікаў вал у былым балотцы, «Галашэнне русалкі» з маленькай слязы-ўспаміну перарастае ў лямант, трэнас. Так рабілі жанчыны-плакальшчыцы, што пасля вайны хадзілі па вёсках: *«Пачыналі галасіць ціха-ціха, потым — рыдалі на ўвесь свет і канчалі зноў ціха...»*

Той свет, калі можна было жыццё апантана ўдыхаць, таропка, аж захлынаючыся, дзівіцца лотаці на лугавіне, збіраць у жменю травы па расіне і ёй умывацца, знікнуў назаўсёды, застаецца толькі стаць на калені на доле зямным і ўзнесці, як Богу, малітву радзіме:

Не трэба мне больш нічога —
дзякуй за поле.
І ў далях далёкіх,
куды адвядуць мяне ціха,
мне цяжка не будзе —
будзе вечна і лёгка.
Тваё зерне ў зямлі свіціцца...

Вось чаму ён не будзе станавіцца ў позу аратара ці нават пракурора і шукаць вінаватых у трагедыі. Вінаваты ўсе, у тым ліку і літаратура. Так лёгка ўсё мяняецца ў свеце: «... *сёння — стол пад веснавое свята, заўтра — памінальны стол*». І ўчора ён быў як Бог, як Пан (старагрэцкі!), лес быў ягонымі пенатамі, бярозы прывялі сваіх *беразанятак* (як прыгожа!) паслухаць казку і каб ім расчасалі косы-вецце. Сёння гучыць «Новая беларуская песня», у якой маці тлумачыць па-новаму класічныя дзявочыя сны: не будзе ў яе дачушкі вяночка, гняздзечка, жаніха, бо ўзышоў Чарнобыль, а таму плача Беларусь, з якой дзікімі гусямі лятуць новыя душы.

Не заіржуць коні, што некалі ляцелі на Грунвальд і Воршу, бо цяперашніх іх нашчадкаў павязуць у Гродна тыграм; алешына з-пад Начы згарэла ў печы і ператварылася ў хмарку... Хаос, як і ля вытокаў Быцця, заняў месца Бога, а плач русалкі падхопліваюць звяры, птушкі і людзі.

Нежаданне жыць сярод людзей, *так, як усе,* у паэтаў тлумачыцца па-рознаму. Байран шукаў *«прибежище среди безмолвного мира звезд и волн, потому что боялся лю-*

*дей»* (А. Маруа), герой навэлы Э. По, шукаючы адзіноты сярод натоўпу, пачынае нагадваць д'ябла.

Нешта іншае бачыцца М. Купрэеву ў пасланні «Юліану Тувіму»:

Як помста
будзеш ты блукаць па свеце
ад народа да народа...
Не замяце ніколі вецер
твае сляды ад Палесціны
да Варшавы,
ад магілы да Наўрота.

Ён амаль тэкстуальна паўтарае славутае купалаўскае: *«А хто там па мосце шырокім з немай ідзе журбой?»*. Але адказ далёка не аптымістычны:

Беларусь мая ціхімі крокамі...
Мост над глыбокай вадой.
Мы ўсе адыходзім, каханая,
з гэтай юдолі зямной.

Для М. Купрэева значна бліжэй «Паязджанне», з іх незразумелай вандроўкай па краі. Родны край — гэта адзіная суцэльная дарога, якая становіцца сімвалам руху, часцей за ўсё броўнаўскага, неўсвядомленага, а таму бессэнсоўнага. Усё жыццё праходзіць ля трасы Масква — Варшава («Рэліктавы беларус»); жыццё плыве між берагоў у неба; рэкі (Ясельда, Прыпяць, Лань, Нача, Дняпро) ператвараюцца ў дарогі; у страшэнную вандроўку ператвараецца апошняе вяртанне на радзіму чэрапа Каліноўскага (аднайменны верш)...

Беларуская літаратура ў асноўным імкнулася ў неба, *да сонца, да зор*. Хаця мы памятаем і купалаўскае — «раскрыйся нанова магіла, страшней цябе людзі і свет». У вершы ў прозе «2086 г.» як бы ўзнаўляюцца падзеі праз стагоддзе з дня сусветнай тэхнагеннай катастрофы.



Збываецца мара Дзяржавіна, чалавек з цара нарэшце ўвасабляецца ў самае прымітыўнае стварэнне:

*Чарвяк я. Чырвонай халоднай вадою напоўнены клеткі майго пакручастага цела. З падземнае цемры выпаўз наверх праз калючы пясок у світанак золкі пад дубам струхнелым. Не ведаю: восень? вясна? Навокал ні лісціка, ні травінкі. З чорных комінаў Калыбані белы чарнобыл-палын у жоўтае неба віецца.*

Істота, у якую ператварыўся паэт, усё разумее, адно сказаць нічога не можа, таму і піша-малюе згібамі цела на вострым пяску (новая форма літаратуры — *sik!*). Чарвякі, у якіх ператварыліся некалі слынныя людзі, што мелі адносіны (станоўчыя і не вельмі) да Чарнобыля і ўсяго з ім звязанага, шукаюць, як і на зямлі, месца для сябе, бо і там, у новай сутнасці і іпастасі, захоўваюць свой першародны пачатак.

Але і там яны шукаюць адно і тое ж, вечнае:

*Б'юць з нябёсаў званы беларускіх цэркваў — толькі й яны жывыя, і ў іх апантаным звоне я, чырвонай халоднай вадою напоўнены, чую крык маёй колішняй роднай мовы, чую ціхае ў звоне высокім маленне нашай вечнай Жанчыны Полацкай. Дайце дарогу, браты-чарвякі, прапусціце. Стаміўся — паўзу я спачыць у нетры пад роднае Ямнае.*

У свой час Гогаль імкнуўся да ідэалу: «*Не связывать сябя никакими узами на земле*». М. Купрэеў не змог дасягнуць такой самоты. Ён лічыць шчасцем, калі над яго целам заплача хоць адна жанчына. Для абязножанага паэта жанчына — гэта цуд, дзівосы, у якіх спалучыўся вырак боскі і рэальны, зямны пачатак. Менавіта яна можа вачыма паклікаць пад дрэва густое, дзе, як у Эдэме, схавана насалода і шчасце, кінуць у неба кара́лі, што расцвітаюць

зоркамі («Жанчына»); у траве стаіць *«ветрык яе дыханнем, яна прыгожа калыша свой цень»*. У той жа час яна можа быць і жорсткай, здрадзіць у небе з Марсам («Мая муза»); можа схавацца ад вас, таму што вы згубілі душу.

Запавет М. Валошына *«Пройдёмте по миру как дети»,* узяты М. Купрэевым для паэмы, ягоныя героі не могуць ажыццявіць. Але чаму ж яны ўсе нават пасля смерці вяртаюцца на радзіму — і Кастусь Каліноўскі, і невядомыя свету Вася, Валодзя, Міша, і сын Іван, што чуе голас сівенькай маці, і шматлікія персанажы балады «А ў полі вярба». Мост над глыбокай вадой не становіцца калінавым, няма старажытнай заставы паміж светам жывых і мёртвых, як і паміж светам людзей і прыродай, усім жывым. Вось чаму слёзы валадара пушчы роўнавялікія чалавечым («Воўк»), як і плач птушыны, як і існаванне кожнай былінкі, у чым паэт пераканаўся рэальна

…Адчыні мне дзверы.
Я стаміўся.
За мной лістапад,
лістапад.
Дай пастаўлю ў куток
свой мяшок, —
свой мяшок…
ён багаты і бедны —
ён з небам і ветрам.
Дай спачыць.
Зноў пайду ў лістапад —
у палескія нетры.
Той самай дарогай.
Назад.

*2009*



*Зоя МЕЛЬНІКАВА*

# Мікола Купрэеў. Імгненні светлыя жыцця…

Мікола Сымонавіч Купрэеў (1937–2004) — вядомы і любімы многімі людзьмі, далучанымі да нацыянальнай літаратуры, паэт і празаік. Яго жыццё было звязана, пераважна, з Берасцейшчынай: Бярозаўшчынай, Івацэвіччынай, Ляхавіцкім, Драгічынскім і Ганцавіцкім краем, з Піншчынай, але найбольш з Пружаншчынай… Ён амаль усё жыццё адпрацаваў настаўнікам-філолагам, аб'ездзіў і абхадзіў палескія гарадкі, мястэчкі, вёскі, бальшакі і лясныя сцежкі-дарожкі.

Не сядзелася яму на месцы і ў апошнія гады ў атрыманай, нарэшце, кватэры з усімі выгодамі ў Пружанах. Нягледзячы на балючыя ногі, спачатку з адным кійком, а потым і на мыліцах часта выпраўляўся ў дарогу. Не зважаючы на фізічную нямогласць, і ў сталым узросце ахвотна выбіраўся ў Брэст. З радасцю прымаў запрашэнні на літаратурныя імпрэзы, сустрэчы з чытачамі, са студэнтамі і выкладчыкамі роднага філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. З удзячнасцю прымаў запрашэнні на юбілеі сяброў-пісьменнікаў. Выказваўся з трыбуны ці ў застоллі заўсёды мудра і нешматслоўна, выяўляючыся пісьменнікам-мысляром, патрабавальным і прынцыповым крытыкам, творчай асобай з уласнай пазіцыяй і эстэтыкай…

У лепшыя часы свайго жыцця прываблівае сяброў, калег, сваіх вучняў начытанасцю, улюбёнасцю ў літаратуру, дзяўчат — мужчынскай прыгажосцю, рамантычнай узнёсласцю, светла-журлівай загадкавасцю ў паглядзе праніклівых блакітных вачэй. У апошнія гады быў, пераважна, самотным, спакутаваным хваробамі і фізічным болем, але

мудра-зычлівым, з пільнай цікавасцю ў вачах да жыцця, літаратуры, да творчасці калег, да ўсіх нас...

З паездак ён не спяшаўся вяртацца ў сваё жытло. Наколькі хапала гасціннасці і ветлівай цярплівасці ў гаспадароў, заставаўся жыць-начаваць у сяброў-літаратараў, блізкіх і цікавых яму па духу людзей — у Брэсце ў А. Філатава, У. Калесніка, І. Мельнічука... І ў сталым узросце ў яго не было, на жаль, так неабходнай кожнаму чалавеку сям'і, гаспадаркі, пасаджанага для дзяцей і ўнукаў сада... У 1999 годзе М. Купрэеў у гаворцы з Л. Галубовічам прызнаваўся: *«Творцу сям'я ніколі не лішняя... не мне, творцу, сям'я была лішняя, а я сям'і — быў лішні. Таму ўсё сваё жыццё я і пакутую: дзе мае дзеці?.. Але ніколі не абыходзіўся сам сабою. Толькі — людзьмі, а найбольш — прыродай: рэчкай, дрэвам, кустом, птушкай...»*

У кожным кутку Берасцейшчыны ў М. Купрэева былі блізкія людзі, якія любілі і прымалі пісьменніка-вандроўніка. Магчыма, дарогі і сустрэчы, як і адзінота, дапамагалі парадкаваць душу. У апошні перыяд творчага жыцця ён быў заняты «раскадзіроўкай» сваёй памяцці: асэнсаваннем пражытага і перажытага, што вылілася ў аўтабіяграфічныя аповесці «Дзіцячыя гульні пасля вайны» (1994 — 1995 гг.), «Імгненне светлае» (1996 г.), «На вуліцы Карла Маркса з Паэтам» (1997 г.), «Палеская элегія» (1998 г.), «Рэчкаю плывём, плывём» (1999 г.). Менавіта ў дзевяностыя гады саспела яго спавядальная элегічна-экзістэнцыйная проза — унікальная з'ява нашай нацыянальнай літаратуры.

Памяць, боль і сум выкрасалі ў душы М. Купрэева натхненне, падтрымлівалі творчы намер — выказаць уласную *задуменна-самотную мелодыю жыцця*. Пра сябе ён гаварыў: *«Я — задуменна-самотны... Так сталася, што ўва мне заўжды «стаіць" задуменна-самотная мелодыя... Ды і як яе не помніць, калі яна са мной, ува мне заўжды — з усвядомленых дзён маленства па сёння... Бо на душы вельмі рана стала задуменна-самотна. І ціха. Была вайна. Але выбухаў, стрэлаў не помню. Адно — самотную цішыню. І ў гэтай цішыні — задуменная старая вярба над чорнай сажалкай у Вікове, ля Дняпра... ля млына на калодзе сядзіць і смаліць піпку мой дзед Навум і задуменна-самотна глядзіць далёка ў поле, і ў вачах яго ціха стаіць сляза. А задуменная маці палошча з кладкі ручнікі ў ручаіне, потым яна, самотная-самотная, стаіць у цёмным палітончыку, раніцай, на высокім ганку, потым кідаецца з яго і бяжыць па вікоўскай вуліцы туды за сажалку, куды немцы павялі майго бацьку...»* (Бацька, партызанскі сувязны, вырваўся з рук карнікаў і, некалькі разоў паранены, змог дабрацца да лесу, уратавацца, а з маці фашысты і паліцаі люта расправіліся).

Задуменная самота, якой прасякнута большасць твораў М. Купрэева, — гэта не толькі ўласны экзістэнцыйны боль, але і боль цэлага пакалення дзяцей вайны. У ёй — вытокі іх вымушанага ўнутранага дысідэнцтва, вытокі драматычнага светаадчування самога М. Купрэева да канца зямных дзён.

Вядомым беларускім паэтам ён стаў яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя, калі выйшла першая кніга вершаў «Непазбежнасць» (1967). Другая кніга паэзіі «Правінцыйныя фантазіі» (1995) знайшла найвышэйшае прызнанне — была вылучана пісьменнікамі краіны на Дзяржаўную прэмію. Ды чыясьці злосная і зайздросная рука выкрасліла з лаўрэацкага спісу імя Паэта...

Нарадзіўся ён у вёсцы Ямнае Рагачоўскага раёна на Гомельшчыне. У час вайны на вачах будучага пісьменніка, шасцігадовага хлапчаняці, фашысты і паліцаі забівалі яго маладую і прыгожую матулю і яшчэ жывую затоптвалі ў балотную твань. Жах забойства і пахавання мамы ўсё жыццё смылеў, абпальваў лёс М. Купрэева, з узростам перайшоў у экзістэнцыйны купрэеўскі боль і тую пранізлівую самоту, якія мноства разоў светапогляднай і эмацыйнай дамінантай прагучалі ў яго творах.

Пасля вайны бацька-настаўнік пераехаў жыць у вёску Старыя Пяскі Бярозаўскага раёна на Брэстчыне. Мачыха

і не імкнулася замяніць маці. Так пачыналася драматычнае жыццё, пазбаўленае імунітэту ўсемагутнай мацярынскай любові.

Яшчэ школьнікам сярэдніх класаў М. Купрэеў пачаў пісаць вершы, захапіўся паэзіяй М. Багдановіча і А. Блока. Пазней стаў пісаць і прозу, якая ўпершыню была надрукавана ў часопісе «Нёман» (тады альманах «Советская Отчизна»). Маладога творцу з Берасцейшчыны падтрымлівалі Анатоль Астрэйка, Янка Брыль, Максім Танк.

Дзіця вайны, неспакойны юнак, шукаў сябе — у рамантычнай і зваблівай геалогіі, потым, паехаўшы да цёткі ў Растоўскую вобласць, працаваў каменячосам. Але ўсё ж вабіла слова, літаратура. Ён хутка вярнуўся дадому ў Беларусь, закончыў у 1962 годзе філалагічны факультэт Брэсцкага педінстытута. Студэнтам напісаў на рускай мове аповесць «Бродят юные на рассвете», якую ўхвалілі Янка Брыль і Барыс Бур'ян. Але рукапіс першага значнага празаічнага твора быў згублены, калі нецвярозы аўтар, па яго ўласным прызнанні, начаваў «на мулкай лаўцы вакзала адной палескай станцыі». Імкненне аднавіць гэты твор многія гады жыло ў душы М. Купрэева. Гэта была споведзь маладога чалавека аб уласна пражытым у час вайны і пасля яе, якую пісаў настаўнік Купрэеў на працягу трох месяцаў — пасля ўрокаў у школе, на кватэры ў вясковай гаспадыні, праверыўшы вучнёўскія сшыткі...

Толькі ў 1994–1995 гадах, знаходзячыся ў тубдыспансеры ў Вярховічах (мястэчка ў Камянецкім раёне Брэсцкай воласці, дзе хворы літаратар падоўгу лячыўся і дзе былі напісаны яго празаічныя творы), М. Купрэеў узяўся ўзнаўляць пражытае ім у маленстве і юнацтве. Так з'явілася аповесць «Дзіцячыя гульні пасля вайны» — твор-споведзь, які даносіць удумліваму чытачу, *чаму і як* смуткавала ўсё жыццё душа М. Купрэева. Шукаючы натхненне і гармонію ў жыцці і людзях, спаталяючы боль і самоту, лекаваўся алкаголем і вандроўкамі. Ён часта пакідаў сямейную ўтульнасць, сваіх каханых жанчын і дзяцей: дачку Святлану (1962 г. н.) у першым, яшчэ студэнцкім шлюбе, а потым і сына Андрэя (1967 г. н.) — у наступным. (Дарэчы, дзеці М. Купрэева пазнаёміліся і сябруюць.) Ехаў, «куды душа скажа» (М. Купрэеў). Цягу да дарог, вакзалаў, вандровак ён тлумачыў прагай волі, жаданнем быць свабодным...

Разбураліся адносіны ў сям'і, з родзічамі і сябрамі. На працы, у школах, дзе праца строга рэгламентавана, не радаваліся такім «творчым вандроўкам». З цяжкасцямі, па рэкамендацыі сяброў ненадоўга ўладкоўваўся ў рэдакцыі раённых газет...

Жыццё М. Купрэева закончылася 17 верасня 2004 года ў Доме састарэлых у вёсцы Лясная, што недалёка ад Баранавіч. Але жыццё яго твораў яшчэ толькі распачынаецца. Сёння даводзіцца, як гэта часта бывае, са спазненнем усведамляць, якая *адметная асоба* была з намі побач, у адным з намі часе і прасторы... Мы пачынаем узірацца душой у яго самотнае аблічча, учытвацца душой і розумам у яго элегічна-філасофскія радкі. Пра М. Купрэева слушна напісаў яго сябар Л. Галубовіч: *«Ён выбіраўся з традыцыйнага беларускага балота на выспу шырокага светагляду, мосцячы гаць лаўжамі ўласнага жыццёвага вопыту, — ішоў сваім натуральным, а не інтэлектуальна запазычаным з Усходу ці Захаду шляхам. Хоць, безумоўна, вучыўся і браў урокі шмат у якіх творцаў свету.*

*Але найперш дзякуючы яго ўласнаму арыгінальнаму мастацкаму мысленню і стылю, лепшыя паэтычныя і празаічныя творы Міколы Купрэева запатрабаваныя нашым часам і, ёсць спадзяванне, будуць узятыя з яго літаратурнай спадчыны нашымі нашчадкамі»*.

Спадчына М. Купрэева па аб'ёме сціплая: дзве кнігі паэзіі «Непазбежнасць» (1967 г.) і «Правінцыйныя фантазіі» (1995 г.) і сем аповесцей: «Дзіцячыя гульні пасля вайны» (1994 — 1995 гг.), «Імгненне светлае» (1996 г.), «На вуліцы Карла Маркса з Паэтам» (1997 г.), «Палеская элегія» (1998 г.), «Рэчкаю плывём, плывём» (1999 г.), «Пастух у Космасе» (2002 г.), «Лісты з млына». Пяць першых на-

званых у пераліку аповесцей выйшлі ў 2007 годзе ў адной кніжцы з назвай «Палеская элегія» дзякуючы намаганням Л. Галубовіча, укладальніка твораў таленавітага палескага самотніка. Гэта пасмяротная кніга, уганараваная Брэсцкай абласной літаратурнай прэміяй імя У. Калесніка, каштоўная ва ўсіх адносінах: акрамя сабраных пад адной вокладкай арыгінальных і адметных аўтабіяграфічных аповесцей, выданне пачынаецца і заканчваецца гутаркамі-інтэрв'ю Л. Галубовіча з М. Купрэевым 1994 і 1999 гадоў. Гэтыя інтэрв'ю дапамагаюць кожнаму, хто дакранецца да незвычайна адметных твораў і лёсу М. Купрэева, уявіць важныя, вызначальныя «абрысы творчай постаці пісьменніка» (Л. Галубовіч).

Варта сказаць, што творчая спадчына М. Купрэева яшчэ не сабраная і не выдадзеная цалкам. У бліжэйшы час неабходна выявіць яго творы, раскіданыя па розных перыядычных выданнях. Прафесійнай даследчыцкай тэксталагічнай увагі патрабуе архіў пісьменніка, перададзены сынам Андрэем у Ганцавіцкі раённы краязнаўчы музей. Аўтару гэтых радкоў сын перадаў шэраг аркушаў — чарнавікоў вершаў, перарваных папалам, якія М. Купрэеў намерваўся знішчыць. З цяжкасцю, але яны чытаюцца, хоць і пісаны-крэслены алоўкам. Андрэй перадаў нам таксама пранізліва-кранаючую перапіску М. Купрэева-мужа з каханай, жонкай Святланай Ягораўнай Яжанковай — матуляй Андрэя. (Гэтыя дакументы захоўваюцца ў адукацыйна-асветным цэнтры імя У. Калесніка на філалагічным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна).

Да творчасці М. Купрэева мала звяртаюцца даследчыкі, бо яна надзвычай адметная, псіхалагічна глыбокая, багатая ў падтэксце, то элегічна-іранічная, то экзістэнцыйна-філасофская, з купрэеўскай жанрава-стылёвай мадэллю і нарацыяй, з яго *ўсясветным сумам* па абсалютнай любові, гармоніі, волі, з яго самотна-балючым унутраным дысідэнцтвам... Да такіх твораў нельга падыходзіць з традыцыйнымі меркамі і крытэрыямі.

Спадчына М. Купрэева чакае свайго, таксама адметнага, даследчыка-інтэрпрэтатара.

...Шчымліва сціскаецца сэрца: так і пайшоў, цалкам не спазнаны і незразуметы намі... Горка і шкада, што яму часта было няўтульна і самотна сярод нас, якія шанавалі яго талент і творчасць і любілі яго.

Не ручны, не прыручаны нават каханнем, жанчынай, сям'ёй, ён і сёння застаецца для нас чалавекам-загадкай. Ці ўсё ён дапісаў пра сябе? Ці ўсё, што хацеў, сказаў нам? Гэта — таямніца, вартая разгадкі. І гэта пранікліва адчулі сябры пісьменніка, паставіўшы на яго магіле ў Міхнавічах (прыгарад Івацэвічаў) помнік з купрэеўскімі роспачна-элегічнымі радкамі *«О, як многа я хацеў вам сказаць...»*.

***Васіль АЎРАМЕНКА***

# Правінцыя і свабода
*Невідавочныя ўрокі Міколы Купрэева*

Прыйшоў паэт — забілі ў ладкі,
У хорам славы прывялі,
А ён ад славы без аглядкі —
Упрочкі па зямлі...

*Васіль Сахарчук, «Вандроўнік»*

Так атрымалася, што Беларусь большую частку сваёй гісторыі была правінцыяй, абшарам цывілізацыйных разломаў і метрапольных уплываў. Таму й не дзіва, што традыцыі правінцыяналізму моцна заселі ў тутэйшых людзях. І хоць мода на сталічныя спакусы і выгоды мегаполісаў апанавалі беларусаў ад сярэдзіны мінулага стагоддзя, мара пра ідылію даўнейшага «простага жыцця» не знікла дазвання.

І паэты тут не выключэнне, больш за тое, якраз яны часцей і вярэдзілі старыя раны ды сілкавалі мроі аб «залатых часах» патрыярхальнай мінуўшчыны. Самі, між іншым, абсеўшы сталічныя кватэры і абжываючы гарадскія ландшафты. Бадай, меншая частка сур'ёзных творцаў асела ў правінцыі і зусім ужо адзінкі засталіся ў вясковых «пастаралях». Законы прагрэсу ды патрэба ў індустрыяльна-нацыянальнай цэнтралізацыі вымушалі і паэтаў імкнуцца ў сталічныя тусоўкі, кучкавацца ў месцах, блізкіх да ўлады і цывілізацыйных даброт. Ды не толькі дзеля дабрабыту матэрыяльнага, але творчага ды інтэлектуальнага развою.

Дзе, як не ў сталіцы, адбываюцца самыя важныя падзеі, нараджаюцца самыя свежыя ідэі ці збіраюцца самыя разумныя галовы. Так нас вучыла савецкая школа, так небеспадстаўна сцвярджала і расейска-імперская гісторыя. Куды ж было дзецца маладой, спачатку зачараванай, а потым запалоханай бальшавізмам эліце нованароджанай нацыі, якая ўрэшце «зацяжарыла» і ўласнай дзяржаваю. Толькі так — хінуцца адзін да аднаго, гадаваць і кшталціць у хаўрусе і канкурэнцыі свае таленты, планы, надзеі.

Што да прыгожага пісьменства, то пры адсутнасці нацыянальнай адукацыі і філасофскай школы, адзінай рэлігійна-канфесійнай плыні і ўладнай эліты беларуская паэзія мусіла стаць той «чароўнай палачкай», якая замяніла сабой і школьную адукацыю, і акадэмічную філасофію, і рэлігійную казань, і футурыстычныя пражэкты. Паэзія як універсальная вольная словатворчасць дазваляла ў канцэнтраваным выглядзе і даступнай форме (алегорыі, метафары, алюзіі) адлюстроўваць мінулае, выказваць актуальныя прэтэнзіі і патрэбы і нават прыадчыняць браму ў будучыню. Па сутнасці яна стала «кропкай крышталізацыі», з якой выраслі і духоўныя сэнсы, і сацыяльныя рухі, і палітычныя структуры, а таму паэты тут былі больш чым словатворцы — яны айцы-зачынальнікі гісторыі, дэміургі нацыянальнага лёсу. Кепска гэта ці добра, казаць не бяруся, але ж гэта здарылася больш як сто гадоў таму і працягвалася бадай да канца 80-х,



а таму «адкруціць назад» той шлях і прынцып беларускага нацыятварэння ўжо немагчыма. Аднак вернемся да нашай правінцыі і яе песняроў.

Так, наша сацыялістычная сталіца па савецкай завядзёнцы «падграбала» пад сябе ўсіх класікаў і значных творцаў (за выняткам, вядома, эмігрантаў), аднак нямала вершатворцаў жыло і ў глыбінцы. Цікава было б мець статыстыку паэтаў (і графаманаў!) на тысячу насельнікаў Беларусі ў савецкія часы і ў апошнія гады. Мяркую, што, як і апантаных кнігалюбаў, аматараў складання рыфмаваных радкоў стала менш, бо спатоліць уласнае графаманства цяпер куды прасцей — праз чаты, каментары, інтэрнэт-сеткі ды іншыя электронныя сродкі.

Разам з тым беларуская паэтычная правінцыя яшчэ існуе: хай адышоў у іншы свет паэт-пастух Люцыян Шчасны, але жывы паэт-пчаляр Мікалай Папека, застаецца цэлая плеяда «старых» журналістаў-паэтаў (Аляксей Белы, Алесь Чобат ды інш.), па традыцыі нямала аматараў рыфмаванага слова сярод настаўнікаў ды выкладчыкаў ВНУ, радзей — іншых прафесійных заняткаў. І усё ж патрыярхам правінцыйнай паэзіі, выбітным паэтам і радыкальным не-класікам (хто не патрапіць у падручнікі) можна лічыць Міколу Купрэева.

Кажучы пра «маргінальную» паэзію ці «перыферыйных» паэтаў, нельга абмінуць пытанне графаманства. Гэтак жа як не заўсёды лёгка правесці мяжу між нормай і паталогіяй, не заўжды атрымаецца аддзяліць пісьменства ад графаманіі. Бо тая ж паэзія — намеранае звязванне словаў па рытму ці рыфме і жаданне знаходзіць у гэтым сэнс ці мэту — ужо адхіленне ад нормы, ад простай мовы звычайнага чалавека, не зацыкленага на формах выказвання думкі. Таму ўсіх паэтаў можна залічыць у графаманы, гукалюбы ці сэнсаловы. Хіба што паэтамі з іх прызнаюць далёка не ўсіх (усе паэты графаманы, не ўсе графаманы — паэты), а ў хрэстаматыі патрапяць толькі тыя, хто стаў першапраходцам, стварыўшы нешта арыгінальнае ці закрануўшы вельмі балючую для многіх тэму, стаў сугучны свайму пакаленню

або цэлай эпосе. Як ні дзіўна, графаманства не вызначаецца месцам пражывання, бо назіраецца не толькі ў правінцыйных рыфмароў-аматараў, але і сярод прафесійных творцаў сталіцы. Прыкметамі графаманіі я б назваў: эпігонства, самалюбства, прагматызм і... занудства. Дык вось, калі вяртацца да Купрэева, то ніводная з гэтых характарыстык да яго не прыкладзецца, больш за тое, і па жыцці, і па характары ён быў антыподам усяму вышэй пералічанаму.

Сама храналогія творчасці Купрэева гаворыць пра многае: даволі гучны дэбют — зборнік «Непазбежнасць» у 1967 годзе, потым 28 гадоў маўчання — і другі, апошні паэтычны «стрэл», кніга «Правінцыйныя фантазіі», вылучаная на Дзяржаўную прэмію. Зусім неграфаманская гісторыя, дый для паэта таксама падзея нетыповая. Вось у гэтай нетыповасці, адасобленасці нашага героя ад стаптаных літаратурных сцяжын уся ягоная сутнасць. Як для беларускага паэта савецкага часу ён быў занадта вольны і самастойны, дый не толькі ў творчым ці будзённа-побытавым плане, але і ў глыбейшым, у светапоглядным сэнсе.

І вось я ў вёсачцы палескай Востраў...
О, як добра, людзі, тут у вас,
Мілыя мае вы астраўляне!..
Хай праплываюць гарады гарачыя ля вас,
як караблі ля вострава ў акіяне.
Хай.
І хай я той бадзяга, што з борта нырнуў
у гэты акіян зялёны,
каб у вашыя сэрцы ціхія зірнуць,
паслухаць шэпт бярозак вашых, клёнаў...

Ён не быў ідэалістам-дысідэнтам ці палітычным змагаром, але жыў незалежна ад агульнапрынятых нормаў, прыватным жыццём дзівака і аскета. Меў, канечне, і сваю «хвігу ў кішэні» для ўлады і афіцыёзу, але ж хто з беларусаў не насіў у самай глыбокай кішэні такую ж «дулю», каб зрэдчас, часцей нападпітку, паказаць яе сваім блізкім. Філолаг па адукацыі, акрамя настаўніцтва ён зведаў нямала іншых прафесій, часта мяняў месцы жыхарства і працы, апантана любіў вандраваць. Вандроўкі ж тыя былі пераважна пешыя і сягалі мясцін, дзе ён жыў і працаваў. А жыў ён у розных месцах Палесся, пераважна Заходняга, і абышоў ледзь не ўсе раёны Берасцейскай і Гомельскай вобласцяў. Што штурхала яго да вандраванняў, адкуль такая няўседлівасць? Чаму, нягледзячы на пільную ўвагу і пашану да жанчын, ён так і не стварыў сям'ю, не пусціў недзе «свае карані».

Біёграфы спасылаюцца на цяжкую псіхатраўму ў дзяцінстве: шасцігадовы хлапчук пабачыў смерць маці ад рук акупантаў, у якой ускосна быў «вінаваты» бацька. Потым былі складаныя адносіны з бацькам, пераезд з роднай Рагачоўшчыны на Палессе, непаразуменні з новай сям'ёй. Пэўна, страта ў раннім дзяцінстве маці і роднага котлішча стала глыбокай ранай, што сфармавала меланхалічны душэўны склад, зрабіла звышчуйным да болю і пакут, наклала адбітак на адносіны з роднымі і блізкімі. Магчыма, тады ж вобраз малой радзімы «рассыпаўся», «расцерушыўся» ў паэтавым уяўленні ад дняпроўскіх кручаў да Белавежскай пушчы, а пастаянныя вандроўкі і частыя змены месца жыхарства сталі сімвалічным «пошукам» і «вяртаннем» да страчанага калісь роднага кута.

І, бадай, галоўнае: пешыя вандраванні! Яны былі ўсё ж не сімвалічным, а рэальным ўвасабленнем індывідуальнай свабоды. Хто можа быць больш вольны ад побытавых, сацыяльных і тэхнагенных путаў, чым валацуга, што ідзе «куды глядзяць вочы» альбо «вядуць ногі». Хіба толькі вольны птах, што лунае ў аблоках і якому падуладны не толькі зямныя, але і нябесныя абсягі. Між іншым «зайздрасць» да птушынага лёсу, прага і адчуванне палёту — адна з цэнтральных тэм у творчасці Купрэева, а журавель, рэдкая, амаль казачная птушка нашых краёў — любімы вобраз і лейтматыў многіх вершаў і прозы.

Пошук паэтам адхлання ў прыродзе, назіранне за праявамі простага жыцця яшчэ ў дзяцінстве зрабілася любімым заняткам, што вяртаў гармонію душы і супакаенне. У лесе і лузе, у зносінах з мурашамі, чмялямі і вавёркамі, сярод бяроз, дубоў і соснаў ён адчуваў сябе вольна і шчасліва, чаго далёка не заўсёды мог дасягнуць сярод людскога тлуму. Але людское жыццё і тлум ёсць тым галоўным, дзеля чаго мы існуем, у што спрабуем укласці свой плён, лёк ці паэтычны парадак.

Калі разумець не хочаце
свежасць, зялёную цішыню —
не чапайце мой лес.
Калі разумець не хочаце,
як ранне сіняе б'е ў акно —
не чапайце мой бэз.
І калі з далоні спакойна
зерне дзяўбуць галубы —
галубоў вы маіх не чапайце!
І калі я па дарозе іду
і шчасця ўсім вам хачу —
вы, калі ласка, мяне не чапайце!

Цяжка назваць вершы М. Купрэева ўпарадкаванымі, класічнымі. Ужо ў першым зборніку, калі яшчэ не было той моды, ён больш схіляецца да вольнага радка, не пераймаючыся рыфмай, а то і рытмам. Гэта цяпер верлібр стаў звычайнай справай, а тады, у 60-я, сілаба-тоніка была паноўнай, бадай, безумоўнай нормай паэтызавання, а моўныя вольнасці дазваляліся хіба што класікам і мэтрам. Таму галоўныя нараканні крытыкі на першую кнігу былі за свабодны, неўнармаваны верш, якому малады паэт аддаваў перавагу. Шурпатасць, «непрычасанасць» радка, кажучы сённяшнімі словамі — «антыгламурнасць» аўтарскага стылю чапляла вуха і вока эстэтаў і знаўцаў класікі, выбівалася з шэрагу традыцыйных, «правільных» вершаў.



Нестандартнасць, выпадковасць і маргінальнасць вобразаў, метафар і сюжэтаў пануе ў ягоных творах.

Ён піша нібыта на вядомыя тэмы, але не пра трывіяльныя рэчы. Галоўныя дзейныя «асобы» ў яго — то чэрап Каліноўскага, то партызанскія боты, то нага Ікара ці Богавы лапці. Здаецца, часам аўтар імкнецца непасрэдна і шчыра выплюхнуць уласны настрой, яркае адчуванне ці нечаканую згадку, якая не паспявае сфармавацца ў лагічную, закончаную думку і застывае ў выглядзе спантанных слоўных усплёскаў. Ніякага наследавання ўзорам ці паэтычным лекалам, рытм і даўжыня радка нечакана мяняюцца, рыфма зусім знікае, і нават думка можа «нырнуць» і схавацца ў хвалях тэксту, каб знікнуць альбо з'явіцца ў канцы нязручным пытаннем ці сваёй антытэзай. Гэта нагадвае хаос, які, праўда, прайшоў праз лабірынты паэтавай душы і мае ўжо прыхаваны сэнс і парадак, але яго трэба яшчэ ўбачыць і ўразумець.

Як мне жывецца ў маім Хаосе? —
Мой утульна-няўтульны Хаос
лесам калючым і мяккім разросся
і горка-салодкую чару паднёс;
п'ю з тае чары — смяюся і плачу;
ля вокнаў балююць зайцы і ваўкі;
спыніўся Дняпро ля скалечанай Начы;
сноп развязаўся — рассыпаў вякі...
цягнуць мяне з маім чорным лёсам
д'ябал — у пекла, анёлак — у рай.
Між Ладам тваім і маім Хаосам
от і жыві тут — хоць памірай.

Нягледзячы на шматлікія прафесійныя і побытавыя мітрэнгі, галоўным жыццёвым заняткам і сродкам матэрыяльнага існавання Купрэева было настаўніцтва. Настаўнічаў ён у розных школах Палесся, пераважна вясковых і з яго вучняў нават выйшла некалькі паэтаў. Але гаворка тут не

пра педагагічны талент спадара Міколы, а пра ўрокі невідавочныя — бадай, экзістэнцыйныя.

З яго не атрымалася ўзорнага сямейніка ці паслухмянага сына, не быў ён прыхільнікам здаровага ладу жыцця, адэптам савецкай улады ці артадаксальным вернікам. Ён быў тым «крывым дрэвам» сярод роўных аднастайных лясных насельнікаў, ля якога заўсёды хочацца прыпыніцца, угледзецца ў яго вычварныя лініі, падзівіцца магутнай сіле, што скруціла ствол і галіны, зразумець, як атрымалася яму выжыць праз усе звіхі ды зломы неміласэрнага лёсу. Ды яшчэ застацца паэтам, не графаманам ці кан'юнктурным «ветразем», а капітанам і стырнавым свайго хісткага жыццёвага чоўна.

У кожнага свой кон, аднак, здаецца, некаторыя паэты маглі б пазайздросціць Купрэеву, які не пайшоў па лініі сталічнай пісарска-рэдактарскай або журналісцкай кар'еры (хоць меў спробы працы ў «раёнках»), а застаўся на «вольных хлябах», наколькі вольным мог быць вясковы настаўнік, бібліятэкар ці качагар. Але ў творчасці ён сапраўды застаўся вольным і самабытным, залежным хіба толькі ад пары году, свайго настрою і... шкодных звычак. Адылі ж упартасць, з якой паэт прайшоў гэтым «крывым», ірацыянальным шляхам, выклікае павагу, асабліва ў тых, хто сам калісь быў на той сцяжыне ды збочыў з яе, улïўшыся ў рэчышча «легальных» і «афіцыйных» мастакоў слова.

Сваім прыкладам Купрэеў даводзіць, што сапраўднаму творцу неабавязкова мець студыю на Манхэтэне, кватэру на Манмартры ці хаця б мінскую прапіску.

І ў палескай глыбінцы можна адчуваць натхненне і знаходзіць сілы для паэтычнага палёту, а каб далучыцца да кагорты пакліканых ці нават абраных, неабавязкова ехаць у Святую Зямлю, узбірацца на Фудзіяму або цягнуцца ў Тыбет. Сваю «шамбалу», «нябесны Ерушаляйм» альбо «рай» можна знайсці і тут, дзе з'явіўся на свет і дзе цягнуцца твае будні і святы. То бок, уваход і выхад у «іншасвет», брама ў «нябачнае і невядомае» вандруе разам



з табой, яна заўсёды пры- ці ў- табе. Увайсці ў яе можна і ў зялёнай дуброве, і на празрыстым лёдзе зімовай рэчкі, і на цёплай печы вясковай хаты. Новы, нечаканы сэнс гэты ўрок краёвага, а хутчэй інтымнага патрыятызму набывае ў эпоху інтэрнэту, віртуальных вандровак і перамогі «сусветнай вёскі».

Другі ўрок Міколы Купрэева палягае ў тым, што чалавек мае права не толькі на жыццё, але і на індывідуальнасць, на свой асабісты жыццёвы шлях, якім бы «маргінальным» ён ні здаваўся. Абсалютна актуальна гэта для творцы, прынцып дзейнасці якога — пакідаць межы звыклага і вядомага, адкрываць новыя далягляды і абсягі быцця. А тое немагчыма без вольнага выбару, спробы самому зрабіць ці не зрабіць памылку.

Нават заганныя звычкі — асабісты выбар кожнага. Купрэеў любіў узяць чарку ў добрай кампаніі, дый на самоце таксама не цураўся віна. Быў зацятым курцом, нават хварэючы ў апошнія гады на сухоты, не кінуў паліць. Такі вось парадокс: вольны ў жыццёвым віры і творчасці, ён аказаўся татальным нявольнікам сваіх звычак (у тым ліку і звычкі пісаць). Вядома, алкаголь ды курава падкарацілі ягоныя гады, але хто ведае, ці было б лепш без іх, ці не здарылася б што горшае значна раней? Можа, зло дадзена чалавеку не толькі дзеля таго, каб падоўжыць дарогу да перамогі дабра ці падкрэсліць ейнае вяршынства, але каб увідавочыць натуральнасць і непазбежнасць тае перамогі, пераканаць усіх, што вольны выбар і свабода не самы просты і хуткі, але самы надзейны, незваротны шлях у прышласць. Сёння, калі вакол зноў пануе ксенафобія, гвалт, барацьба з «няправільнымі» думкамі, з «адшчапенцамі», «ухіленцамі» ды іншымі «здраднікамі радзімы», гэты ўрок Міколы Купрэева становіцца асабліва важны.

Калі чытаеш Купрэева, пераадольваючы напластаванні няроўных радкоў, спатыкаючыся на арытмічных сінкопах і нечаканых паўзах, дзіву даешся, як пры такой шурпатай, «каструбаватай» мове (ніякага табе «люлянне лілеяў») яму

ўдаецца захаваць рамантычны дух, узнёсласць і палётнасць думкі. «Элегіі» — любімая паэтычная форма і найлепшае азначэнне ягонай творчасці. Менавіта так, толькі з дадаткам «палескія», названы і цыкл ягоных аўтабіяграфічных аповесцяў, якія шмат чаго дадаюць да будзённага партрэту і лёсу аўтара.

А відаць, так і трэба, проза — больш пра будзённае і наша-сацыяльнае, а вершы — пра інтымнае і вечнае. Нездарма і вершы, і аповесці Купрэева прасякнуты тым элегічным настроем, духам вольнага палёту і лунання над прасторамі радзімы, жаданнем пакінуць усе зямныя недасканаласці там, унізе і... немагчымасцю абарваць тую тонкую сувязь з перажытым і дарагім. Элегія Купрэева і ёсць спосабам прымірэння са светам, прызнаннем і прыманнем жыцця такім, якім яно склалася — з яго несціханым болем, маленькімі радасцямі і шчасцем палёту, хай нават толькі ў думках, вершах ці ў сне. Прымірэнне і прыманне іншасці, пры захаванні самасці і свабоды ўласнай душы — гэта тое, праз што прайшоў паэт і праз што яшчэ давядзецца прайсці нам, беларусам.

Пакіну ўсё і пайду ў той край,
дзе няма ні сяброў, ні ворагаў,
дзе бацька не будзе вучыць мяне жыць
і дзе жонка не будзе чакаць і тужыць,
крыўдаваць і злаваць не будзе,
дзе нікому ніколі не змагу я зманіць —
гэта нікому не будзе трэба...
...Пакіну ўсё і пайду у той край,
цячэ дзе павольна шырокая Лета,
і, падтрыманы нябачнай рукой,
паплыву на спіне,
паплыву, паплыву
па блакітнаму ціхаму свету
І нічога, нічога не буду знаць,
што дзесьці ўгары нада мною Венера
і што пада мною Атлантыда — не буду знаць



і буду плысці і плысці я ў Спакойную Эру...
...Усё застанецца, і я не пайду ў той край.
У той край ніхто не хадзіў ніколі.

Апошні, нібыта самы просты ўрок Міколы Купрэева, які ён праводзіў і са сваімі вучнямі — гэта любоў да хады. Сёння яна стала часткай здаровага ладу жыцця, спробай барацьбы з гіпадынаміяй. Але ва ўмовах мегаполіса часцей набывае выгляд механічнага перасоўвання ног па бегавой дарожцы ў хаце або ў лепшым выпадку прагулянкі ў гарадскім асяродку ля шумных загазаваных вуліц.

Купрэеў адолеў у жыцці тысячы кіламетраў і меў ад таго не толькі фізіялагічную, а і эстэтычную, бадай, духоўную карысць. Бо акрамя радасці свабоднага руху чалавек, які крочыць па лесе, у полі ці лузе, яшчэ і слухае, нюхае, бачыць, чуе, мацае, а сарваўшы ягаду ці травіну — смакуе на язык, што яму трапляецца. То бок, купрэеўская пешая вандроўка — гэта сеанс татальнага эмацыянальнага ўздзеяння, які гоіць, лекуе, надае сілы, абуджае жаданні ды мары.

Сучасны чалавек спрабуе кампенсаваць гэты дэфіцыт штучна або «тэхналагічна» — праз хімічныя рэчывы, рытмічныя гукі, музыку, электронныя прыстасаванні, эзатэрычныя медытацыйныя практыкі. А мо карысней, не заглыбляючыся ў багну нанатэхналогій, псіхатэрапеўтычных лабірынтаў і фармакалагічнага «раю», звярнуцца да простай народна-»хадавой» традыцыі лекавання душы і цела, якую так ўслаўляў паэт.

Я разумею, што гэта недасягальная раскоша для многіх жыхароў сённяшніх мегаполісаў — ехаць за дзясяткі ці сотні кіламетраў на спатканне з прыродай і сабою. У вечным цэйтноце, спешцы, у бегу па коле штодзённых турботаў або сядзенні перад кампутарам, мы ўсё роўна спазняемся, не паспяваем ні за жыццём, ні за прагрэсам, ні за здароўем. Такі, на жаль, лёс насельнікаў сённяшніх гарадоў, і не толькі сталічных. І усё ж адзінкі, самыя прасунутыя ці кемлівыя ўжо зрабілі свой выбар і... перабраліся ў глыбінку. Іх няшмат, гэта дзівакі і арыгіналы, што ідуць супраць

агульнай плыні, аднак менавіта яны — «вольныя маргіналы» — надзея і рухавік вяртання да жыцця нашай правінцыі. Нараджэнне новай Беларусі немагчыма без адраджэння правінцыі, без аднаўлення тых прыродных ландшафтаў і духоўных асноў, з якіх пачыналася, якімі жыла і жывілася наша краіна.

І тут Мікола Купрэеў не толькі пясняр, але «заслужаны вольны хадок Беларусі», прадвеснік і правадыр мірнага рушэння ў нашу непазбежную прышласць.

*2023*

## «Купрэеў як Купрэеў...»

*З лістоў Ганны ХАДАРОВІЧ да Леаніда ГАЛУБОВІЧА*

* * *

Добры дзень, Леанід Міхайлавіч!

Вы правільна здагадаліся: Сямёнавіч цяпер у Шарашоўскай бальніцы, лечыць ногі і, як сам кажа, душу. Апошняе добра тым, што менш курыць, бо трэба з другога паверха сыходзіць на першы, і зусім не п'е. Доктар яго ведае — лечыць не першы год. І накрычаў на нас, што прывезлі так позна, дакладней, што доўга не прывозілі. Але цяпер, расказвае, яго хворы папраўляецца. Ужо становіцца на ногі і нават крыху ходзіць. Калі можна назваць хадзьбой перасоўванне — цяжкае і павольнае — ног. Да гэтага было вельмі дрэнна. Ногі зусім не слухаліся. Аднойчы падыходжу да яго кватэры і яшчэ з лесвіцы чую: бух! бух!! бух!!! З кожным разам усё мацней. Упаў, думаю, і не можа падняцца — лупіць нечым па падлозе, кліча дапамогу. Аказваецца, гэта ён так «ходзіць»: сядзіць на табурэтцы і падскоквае, адначасова яе падымаючы і падсоўваючы. Грукат стаіць на ўсе пяць паверхаў. Шкада да болю! Усё, кажу, Сямёнавіч, збірайце манаткі — паедзем у бальніцу. Пагадзіўся.



Піў ён апошнім часам не так шчыра. Патроху. Кажа, што лягчэй сябе пры гэтым адчувае. Ну і добра. Абы не запойна. Абы лягчэй. Але што будзе потым? Мне ажно душна робіцца, як падумаю аб гэтым. Урач кажа, калі не будзе хоць крышачку рухацца, то... Поўная нерухомасць можа наступіць хутка. Баляць жа не толькі ногі, але і рукі — пагаліцца цяжка. Як будзе ўсё гэта пераносіць светлая галава Купрэева, аднаму Богу вядома.

Але лепей я напішу пра добрае. Прачытала Ваша пісьмо Мікалаю Сямёнавічу па тэлефоне, і на «Мікола, напішы трохі вершаў» ён тут жа запэўніў: «Напішу, абавязкова напішу!». Так што «валацуга палескі» яшчэ будзе жыць. І, спадзяюся, яшчэ парадуе нас...

І яшчэ аб прыемным: пакуль Сямёнавіч у бальніцы, нам удалося зрабіць неблагі рамонт яго жытла. Хадзіла да старшыні райвыканкама, і ён распарадзіўся камунальнікам. Нават замянілі мэблю і ўсё астатняе. Купрэеў не пазна́е. Светла стала, чыста. Можна і гасцей запрашаць. А то ўсё адзін ды адзін, а калі хто і зойдзе, то толькі які бомж з вуліцы — з пляшкай у руцэ. Гэта я наконт «усёй беларускай літаратуры». Нягожа так чалавека — не апошняга чалавека на зямлі — пакідаць. Яму ж, акрамя вас, і пісем ніхто не піша. Тут міжволі зап'еш. Хаця хіба я маю права асуджаць? Свет такі...



• *Мікола Купрэеў з Ганнай Хадаровіч. 2004 год*

Калі выветрыцца фарба, забяром Міколу Сямёнавіча дахаты. Надоўга не загадваем. Але, мне здаецца, яшчэ пажывем. Толькі пішыце, Леанід Міхайлавіч. Каб вы ведалі, як ён заўсёды радуецца вашым пісьмам!

Усяго Вам добрага!

*16.03.2004, г. Пружаны*

* * *

Добры дзень, Леанід Міхайлавіч!

Ваша пісьмо мяне так усхвалявала, асабліва радкі пра Купрэева, што нават ноччу не магла заснуць. Я крыху ведала гэта. Аднойчы Леанід Філатаў па дарозе ў Вярховічы да Купрэева расказваў пра яго, і ў рэдакцыі таксама не раз гаварылі. Вось такі ў мяне сябар. Хаця ці можна назваць нашы адносіны сяброўствам? Калі мог, час ад часу прыходзіў у рэдакцыю — грошы пазычыць. Як вецер у полі. Шкада яго стала. Зайшла аднойчы. А ён п'яны, няўдалы, мокры па вушы. У кватэры горш, чым у іншага ў хляве. І раптам — такія вершы! Колькі разоў спрабавала пагаварыць з ім, крычала, саромела. Ён потым казаў, што баіцца мяне. Папрасіў, каб забірала яго грошы і сама выдавала патроху. Магчыма, гэта крыху і дапамагло. Калі не было за што піць, і сабутэльнікаў заходзіла менш. Аднойчы амаль беспрытомнага завезлі яго ў Магілёўцы (псіханеўралагічную бальніцу). Хлопцы нашы робяць вывад, што такога, як было дагэтуль, цяпер няма. П'е, не без таго, але не ў такой меры. Вось і пасля Шарашоўскай бальніцы. Прывезлі дахаты, задаволены рамонтам кватэры. Усё, думалася, можа зразумее, адчуе, што за яго хвалююцца, стараюцца. А заходжу праз тры дні — зноў як выкапень. Кажа: піў. Маўляў, пляменніца прыязджала, сказала, што бацька памёр і мачыха таксама. Памінаў...

Я часта думаю: навошта мне гэты галаўны боль? Быццам свайго не хапае. Аднак цяпер кінуць яго на волю лёсу і не заходзіць хаця б разок у тыдзень — мне здаецца, гэта нават горш, чым здрада. Ды і не так я ўжо там перарабляюся — ён жа на абслугоўванні ў сацыяльнай службы. Іншая справа, як ён да гэтага адносіцца. Дамовіліся, каб у фортку «белы сцяг» вывешваў, калі што трэба — з акна майго рэдакцыйнага кабінета бачны вокны яго кватэры. Забягаю надоечы, а ён — п'яны. Кажа: я ж цябе зранку чакаў — да вечара, відаць, не ўтрымаўся...

Вось напісала вам і быццам сама сабе адказала на многія пытанні, растлумачыла, хаця незразумелага яшчэ вельмі шмат. У рэдакцыі таксама дзівуюцца: навошта ён табе? Магчыма, думаюць, што я кінула вока на яго кватэру. Але гэта няпраўда. Па-першае, яна не прыватызавана. Па-другое, жыць у ёй зможа, напэўна, толькі той, хто не бачыў Купрэева і таго, што ў ёй часам робіцца. Я бачыла. Хаця надоечы я яму гаварыла аб прыватызацыі. Для інваліда першай групы гэта ўсё робіцца бясплатна. Я б пахадзіла па даведкі. Няхай бы хоць адно добрае зрабіў бы — жонцы якой ці дзецям, пляменнікам. Усміхаецца ў адказ, як дзіця малое. Купрэеў як Купрэеў... Часам, прызнаюся, калі доўга не бываю, я баюся да яго заходзіць: каб не зрабіў, як той небарака Сахарчук. Хоць, мне здаецца, Купрэеў слабахарактарны, на такое не здатны. (О, Гасподзь, пра што гэта я?!)

<...>

Усяго вам добрага і светлага.

*01.04.2004*

* * *

Хрыстос уваскрос, Вам, Леанід Міхайлавіч!

Хрыстос уваскрос усёй вашай сям'і!

Пісьмо Ваша вельмі ўзрадавала. Напэўна, таму, што атрымала яго якраз на Дабравест. І дзень быў харошы. Завезлі Купрэеву новы ложак. У яго быў вялікі, жалезны. Памятаеце, як раней у вёсках? Ды і цяпер там такія стаяць... Я ж у вялікім парыве «перабудовы» ў кватэры

Мікалая Сямёнавіча ўсю яго «мэблю» загадала выкінуць. У тым ліку і гэты страшны ложак. Пабіты, як дарога ў бамбёжку. Аказваецца, дарэмна. Купрэеву на ім добра спалася. А вось новы аказаўся надта мяккім. Мікалай Сямёнавіч памучыўся на ім цэлы тыдзень. Нічога не гаварыў. А я сама не здагадалася. І раптам, ледзь не плачучы: «Не магу спаць, Аня. Дзе мой стары ложак?» Вядома, стары ўжо быў на смеццязвалцы. Дапамаглі зноў камунальнікі. Да «Дажынак» у нас капітальна рамантавалі гасцініцу. Мянялі там і мэблю. Вось са старой і выдзелілі беднаму, змучанаму ад бяссонніцы Купрэеву ложак і прыложкавую тумбу нават. Цяпер, здаецца, усё нармальна. Задаволены. А той ложак паставілі на кухні. Кажа: а раптам госці? Хаця госці ў яго бываюць рэдка. На свята прыходзілі М. Антаноўскі і М. Папека. Дык, здаецца, ажно пасвятлеў вачыма. Радаваўся. Кажа: мы яшчэ напішам! Нешта задумаў. Дыялог пісьменніка і журналіста. Хаця аб чым, я не ўяўляю. Паперкі з вершаванымі радкамі ў яго паўсюдна — на кухні, ля ложка на табурэтцы, на вялікім стале. Але, кажа, яны яшчэ спеюць. Калі прыйдзе час, тады...<...>

Акуляры ў Міколы Сямёнавіча ёсць, не скардзіцца больш на вочы. А вось з нагамі дрэнна. Не слухаюцца зусім. Не ўяўляю, як ён дапаўзае да прыбіральні. Нядаўна заявіў, што лета яшчэ пратрымаецца дома, а ўвосень будзе збірацца ў дом састарэлых. Каб хоць пратрымаўся!

Учора, у першы дзень Вялікадня, заехалі да яго з гасцінцамі ўтрох з мужам і сынам. У яго чысценька. І сам такі ўрачысты. Цвярозы. Хай бы так і было! Наконт грошай, Леанід Міхайлавіч, не хвалюйцеся. Пенсія ў яго 150 тысяч. 17 тысяч плаціць за кватэру. 10 тысяч — за сац[ыяльнага] работніка. 120 тысяч хапае. Нармальна. Хаця, ганарараў, вядома, чакае. Пра той, што ўсё яшчэ не даслалі, успамінаў ужо не аднойчы. Але што зробіш, што так атрымліваецца. <...>

Усяго добрага Вам, Леанід Міхайлавіч!

*12.04.2004*



* * *

Добры дзень, Леанід Міхайлавіч!

Вы просіце, каб напісала пра Купрэева. А я ўсё адкладваю: і Вам чытаць будзе нялёгка, і мне пісаць.

Тыя дні ён ляжаў у Шарашоўскай бальніцы. Неяк я патэлефанавала ўрачу, які яго лечыць, каб даведацца, можа, што трэба прывезці, а той нечакана: трэба Купрэева забіраць, бо мы закрываем хірургічнае аддзяленне на рамонт. Але я, кажа, магу даць накіраванне ў Пружанскую бальніцу — на далечванне. Схадзі толькі, дамоўся, каб яго туды ўзялі. А потым і Сямёнавіча да тэлефона паднеслі, і ён таксама пра тое ж: перавязі мяне ў Пружанскую хірургію. Збегала, дамовілася аб усім, а ў нядзелю (гэта было два тыдні таму) паехалі з Хадаровічам у Шарашова. Купрэеў ужо сабраўся, сядзеў — чакаў нас — на ложку. Знеслі яго да машыны. Усё, здаецца, нармальна. Едзем. «Ну, што, — кажу, — Сямёнавіч, — у Пружанскую бальніцу едзем?» Аб іншым не магло быць і размовы. Ён жа зусім не ходзіць. А сабес з афармленнем у інтэрнат чамусьці зацягвае. Адно ратаванне — бальніца. А ён нечакана: не! Вязіце мяне дахаты! Мне трэба сабрацца!

Што сабрацца? Нам няма часу чакаць, пакуль вы збераццеся, бо трэба ехаць да бацькоў у вёску! А ён: ты, Аня, прычапілася да мяне вось ужо два гады! Возіш мяне тудысюды...

У мяне ажно дыханне спынілася: я прычапілася, аказваецца! А думала, што раблю добрае, што падтрымліваю яго, што яму патрэбна... Далей усю дарогу ехалі моўчкі. Хадаровіч без слоў звярнуў да дома Купрэева. Гэтак жа моўчкі занёс яго у кватэру на ложак. Я, ашаломленая, сядзела ў машыне. Потым ехалі ў вёску, і майго Валеру прарвала: каб тваёй нагі, кажа, там больш не было і г.д.

Ну вось. Прайшло дзевяць дзён. Я амаль супакоілася. Тым больш, што ведала: Купрэеў не адзін, у яго ёсць сусед-сябра, які заўсёды прынясе што выпіць і чым закусіць. А тут прыходзіць у рэдакцыю другі сусед: Аня, Купрэеў

упаў з ложка, ляжыць на падлозе і нікога не пазнае. Ну, пайшлі. Тое, што там убачыла, не паддаецца ніякаму апісанню. Самі ўяўляеце, як можа жыць абязножаны чалавек ды яшчэ нападпітку. Ляжаў на падлозе, укручаны ў коўдру. Як воўк. Праўда, мяне пазнаў.

Выклікала хуткую дапамогу. Крыху адмылі, ачысцілі яго разам з фельчарам. З левага боку на ягадзіцы аказаліся такія вялікія пролежні (відаць, яму было зручней ляжаць на адным баку), а ў жывым мясе — куча чарвякоў. Не дай Божа! Фельчар казаў, што нармальны чалавек гэта не вытрымаў бы.

Завезлі мы яго ў бальніцу. Яшчэ тут прыйшлося паваявацъ, каб прынялі. Потым яшчэ з усімі пасварылася, каб пачалі нарэшце афармленне ў дом састарэлых. Быццам бы пачалі.

Сямёнавіч цяпер ляжыць у хірургічным аддзяленні нашай бальніцы. І кожны раз нешта гаворыць, як прыйду. Я нічога не разумею. Па слову толькі здагадваюся. Адно дакладна ведаю: дахаты ён ужо не вернецца. Цяпер ужо нават сядзіць з цяжкасцю. А дзе акажацца для яго апошняе прыстанішча — у Кобрынскім, Дамачаўскім ці Шарашоўскім дамах састарэлых, — адзін Бог ведае.

А наракае ён, напэўна, правільна: калі б не гэтыя перавозы ў бальніцы, не рамонт кватэры, не амаль штодзённыя мае наведванні, не падштурхоўванні работнікаў сацыяльнай службы, ён даўно быў бы недзе ў доме састарэлых, і да ўсяго гэтага не дайшло б. Гэта мне роздум на ўсё жыццё: «прычапілася...» Але ж калі адыходзіла з бальніцы, ён крычаў мне наўздагон на ўсю палату: «Аня, не пакідай мяне!..»

Я вельмі здзівілася, што нашы дактары ведаюць, хто такі Купрэеў. Многія называлі яго вершы і гэтыя «Лісты з млына». Здзіўляліся, няўжо так жыве паэт, яму ўсяго 67 гадоў?

Я памятаю, Леанід Міхайлавіч, як Вы аднойчы пісалі, што крыві ён папсаваў многім людзям. Мне здаецца, што ён да цяперашняга часу гэтага не зразумеў. Не дай Бог такой кары... Хаця, аднойчы, як атрымаў ад Вас «Голас» Васіля Гадулькі, кажа: «А я, Аня, нават павесіцца не магу, бо для гэтага ж на ногі трэба стаць...»

Вось такое атрымалася маё пісьмо. Даруйце, Леанід Міхайлавіч, і не падумайце, калі ласка, што я такі аматар скардзіцца.

Надоечы была ў Купрэева. Пытаюся: «Што напісаць Галубовічу?» А ён задумаўся, а потым: «Пакуль не пішы нічога...»

Магчыма, і не трэба было.

Усяго добрага Вам!

Да пабачэння!

*20.07.2004*

## «Чорны дзень 19 верасня»

*Ліст Валянціны БАСАЛАЙ да Леаніда ГАЛУБОВІЧА*

Добры дзень, паважаны Леанід Міхайлавіч!

Піша Вам сястра Міколы Купрэева Валянціна. Я даўно ўжо хацела сказаць Вам, Леанід Міхайлавіч, вялікі дзякуй за памяць аб маім браце, за добрыя Вашы адносіны да яго яшчэ пры жыцці. Ваш ліст да Колі (так я яго заўсёды называла) і цяпер берагу, калі-нікалі перачытваю, каб яшчэ і яшчэ раз адчуць, што ёсць у нашым жыцці і цудоўныя таварыскія адносіны адзін да аднаго, і спагада да чужой бяды. Гэта я маю на ўвазе апошні ліст Ваш (з працягам) да Колі ў Лясную, які прыйшоў туды за тры дні да яго смерці. Брат ужо не змог прачытаць яго сам. Чытала яму медсястра. (Яна і аддала яго мне), расказаўшы, што, калі яна чытала, Коля ляжаў і слухаў неяк быццам безуважлі-

ва, але калі яна скончыла чытаць, то ўбачыла, як па яго шчоках ціха цякуць слёзы...

Я так доўга збіралася Вам, Леанід Міхайлавіч, напісаць таму, што смерць брата зусім падкасіла маё і без таго не вельмі моцнае задроўе. Тым больш што гэта была трэцяя смерць у нашай хаце за апошнія дзевяць месяцаў. 25 студзеня 2003 года памёр бацька, 5 сакавіка 2004 года не стала маці, і вось надышоў чорны дзень 19 верасня, калі не стала і брата. Гэтая чорная паласа закончылася маім інсультам, ад якога ніяк не магу ачуняць. Праўда, дзякуючы сваёй дачушцы, я не ляжу, а хаджу і па хаце, і па двары, дапамагаю няньчыць маленькую ўнучачку Іначку, якая нарадзілася два гады назад. Старэйшая, дзесяцігадовая Алінка, помніць дзядзьку Колю, часта расказвае, пра што яны з ім гаварылі, якія гасцінцы ён прывозіў, ганарыцца ім. Ну, усё гэта невялікае адступленне ад таго, што я хацела сказаць.

Я, ведаеце, Леанід Міхайлавіч, ужо ніколі не змагу пазбавіцца ад успамінаў пра апошнія два месяцы жыцця Колі, калі ён ляжаў яшчэ ў пружанскай бальніцы. Дзён дзесяць я жыла ў яго кватэры, каб быць бліжэй да брата. Наведвала яго па два разы на дзень. Хаця ў братавай памяці здараліся нейкія правалы, ён заўсёды прасіў мяне прынесці пачытаць газеты... А яшчэ прасіў цыгарэты, і вельмі злаваўся, калі я не выконвала яго просьбы, даказваючы, што ў палаце нельга курыць. Ён абяцаў, што выйдзе пакурыць на вуліцу. А як жа ён выйдзе, калі нават на бок не можа павярнуцца самастойна, такія глыбокія і балючыя пролежні. Урач сказала, што нічым яму ўжо нельга дапамагчы ў бальніцы. Трэба адпраўляць у Дом інвалідаў і састарэлых. У маім уяўленні гэта былі светлыя Дамы, дзе жывуць паўнавартасным жыццём адзінокія людзі, якія знаходзяць сабе там сяброў, займаюцца любімай справай, а пры жаданні могуць і вярнуцца да сваіх блізкіх. Карацей, у маім уяўленні гэта былі кіношныя Дамы састарэлых (тыпу Ждановічаў). Я так і думала: «Вось Коля пабудзе ў Лясной, пролежні там яго загояцца». Дактары зробяць тое, чаго я сама не здужаю. А потым ён будзе жыць у бацькоўскай хаце, а мы яму дапаможам... Вось такія думкі былі ў маёй наіўнай, даверлівай галаве.

А што ж з гэтага ўсяго выйшла? Ганна Хадаровіч, завёзшы Колю ў Лясную, пазваніла мне і расказала, як ён паводзіў сябе па дарозе. Казала, ён ажывіўся, гаварыў, што некалі быў тут, у Лясной. Прасіў, каб прывезлі паперу, ручку: будзе пісаць. Мне крыху лягчэй стала на душы. Дні праз тры-чатыры я паехала наведаць брата, накупіўшы яму і паперы, і ручак, і яшчэ таго-сяго.

Падыходзячы да Дома, я адчула нейкую трывожнасць у паводзінах яго жыхароў. Потым высветлілася, што тут рыхталіся да пахавання. Зайшоўшы ў палату, дзе ляжаў брат, я спынілася каля парога, ашаломленая ўбачаным. Іх было двое. На ложку каля акна ляжаў худы, нагала астрыжаны чалавек з дзіцячымі вачыма. І столькі ў іх асела болі, тугі, гора! Гэта быў Коля. Я падышла да яго. Ён доўга, неяк падаўлена ўглядаўся ў мяне, нібы пазнаючы, а потым сказаў: «Валя, ты чуеш? Гэта ж мяне хаваюць». І так паўтарыў некалькі разоў. «А з кім жа гэта я размаўляю? — сказала я. — Ты ж тут, Коля, жывы, і я прыехала да цябе!»

Паступова ён вяртаўся да рэальнасці і ўрэшце рэшт запытаў: «А віна ты мне прывезла, а курыць?» Брат так прасіў таго віна, што я, грэшная, схадзіла ў магазін і купіла яму бутэльку. Прынёсшы, наліла грам 200. Коля выпіў, павесялеў, пачаў распытваць, чым я прыехала, сказаў, каб доўга не сядзела каля яго, а то яшчэ спазнюся на электрычку. Запытаў, ці прыйшоў яму ганарар. Я, канечне, нічога не ведала пра яго ганарары, але сказала, што яны былі і іх атрымала Ганна Уладзіміраўна. (А яно, аказваецца, гэтак і было.) І яшчэ спытаў, ці званіў яму Лёня Галубовіч, і я зноў сказала, што званіў і абяцаў наведаць яго. Ён зусім паспакайнеў і кажа: «Ну, то ўжо едзь, а то там Алінка цябе чакае. Завязі ёй шакаладку ад мяне».

Я пайшла ад яго, крыху суцешыўшыся. А яшчэ праз дні тры яго наведаў Рымач са сваёй малодшай дачкой. Як расказваў Рымач, Коля пазнаў і яго, і яго дачку, успомніў, як яе завуць. Яны нават распілі бутэльку віна і, як кажа Рымач, Коля выглядаў болей-меней бадзёра.

Праз тыдзень я зноў паехала да брата. Ляжаў ён у той жа палаце, але ўжо на другім ложку. Мяне ён пазнаў, але быў нейкі згаслы. Расказваў мне: «А я сёння быў там (паказаў наверх), і ты там была». А пасля зноў стаў прасіць, каб я яму купіла цыгарэт: «Схадзі, Валя, тут жа блізка».

— А дзе гэта, блізка? — пытаюся.

— А вось за гэтым вуглом.

І паказвае на дзверы. Я дала яму банан. Як маленькаму, адломвала кавалачкамі, клала ў рот, і ён доўга-доўга жаваў іх, а потым павярнуў галаву набок, узяў маю далонь і заснуў на ёй, як малы, так соладка. Пасядзеўшы з паўгадзіны, я пачала збірацца на электрычку. Асцярожна выцягнула сваю руку, стала папраўляць коўдру на Колю і аслупянела. Вы ведаеце, у што ён быў адзеты (а правільней — тое было накінута цераз галаву на адно плячо)? Брат ляжаў у блакітным жаночым каптаніку з карункамі. Ну, гэта быў проста здзек з чалавека. Ці можна так адносіцца да людзей, хай сабе і хворых. Я зразумела, што справы Колі вельмі дрэнныя, калі з яго так паздзекваліся. Каб хоць трохі было ў яго памяці і сіл, ён не дапусціў бы гэтага.

Я ішла да вакзала як у сне. Перад вачыма стаяў блакітны каптанік у карунках...

Прыехала да Колі праз тыдзень. На гэты раз знайшла яго ў двухмеснай палаце. Коля ляжаў у чыстай майцы (мужчынскай), есці нічога не хацеў, толькі зноў паспрабаваў банана і нібы задрамаў. Я пасядзела, пачала збірацца, паабяцаўшы, што прыеду зноў праз тыдзень. Ёнпаківаў галавой у знак згоды, ціха пацiснуў руку і доўга не выпускаў яе. Было вельмі трывожна і цяжка.

Пасля я ўжо даведалася ад дырэктара Дома: за тыдзень да смерці яму званілі з Брэста і яшчэ аднекуль, распытвалі пра здароўе Купрэева, расказвалі пра яго. І я здагадалася, адкуль такая палата, мужчынская майка, чысценькая пасцелька... Вось так.

На наступны тыдзень мы дакапалі бульбу, наняўшы трасілку. Я радавалася, што ўрэшце пакончана з гэтай работай, і заўтра думала паехаць да Колі. Але тут пазванілі. Гэта быў званок з Лясной. Нам паведамілі, што наш Коля памёр.

Трохі сабраўшыся з сіламі, я пазваніла супрацоўнікам рэдакцыі. Папрасіла, каб паведамілі Рымачу і ўсім, хто ведаў брата. Я нават мела надзею, што мне дапамогуць з транспартам, каб прывезці брата ў Міхнавічы. Нікога і нічога я не дачакалася. Зяцю ўдалося наняць машыну ў ДЭУ. Я сама паехала па яго. Дзякуй дырэктару Дома, які спагадліва аднёсся да майго гора. Хуценька былі афармлены ўсе дакументы. Адтуль, з Дома, я пазваніла ў Пружаны Хадаровіч, сказала, калі будзем хаваць.

Людзей на пахаванні было мала: толькі мае сябры ды некалькі былых суседзяў з вёскі. З рэдакцыі івацэвіцкай газеты і з бібліятэкі не было ніводнага чалавека. Вялікі дзякуй Ганне Уладзіміраўне, Міколу Антаноўскаму, Папеку, якія прымчаліся з Пружан і паспелі на пахаванне.

Мусіць, ужо хопіць, Леанід Міхайлавіч, тлуміць вам галаву. Яшчэ раз вялікі дзякуй Вам за добрую памяць аб маім браце.

З павагай да Вас,

*Валянціна Сямёнаўна Басалай*
*і мая дачка Галя (таксама Басалай).*

# «На могілках пад маладым дубам...»

*E-mail ад Міколы ПАПЕКІ Леаніду ГАЛУБОВІЧУ*

Прывітанне, Лёня.

Ну вось я і наведаў Купрэева, але ўжо нежывога, і без Каско (які ў гэты дзень капаў бульбу: проста, празаічна, па-беларуску), і шмат без каго іншага.

Цэлы ранак дазваньваўся ў Івацэвіцкі раён, каб даведацца, дзе і калі будзе пахаванне. Ужо нават хацеў тэлефанаваць яго бацьку ў вёску Міхнавічы (а ён, аказваецца, 8 месяцаў як памёр), ды мяне асадзіў Антаноўскі думкаю, што хаваць усё-ткі будуць заўтра. Але на тэлефон бацькі ў Міхнавічы пазваніла Ганна Хадаровіч. І ўжо пасля 11 гадзін даведаліся, што хаўтуры-такі адбудуцца сёння а 14-й гадзіне. Лёгка ўдалося пераканаць Антаноўскага як мага хутчэй ехаць, бо калі спознімся, то будзе для нас брыдка. Ён купіў вянок, падпісаў: ад сяброў з Пружан...

Па дарозе спяшаліся. Прыехалі, а машына з труной ужо кранулася з месца, за ёй ішлі 2 чалавекі: і гэта ў Івацэвічах, дзе ў яго было шмат сяброў і якіх ён з такім замілаваннем апісаў у сваіх творах?!

Да працэсіі даядналіся Антаноўскі, Хадаровіч і я. Следам крануліся дзве легкавушкі — з сястрой Купрэева ды яе блізкімі. Я нават спачатку ўсумніўся: а ці Купрэева гэта праводзяць? Вырашыў наблізіцца да труны, ды мяне агаломшыў малады п'яны хлопец, які, як пазней аказалася, нядаўна ўцёк на Беларусь з Чачні: «Ближе, чем на три метра нельзя».

— Чаму нельга, і што будзе, калі перайду мяжу?..

І ўсё ж такі ўдалося разгледзець вянкі: «От сестры Вали и её семьи Николаю Семёновичу».

Горшае маё прароцтва спраўдзілася. На жаль, ніхто з родных не ўспрымаў Купрэева сур'ёзна, як таленавітага пісьменніка, у ім бачылі толькі дзівака-бадзягу...



Перайшлі за машынай чыгуначнае скрыжаванне, і п'яны малады чалавек наблізіўся ўшчыльную да машыны. Я спытаў: а чаму ж ён сам перайшоў агавораныя тры метры?

— А сейчас можно.

— Чаму?

На што пачуў: «Ахтар Агбар, некогда пояснять».

Другім з *чужых*, хто праводзіў Міколу, быў сябар дзяцінства Купрэева Лявон (з яго слоў за сталом прагучала, што ён чытаў усе Міколавы творы і што, калі бацька падчас наведванняў Міколы ў Міхнавічы не пускаў сына ў хату, Купрэеў начаваў у яго).

На могілках пад маладым дубам Міколу чакала выкапаная магіла.У рукі Купрэеву быў уторкнуты чорны пластмасавы праваслаўны крыж, а за палу фрэнча заткнутая іконка, і, дзякаваць Богу, хоць на галаву не была прымацавана чорная папяровая стужка, а можа і была, ды, пакуль мы былі ў дарозе, згубілася.

Запалілі свечкі, якіх на ўсіх не хапіла, а было нас не болей за 20 чалавек. Бацюшка прачытаў малітву ды акрапіў свенчанай вадой дамавіну і дол. Купрэеў ляжаў як дзіцё (як мне падалося, хоць гэта банальна), і ў гэтым вялікая мудрасць — быць дзіцём Маці-Зямлі. Ніхто з родных пры развітанні не пацалаваў Міколу ў лоб. Хутка забілі века ды апусцілі дамавіну ў яму.

Потым былі памінкі ў былой школе, дзе яшчэ нядаўна жыў Міколаў бацька з жонкай. Там стаялі два невялікія сталы (вядома, што нас тут ніхто не чакаў), за якія ледзь уселіся 17 чалавек. І хоць сястра Купрэева пераконвала нас, што тэлефанавала Хадаровіч, — у гэта не надта верылася.

За сталом прамовіў Антаноўскі, за другой чаркай далі слова і мне, а пасля паспрачаліся аб рэферэнце ды ўзгадалі, за што і кім Мікола быў пазбаўлены Дзяржаўнай прэміі. Але не сталі падымаць пытанне, чаму Купрэева пазбавілі больш вартых провадаў...



• *Мікола Папека і Мікола Купрэеў. Пружанскі палацык. 2002 год*

Збоку пры стале стаяла таблічка на расейскай мове з прозвішчам памёрлага і датамі яго жыцця. Мы з Антаноўскім папрасілі, каб гэтую таблічку не прымацоўвалі да драўлянага крыжа, а пазней каб без нас не ўздумалі паставіць помнік з надпісам па-расейску.

Па дарозе Ганна Хадаровіч сказала, што ў яе засталося 250 тысяч Купрэевых грошай. Мы параілі гэтыя грошы не аддаваць яго сястры, а пазней выкарыстаць іх на выраб помніка.

Ну вось практычна і ўсё. Хіба яшчэ дадаць тое, што сястра Купрэева пасля вячэры прызналася: «Хацела пабыць у Міколы ў Пружанах, ды спытала ў дактароў, як доўга ён яшчэ будзе жыць, на што яны адказалі, што ў яго моцнае сэрца...» І яна перадумала.



# «НЕЗАБУДКІ ПАКІНЕ ПАЭТ»

## *Паэтычныя прысвячэнні*

*Святлана КУПРЭЕВА*

# Поэту...

Стихов и прозы твой летящий слог
Таланта божьей искрою отмечен.
Всегда творил, жил, как хотел, как мог,
Был неприкаян, грешен, незамечен.

Судьба жестока, а стихи нежны...
Полет, паденье — все как у поэтов.
Творить — от бога, пить — от сатаны,
А может, от второго то и это.

Любить, страдать, скитаться по земле
Приходят из иных миров поэты.
И души их блуждают в вечной мгле,
Земля рождает их, чтоб быть воспетой.

И ты её, родную, так воспел,
Что сердце задыхается от боли,
И ты, конечно, этого хотел —
Стихи, как птицы, выпустил на волю.

Раз дан талант — мучения сполна,
Всё в жизни по закону равновесья.
Твой светлый рок — Поэзия, — она
Списала всё — во тьме и в Поднебесье...

*18 лістапада 2007 г.*

*Алесь КАСКО*

# Вандроўнік

*Памяці Міколы Купрэева*

Кавеньку-павадыра
паставіць у кут з абуткам.
Запыленым незабудкам
дасць свежай вады з вядра.

Сарваныя ў добры час,
яны ажывуць, як просінь.
«Што ў свеце, кажы, — папросім, —
і што ты згубіў у нас?»

«Што ў свеце? — ён скажа ў такт. —
Прастора, краса, дарога...»
Бязмэтных цяпер ці многа?
Мы скемім: тут штось не так.

Узятыя на іспыт
няпэўным жыццём замкнёным,
зняверымся ў незнаёмым,
прынеслым палёў блакіт.

Які сёння хціві свет,
якія ў ім ходзяць чуткі!..
Чысцюткія незабудкі
пакіне, між тым, паэт.



*Васіль САХАРЧУК*

# На вакзале з Міколам Купрэевым

Сяджу на халодным вакзале
паміж Брэстам і Мінскам
з паэтам Міколам Купрэевым,
які пракураным басам
у паўголасу
нетаропка чытае мне
свае апошнія вершы.
Ціха ў чакальнай зале.
Туруючы яго басу,
раз-пораз б'ецца ў аконную шыбіну
сонная муха,
а з валовага вока паэта
коціцца па шчацэ серабрыстая зорка.
«Кожны нясе свой крыж», —
чытае паэт,
і я заўважаю: гэты радок
ён вынес у загаловак,
а Мікола паказвае,
што аздобіў яго пытальнікам,
падобным да ягонай кульбы.
«Добра жывём...» —
смяецца Мікола, выцірае шчаку
і доўга сухотна кашляе,
кінуўшы пагаслы недапалак
ля адкаркаванай пляшкі «Пятроўкі»,
што прытулілася да гранёнай «шклянкі
Малянкова»,
накрытай пліткай шакаладу.

Дрогкая рука кладзе поруч
белыя аркушы,
ад якіх мне пахне
прэлым лісцем,
бацькоўскай хатай
і рукапісам нявыдадзенай кнігі
майго сябрука Васіля Гадулькі.

*1995*

***Аляксей БЕЛЫ***

## Папялёва

Тут шанавалі і шануюць Слова,
Ускраек тут яшчэ старой Еўропы.
Ля самай пушчы вёска Папялёва,
Дубы — у два, а то і ў тры абхопы.
Спрадвеку просты люд тут жыта сеяў,
Вітаў у святы з іншых сёл гасцей.
Мікола тут калісьці жыў Купрэеў,
Гісторыі ён тут вучыў дзяцей!

...Тчэ павучок над лесвіцай мярэжы.
Другі паверх. Уздымацца цяжкавата.
Фантазій правінцыйных непазбежнасць
Сем год яго трымала ў гэтых шатах.
Не пазычаў, не чуўся вінаватым,
*(Вершы былі надрукаваныя ў берасцейскіх раёнках і абласной газеце «Заря» за 3 красавіка 1963 г.)*

* * *

Кожная бярозка — нібы песня...
Кожны лісцік на бярозе — слова песні.
І таму бярозкам цесна ў лесе
і яны дзяўчынкамі бягуць к дарогам.



Сёння на Зямлі дарогам цесна,
стрэламі яны імчацца к зорам.
І таму мне ў хаце стала цесна,
стаў складаць я маладую песню:
крок ступлю — слова песні,
на будоўлі пакладу цагліну — слова песні,
кіну зерне ў поле — слова песні,
Ёй скажу «кахаю» — слова песні,
жыццё пасею на Зямлі — слова песні...

О, каб на Зямлі было цесна толькі ад песняў!

*(Гэта — пазнейшы варыянт верша «Зямля і песні» («***Кожная бярозка — нібы песня...»), апублікаваны ў газеце «Чырвоная змена» 27 чэрвеня 1963 г. Мажліва, у рэдактарскай «апрацоўцы».)*

* * *

Калі захварэю цяжка —
у бальніцу мяне не вязіце.
На пагорку высокім мяне палажыце!
Там сонечны промень, як шпрыц,
увядзе ў мяне поўную дозу вясны:
кубік цяпла,
кубік святла,
кубік соку бярозы,
кубік свежага ветру,
кубік водару кветак першых
і апошні, самы асноўны —
кубік соку зямлі маёй роднай.
І я ажыву! Ажыву!
Толькі —
        поўную дозу вясны!

Толькі —
    на тым пагорку:
бачыце каля Нёмана дзве сасны?

*(Вершы былі надрукаваныя ў газеце «Заря» 8 верасня 1963 г. Там жа быў апублікаваны артыкул Уладзіміра Гніламёдава «Лирика Миколы Купреева».)*

* * *

Недзе далёка — атамныя выпрабаванні…
А тут, на Палессі,
над раздоллем духмяных траў
выспявалі такія прыгожыя ранні,
такія блакітныя, ціхія ранні, —
і дуб,
    як юнак прад вачыма любові,
маўчаў,
зачараваны сінім спакоем,
свежай зямлі медастоем,
зялёным лясным прыбоем,
бярозавай чысцінёю,
русакосаю, юнай табою,
у сукенцы-званочку табою —
нявестай маёю.
І я прад вачыма вечнай зямное любові
цвёрда на роднай зямлі стаяў,
шукаў у сэрцы пяшчотныя ціхія словы,
ды словы закляцця
            сказаў:
— Каб атамныя выпрабаванні
            не дыхалі смерцю
                    на ціхія ранні!



* * *

Тады ж палюбіў я і вуліцы тыя,
па якіх ты праходзіла ў маі,
і бэз на світанні ў расе,
што ламаў я табе за горадам,
і ліпеньскі той надвячорак —
ты глядзела, як ён дагарае
недзе за Бугам,
і тую ноч, калі косы твае
былі раптам асыпаны зорным золатам.

Праклінаў і любіў цягнікі,
што імчалі цябе да Начанкі, дадому.
І захацелася кратаць бярозы твае,
у лугах твае кветкі і травы,
пачуць твае лёгкія крокі.
І, як звар'яцелы, ляцеў я к небу твайму,
як хлопчык з бацькоўскага дому
ў рамантыку мораў сіне-далёкіх.

А ля Начанкі так пахла рутай.
І стала зямля тая сватам і свацціяй.
Хацеў свет абняць, калі людзі казалі:
«Маладая і малады…»
Не даравaў бы жыццю ніколі,
каб яно не дало мне з табою спаткацца,
каб на свет гэты цёплы
не нарадзілася ты!

*(«Маладосць», 1963 г., № 5)*

## Песня дзяўчыны

Калі ціхім касмічным ранкам
ты прачнешся далёка ад роднае хаты,
глянь на Зямлю: на высокім ганку
табе я ружовай хусцінкай
махну крылатай.

«Добрай раніцы, зорны мой віцязь!»
І, як некалі тут, на Зямлі,
я пачую тваё прывітанне.
І памкнуцца ў неба
блакітныя хвалі Свіцязі,
Як рукі мае на спатканне.

*(«Заря», 19 снежня 1964 г.)*

* * *

Была восень і сцежка ў лузе
Ля калін, залацістых ажынаў.
У звычайнай заношанай блузе
Хлопец крочыў паволі сцяжынай.
Стала неба — спакойнае, строгае
Найвялікшым сінім цудам.
На плячы быў у хлопца зацёганы
На раменьчыку вузкім эцюднік.
Як сяўню, нёс яго ён турботна, —
Зелянелі навокал атавы, —
І, здалося, вось-вось на палотны
Ён з яе сыпане зерні-барвы, —
І сустрэнемся зноўку мы ў лузе —
Залацістым,
сінім,
зялёным...
Нібы сейбіту, хлопцу ў блузе
Пажадаў я шчодрага плёну!

*(«ЛіМ», 15 снежня 1964 г.)*

* * *

Ішоў па зямлі чалавек.
Расцвітала вясна на зямлі.
Ішоў па палях, каля рэк.
І там,
дзе вочы яго прайшлі,
дзе добрае сэрца яго прайшло,
пахлі хлебам палі,
маладыя сады цвілі
і неба спакойна плыло.

*(«Чырвоная змена», 7 лютага 1965 г.)*

* * *

Дзеці босыя беглі па сонцы,
разбівалі яго на аскепкі апантанымі пяткамі,
залатыя асколкі з-пад ног ляцелі
і падалі зноў у крыніцу,
і, як кропелькі ртуці,
збіраліся зноў у сонца.

Дзеці беглі па небе,
па высокім ціхім небе,
раскідалі яго на блакітныя гронкі.
Лавілі і сонца, і неба ў далоні.

І ён над крыніцай за імі ішоў і бег —
над дзяцінствам, над сонцам, над небам,
рукамі хапаў паветра,
лавіў блакітнае,
спыніўся, вакол азірнуўся —
няма...

А недзе ўперадзе дзеці па сонцу беглі,
разбівалі яго на аскепкі апантанымі пяткамі,
залатыя асколкі з-пад ног ляцелі
і падалі зноў у крыніцу,
і, як кропелькі ртуці,
збіраліся зноў у сонца,
збягаліся зноў у сонца.

*(«Чырвоная змена», 25 ліпеня 1965 г.)*

* * *

Галінкай сухою — не быць на дрэве,
непрачытанай кнігай — не быць на полцы,
семафорам разбітым — не стаяць ля рэек,
цёмным чалавекам — не жыць пад сонцам.

*(«Заря», 19 красавіка 1967 г.)*



* * *

У каханні тваім і маім згараю,
попел з сэрца свайго страсаю,
гарыць!

І ідуць гады...

Пагляджу — і дзіўлюся, нямею:
сэрца новае з попелу вырастае,
і я зноў — малады, малады.

І зноў расцвітаюць сады-надзеі,
і зноў на Палессі збіраю табе лілеі,
і ў вачах тваіх — век тануць.

Толькі ў неба баюся глядзець:
там аблокі плывуць —
нібы вёсны плывуць.

*(«Заря», 18 лістапада 1967 г.)*

## Сцежка

Спачатку сцежка мяне вяла.
Сярод хмызнякоў густых праз балота.
Ішлося лёгка,
Таму што сцежка грунтоўна зроблена —
Маім дзедам пракладзена,
Бацькам прытоптана.
Сюдой хадзілі яны
на працу,
на паляванне,

на войны,
у госці.
Ляжаць на сцежцы
іх мазалі,
іх любоў
і нянавісць,
пялёсткі пяшчотнасці іх
і грудкі злосці.

Таму мне ішлося лёгка.
Ды раптам сцежка звярнула ўправа.
А мне трэба — прама.
І я пакланіўся сцежцы бацькоў.

Ідзецца цяжка.

*(«ЛіМ», 31 сакавіка 1967 г.)*

* * *

Давай будзем жыць на высокай мелодыі,
давай будзем жыць на высокай струне!
А калі штосьці там абарвецца, тады, раскалёныя,
нашы душы шчэ доўга будуць звінець.
Высока гарыш пад сузор'ем Вернасці,
і я пад сузор'ем Чакання гару.
Не абрывайся толькі раней за мяне.
У вечнасці
тады і я на паўноце замру.



* * *

Я крычу табе, чуеш, раніцай
праз лясы і азёры, балоты, пяскі:
дзе ты некалі ў жыцце злавалася і смяялася,
расцвілі сёння чыстыя васількі.

*(Івацэвіцкая раённая газета «Кастрычнік», 2 ліпеня 1968 г.)*

* * *

Прынёс рэдактару вершы.
Кажа:
— Не тое, брат, нешта не тое.
Надта многа тугі...

Ну, а што я зраблю,
калі назаўсёды страціў самае найсвятое,
паўсвету прайшоў,
а нідзе не пачуў:
— Сынок дарагі...
Што я зраблю,
калі ліст ад сястры б'е па сэрцу трывожна:
«Дзесяць гадоў, як дома не быў...
Прыедзь, Колечка... Так жа няможна...
Дзед перад смерцю ўсё Бога прасіў,
каб быў ты жывы й здаровы...»

А што я зраблю,
калі там будзе цяжка вельмі:
там маці калісьці ішла над Дняпром...

Дзе стаялі сляды яе — вырас ельнік...
Ходзіць мама ў зямлі сырой.

Ходзіць мама, шукае выйсця,
рукамі-ценямі дакранаецца столі зямной...

Што я зраблю,
калі там мне цяжка вельмі?
І ўсё-ткі паеду,
пайду,
паплыву туды,
адшукаю балюча-гаючы ельнік,
паблукаю там, дзе дагэтуль цвітуць
маіх родных сляды.

*(«ЛіМ», 21 кастрычніка 1969 г.)*

## Дняпроўскія мроі

...Без мяне, адзін, натужна, аслабела
Атаву продак мой пажоўклую скасіў...
Плывуць удвух яны — кіёк і барада ў белі —
У лодцы на мой бераг.

«Папрасіць
У вас запалку, чалавеча, можна ці няможна?
А то я крэсіва згубіў і не знайшоў — падслеп...»
І працягвае далонь — трасецца жылкай кожнай
Далонь, што некалі мне несла хлеб!

Хачу крыкнуць: «Дзеду! Я ўнук твой, дзеду!»
Ды застылі словы ў горле камяком.
І рукой дрыжачай з фільтрам цыгарэту
Працягваю...



А ён стаіць з кійком
Сухім, крывым, патрэсканым і тоўстым...
«Дзякуй, чалавеча. Зблізку ці здалёк?
Поездам? Аўтобусам? Ці хваляю дняпроўскай? —
Смяецца ў бараду: — Ці д'ябал прывалок?..»

І ён пайшоў к Дняпру — сівы к сівому,
Паплыў — сівы цераз сівое — у свой дом...
І крычу я берагу крутому тому,
Каняю крычу над колішнім гняздом...

* * *

Вядзі, мой капітан!
Кіруй, мой капітан!
Толькі я прашу цябе істотаю сваёю ўсёю:
як настальгіяй захварэю,
спусці мяне ў адкрыты акіян
у шлюпцы
і скажы мне, як папасці ў Гібралтар, —
а там я ўжо і сам знайду,
дзе тое Сярэдземнае, дзе Чорнае, дзе Днепр, —
а там я ўжо і сам зайду Дняпром у Прыпяць,
а з Прыпяці — у Лань,
а з Лані — ў Начу,
а там — у вёсачку Панач,
адкуль уцёк калісьці я ў далёкі шлях,
згубіўшы пацалунак першы ў тых палях...

*(«ЛіМ», 16 красавіка 1971 г.)*

* * *

Ранне буйнее.
Густа запахла жывіцай.
Распусцілі лілеі пялёсткі на Шчары і Ясельдзе.
Чую шоргат ігліцы:
прадзёўбваюць корку зямную
ўчарашнім дажджом акрыялыя добрыкі.

Ступаю на столь камянецкае Белае Вежы,
аглядаю краіну сваю палявую,
лясную,
рачную:
п’юць лані спакойна ваду, і пяшчотна зубрыхі
сваіх зубранят аблізваюць — аж парна ў пушчы.
Сонца ўзыходзіць.

*(Альманах «Дзень паэзіі-72».)*

## Рэкі Івана

Калі шапнецца цішыня начная
і бусел ціха клёкне перад сном,
сляпы Іван у восецi шукае
старыннае бацькоўскае вясло.

І ім з двара, намацаўшы барозны,
над цвітучай бульбаю ідзе —
туды, дзе цёмна свецяцца бярозы,
дзе каліна цёмная цвіце.

Там ёсць бераг і ёсць лодка.
Іван вяслом шукае ўсплёск ракі...



О-эх, як пахнуць чараты салодка
і самі датыкаюцца рукі!

Між цёмных берагоў паціху лодка
сама дрыготка-чуйная плыла,
і было ў ёй чалавеку лёгка-лёгка,
і душа яго святлом цвіла.

Чуў, як за лясамі ўпала знічка
і як рыба пазяхала ў чаратах,
і цурчанне — у раку крынічкі,
і дыханне сонных птушак у кустах...

Каб больш пачуць і больш убачыць,
дастае з вады бярэмя чарацін,
засцілае дно і ўгору тварам ён кладзецца нанач —
з цішынёю, з рэчкай, з рыбаю — адзін.
І тады яму здаецца, што і сам ён — лодка,
і не ён у лодцы — а гады´ ў грудзях яго плывуць...

А недзе ў мора Віслаю плыве прабітая пілотка,
процьму гадоў плыве — не можа патануць.

## Апошняе слова бярозы

Захвалілі мяне паэты,
заспявалі мяне спевакі,
панавешвалі мне завушніц,
разнеслі па белым свеце,
што ствол мой — як цела дзявочае...

Сэрцавіна ж мая даўнім болем гарыць,
немым крыкам крычыць!..

...прывязалі,
да ствала майго прывязалі
вашага сына, Панас і Панасіха,
я хацела яго ўратаваць —
ўзвіцца хацела стралою ў неба, —
не пусціла карэнне,
не памог буйны вецер...

Я доўга крычала —
плачу і сёння...

*(Альманах «Дзень паэзіі-74».)*

## Вечны ўздых

Напрацаваўся,
навесяліўся,
наездзіўся
і нахадзіўся —
Мінск патанае ў сон.

І, адыходзячы ў сон,
устрапянецца трывожна,
як аб Вечны агонь —
аб штодзённую памяць спаткнуўшыся:
здаецца яму, што ўздыхае зямля ў Трасцянцы
двумастамі тысячамі душ,
і глыбокі прыглушаны звон...



* * *

Сёння позна сядзець не буду,
спаць лягу рана.
Раніцою ў Антонаву Буду
пайду па тумане.

Па цёплым балоце, па гаці,
па рассцеленым лёне...
У адзінокай і цеснай хаце
да болю прасторна Алёне.

Мулка. Трывожна. Не спіцца.
Ранак над ціхаю Начай.
І нешта святое сніцца.
І нехта ля веснічак плача.

*(«Маладосць», 1974 г., № 5.)*

* * *

Адыходзяць мамы ў свет далёкі.
Але з намі
яны кожнаю вясной і ўлетку:
перапляліся з каранямі —
шлюць з зямлі нам лісце,
тра́вы,
кветкі.
І толькі паміраюць на зіму.

## Сакавіцкае

Нахілю я галінку
сакавіцкай вярбы
і схаваю ля сэрца:
дзьмуць нявесна вятры.

Можа, к вечару коцікі
мякка-цёпла ўздыхнуць...
Ранавата — у Вербнае
плыве ціхая Друць.

Якія мы сталі даверлівыя,
людзі й зямля.
І дачаснай цяплыньцы
давярае ралля.

Заўтра ж, скутая сіверам,
не прылашчыць зярнят.
Сціхлай грудкаю з неба
ападзе жаўраня.

Нахілю я галінку
сакавіцкай вярбы
і схаваю ля сэрца:
дзьмуць нявесна вятры.

*(Альманах «Дзень паэзіі -78».)*



## Вясковыя вераб'і

Вераб'іная песня — простая,
сярмяжная, сарамяжная,
прапахла саломеннай вёскаю —
учарашняю.

І так вераб'ям спяваецца —
так чырыкаецца,
калі гной у двор выкідваецца —
вясна шырыцца.

Купаюцца ў шэрым нагрэтым пяску,
шчасліва заплюшчваюць вочкі.
«Я табе верабейчыкаў прынясу —
дачок, чырык, і сыночкаў...»

...Ёсць на гэтай зямлі
і вераб'інае свята:
паляцелі — гняздзечка звілі
пад страхою...
Чацвёртае хаты.

## Драчы

У лузе дняпроўскім
трывожна,
шумна шапоча чарот.
Выпаў ля роднае пожні
байцу паміраць чарод.

«...Гэта апошняя рана...
Мама мая, не плач.

Ля сына твайго Івана
ранены стогне драч.
Ляцеў ён у вырай заўчасны.
Па мінах твой сын ішоў...
А сонца ўзыходзіць ясна
над Варшаўкай-шашой.
Аб драчах ты ніколі не пела,
бо і самі яны не пяюць —
толькі ў траве, у тумане белым
маленькае горла дзяруць...
...Я ўсяго не сказаў табе, мама:
зараз апошняй гранатай скажу —
ідзе сюды вораг прама...
сышоў на маю мяжу...»

Туліцца драч к салдату,
шэпча салдат яму: «Бач,
ты — маленькі, у травах схавайся,
ты — птушка.
А я — салдат Іван Драч.

*...Сівенькая маці блукае*
*тысячы дзён ля ракі,*
*сына Івана гукае*
*на ўсе чатыры бакі.*

*З боку Расіі — ціха,*
*і з захаду — немата,*
*ад Украіны — ні слыху,*
*а з Магілёва — вада.*

І больш не магу я! З лугу —
«Маці, — шапчу, — не плач.
Няўжо ты не чуеш? Слухай:
Горла дзярэ сваё драч!..»

*(Вылучаны курсівам урывак друкаваўся асобным вершам у кнізе «Правінцыйныя фантазіі».)*



# Буслы

Толькі ў адной народнай песні
знайшоў два радкі пра бусла.

*З размовы*

**1**

Вяселле ў хаце.
Хата пад бярозай,
пад гняздом бусліным.
Як спявае цётка Прося
за сталом гасцінным:
«А бацян напіўся
ды пад стол зваліўся...»
Ах, спявайце, людзі,
гарэліцу піце.
Над хатай буслоў не будзе,
перапёлкі ў жыце.

Жыта не ўрадзіла,
высахла балота...
Госці, не будзіце
буслянят ля плоту...

Ах, спявайце, сваццi,
гарэліцу піце.
Будзе бедна ў хаце —
буслоў не судзіце.

Бусел не наеўся,
бусел не напіўся —
аб дрот зачапіўся
ды пад слуп зваліўся...

А госці цётку Просю
па-над чаркай просяць —

сумна паўтарае,
галавой качае:
«...напіўся
ды пад стол зваліўся».

І ціха плача Прося.
Не ад віна.
Не ўрадзіла проса —
кашы дзеткам няма.

...А за хатай — танкі на шашы
стомлена вяртаюцца з вайны.
У гняздзе клякоча сірата-бусліха...
Звечарэла. Ціха...

**2**

*Мастаку Г. Х. Вашчанку,*
*аўтару карціны «Матчыны крылы»*

Якім асеннім днём ці вечарам
яны зрабілі тут апошні круг?..
Стаю. І не хапае нечага.
Падае з вышыняў белы пух.

Бягу ў хату. Бразну зашчапкай!
Нахілюся цяжка над сталом...
Б'е трывожна ў вокны Вашчанка
палескага бусла крылом.

Няўжо стануць светлай казкаю
нашы беларускія буслы?!
Сустракаем Прыпяцкім заказнікам
не буслоў — цяпер яны паслы...

Дык асеннім днём ці вечарам
тут зрабілі свой апошні круг?
Стаім. Чакаем. І шукаем нечага.
Падае з вышыняў белы пух.



**3**

**Баладнае**

Перад выраем са стаі выгнаны —
і хворы, і стары, —
белы бусел па-над выганам
ляцеў паціху на зары.

І ўзмахнула скрухаю такою
крыло над мілаю зямлёй!..
А нехта плыў пад ім ракою
і махаў буслу рукой.

Які наш боль, якая роспач
нас прымушаюць зразумець:
калі ляцяць буслы на поўнач —
на поўдзень не усім ляцець...

Той, хто плыў унізе ў лодцы, —
ці не птушка ён і сам?
Перад сваім апошнім сонцам
ён верш апошні свой пісаў.

А бусел плыў — у вечныя аблокі
вяло яго нявечнае крыло.
Закрыў там вочы — ў вір глыбокі
яго ўжо не крыло няслo...

Лодка здрыганулася на хвалях,
доўга калыхалася рака.
З борту вёсламі звісалі
птахава крыло,
паэтава рука.

* * *

У цэнтры ўпраўлення палётам
толькі Клімук разумеў,
чаму касманаўт Кавалёнак
над Беларуссю знямеў.

Чуў ён зямлі пазыўныя
і адказаць не мог.
Пелася ціхае: «Сыне,
журавіначка падае ў мох...»

Дзе ж тая родная вёска,
калі і Еўропа — туман...
У космас глядзеў узнёсла
з плоту старэнькі жбан.

Іванчэнкаву шэпча: «Крылы...
пад караблём прараслі
нейкія дзіўныя крылы —
здаецца, ляцяць буслы...»

*(Нізка вершаў «Птушкі Беларусі»: «Вясковыя вераб'і», «Драчы», трыпціх «Буслы», «***У цэнтры ўпраўлення палётам...» была надрукаваная ў штотыднёвіку «ЛіМ» 28 сакавіка 1980 г.)*



* * *

*Паважанаму Мікалаевічу**
*з просьбай: каб верыў у гэта*
*(а можа і так?)...*
*13.03.84*

Не, я не разбіўся ўшчэнт, я не стаміўся —
вось толькі тут на некалькі зямных арбіт стаіўся,
паміж палёў, лясоў,
наўзбоч ад аўтастрады,
каб падрахаваць спакойна свае страты.
А іх нямала.

Не, я не адышоў ад вас, сябры-паплечнікі, —
хачу адзін пабыць пад небам вечным,
каб дабраты і шчырасці набрацца —
і потым зноўку з вамі прывітацца.
А вас — нямала.

Не, я не ўцёк ад вас, мае старыя ворагі —
я толькі начыню тут сэрца сваё порахам,
каб на абрыве зноў мог сутыкнуцца з вамі
і кулакамі, й вершамі, й вачамі!
А вас — нямала.

Пасланнем гэтым пра сябе напамінаю:
плыву тут Ясельдаю — пыл і бруд змываю,
ды мускулы на хвалях правяраю,
кладуся на спіну — і неба на грудзях трымаю.
Мяне — яшчэ нямала.

*1984*

* Сябру Міколу Рымачу з Івацэвічаў. — Л. Г.

## Яма ў канцы XX стагоддзя

Па чыгунцы стагоддзя гудзе і грыміць аграмада,
і я свой вагон прычапіў да пачвары праклятай,
кідае ў бакі мой вагон, і за намі масты
рушацца з грукатам страшным у бездань.

Так мы ў чэраве той аграмады ляцелі,
ды пад гарой на крутым павароце ўзарваліся рэйкі,
і ўпаў мой вагон у глыбокі адхон,
і душа раз'ядналася з целам.

У крыві і асенняй гразі я сабраў сваё цела
і паклікаў душу — яна з поля азвалася ціха,
я на голас пайшоў — пад халодным кустом трымцела,
шэпча: ў неба хацела — цяжкія грахі не пусцілі.

Зноў душу я ўдыхнуў у сябе, астудзіў ёю горла
і прыйшоў па разбітай дарозе назад на радзіму,
пад вокнамі дзедавай хаты палын вырас горкі,
і брыду я з рыдлёўкай на ўзлесак счарнелы і дзікі.

Капаю, капаю — стукаю ў камень рыдлёўкай,
капаю, камень і камень, капаю.
Раптам шэрая мышка-палёўка
глядзіць на мяне пад рукамі.

Стукаю ў камень, капаю.
А яна з-пад карэння, камення
так на мяне паглядае
маленькімі бубкамі-вочкамі.

Кінуў рыдлёўку, прысеў перад ёй —
не ўцякае,
вочкамі быццам пытае:
«Вярнуўся? Вярнуўся?..
У норках маіх —



зернейка, зернейка,
хопіць нам на дваіх...»

Ля Ямнага выкапаў яму, пакрыў дзірваном —
ля сівых курганоў, ля пакінутых хатаў,
схаваўся ў ёй — не чуць і не бачыць,
як трашчыць і гарыць аграмада,
як падаюць рэйкі з неба...
Дзе ж ты, мышка?
Хопіць нам на дваіх.

## Ноч Янкі Юхнаўца

Калі землякі-эмігранты
спакойна спяць па Амерыцы,
ціха з ганку паэт
у індзейскія сосны сыходзіць.

Недзе далёка
«клікаюць штодня званы маліцца»*.

Рукою дрыготкаю хрысціцца,
скрушную шэпча малітву.

— О Божа!
Пакутна на гэтай тваёй зямлі —
дай жа пакутаў яшчэ і ў вышынях тваіх,
дай, о Божа, прытулак апошні
ў аблоках.

Індзейскія сосны ідуць у ноч.

«...да мясцін святых шчэ цягнецца дарога»*,
ды — «...малітваслоў забыўся,
пакінуў дома на паліцы»*.

І не вярнуцца да пакінутага роднага парога,
каб на мове Еўфрасінні за радзіму памаліцца.

Не прыйдзе пакорнік «на узлонь далін»*,
у моўкнасць камянёў на докшыцкіх палях,
у развіненне велікомае крывіцкіх каляін,
што кінулі яго на незваротны шлях.

— О Божа!..
Скронню прынік да сасны —
і ў высокім чудзенні ствала
чуе верацяна вярчэнне,
вочапа скрып, звон даёнкі.
І бразнула клямка ў сасне:
ён з хаты ў маленства бяжыць —
з рук матчыных
піць сырадой вячэрні...

...Не азірнуўся на ганку туды,
дзе маліўся.
У пакойчыку свечка патухла ў бажніцы.
Амерыка спіць.

## Закляцце

З трыбуны сышлі,
на руках мне разбілі ланцуг,
на нагах — кайданы
і замок знялі з вуснаў.
Сказалі:
«Ідзі з плугам у поле сваё,
з касой — у свой луг.

* Радкі з верша Янкі Юхнаўца



Спявай і крычы
што хочаш
на мове сваёй беларускай».

Зноў на трыбуны ўзышлі.

А самі ж
рукі мае адвучылі араць і касіць,
ногі — шырока і вольна хадзіць гасцінцам,
звязалі свабоду па-свойму думаць і жыць
і роднае слова казаць,
і маліцца-хрысціцца.

Прашу:
зноў на рукі ланцуг падаць,
вусны замкнуць і ногі скаваць кандаламі,
зацягнуць на Незалежнасці пляц —
пасадзіць там
пад тымі нагамі.
Стану каменны й халодны, як ён.
Будзеце тут святкаваць свае святы —
чорны ў яго не кідайце праклён,
у выраджэнні сваім
я быў сам вінаваты.

## Блакітныя коні

— У нетрах пушчанскіх
знайшоў капыты,
парослыя мохам зялёным...

А як пачую вясною
гром малады ў нябёсах —
ведаю:

там, у вышынях,
выкрасаюць агонь капытамі
блакітныя коні,
і за імі грыміць калясніца,
і то не аблокі — грывы ляцяць.

А хто тымі коньмі правіць
і хто ў калясніцы —
не ведаю я.

*(«ЛіМ», 15 чэрвеня 1994 г.)*

## Дзікія гусі

Над маёю мансардай асенняй
дзікія гусі крыкнулі.
Кульбай насцеж акно расчыняю —
а яны ўжо далёка-высока.

На вуліцы суседскія гусі
ўгору задралі галовы,
сталі біць «па зямлі» крыламі,
пыл паднялі і з адчайным крыкам
пранесліся нізка і ўпалі на выгане,
зноў угору задралі галовы…

Зачыняю акно.
Пішу гэты верш Валянціне Аксак,
пад страхою высока —
каб на ўзгорках сваіх нясвіжскіх
і ў менскіх аблоках — арліца — не думала,
што вершамі дыхаю на падлозе
і б’юся, бяскрылы, нізка…



* * *

*Ганне Хадаровіч*

«Ганулька па лесе хадзіла,
дзіця нарадзіла»* —
ад дуба, ад клёна, ад ясеня,
ад сонейка яснага.

Сын крыкнуў адчайна і громка —
і гарацЬ калінавыя гронкі
на беразе ціхай Ясельды,
і сталі ласі і алені
прад чыстай вадой на калені,
кінуў высока клёкат
чорны бусел —
маргінальны птах Беларусі,
вывернуў зубр-адзінец рагамі
і б’е радасна капытамі
Белавежскую пушчу…

«Ганулька па лесе хадзіла —
дзіця нарадзіла»…

## З гісторыі Падняпроўя

У траве начной ля Рагачова
радзіміцкія дзеўкі так крычалі.
На зямлі Міколы Сурначова
іх красу жаўнеры ў гразь тапталі.

* З народнага.

Радзімічы іх чулі ў Рагачове,
і габрэі рагачоўскія іх чулі,
і цыганы кудлатыя ў Збарове,
што ля Дняпра на вогнішчах начуюць.

Як ноч пайшла сваёй дарогай
і на Юдзею памаліліся габрэі,
у Турскім лесе лёг Іван Купрэеў,
І піў віно з турынага ён рога.

А дзеўкі недзе плакалі, крычалі,
Варшаве ж і Маскве было ўсё роўна.
Расейска-польскія жаўнеры іх таптaлі —
пасля ўжо й продку твар здзяўблі вароны.

* * *

Я ўвайшоў у райскі сад,
неба пада мной плыло блакітнае.
І пачуў: дарогі мне назад
няма. Бо Ева там вагітная

рукі прасцірае да мяне,
плача: «Што зрабіў са мной ты!»
На маладыя рукі ўзяў яе,
да Адама нёс самотнага.

Ён хавацца за кусты пабег,
кінуўшы той яблык у нябёсы.
Тады нам Бог стварыў начлег
у шалашы, раздзетым, босым.



* * *

Жорсткія дзіды
з усходу і захаду
білі Яе маладое цела.
Няўжо на гвалт Яе кінуў Бог?
І Пагоня ледзь чутна сапе з прадоння.
Хачу крыкнуць-паклікаць,
ды язык адарваны...

* * *

Выйшла з балота
ў вянку з журавінаў чырвоных
і белых туманаў.

Выйшла з лесу
ў вянку з багульніку горкага,
ядлоўцу калючага.

І сама пацягнула сябе за косы
зноў у лес і балота —
беларуская наша свабода.

*(Вершы расшуканыя ў архівах
Ціханам Чарнякевічам і з архіваў
Леаніда Галубовіча.)*

# Лісты з млына

*Аповесць*

## Ад аўтара

Кучаравы паэт Парыжа Альфонс Дадэ спякотным летам 1865 года весела скокнуў у Бакерскі дыліжанс і махнуў адтуль шырокім капелюшом маладой жанчыне, якая стаяла ў натоўпе праводзячых і самотна пазірала на вясёлага Альфонса. А калі дыліжанс, ужо стараваты, але ўсё яшчэ шыкоўны, грымнуў па каменнай правансальскай дарозе, жанчына далікатна перахрысцілася ўслед...

Так, Дадэ імчаў углыб Праванса. Недзе там, у даліне Роны, на схіле пагорка, парослага сасной і дубам, яго чакае стары млын з паламаным колам і цаглянай пляцоўкай, парослай травой, як было пазначана ў купчай. Чым болей пашкоджанняў у млыне, думаў Дадэ, тым больш і весялей ён будзе пісаць, — прычым, казалі Альфонсу, у тых месцах добрае віно. І пацвердзіў гэта Містраль, калі «чытаў яму ў Парыжы вершы на цудоўнай правансальскай мове, на тры чвэрці лацінскай, на якой раней гаварылі каралевы і якую цяпер разумеюць толькі пастухі...» (А. Дадэ).

Дадэ гойдаўся, гойдаўся на мяккай канапцы ў дыліжансе ды й заснуў. Свежы вецер Праванса налятаў на дыліжанс, трывожыў сон Альфонса, і ён зрэдку лыпаў вачамі. І вось адно яго вока ў нейкі момант так лыпнула, што злавіла над вінаграднікамі ўзгорак і на ім вялізнага, нібы прыколатага да зямлі, матыля — млын. Ён расплюшчыў другое вока і сказаў сам сабе, што тут яму будзе лёгка пісацца. «Оэ-эх!» — усклікнуў Альфонс і выпіў з гарлачыка віна, пакуль што парыжскага; паэт ужо ведаў, што на млыне ён будзе пісаць лісты ў Парыж, і ў кожным лісце будзе нарыс ці ўспамін пра што-небудзь. Калі ж напісанае ім будзе звязана тэматычна, гэта ўжо будзе літаратурная зададзенасць. Але Парыж ён злёгку патрывожыць — памахае яму чырвонай фескай Тартарэна з Тараскона, а феску, з дазволу непаслухмянага Тартарэна, добра будзе абліваць вінам Праванса. Мо́жа, пах яго пачуе і Яна, якая хавалася ў натоўпе праводзячых. Яна прыедзе на млын, які ён купіў, ні разу да гэтуль не бачыўшы. Ён купіць увесь Праванс з усім яго вінам, і Містраль прыедзе да яго — на вершы і віно, і яны разам будуць дыхаць паветрам Роны.

«Сігальер! — крыкнуў вазніца коням пад хвасты. — Прыехалі, месье Дадэ!» І гэты рыжы д'ябал зняў з галавы дзіравы капялюш і пакланіўся ўзмыленым конскім азадкам, а потым — паэту.

Дадэ лёгка скокнуў з падножкі дыліжанса і схіліў галаву перад натоўпам сустракаючых — дамамі і іх кавалерамі. Адна маладая жанчына ў блакітным пеньюары стаяла ўбаку ад усіх і нешта шаптала небу. Да паэта падышоў месье Міціфье, сігальерскі фермер, былы гаспадар млына, яны разам пакланіліся сустракаючым, і фермер павёў вясёлага кучаравага паэта Парыжа праз вінаграднік да млына.

Праз 138 гадоў спякотным беларускім летам 2003-га на аўтастанцыю ў раённым гарадку П. прыйшоў лысы літаратар К. з драўлянай кульбай у левай руцэ і ладным саквояжам — у правай. Да пляцоўкі пад'ехаў зацёрханы аўтобус. Літаратар зайшоў у яго, нехта з пасажыраў ззаду падаў яму саквояж. Калі аўтобус хрыпата таргнуўся з месца, літаратар убачыў праз акно прыгожую жанчыну з доўгімі чорнымі вейкамі. Яна стаяла пад бярозай за пляцоўкай з чырвоным і жоўтым цюльпанамі ў руцэ. Яны сустрэліся позіркамі, і жанчына, лёгка махнуўшы кветкамі, нешта шапнула яму. Ён быў ужо прыўзняўся са свайго месца, каб накіравацца да выхаду, але тут сусед-пасажыр рашуча сказаў яму: «Грамадзянін, супакойцеся!». Тады ён махнуў ёй рукой праз акно і ўжо не пабачыў, ці махнула яна ў адказ.

Літаратар К. ехаў у Пушчу — каб знайсці там які ціхі прытулак і пісаць. Што пісаць, ён яшчэ дакладна не ведаў.

Вось знайсці б там закінуты хутарок, стары млын ля яго і — проста пісаць... Учора яна прынесла яму на кватэру і паклала на стол стос канвэртаў. Ён яшчэ раз спытаў у яе, ці будзе яна шукаць «Лісты з млына» Альфонса Дадэ. Сказала, што будзе, не спытаўшы, якой парою ён заўтра ад'язджае...

У Папёлцы яго ніхто не сустракаў, нікога ён тут не ведаў. Ён не быў кучаравым паэтам сталіцы...

Старая хатка на хутары ветліва кіўнула яму...

**1.**

*Шаноўная Кацярына Пятроўна!*

*Мілая Каця! Добры дзень!*

*Даруй, неяк неўпрыкмет перайшоў на «ты» і набраўся смеласці назваць цябе мілай. Праўда, наконт «ты» — твая прапанова...*

*Учора я прыехаў у Папёлку. Вёска на ўскрайку Пушчы. Зняў паблізу хатку на хутары. І сам у подумках сказаў той хатцы: нічога, бабуля, будзем трымацца, я ж таксама немалады і напаўразбіты. Аднак сцены хаткі аказаліся з крэпкай смалістай сасны. З бярвення глядзяць жоўтыя вочкі смалы.*

*Даруй, Каця: нецікава чытаць лісты літаратараў — метафары, эпітэты, мастацкія дэталі... Цікава, што нават у маленстве лісты мы пішам геніяльна. Я й цяпер, праз столькі гадоў, смяюся і плачу над лістом, які пісаў у хаце ямнаўскага дзеда летам 1944-га; ён цудам збярогся ў старым квятастым куфры маіх вясковых цётак і стаў зусім жоўтым. Помятаю яго на памяць:*

*«Драстуйця дед Іван баба Марфа цётка Маня цётка Вера цётка Ніна піша Толя у нас е авечка і баран дед навучыў мяне чытаць і пісаць скора пайду у першы клас усе мы жывы і здаровы чаго і вам жалаем зімой карова прывяла бычка учора зарэзалі пеўня, сёння узялі у армію дзядьку Аркадя ён у двары цалавав і цягав за валасы жану ён у полі ужо цягав за хвасты самалёты і мыв ім хвасты у нас дома стаяв афіцэр з жаной і ён цягав жану за валасы яна плакала на вуліцы пленныя фрыцы смяяліся з девак не цягалі за валасы здохла кошка дуня дасвідання прывет ад деда Навума бабы Пелагеі цёткі Ніны ждом атвета як салавей лета».*

*Найшчырэйшае пісанне. Так мы ўжо ніколі не напішам...*

*У хатцы стаіць старажытны драўляны ложак. Гаспадыня хутара (жыве ў вёсцы) прынесла мне з дому пасцель.*

*З сабой я прывёз рукапісы, паперу. У горадзе ў маім пакоі стаіць шырачэзны драўляны пісьмовы стол. На ім я быў паклаў некалькі стосікаў чыстай паперы — для нейкіх там сваіх Тэкстаў. Сядаў у крэсла перад сталом і пісаў на кожным стосіку асобны Тэкст. Перад самым ад'ездам расчыніў насцеж вакно, і тут з вуліцы шугануў такі вецер, што ўсе мае паперы ўзняліся са стала і рассыпаліся на мосце. Сабраў я іх пасля ў адзін стос. Тэксты ж былі так перамяшаныя, што я махнуў рукой і запхнуў іх у торбу не раскладаючы.*

*Ты папрасіла дасылаць табе на рэдакцыю рукапісы маіх новых твораў. Буду дасылаць. Загадзя табе дзякую за перадрукоўку іх на камп'ютары. І яшчэ ты прасіла, каб я не хітраваў, не хаваўся і дасылаў усё (ты паўтарыла: усё!), што напішу. І навошта я прагаварыўся, што чытаць табе дам не ўсё? Ты паставіла локаць на стол, падперла далонню шчаку, усміхнулася і самаўпэўнена сказала: «Усяроўна ж прачытаю».*

*Сёння ўвечары (на хутары ёсць газнічка) упарадкую аркушы з пачатымі Тэкстамі.*

*Працягваю табе праз сіні густы туман сваю руку. Помню тваю руку, голую да локця. Далонню ты падперла шчаку і глядзела за вакно.*

*Бывай.*

*Я.*

**2.**

*Мілая Каця!*

*Пішу табе сёння ўжо не ў хатцы. Пішу ў млыне. Так, у старым, напаўразваленым, пашчэпленым ветраку. Учора падвечар ішоў з хутара ў поле і раптам выйшаў на вялікую прастору, і паблізу на горцы бачу: тры (!) крылы на цёмнай сцяне. Падыходжу. Побач высокая, тоўстая бяроза. Блізка — поле квітнеючай грэчкі. З бярозы на мяне ўпала буйная раса (от, бачыш, зноў пішу як пісьменнік, ажно брыдка). Пад млынам ляжаць на зямлі амаль спарахнелыя, чорныя рэшткі дошак даху, ваконных рамаў і чацвёртага крыла. На паніклых трох крылах няма нават рэштках палатна. І ад дзвярэй — нічога. А над млынам — шырокі куст каліны з зялёнай ягадай.*

*Лесвіца ў млын чамусьці цэлая, нават не рыпіць над нагамі. Узышоў наверх. І мост таксама цэлы. Пасярод яго шырокая, счарнелая дубовая калода з глыбокай круглай адтулінай пасярэдзіне. Ля яе ляжаць на баку два круглыя, добра абчасаныя молатам, рукамі і часам камяні. Абодва абабітыя па краях жалезнымі ржавыли стужкамі. Яшчэ побач ляжыць на баку другая, меншая калода. Я паставіў яе. Млынары тут, канечне, елі хлеб з салам, цыбуляй, гурком, частаваліся з наезджымі мужыкамі.*

*Гляджу ўгору: столі няма — мабыць, хутаранцы своечасова, каб упустую не пагнілі, разабралі дошкі, і замест столі цяпер далёкае-далёкае неба, над млынам, нада мной плывуць белыя аблокі.*

*А якое старое тут павуцінне: развесілася з кутка ў куток, дзе-нідзе ажно чорнае, калматае, густое. Вісіць таталітарна. Можа, і трэба — каб таталітарна? Бо калі і дзе не было таталітарызму? Без яго, без супраціву яму, бывала — без крывавага супраціву, чалавецтва не гартавалася б, не крэпла б, не абнаўлялася б. Віват, павуцінне!*



*Падыходжу да ваконнай прабоіны. Бярозавая галіна ўпіраецца ў млын. Цвітучая грэчка наплывае мёдам...*

*А блізка за млынам — рэчка ў высокіх чаротах. За тым берагам, за алешнікам пачынаецца магутная Пушча.*

*Азіраюся на калоду і ўжо ведаю: гэтая калода будзе маім сталом, меншая калода побач — крэслам. Тут я буду пісаць і табе, Каця, — ты ж на развітанне ля рэдакцыйнага ганка сказала і гэтае: пішыце мне доўгія лісты.*

*От і пішу я табе гэты ліст ужо ў млыне. Але надалей буду больш лаканічным. Калі атрымаецца. Буду пісаць пра новае ў бярозе, у калінавым кусце, у полі, у рэчцы Нараўцы (уліваецца ў блізкую ўжо, на Беласточчыне, раку Нараў, што ўпадае ў Віслу).*

*Я вышэй пісаў табе пра сваю наканаванасць, жаданне пісаць у млыне. Адчайным штуршком да гэтага быў імгненны ўспамін ля вакна: Альфонс Дадэ, «Лісты з млына». Некалі даўно чытаў яго па-руску: «Письма с мельницы». А прачытаў яго «Лісты» пасля зачараванасці «Тартарэнам з Тараскона» (на кожнай старонцы аповесці з дзіўным, глыбокім гумарам лятае чырвоная феска Тартарэна).*

*Ну, і як там у горадзе з туманамі?*

*Бывай, Каця.*

*Я.*

**3.**

*Добры дзень, Каця!*

*Не назваў сёння мілай? Ты й так ужо ведаеш, якая ты мне.*

*На развітанне ты ж яшчэ сказала і гэтае: маўляў, я апошнім часам прыходжу ў ваш кабінет, сядаю ў крэсла, чытаю прэсу і — маўчу. А раней нешта гаварыў, жартаваў. Дык ведай: калі вы ўсе ў кабінеце схіляеце свае галовы над глянцавымі мудрымі сталамі, я не чытаю*

*газету, я гляджу на цябе — на твае голыя да локцяў белыя рукі, на тваю белую блузку. І лаўлю, як ты іншы раз, быццам так сабе, няўцямна, ну, зусім абыякава, кідаеш імгненны позірк на вакно, ля якога сяджу я. Потым, было і такое, ты рашуча кідаеш на стол ручку, гэтак жа рашуча ўстаеш з крэсла і чамусьці гэтак жа рэзка адчыняеш шафу для адзення, адчайна напінаеш на блузку чорную куртачку, амаль подбегам ідзеш да дзвярэй, з нейкай, здавалася, злосцю расчыняеш і зачыняеш іх. Я гляджу табе ўслед. І ты пра гэта ведаеш. Ты гэта нават бачыш, калі паварочваешся ў дзвярным праёме і, быццам так сабе, кідаеш у мой бок, быццам за вакно, той самы імгненны позірк.*

*І бяжыш дахаты, каб пакарміць мужа і сына. У дзве гадзіны вяртаешся і чамусьці ўжо зусім спакойна і нібыта нерашуча адчыняеш дзверы ў кабінет. І кажаш: «Ну, што вы тут без мяне цікавага прачыталі?..»*

*Каця, даруй! Зусім незнарок зноў кінуўся я ў белетрыстыку. Здаецца, пісаць я табе хачу не толькі шчыра, а і вельмі, амаль па-дзіцячы, проста. Можа, на мову маіх лістоў уплывае мой узрост — шэсцьдзясят. А ты —маладая, табе сорак пяць...*

*Ну, хопіць. Занадта я ўжо тут...*

*Дык вось, Каця: сёння дастаў з торбы той стос паперы, расклаў яго на падлозе і ўпарадкаваў злева направа, — што да чаго, які аркуш да якога. І вырашыў так (ці не блюзнерства?): хай Тэксты ідуць так, як яны раскладзены на падлозе. Тым болей, што яны, як у вядомых «Лістах з млына» Дадэ, між сабой тэматычна не звязаныя.*

*Што ж, Каця, можаш цяпер пачынаць чытаць і друкаваць. Дасылаю табе Тэкст, каторы клаўся першым злева.*



## Сталін у Оршы па дарозе ў Патсдам

За вакном цягніка Вярхоўнага кіраўніка дзяржавы пагруквала рэйкамі чорная ноч 7 мая 1945 года. Сам Вярхоўны стаяў ля вакна ў калідоры, трымаўся правай, не пакалечанай у разбойна-бальшавіцкай маладосці, рукой за прахалодную алюмініевую падваконную трубку. У шкле ён бачыў толькі адно — рабаціннe на сваім твары ды яшчэ вусы. Вагон мерна пакалыхваўся. Вярхоўны прыўзняў галаву — жоўты месяц пакалыхваўся ў такт вагонам. «Наше дело правое. Мы победим». Гэта быў, за ўсю яго прыўладную эпоху, другі, пасля Тэгерана, выезд за мяжу. Ехаў неахвотна: не хацелася зноў сустракацца з пранізлівымі і насмешлівымі вачамі Чэрчыля. Ён нават пабойваўся гэтага магутнага ілба. Рузвельта ж Сталін паважаў за тое, за што паважалі ўсе, ды яшчэ шкадаваў яго як калеку. Французскага лідэра ён нават у твар не памятаў...

Так трэба было: у Оршы цягнік стаў, пагружаны ў цемру. Але ў месяцовым мройлівым святле Сталін бачыў, як адразу ўздоўж цягніка паўстала стройная шарэнга афіцэраў-энкэвэдзістаў. Ахова займала свае пасты ў крайніх купэ і абодвух тамбурах.

Гэта быў яго першы ў жыцці прыезд у Беларусь, калі не лічыць прысутнасці на абмеркаванні беларускага пытання ў Смаленску.

Сталін адвярнуўся ад вакна, увайшоў у купэ. Тут цьмяна свяціла бра. Сеў у цвёрдае драўлянае крэсла, паклаў правую руку на таксама драўляны столік, левую далонь засунуў за кіцель. За вакном нерухома стаяла шарэнга афіцэраў-энкэвэдзістаў.

«Бэлоруссия», — успомніў ён. Генералісімус выдатна ведаў карту і ведаў, што на поўдзень ад Оршы, пад Магілёвам, Чырвоная Армія дала першы адчайны бой немцам. І яшчэ тут, у купэ, ён сказаў сабе, рашуча пасунуўшы руку па століку: правільна, што расстраляў Паўлава, хоць той і быў выдатным генералам; затое, пасля ўжо, усю вайну дрыжалі

ўсе астатнія генералы і маршалы; толькі хіба чорт гэты, Жюкаў, ніколі не задрыжаў...

Сталін ведаў, якія вялікія чалавечыя ахвяры панесла ў вайну Беларусь, высока цаніў партызанскую, рэйкавую вайну ў Беларусі, ведаў гісторыю: Беларусь была неабходным крывавым буферам паміж шведамі, французамі, германцамі і Масквой. Будзе буферам заўсёды, — падумаў ён сам сабе, — самаахвярны народ. Яшчэ перад вайной прывезлі ў Крэмль спіс пісьменнікаў, пазначаных для расстрэлу; быў у тым спісе і нехта Янка Купала; памочнік падказаў, што гэты Янка Купала для Беларусі, як Шата Руставелі для Грузіі; і Купала застаўся жыць...

І яшчэ ўспомніў Сталін, як у дваццаць першым годзе, у Смаленску, ён спытаў у Чарвякова, ці хочуць беларусы сваёй рэспублікі, і той нерашуча, амаль спалохана прашаптаў: нібыта хочуць... Сталін, павольна раздзяляючы словы, цвёрда сказаў: рускія хочуць, грузіны хочуць, украінцы хочуць, узбекі хочуць — і беларусы хацець павінны. Чарвякоў, крыху ачомаўшыся і пасмялеўшы, але ўсё ж шэптам, сказаў: «Жыве Беларусь!..». «Во-во, — сказаў Сталін, — жывэ Бэларусь...»

Сталін ведаў, як дашчэнту разбурана, панішчана ў вайну Беларусь, і быў упэўнены, што пад яго кіраўніцтвам яна зноў ажыве.

Энкэвэдзісты ля вагона сталі на «зважай», цягнік лёгка торгнуўся і — пайшоў, пайшоў далей на захад...

Крыху пазней з глухіх запасных пуцей за Оршай на ўсход пайшлі эшалоны з былымі ваеннапалоннымі (іх везлі з Германіі) і эшалоны з заможнымі сялянамі Заходняй Беларусі. І чуйна плыў на захад цягнік па сціхлай Беларусі.

Каця, я таксама, як і ўвесь былы савецкі народ, апроч палітзэкаў, крымскіх татараў, чэчэнцаў, інгушаў ды паловы заходніх украінцаў, плакаў па Сталіну. Дырэктар школы прыйшла да нас, сямікласнікаў, на ўрок беларускай літаратуры сумная, з пачарнелым тварам, села на сваё крэсла, заплюшчыла вочы і раптам ціха заплакала, клас знерухомеў, потым яна сказала: «Дети! Сталин умер». Дзяўчаткі адразу зарыдалі. Хлопцы схавалі вочы ў далоні, і я не ведаў, як у іх, а ў мяне ўпала сляза на парту. Я расплюшчыў вочы, азірнуўся па баках: хлопцы паапускалі рукі, а дзяўчаткі ўсё яшчэ плакалі разам з дырэктаркай. Пасля супакоіліся і дзяўчаткі, толькі ў дырэктаркі падрыгвалі плечы...

Праз шмат гадоў, ужо калі сам быў настаўнікам, я ўведаў, што мужа дырэктара нашай школы 7 мая 1945 года звезлі, як былога палоннага, на шахты ў Данбас, дзе ён быў завалены вугалем...

Каця, тут у мяне вечарэе. Я толькі што адышоў ад акна. Над рэчкай, над чаротам паўстае светлы туман. У двары, чую, цёпла, а ў млыне дык і душна нават. Пахне мёдам.

А што там у вас за вокнамі? Працягваю табе руку праз туман.

Бывай, Каця.

Я.

**4.**

*Добры дзень, мілая вядзьмарка!*

*На калодзе ажно два твае лісты. Адзін канвэрт ляжаў — колькі дзён, не ведаю — на падлозе ў хутарскіх сенцах, у прыцемку, за шулам. Паштарка прасунула яго ў шчыліну між дошкамі. Распавядаеш у абодвух лістах, як добра вам усім у рэдакцыі працуецца, а табе яшчэ і ў сям'і добра, і як гэта разумна, што я пішу табе на адрас рэдакцыі.*

*І мне тут добра. Вельмі добра зрабілася, калі з пазнейшага твайго конвэрта выпаў на стол калінавы лісток. У горадзе таксама расце каліна? Пішаш, што Тэкст мой пра Сталіна табе спадабаўся. Папікаеш, што я забыў сказаць, хоць бы двума-трыма сказамі, пра сталінскія рэпрэсіі ў Беларусі. Але ж і так ужо шмат напісана пра гэта і ў Расіі, і ва Украіне, і ў нас, што ўжо й чытаецца цяжка ці занадта лёгка. І страхоцце, і жу-*

*доцце. Адпачнем? Вунь і Салжаніцын пад Масквой ужо не піша пра тое.*

*Пішаш, што ў маі 1945 года бацькаў знаёмы з суседняй вёскі, кавалер двух ордэнаў Славы, загрымеў на Калыму за одно неасцярожнае слова пра мясцовы сельскі савет (толькі пра сельскі савет).*

*Вельмі слушна кажаш у лісце, што тэкст пра Сталіна лагічней было б скончыць трагічнымі фактамі, да прыкладу, высылкай на шахты, на Калыму, на верную пагібель...*

*Так, гэтак будзе лагічней, і Тэкст стане больш падобным на навэлу.*

*Досылаю новы Тэкст.*

## Беларуска-польскае пытанне

У слонімскія лясы прыйшоў верасень. Купкі верасу ружова цвілі пад залацеючым нізкім веццем бяроз і соснамі. Зямля тут узгорыстая, і таму мы, калі ідзём пад гару, часта кідаем на дол з плячэй трубы (адзін канец на плячы ўперадзе, другі — на плячы ззаду), кідаем стальныя цяжкія снарады-свярдзёлкі і самі сядаем на дол, і ямо брусніцы і дурніцы. Брусніцы ўжо чырвона-ядраныя, кісла-салодкія, і буйныя блакітныя дурніцы — сакаўныя, таму не бяром з сабою ў лес ваду. Толькі брыгадзір наш, рыжы рускі, недзе з Волгі, стаіць і есць з куста крушыну, і ўсе мы ахвочыя да буйной чорнай ажыны. Ды яшчэ, калі выходзім на рэчку, п'ём ваду. А вада ў пяцьдзясят сёмым, яшчэ задоўга да абвальнай хімізацыі — чыстая-чыстая і тут, у лесе, пахла ягадамі, грыбамі, ігліцай. А мы — гэта хлопцы і мужыкі з геолага-пошукавага атрада. Пасля цяжкай працы ў лесе (а кіравалі намі рыжы брыгадзір і лабарантка Сабіна — яна маўкліва цягнула за намі мяшок з мяшочкамі, у мяшочках пробы, — шукалі мел і вапняк), скінуўшы ў кустах з плячэй «снарады» і трубы, брыдзём, стомленыя, у вёску. І там, у старым драўляным бараку, дзе мы кватаравалі, ажываем, бо маладыя, крэпкія, апранаемся ў чыстыя чорныя штаны і белыя кашулі, выпіваем самагонкі, са смакам вячэраем і, як ужо добра сцямнее, ідзём у канец вуліцы, там ля клуба танцпляцоўка.

Іду ззаду ўсіх і ўспамінаю дзень у лесе... Кручу за ручку з напарнікам Віцем снарад-свярдзёлак і спадылба пазіраю на Сабіну, бо мне дзевятнаццаць гадоў, а ёй усяго шаснаццаць (я быў тады ў інстытуцкім акадэмічным водпуску, а яна скончыла дзевяць класаў тутэйшай школы). Пазіраю на яе яшчэ і таму, што яна вельмі прыгожая і прыгожа сядзіць на бярозавым пні. У яе, як у гераінь раманаў Тургенева, доўгія цёмныя вейкі (гэта прыгажэй, чым «ресницы», бо — «веяць», дрыжаць), вялікія карыя вочы, чорныя бровы, як пішуць у кнігах — падкоўкай, маленькі носік, смуглявы твар. Сядзіць на пні — роўна трымае стан і ўсё папраўляе квятастую спаднічку на поўненькіх каленках, злёгку калупае мох мыском боціка. Амаль увесь дзень маўчыць. Калі яна, бывае, пазней прыходзіць у лес, рыжы брыгадзір, квадратны здаравяк, першым убачыўшы з'яўленне між дрэў Сабіны, смачна вылаяўшыся «...т-твою мать!», прыкладвае палец да вуснаў і кажа: «Идёт. Тихонько выругайтесь в последний раз». І больш ужо да вечара ніхто не мацюкаецца. Толькі напарнік мой, Віця, аднойчы, калі снарад стукнуўся ў камень, забыўся на брыгадзіраву забарону і ўжо вось-вось гатовы быў мацюкнуцца... Аднак рыжы, які надарыўся побач, пстрыкнуў яго пазногцем па ілбе...

Сабіна ціха падышла да нас, нахілілася над снарадам, лыжкай выграбла з яго ў мяшэчак паднятую з глыбіні зямлю. Калі яна нахілілася, я ўбачыў на яе тонкай шыйцы маленькую карычневую радзімку. Мне захацелася дакрануцца рукой да радзімкі, але Сабіна, мабыць, шыяй адчуўшы маё жаданне, выпрасталася і вельмі сур'ёзна і крыху насмешліва глянула мне ў вочы. Так упершыню сустрэліся нашы позіркі.

Толькі старэйшы лабарант, які два разы на тыдзень прыязджаў да нас з канторы па пробы, мог іншы раз грубавата паставіцца да Сабіны: «Ну, тартакоўка (яе вёска Тартакі амаль уся з палякаў), ну, пані Сабіна, давай свае мяшэчкі...».

Аднойчы яна сядзела на пні, — на яе калена ўпаў пажаўцелы бярозавы ліст. Сабіна доўга і задуменна на яго глядзела, потым узяла ў пальцы, дыхнула на яго ў мой бок. Я сам сабе падумаў: «Мілая Сабіна, мілая полька...». Падвечар з лесу яна хуценька ішла наперадзе. І чым далей адрывалася ад нас, тым гучней і гусцей мацюкалася ўся брыгада.

Увечары, выпіўшы «тартакоўкі», мы ідзём да клуба, на танцпляцоўку. Віця на сваім гармоніку, схіліўшы галаў на падраны чырвоны мех, іграе вальс, танга, факстрот, абэрак, польку... Прыходзяць і спаважна сядаюць на лаўкі па-святочнаму апранутыя Фрэда, Тэрэза, Альбіна, Данута і іншыя дзяўчаткі, крыху пазней — Сабіна ў сіняй сукенцы і ў чорных чаравічках на нізкіх абцасах. Я быў запрасіў яе на танга. Крыху, можа, неасцярожна, прыціснуў яе грудзі да сваіх. Яна глянула мне ў вочы, усміхнулася і наставіла мне ў грудзі востранькія локці, крыху адступілася назад. Я сказаў ёй:

— Паглядзі, Сабіна, вунь дзяўчаты не ставяць локці...

Яна шэптам адказала:

— То яны ўжо, мусі, прывыклі...

Я незнарок, а можа і знарок, не помню, крануў ў танцы сваім каленам яе. Яна зноў, але неяк строга, усміхнулася, шапнула:

— Я сапраўдная полька, каталічка. Гэта вы, рускія, не зусім... тэго...

— Я ж беларус.

— Ах, усё роўна — што рускія, што беларусы.

— Няпраўда, Сабіна. Я старажытны беларус. Вось толькі не ведаю пэўна: радзіміч я ці крывіч?

— Ну, то добжэнько. Дзенькую цебе.



— Мілая Сабіна.

— Ціха...

Танга скончылася. Я хацеў правесці яе за локаць да лаўкі, да дзяўчат, але яна страпянулася, сказала:

— Мы тут да такога не прывычныя. Дзенькую.

Пайшла да дзяўчат. А там ужо і хлопцы стаялі, жартавалі, рагаталі. І грамчэй за ўсіх рагатаў рыжы брыгадзір Іван, што аднекуль з Волгі.

Віця хрыпата крыкнуў:

— Белы вальс!

І ўсё-такі Сабіна падышла да мяне, ціха паклала руку на плячо... Мы станцавалі з ёй яшчэ абэрак. На факстрот да яе пайшоў рыжы Іван, але Сабіна скокнула з пляцоўкі, пабегла ў цемру вуліцы... Наступным вечарам я сказаў Сабіне ў танцы, што хачу правесці яе дахаты. Яна спытала:

— Вельмі хцэш?

— Вельмі.

— Добжэ...

Мы з ёй спыніліся на масціку праз ручай. У вадзе дрыжалі зоркі, гарэў светлы месяц. Я прыхінуў яе да сябе, пацалаваў у губы. Яна не адхінулася, часта дыхала: дыханне было цёплае. Але калі я абняў яе, яна рашуча адхінулася, напружана выгаварыла:

— Усе вы такія ру...

Хацела сказаць «рускія».

— Дык я ж беларус.

— Ах, усё адно. А я сапраўдная полька. Каталічка. Мы з мамусяй ездзімо до косцелу ў Слонім. І я правяла Зыгмуся ў войска... — І зноў паўтарыла: — Я сапраўдная полька.

А я тады ж падумаў: дык што — сапраўдныя полькі толькі цалуюцца? У Напалеона ж з прыгажуняй-полькай — нават графіняй! — было «ўсё». І яшчэ ўспомнілася, што нашымі суседзямі ў вёсцы была польская сям'я, і ў ёй — маладзенькая прыгажуня Ядзя. Яна ў шаснаццаць гадоў нарадзіла дзіцё ад лётчыка, спакушала хлопцаў і мужыкоў,

аднойчы дагнала каля лесу майго аднакласніка, кінула яго на зямлю пад куст.

«До косцелу» ў Косаў Ядзя не ездзіла...

Я некалькі хвілін маўчаў, трымаючы яе руку ў сваёй, потым сказаў:

— Правяла ў войска?

— Так, правяла... Не, не, не! Не абдымай мяне так моцно! Я ж...

Я раззлаваўся, не даў ёй дагаварыць, бо амаль крыкнуў:

— Я ж сапраўдны старажытны беларус!

І схапіў яе за плечы, прыхінуў да сябе і цалаваў, цалаваў, і яна мяне цалавала...

Ад мосціка, ад дрыготкіх зорак і месяца ў ручаі я нёс Сабіну на руках, мілаваліся...

Назаўтра ў лесе рыжы брыгадзір Іван з Волгі нешта брыдкае сказаў ёй. Сабіна змаўчала. Я, яшчэ амаль хлапчук, рашуча падышоў да яго і так цвёрда глянуў яму ў вочы, што ён, рускі мацак, неяк зніякавеў, махнуў рукой і адышоўся ўбок.

Пад вечар Сабіна кінула рыжаму мяшэчкі з пробамі і пабегла з лесу. Раніцай на яе месца ў лес прыйшла Тэрэза, адразу стала рагатаць з хлопцамі, і я падумаў: «А вось гэтая ўжо сапраўдная полька!..»

Некалькі вечароў Сабіна не прыходзіла на танцпляцоўку, значыць — і мосцік над ручаём абыходзіўся без нас. Аднойчы я не вытрымаў і вечарам падышоў да яе хаты, што стаяла наводшыбе вёскі, пад старую бярозу з пустой буслянкай. Ведаў, што Сабіна жыве з маці і меншай сястрой (бацька «сядзеў» недзе ў Сібіры як былы «жолнеж» Арміі Краёвай).

Як злодзей, які тут яшчэ нічога не ўкраў, але хоча ўкрасці, я стаяў пад вакном, крыху збоку ад яго. У хаце гарэла слабае святло, фіранка чамусьці была не завешаная, фортка адчыненая. Сабініна маці ў чырвоным фартуху стаяла ля прыпека і нешта гатавала. Сабіна сядзела на ўслоне, далонямі закрыўшы вочы, а маці ціха, але ўзбуджана казала ёй:



— Не, не і не! Больш ты до его не пуйдзеш! До гэтого студэнта... Ойцец его ўчыцель? І я была ўчыцелькай на гэтых пшэклёнтых крэсах. А бацька яго біўся з твуім бацькам! Ды мы ж каталікі, помні, Сабіна. Тшэба было нам з'ехаць пасля вайны ў Бялысток. Але ж чэкам ойца, можэ й жывы. Сабіна! Дочачка муя!..

Сабіна маўчала, плечы яе дрыжалі — яна ціха плакала. З другога пакоя выйшла ў белай начной сукенцы дзяўчынка, узяла Сабіну за руку і павяла ў пакой. Я бачыў слёзы на вачах і шчоках Сабіны.

Паціху пайшоў ад яе хаты.

Але праз два вечары яна ў сіняй сукенцы ўсё-ткі прыйшла на мосцік. На танцавальную пляцоўку не пайшлі. Нам было добра тут, над ручаём, у якім трымцелі зоркі і гарэў светлы месяц...

Неўзабаве наша брыгада пакінула Тартакі. Прынёсшы Сабіну на руках пад яе хату, я сказаў на развітанне, што буду пісаць ёй. Яна ціха-ціха сказала, амаль папрасіла:

— Не тшэба.

Прыхінулася, цёплая, да мяне...

...І я не пісаў Сабіне...

Праз сем гадоў (працаваў з жонкай у школе) я ехаў цягніком Брэст — Мінск і раптам рашуча скокнуў з тамбура на станцыі Лясная і пабег у Тартакі — кіламетраў за пяць. Спыніўся на ўзлеску, — ужо вечарэла, — перад мосцікам праз ручай. Дзіва, але на мосціку стаіць яна, Сабіна, у шырокай белай сукенцы, памажнеўшая ў таліі, а з ёю — мужчына і двое малых дзяцей. Абапёршыся аб парэнчу, глядзяць у празрыстую ваду ручая, пра нешта гавораць... Сабіна раптам павярнула галаву ў мой бок, спалохана схамянулася... І ўсе яны пайшлі з мосціка.

Калі добра сцямнела, яна вярнулася туды. Я ўсё яшчэ чакаў яе. Абняла мяне. Я ж моцна трымаў яе ў сваіх руках, і яна тут, нарэшце, не сказала мне, што яна сапраўдная полька, каталічка... Мы развіталіся назаўсёды. Я пайшоў

адзін цёмнай дарогай праз лес, потым пабег пад зоркамі і светлым месяцам...

*Каця, у тваім кабінеце ў рэдакцыі я табе сказаў, што ў чалавека самы светлы ўспамін пра першае і апошняе каханне. Ты памаўчала і разгублена-коратка хітнула галавой у знак згоды. І мне яшчэ ўспомніцца маё апошняе...*

*Бывай, Каця.*

*Я.*

*P. S. Як табе тое месца ў навэле пра бярозавы лісток на каленях Сабіны? Быццам той лісток упаў на тваё калена... Прабач.*

**6.**

Далёкая мілая Каця!

*Пытаешся, як тут мая прырода?*

*Хоць і не чую, але ведаю, што чараты на рэчцы шумяць. З бярозавай галінкі зіркае мне ў вакно верабейка, б'е крыльцамі, скача па галінцы. Грэчка ўсё яшчэ пахне мёдам. Пушча за рэчкай стаіць зялёна і магутна...*

*Пішаш, што была ў грыбах, прысела на пень пад бярозай, на калена зверху ўпаў бярозавы, яшчэ пакуль зялёны, лісток, узяла яго ў пальцы, дыхнула, а ён нікуды не паляцеў, упаў зноў на калена... Мне здаецца, што ты або позна аслабіла пальцы, або зусім слаба дыхнула...*

*Каця, Каця...*

*Дасылаю яшчэ навэлу.*

## Як студэнт Алег быў «стукачом»

У канцы верасня 56-га студэнт першага курса філфака пединстытута ішоў у інтэрнат па вуліцы Леніна. Ён быў апрануты ў шыракаваты (напэўна, бацькаў) паношаны шэры касцюм. Тратуар, дахі дамоў, балконы былі ўсыпаны барвовым кляновым лісцем. Ціха, цёпла, ляціць белае



павуціннe. Студэнту ўсцешна на душы, ён нават забыўся, што яму хацелася есці. Сёння на лекцыі па гісторыі КПСС студэнтка Лена азірнулася на Алега (ён сталаваўся за яе спіной) і ўсміхнулася яму блакітнымі вачамі.

Студэнт звярнуў з Савецкай на Камсамольскую, потым — на Карла Маркса. Перад вуліцай Дзяржынскага, на драўлянай лаўцы пад сцяной высокай мураванкі, сядзеў белавалосы чалавек гадоў сарака ў новым сінім касцюме. Чалавек нягучна і весела сказаў:

— Алег Паўлавіч, добры дзень! Прысядзьце тут.

Студэнт спыніўся, здзівіўшыся: упершыню яго назвалі па-бацьку. Але сёння яму было радасна на душы, ён сеў на лаўку.

— Алег Паўлавіч! — чалавек у новым сінім касцюме падаў яму руку, яна была цёплая. — Будзем знаёмыя. Я капітан органаў дзяржаўнай бяспекі. Барыс Барысавіч. — Капітан дастаў з нагруднай кішэні і паказаў пасведчанне. — Пра вас я ведаю. Вы камсамолец і сын настаўніка-камуніста. Вашу маці, з-за бацькі, немцы паранілі, а паліцэйскія яшчэ жывой закапалі ў зямлю. Яна бегла за бацькам, крычала яму, а ён уцякаў ад немцаў у лес праз кусты. Пра гэта вы пісалі ў сваім сачыненні на ўступных экзаменах.

— Так, — сказаў студэнт.

— Дык вось. Доўга гаварыць не будзем. — Капітан ласкава ўсміхнуўся. — Бачыце, з якой вы сям'і. А вы ж яшчэ і камсамолец. — Капітан, як быццам так сабе, азірнуўся і бліжэй на вуха студэнту сказаў: — У нас яшчэ ёсць, хоць і няшмат, ворагі савецкай улады і партыі. Яны стараюцца, дзе можна, хітрыкамі, з-за вугла паўплываць на моладзь, асабліва на студэнтаў. І вы, Алег Паўлавіч, павінны дапамагаць нам выяўляць такіх студэнтаў. Паўтараю, вы сын камуніста. Тым болей, вы назіральны чалавек. Пішаце апавяданні і друкуецеся, пакуль што ў раённай газеце. Я чытаў. Мне яны, як і вашае сачыненне, падабаюцца. —

Капітан памаўчаў, потым рашуча і строга сказаў: — Вы згодныя?

Студэнту было васямнаццаць гадоў, ён быў камсамольцам, членам факультэцкага камітэта камсамола, сынам настаўніка-камуніста, сынам маці — ахвяры фашызму, і ён разумеў, у якой апынуўся сітуацыі, і таму адказаў:

— Згодны.

Капітан органаў дзяржаўнай бяспекі ласкава ўсміхнуўся навабранцу ў сакрэтныя асведамляльнікі. Тут жа назваў вуліцу і нумар дома, сказаў: — Заўтра ля дома сустрэну вас роўна ў пятнаццаць гадзін. А цяпер ідзіце ў інтэрнат у свой пяцідзясяты пакой, абедайце.

Капітан ласкава ўсміхнуўся, пацiснуў студэнту руку і шпарка пашыбаваў прэч. Студэнт, у шыракаватым паношаным шэрым касцюме, у стаптаных чаравіках, пайшоў у інтэрнат — па барвовым кляновым лісці... У сваім пакоі Алег уважліва паглядзеў на трох хлопцаў-суседзяў (усе з розных факультэтаў): хто з іх таксама сустракаецца з белавалосым (а можа, з іншым — з чорнавалосым) кадэбістам?..

У пятнаццаць гадзін наступнага дня студэнт Алег падышоў да невялікага белага і вельмі зграбнага асабняка ў старым яблыневым садзе.

— Алег Паўлавіч, добры дзень.

Студэнт ад нечаканасці ажно здрыгануўся. Азірнуўся: перад ім стаяў белавалосы ў новым шэрым касцюме.

— Добры дзень, Барыс Барысавіч, — сказаў студэнт і падумаў: не, ты не Барыс Барысавіч, і пасведчанне не на тваё сапраўднае імя і прозвішча.

Капітан жа ласкава ўсміхнуўся, падаў руку, глянуў у абодва бакі вуліцы, сказаў:

— Хадзем.

У сенцах капітан стаў перад «вочкам» у дзвярах, націснуў на кнопку. Дзверы адчыніла тоўстая, у квятастым халаце, сівавалосая жанчына:

— Калі ласка, заходзьце.



«Госці» селі ў пакоі за круглы стол, гаспадыня паставіла перад імі па кубку гарачай кавы і сподачак з печывам, а сама выйшла ў суседні пакой. Капітан пацікавіўся:

— Як здароўе, Алег Паўлавіч?

— Нічога, добра. Толькі выпілі ўчора з хлопцамі халоднага вермуту, дык у глотцы крыху пяршыць.

Капітан дастаў з нагруднай кішэні маленькі флакончык з цёмнай вадкасцю:

— Экстракт жэньшэню.

— Не трэба, Барыс Барысавіч. Дзякуй. Лепш вып'ю гарачага віна.

Капітан з усмешкай, але і сур'ёзна паківаў Алегу пальцам:

— Ну, глядзіце.

Разы два-тры глынуўшы кавы, капітан дастаў з кішэні і паклаў перад Алегам аркуш паперы і аўтаручку.

— Алег Паўлавіч, напішыце распіску... Бярыце ручку.

Студэнт насцярожана ўзяў ручку. Капітан прадыктаваў, а Алег напісаў, што «сотрудничая с органами КГБ в качестве добровольного... — Тут малады «сотрудник» запытальна паглядзеў на капітана, але той цвёрдым голасам паўтарыў: «...добровольного» і працягваў: «сотрудника, никогда не буду разглашать тайны сотрудничества».

«Ад сёння прозвішча ваша ў нас будзе Стульчык. Пастаўце дату і распішыцеся, Стульчык».

Малады супрацоўнік падумаў, падумаў, паставіў дату, распісаўся: Стульчык. Як жа — камсамолец, сын партызана-камуніста і маці — ахвяры фашызму, у эпоху барацьбы з капіталізмам...

Капітан паклаў паперчыну ў кішэню.

— Піце, піце каву, Алег Паўлавіч.

Але напаўгалодны студэнт больш яе піць не стаў.

— А цяпер, Алег Паўлавіч, слухайце ўважліва. У вашым інтэрнаце таемна ходзіць па руках брашура львоўскага дацэнта пра выдуманыя ім недахопы сацыялістычнага

спосабу вытворчасці. Нам трэба ведаць, хто са студэнтаў яе чытае. Прозвішчы.

Капітан КДБ зноў паклаў перад новым сакрэтным супрацоўнікам паперу з напісаным кароткім зместам і (студэнт здзіўлена і ўпершыню з нейкім страхам глянуў на яго) новенькую «дзясятку», сказаў:

— Вы — студэнт, і вам ой як спатрэбіцца. Толькі распішыцеся: Стульчык.

Студэнт у паношаным касцюме і чаравіках, прыняты ў інстытут без стыпендыі і сёння зусім галодны, хоць і нерашуча, але ўзяў са стала «дзясятку», нялоўка шмаргануў яе (яна, здаецца, не хацела лезці) у кішэню бацькавых штаноў.

Капітан устаў з-за стала, ласкава ўсміхнуўся Алегу, паціснуў яму руку, сказаў:

— Роўна праз тыдзень у гэты час.

Гаспадыня ветліва праводзіла іх у сенцы. Яны выйшлі на вуліцу, капітан КДБ хутка пайшоў у адзін бок вуліцы, а новы сакрэтны асведамляльнік павольна, задуменна звесіўшы галаву, — у другі яе бок...

У нядзелю ў інтэрнат прыехаў бацька, прывёз паўмяшка бульбы, кавалак сала, кілаграм цукру (ён, настаўнік вясковай пачатковай школы, атрымлівае ў месяц шэсцьдзясят рублёў, а сям’я ж яшчэ — мачыха і хворая малодшая сястра). Даў сыну дзесяць рублёў. На развітанне, на аўтастанцыі, сказаў Алегу:

— Сын! Добрыя хлопцы ў тваім пакоі. Глядзі, не падводзь іх. Нікога не падводзь. Не здраджвай людзям. Сябруй з людзьмі...

З-за вакна аўтобуса бацька махнуў сыну рукой, усміхнуўся...

Праз тыдзень Алег спыніўся ля таго асабнячка, стаіць. Ззаду пачуў голас:

— Алег Паўлавіч, праходзьце.



Увайшлі ў дом. Гаспадыня паставіла на стол перад кожным кубачкі з кавай, сподачак з печывам. З кубачкаў ішла пара.

Капітан КДБ ветліва ўсміхнуўся і сказаў:

— Перапішыце распіску: у слове «Стульчык» вы замест «т» напісалі «ц». Алег перапісаў.

— Ну што, Алег Паўлавіч, прынеслі?

Сакрэтны асведамляльнік дастаў з нагруднай кішэні пінжака паперу, паклаў перад капітанам. Той узяў паперу ў рукі, моўчкі прачытаў, пасля прачытаў уголас:

— «По рукам студентов тайно ходит книга зарубежного врача «Всё о женщине»! со страшными иллюстрациями, схемами». — Капітан памаўчаў і раздражнёна сказаў: — Не тое, Алег Паўлавіч. Брашура львоўскага дацэнта!

Алег спакойна адказаў:

— Не відаць, не чуваць.

— Прыйдзеце роўна праз тры тыдні. Заданне, — капітан павысіў голас, — не просьба, а заданне: што гаворыць на лекцыях пра беларускі фальклор, пра гісторыю беларускага народа дацэнт Стэльмах. Усё! Да сустрэчы!

Яны выйшлі з дому, нават не прыгубіўшы кавы.

На новую сустрэчу з капітанам Алег прынёс паперу, у якой расхваліў Стэльмаха і, дарэчы, напісаў, што «доцент Стельмах в одной из лекций сказал, что белорусский народ создал богатейший фольклор, который стал широко известен только при советской власти, и сказал однажды, что только при советской власти стал по-настоящему цениться Кастусь Калиновский».

Капітан паморшчыўся, доўга спадылба глядзеў на Алега, потым сказаў:

— Стэльмах — заядлы заходнік... Заданне застаецца тое ж — пра Стэльмаха, і ўсё пра яго і не толькі адносна фальклору. Майце на ўвазе, Алег Паўлавіч. Вы камсамолец, вашу маці забілі фашысты. Бацька — камуніст. І вы — пачынаючы пісьменнік. Дапаможам друкавацца. Набліжаецца ваша першая зімовая сесія. Турбаваць вас не

буду. Сустрэнемся пасля сесіі. Я знайду вас. Усё. Будзьце здаровыя.

Алег паспяхова, на стыпендыю здаў зімовую сесію. Прадаў аднакурсніку бацькаў гадзіннік, аддаў студэнту-земляку коўдру, каб той завёз яе (і запіску бацьку) дахаты, пайшоў да дырэктара інстытута, падаў яму заяву на акадэмічны, гадавы, адпачынак. Лысы, як калена, дырэктар сказаў Алегу ў кабінеце:

— Ну што ж вы так? Жаніліся б на прыгожай студэнтцы, яна б вам раніцай чай падавала, і жылі б сабе, вучыліся. Пачакайце ў прыёмнай хвілін дзесяць.

Алег выйшаў у прыёмную. Праз хвілін дзесяць зазвінеў тэлефон, і дзяўчына-сакратарка сказала:

— Заходзьце.

Дырэктар сказаў Алегу:

— Згодны. Вяртайцеся ў інстыту праз год на другі семестр.

У той жа дзень Алег на грошы, атрыманыя за гадзіннік, купіў білет на цягнік да Растова-на-Доне, каб заехаць да цёткі, бацькавай сястры, якая жыла з мужам і дачкой у данской станіцы. На пероне да яго падышоў у новым карычневым касцюме капітан КДБ, адвёў яго ў больш-менш глухое месца вакзала, ціха і ветліва сказаў:

— Прыедзеце ў Растоў — зайдзіце ў нашы органы, прадстаўцеся. Можа, чым дапамогуць. Бывайце, Алег Паўлавіч. Шчаслівай дарогі.

Падаў на развітанне руку і хутка знік...

Алег рэшту зімы і вясну жыў у цёткі, драбіў молатам ля дарогі камяні. На пачатку лета прыехаў з Гомельшчыны дзед, забраў унука і прывёз яго да сябе. А пад восень па Алега прыехаў суровы бацька. Жнівень і верасень хлопец працаваў у геолага-пошукавай партыі на Слонімшчыне. На другі семестр Алег вярнуўся ў інстытут. Капітан яго больш не турбаваў.

Праз гадоў дваццаць Алег ішоў летнім вечарам праз скверык ля інтэрната і ў слабым святле ліхтара ўбачыў сівога, у паношаным сінім касцюме чалавека, які спаў п’яны на лаўцы.

Алег дастаў са сваёй кішэні дзве «дзясяткі» і засунуў іх чалавеку ў нагрудную кішэню...

*Мілая Каця, ты ўсім усё даруеш. Даруй Алегу...*

*Прывітанне з млына. Прывітанне ад маёй бярозы, ад каліны, ад рэчкі.*

*Я.*

## 7.

Дарагая Каця!

*Дзякуй за шчырасць. Ты пішаш, што мая навэла «Беларуска-польскае каханне» табе не спадабалася, што гэта было несапраўднае каханне да Сабіны, што я закахаўся ў яе часова і толькі таму, што ўсё гэта адбывалася ў глухім лесе і я адчуваў адзіноту, і асабліва табе не падабаецца ў навэле бярозавы лісток на поўным калене полькі, тым болей, пішаш, ты не ўяўляеш нейкі лісток на сваім калене... Яшчэ й пажартавала: няўжо сапраўдная полька болей любіць нейкі лісток на сваім калене, чым руку мужчыны на ім...*

*Пішаш, што навэла «Як студэнт Алег быў “стукачом”» табе спадабалася за розум і мужнасць Алега. Пішаш, што хочаш наведаць мой млын, пабачыць усё тут, нават жабак — як яны скачуць з берага ў рэчку. Каця, я буду шчаслівы — прыедзь. Мы пераплывем з табой рэчку; на тым беразе пачынаецца Пушча. Там, я чуў яе не аднойчы, крычыць сойка — любімая птушка Пімена Панчанкі, а ты любіш яго паэзію.*

*А ці ўмееш ты плаваць? Калі не — я «перавязу» цябе на той бераг на сваёй спіне, плаваю добра. (Некалі, у студэнцтве, быў нават інструктарам па плаванні ў піянерскім лагеры, і начальнік лагера казаў мне, строга махаючы пальцам перад носам: «Ты мне дзяцей плаваць не вучы, сядзі з імі на беразе»).*

*Званіў учора з вёскі ў бліжэйшую, больш-менш прыстойную бібліятэку (у гарадскім пасёлку): ці ёсць у іх француз Альфонс Дадэ? Не, сказалі, такога француза ў іх няма і не чулі, пра француза Акутагаву чулі, а пра такога Альфонса — не...*

*Мілая Каця, чакаю цябе. Сустрэну твой аўтобус у вёсцы.*

*Я.*

**8.**

*Мілая Каця! Усё сваё астатняе жыццё буду памятаць твой прыезд да мяне, буду памятаць, як ішлі мы з хутара на млын, як ты спынілася ля куста каліны і задуменна ўзяла ў далонь яе ружовую гронку, як стаяла пад бярозай і вачамі шукала ў веццi верабейку, а ён дзесьці ў гары над табой чырыкаў; як нізка ты нахілілася над ужо адцвілай грэчкай, як мы ўзышлі на млын, як прысела ты на маю калодку і паклала рукі на «стол», як мы падышлі да вакна і глядзелі ў поле, як прыйшлі на бераг рэчкі і жабкі з вады віталі цябе інтэлігентнымі лупатымі вачамі і ўрачыста скакалі з вады на шырокае лісце гарлачыкаў, як пасля мы ўрэшце пераплылі рэчку... У Пушчы я называў цябе любімай, каханай. Ты маўчала, я цалаваў твае слёзы. Ты маўчала...*

*Пушча была нашай. Дзякуй табе, любая жанчына, за маё неймаверна вялікае, на ўсё астатняе жыццё шчасце.*

*Я толькі прасіў цябе быць са мной на «ты». Згадзілася. А калі мы вярнуліся на свой бераг, ты зноў чамусьці стала са мной на «вы». Навошта, Каця?..*

**9.**

*Добрая, мілая Каця!*

*Сёння вада ў рэчцы ціхая, зусім не хвалюецца, як і Пушча на тым беразе — можа, таму, што і вада, і Пушча вельмі-вельмі старажытныя і таму — мудрыя, як і неба над імі, і поле за млынам. Мне ўжо здаецца, што і гэты мой млын — вечны, і трава, па якой мы йшлі з табой да рэчкі, — яна заўсёды была й будзе...*

*Дасылаю два невялікія Тэксты.*

*Я.*

## Хроніка студзеняў
*Драматычная навэла*

**Дзейныя асобы:**

**Анатоль, Махлюд-2** — два сябры-суседзі ў даваенным маленстве;
**Хведар, Махлюд-1** — бацькі маленькіх сяброў-суседзяў і самі сябры ў даваеннай маладосці, **Хведар** да вайны — настаўнік, **Махлюд-1** — паштальён; у час вайны **Хведар** — партызанскі сувязны, **Махлюд-1** — стараста;
**Ігнат** — швагер Хведара, партызанскі разведчык, у першыя два месяцы вайны працаваў у немцаў майстрам па рамонце шашы;
**Сцяпан** — малодшы брат старасты.

**Студзень 1941 г.**

Толя — сябру-суседу Махлюду-2, на вуліцы, у снезе:
*— Я цябе люблю. Ты мой лепшы сябар.*
Махлюд-2 — Толю:
— І я цябе люблю. Ты — добры. Але падчас магу й зарэзаць...
Хведар — Махлюду-1:
*— Зайдзі да мяне на свежыну. Павячэраем за чаркай.*
— Махлюд-1 — Хведару:
*—Зайду. А заўтра — да мяне на свежыну...*

**Студзень 1943 г.**

Махлюд-2 — Толю:

*— Я цябе больш не люблю, бо твой бацька настаўнік пры немцах.*

Толя — Махлюду-2:

*— А я цябе люблю, бо хоць твой бацька староста, але ж мы з табой сябры.*

Махлюд-1 — Хведару:

*— Здагадваюся, што ты — партызанскі сувязны, ужо даўно мог цябе выдаць.*

Хведар — Махлюду-1:

—Ты быў бы нягоднікам.

**Студзень 1944 г.**

Толя — Махлюду-2:

*— Твой тата восенню выдаў майго тату. Тату арыштавалі фрыцы, пасадзілі ў машыну, але тата выскачыў з машыны, пабег у лес, па ім стралялі, чатыры раны. Мама бегла за ім, крычала, плакала, яе ранілі ў нагу, яна страціла прытомнасць, і яе жывой засыпалі ў кустах зямлёй, ноччу дзед з дзядзькам прывезлі яе дамоў, каб пахаваць... Я цябе ненавіджу.*

Махлюд-2 —Толю:

*— Ігнат не знайшоў майго тату, дык завёў у лес майго дзядзьку Сцяпана, прывязаў да дрэва над мурашнікам, пайшоў, але пасля ўсё ж вярнуўся, адвязаў і моцна збіў. Я цябе ненавіджу.*

Хведар — Махлюду-1:

*— Не буду аб цябе й рукі брудзіць. Бог цябе пакараў. У Сібір на дваццаць пяць гадоў?*

Махлюд-1 маўчыць.

Ігнат — Сцяпану:

*— Я быў адвязаў цябе ад дрэва. Мне дадуць дзесяць гадоў за два месяцы работы на дарозе пры немцах.*



Сцяпан — Ігнату:

*— Лепей пагналі б мяне адсюль. Жыць мне тут з-за брата цяжка будзе.*

Ігнат — Сцяпану:

*— Як-небудзь жыві.*

Сцяпан — Ігнату:

*— Вярнуся — буду вечным у цябе заложнікам.*

Ігнат — Сцяпану:

*— Не трэба. Ты не быў ні ў партызанах, ні ў паліцыі. Жыві як-небудзь.*

**Студзень 2003 г.**

Хведар і Махлюд-1 сустрэліся на заснежанай вуліцы суседняй вёскі. Кожнаму з іх дзевяноста, з-пад шапак — рэдкія, белыя, як снег, валасы. Махлюд-1 упаў на калені перад Хведарам.

Махлюд-1:

*— Забі мяне.*

Хведар:

*— Мы хутка і так памром. Устань ды йдзі.*

Махлюд спрабуе ў снезе ўстаць на ногі і не можа. Хведар спрабуе падняць яго, але сам падае ў снег...

Махлюд-1:

*— Задушы мяне.*

Хведар:

*— Не трэба. Вось падымемся і ўжо навечна разыдземся.*

Хведар з цяжкасцю ўстае, дапамагае ўстаць Махлюду-1. Разыходзяцца.

Ігнат і Сцяпан (з-пад шапак — сіва-зімныя валасы) сустракаюцца на заснежанай вуліцы.

*— Здароў, Сцяпан.*

*— Здароў, Ігнат.*

Разыходзяцца па снезе.

Анатоль і Махлюд-2 (кожнаму па шэсцьдзясят пяць) нечакана сутыкаюцца на заснежанай гарадской вуліцы і моўчкі размінаюцца.

На заснежаным кладаўі, на ўзлессі, над магілай Анатолевай маці Агапы — новы высокі сасновы крыж. На ім вісіць белы фартушок, павешаны ўнучкай Агаф'яй.

## Ніл Гілевіч — самы народны паэт

Сяджу на драўлянай лаўцы ў скверыку ля Маларыцкага вакзала, чакаю свайго цягніка. Вечарэе. Па-ліпеньску цёпла. На суседняй лаўцы сядзіць пажылы мужчына. У яго ўскудлачаныя, даўно, мусіць, нечасаныя чорныя валасы, чорная шчэць на твары, апрануты ў зашмальцаваную камуфляжную форму, на нагах — падраныя тэпці.

Клічу яго да сябе. Ён цяжка і, здаецца, неахвотна падыходзіць. Я дастаю з пакета бутэльку віна, батон, пластмасавы кубак. Наліваю і працягваю яму. Ён п'е павольна, глыткамі, пазірае на мяне наўздзіў блакітнымі вачамі. Кажа:

— Дзякуй.

Адламаў маленькі кавалачак батона, падняўся і павольна пайшоў на сваю лаўку. Узяў там бухматую (празвінела шклом) чырвона-зялёную торбу, адышоў падалей, сеў пад клёнам на траву, прыхінуўся спінай да ствала, глядзіць у пацямнелае неба. Пасля апусціў долу кудлатую галаву і сам сабе, дрэву і траве ціха заспяваў. Я міжволі прыслухоўваюся:

— ...хай накрые тума-ан...

І зноў паўтарае спачатку — мусіць, больш не ведае, а можа, і ведае, ды паўтарае самыя блізкія і шчымлівыя для яго словы:

— А я лягу-пryля-агу-у
Край гостынця старо-ого-о...
Хай накрые тума-ан...



Ты, каторы пайшоў ад мяне на траву пад дрэва і пяеш: «Хай накрые туман», — кім ты «быў»? Быў інжынерам-бэнээфаўцам? Мастаком-афарміцелем? Рабочым? Служыў у Афгане?.. А цяпер, пэўна, — алкаголік-развядзенец...

Мой цягнік гудзе на падыходзе, і я іду на перон, чуючы за спінай глухі працяглы спеў-уздыханне:

— ...хай накрые тума-ан...

У вагоне думаю: народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч — па-сапраўднаму народны паэт. Яго словы пяюць і «бамжы» ў глыбі берасцейска-валынскага Палесся...

**10.**

*Дарагая Каця!*

*Ты паклала ў канвэрт яловую голку. А чаму не сасновую? Што, яловая лепей колецца? Добра хоць не сухую — зялёную. Дзякуй, вядзьмарка. Ну, вярнуся дахаты — прыйду да цябе ў кабінет і ўсю абсыплю шыгаллем. А не будзе цябе — пакіну на стале яловую лапку...*

*А ўсё-ткі прыйдзеш да мяне, калі вярнуся? Ты ж неяк прагаварылася, што любіш пячы дранікі. Вось і напячэш мне. Бульба ёсць, алей таксама (ці лепей на сале? — і сала ёсць). Паямо разам. Бог дарue. Ды ён і ведаць не будзе...*

*Некалі ў кабінеце ты казала, што ўпэўнена: уся мая проза мае аўтабіяграфічную аснову. Так, не толькі аснову, а й напалову аўтабіяграфічная. Зменены толькі імёны і, злёгку, тапонімы. Мае Тэксты — усё-ткі ж літаратурна-мастацкія. Вось толькі казытлівае пытанне наконт простай мовы. А нічога страшнага: гэтак маглі гаварыць, думаць персанажы.*

*Усё гэта тычыцца і вядомых мастацкіх твораў, пра якія нельга сказаць: на аўтабіяграфічнай аснове... Але якія маюць пэўную жыццёва-гістарычную аснову. Такія творы заўсёды карыстаюцца папулярнасцю сярод чытачоў, бо да такіх твораў — асаблівы давер. Вось яны най-*

*перш: «Слова пра паход Ігаравы» (Кірылы Тураўскага?), «Рабінзон Круза» Дэфо, «Гамлет» Шэкспіра, «Вайна і мір» Талстога, «Марцін Ідэн» Лондана, раманы Хэмінгуэя, аповесці лётчыка дэ Сент-Экзюперы пра лётчыкаў, «У палескай глушы» Коласа, аповесці Гарэцкага, «Птушкі і гнёзды» Брыля, «Хроніка дзетдомаўскага сада» Казько, аповесці-эсэ Карамазава пра Бялыніцкага-Бірулю, проза Салжаніцына, Астаф'ева... Але свет ахвотна чытаў і чытае геніяльных фантазёраў Рабле, Гофмана, Сервантэса, Флабэра, Дастаеўскага, Булгакава...*

*Я даслаў табе, Каця, некалькі навэл, амаль усе яны маюць жыццёвую аснову. Ну, вядома, «Сталін праз Оршу едзе ў Патсдам» — гэта мая прыдумка, апроч таго, што Сталін напраўду праз Оршу ў Патсдам ехаў. Таму гэты Тэкст выклікае недавер і ў мяне як аўтара.*

*Сёння ноччу ты хацела прысніцца мне, але перадумала, уцякла, я стаў даганяць твой прывід, ды не дагнаў і — прачнуўся.*

*А што мне рабіць з тваёй яловай голкай?*

*Хачу, каб не ўсохла і падоўгу на беразе рэчкі трымаю яе ў далоні з вадой. Жабкі недаўменна і насмешліва лыпаюць з вады на мяне...*

*Будзь здаровая, Каця.*

*Я.*

**11.**

*Дзень добры, мілая Каця!*

*Пішаш, што прыедзеш да мяне на кватэру і напячэш гару дранікаў. Гару не трэба — горку.*

*Пытаешся: у «Хроніцы студзеняў» Толя-Анатоль — ці не я? Так, я.*

*Учора ўвечары да мяне на хутар прыходзілі двое — Ён і Яна. Трыццацігадовыя муж і жонка. Ён — русавалосы настаўнік беларускай мовы і літаратуры, Яна — белавалосая настаўніца рускай мовы і літаратуры. Прынеслі бутэльку хлебной і пальцам пханую сялянскую закуску... Селі за стол.*

*Яна (на чысцюткай беларускай мове):*

*— Пачулі, што ў нас на хутары жыве беларускі пісьменнік. Захацелі завітаць. Я чытала вашую паэзію і прозу. Сама я, праўда, руская, з-пад Разані, але шаную беларускае... Па-руску гавару толькі на ўроках.*

*— А вы? — пытаюся ў Яго.*

*Ён:*

— А я, хоть и белорус и учитель белорусского, говорю по-белорусски только на уроках. В школьном же коридоре, в учительской, на улице, с земляками — только по-русски.

— Чаму?

— Русский язык — язык великой культуры. Один из официальных языков ООН. Это — во-первых. Во-вторых, всё руководство Белоруссии по-русски говорит. Вся «вертикаль», от верха до сельсовета — по-русски. Документация — по-русски. І только сельский народ — или по-белорусски, или по-полешуцки, или на «трясянке». В-третьих, Белоруссия вот-вот объединится с Россией.

Яна:

— Ён не толькі мой муж, але й манкурт. Але я яго, д'ябла, кахаю. Ён жа бацька нашых двух дзяцей. А пазнаёміліся мы з ім у цягніку... Масква — Брэст... Ен быў вельмі ветлівы, ласкавы, а я — вельмі маладая і дурная. Ну, во так і выйшла адно дурноцце за другое.

Я:

—То й добра. Жывіце і далей шчаслівыя.

Яна:

— Яшчэ наконт родных моў. Бацька мне некалі сказаў: «Доченька, меж какого люда, в каком народе придётся жить — уважай его обычаи, язык, без этого нет хорошего человека». А бацька мой няблага гаварыў па-літоўску. Служыў у войску ў Літве. Часць яго стаяла між хутароў. Змог здружыцца са старымі летувісамі. Сам рускі, ён да

самазабыцця любіў усё рускае, асабліва рускую гісторыю і паэзію. Чытаў на памяць вершы Блока, Ясеніна. Гэткае ж шанаванне ўсяго свайго, летувіскага, ён убачыў у Літве, быў проста агаломшаны гэтым. Сам стаў спрабаваць па-летувіску... А муж мой толькі раз быў загаварыў на роднай мове — калі мы былі ў гасцях на маёй радзіме пад Разаннню. Пад час застолля яго папрасілі сказаць які тост па-беларуску. Ён сказаў, але ажно пачырванеў.

Ён:

— Мне было неудобно показывать себя, тем более под Рязанью.

Я:

— Чаму няёмка?

Ён прамаўчаў.

Яна:

— Добра, што прамаўчаў. Ён такі ў мяне: які ёсць — такі ёсць, адкрыты. Адкрыты манкурт. І мой муж.

Я:

— Жывіце шчаслівыя.

Выпілі яшчэ. Я адчыніў насцеж вакно. З падворка дыхнула пахам бярозавага лісця, ліпы, крапівы, палыну і чароту з блізкай рэчкі.

Яна:

— Беларуссю пахне!

Ён прамаўчаў.

На развітанне я падпісаў ім на памяць аб сустрэчы сваю кніжачку. Яна пацалавала мяне ў шчаку. Пацалунак быў лёгкі і цёплы.

І яны пайшлі ўтравелай сцежкай да рэчкі, берагам рэчкі, сталі на беразе, доўга глядзелі ў ваду, а вада ж там, ля іхніх ног, цякла, цякла...

Каця, глядзіш за вакно? Што бачыш там, Каця?

Бывай.

Я.



Мілая Каця!

Праз два-тры дні прыязджаю дахаты. Прывязу табе вітанне ад Пушчы. Белыя гарлачыкі хай жывуць у рэчцы.

P. S. А ўсё-ткі яловая голка твая, як я ні бярог яе, усохла. Пусціў яе ў рэчку — паплыла далёка-далёка, у блізкую ўжо восень...

## Ад аўтара

*Я сустрэў літаратара К. на прывакзальнай плошчы. Узяў яго саквояж, і мы селі на лаўку. На супрацьлеглым баку плошчы стаяла пад бярозай жанчына з блакітнай хусточкай на плячах. Я ведаў, што ў яе доўгія чорныя вейкі. Адной рукой абдымала бярозу, у другой руцэ былі восеньскія кветкі. Яна чакала, пакуль я, можа, пайду ад яго. І я пайшоў, таму што ўбачыў у яго вачах ціхую радасць.*

*Я ні разу не азірнуўся: ведаў, што ён пайшоў да яе, што яна пакладзе восеньскія кветкі на лаўку, што яны разам пойдуць па вуліцы, але побач ісці будуць нядоўга, спыняцца, нешта скажуць адно аднаму і — разыдуцца, можа, назаўсёды.*

*Восеньскія кветкі ляжалі на лаўцы.*

*Бліснула крутая сіняя маланка і грымнуў гром. А мне падалося: бліснулі сінія іскры з-пад капытоў і грымнулі колы дыліжанса недзе высока над млынам ля Папёлкі. А ў самім дыліжансе ўжо даўным-даўно нікога не было, але, напэўна, усё яшчэ пахла сапрэлым віном, якое яны шчодра пралілі з Містралем, і на зямлі ад яго пахла паэзіяй...*

*А галоўнае: ой, як добра галаве і сэрцу, калі на гэтай зямлі нас сустракаюць і праводзяць жанчыны, хай сабе іншы раз і здаля...*

*Красавік-снежань 2003 г.,*
*в. Вярховічы — г. Пружаны.*

# Змест


«О, як многа хацеў вам сказаць...» .................................. 3

**ТЭКСТ І КАНТЭКСТ ЖЫЦЦЯ** ...................................... 7

«Верш — гэта дыханне яго творцы»
*Гутарка Леаніда ГАЛУБОВІЧА з Міколам КУПРЭЕВЫМ, якая адбылася на пачатку 1994 года* ........................................................ 9

Леанід ГАЛУБОВІЧ
Схіліўшыся над мурашнікам
*(Да 60-годдзя Міколы КУПРЭЕВА)* ............................ 22

Леанід ГАЛУБОВІЧ
Помнік паэту ................................................................ 29

Віктар ГАРДЗЕЙ
Вершы, напісаныя ў белых бярэзніках
*(Да 70-годдзя з дня нараджэння Міколы Купрэева)* ........................................ 31

Леанід ФІЛАТАЎ
То сэрца паэта гарыць
*Да 70-годдзя Міколы Купрэева* ................................ 48

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ
Працяг пачатку
*(Да 70-годдзя з дня нараджэння Міколы Купрэева: 25.V.1937–19.IX.2004)* ................................................. 50

Анатоль СІДАРЭВІЧ
У чаканні біёграфа ...................................................... 54

Алесь КАСКО
«Жураўлі журлівыя мае...»
*Эсэ* ................................................................................ 59

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ
Хацеў нам сказаць
*(Мікола Купрэеў — шасцідзясятнік)* ......................... 69

Аляксей БЕЛЫ
Непазбежнасць правінцыйных фантазій
*(Успаміны пра Міколу Купрэева)* ................................ 75

Святаслаў КАЖАДУБ
Дзве апошнія сустрэчы з Міколам Купрэевым .......... 84

Віталь СКАЛАБАН
«Шчырая Шчара мая...»
*(Успаміны пра Міколу Купрэева)* ................................ 93

Алег АБЛАЖЭЙ
Праклятыя паэты ........................................................ 100

Людміла БУНЕЕВА
«Ён па натуры быў вандроўнік» ................................ 104

Мікалай РЫМАЧ
Паэзія ў прозе
*(Выступ на прэзентацыі кнігі Міколы КУПРЭЕВА «Палеская элегія» ў Івацэвіцкай раённай бібліятэцы)* .................................................................. 106

Лявон ВАЛАСЮК
Многа паспеў нам сказаць ........................................... 114

Ядзвіга БЫЧКОВА (АСЕЦКАЯ)
Погляд са студэнцкага часу і пазней ........................... 116

Яўген ГАРАДНІЦКІ
Азірнуцца на сябе самога...
*Кніга вяртанняў Міколы Купрэева* ........................... 118

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ
Адвечныя лісты з млына, альбо Пра тое, як паэт вершы ў прозуператварыў ........................................ 125

Таццяна ГАЎРЫС
Вяртанне ў юнацтва ................................................... 128

Ірына РУДКОЎСКАЯ
«Я ганаруся...» ............................................................. 133

Іван ШТЭЙНЕР
Мост над зачараванай ракой ..................................... 136

Зоя МЕЛЬНІКАВА
Мікола Купрэеў. Імгненні светлыя жыцця... .............. 143

Васіль АЎРАМЕНКА
Правінцыя і свабода
*Невідавочныя ўрокі Міколы Купрэева*........................ 149
«Купрэеў як Купрэеў...»
*З лістоў Ганны ХАДАРОВІЧ*
*да Леаніда ГАЛУБОВІЧА* ............................................ 160
«Чорны дзень 19 верасня»
*Ліст Валянціны БАСАЛАЙ да Леаніда*
*ГАЛУБОВІЧА* ............................................................. 167
«На могілках пад маладым дубам...»
*E-mail ад Міколы ПАПЕКІ Леаніду ГАЛУБОВІЧУ* .... 172

**«НЕЗАБУДКІ ПАКІНЕ ПАЭТ»**
*Паэтычныя прысвячэнні*............................................. 175

Святлана КУПРЭЕВА
Поэту... ....................................................................... 177
Алесь КАСКО
Вандроўнік ................................................................... 178
Васіль САХАРЧУК
На вакзале з Міколам Купрэевым............................... 179
Аляксей БЕЛЫ
Папялёва ..................................................................... 180
Уладзімір ЦАНУНІН
* * * Шкрабе тужліва вецер па страсе... ...................... 181

**«ХОЧЕТСЯ ОЧЕНЬ ОБЪЯСНИТЬ СЕБЯ ДРУГИМ»**
*Лісты Міколы КУПРЭЕВА да жонкі Святланы*
*ЯЖАНКОВАЙ* .............................................................. 183

**ВЕРШЫ І ПРОЗА МІКОЛЫ КУПРЭЕВА**.................. 211

«ЗЯМЛЯ І ПЕСНІ»
*Тэксты, якія не ўвайшлі ў паэтычныя зборнікі* ....... 213
Табе............................................................................. 213





* * * Не прыедзеш дадому ніколі... ................................ 214
* * * Мабыць, зямля тут у нас такая... ............................ 215
Зямля і песні ................................................................ 216
* * * Кожная бярозка — нібы песня... ............................ 216
* * * Калі захварэю цяжка... .............................................. 217
* * * Недзе далёка — атамныя выпрабаванні... .............. 218
* * * Тады ж палюбіў я і вуліцы тыя... ............................ 219
Песня дзяўчыны ........................................................... 220
* * * Была восень і сцежка ў лузе... .............................. 220
* * * Ішоў па зямлі чалавек... ......................................... 221
* * * Дзеці босыя беглі па сонцы... ............................... 221
* * * Галінкай сухою — не быць на дрэве... .................... 222
* * * У каханні тваім і маім згараю... ............................ 223
Сцежка ......................................................................... 223
* * * Давай будзем жыць на высокай мелодыі... ............ 224
* * * Я крычу табе, чуеш, раніцай... ............................... 225
* * * Прынёс рэдактару вершы.... ................................... 225
Дняпроўскія мроі........................................................... 226
* * * Вядзі, мой капітан!.. ............................................... 227
* * * Ранне буйнее... ...................................................... 228
Рэкі Івана ..................................................................... 228
Апошняе слова бярозы ................................................. 229
Вечны ўздых.................................................................. 230
* * * Сёння позна сядзець не буду... .............................. 231
* * * Адыходзяць мамы ў свет далёкі... ........................... 231
Сакавіцкае ................................................................... 232
Вясковыя вераб'і........................................................... 233
Драчы........................................................................... 233
Буслы........................................................................... 235
* * * У цэнтры ўпраўлення палётам... ........................... 238
* * * Не, я не разбіўся ўшчэнт, я не стаміўся... ............... 239
Яма ў канцы XX стагоддзя............................................. 240
Ноч Янкі Юхнаўца......................................................... 241
Закляцце....................................................................... 242
Блакітныя коні............................................................... 243
Дзікія гусі..................................................................... 244

* * * «Ганулька па лесе хадзіла…» ........................................ 245
З гісторыі Падняпроўя ........................................................ 245
* * * Я ўвайшоў у райскі сад… ............................................ 246
* * * Жорсткія дзіды… ........................................................ 247
* * * Выйшла з балота… ...................................................... 247
Лісты з млына
*Аповесць* ........................................................................ 248



В17 **Вандроўнік**. Дарогамі Міколы Купрэева : успаміны, эсэ, прысвячэнні, вершы і проза / уклад. Л. Ф. Валасюка, Л. М. Галубовіча. — Мінск : Выдавец Цымбераў Р. М., 2024. — 288 с.
ISBN 978-985-7303-89-2.??

Кніга прысвечана памяці Міколы Купрэева (1937–2004), таленавітага беларускага пісьменніка, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова. Праз успаміны і згадкі родных, сяброў, землякоў творцы паўстае каларытная асоба паэта-думанніка, паэта-вандроўніка з «жураўліным сэрцам», крэўна паяднанага з роднай яму палескай зямлёй.

У кнігу ўключаны таксама вершы Міколы Купрэева, якія не ўвайшлі ў ягоныя прыжыццёвыя зборнікі паэзіі, лісты і адна з апошніх аповесцяў.

Выданне прымеркаванае да 20-годдзя з дня смерці творцы.

**УДК 821.161.3-3**
**ББК 84(4Беи)**

12+

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Вандроўнік**

Дарогамі Міколы Купрэева

*Успаміны, эсэ, прысвячэнні, вершы і проза*

Адказны за выпуск Раман Цымбераў
Рэдактар Алесь Пашкевіч
Вёрстка Ларысы Гарадзецкай
Карэктар ??

Падпісана да друку 22.07.2024. Фармат 84×108 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 15,12.
Ул.-выд. арк. 9,82. Наклад ?? ас. Зак. ??.

ІП Цымбераў Раман Міхайлавіч.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/530 ад 30.05.2018.
Пр-т Ракасоўскага, 85-47, 220085, Мінск.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў друкарні ТДА «Новапрынт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/54 ад 25.02.2014.
Вул. Купрэвіча, 1/3-6, п. 6-127, 6-107, 220141, Мінск.
Тэл. +375291037995.